Яраслаў Пархута

# ЗЯМЛЯ БАЦЬКОЎ НАШЫХ







Захапленне прыгажосцю зямлі,
дзе жылі дзяды і прадзеды,
дзе нам суджана пражыць жыццё,
паўтарыць сябе ў дзецях,
састарыцца і пайсці ў зямлю,
якая нарадзіла нас,—
гэта важнейшая эмацыянальная
крыніца любові да Радзімы.

*В. А. СУХАМЛІНСКІ*



Яраслаў Пархута

# ЗЯМЛЯ БАЦЬКОЎ НАШЫХ



Мінск «Полымя» 1988

ББК 84Бел7
П 18

Рэцэнзенты:
кандыдат гістарычных навук, член СЖ СССР
М. М. ЖЫЛІНСКІ;
кандыдат гістарычных навук, член СП СССР
Г. А. КАХАНОЎСКІ

Мастак **А. В. АЛЕКСАНДРОВІЧ**

**Пархута Я.**
**П 18** Зямля бацькоў нашых: Падарожжа па родным краі.— Мн.: Полымя, 1988.— 303 с.: іл.
ISBN 5-345-00199-5.

**Пархуто Я.** Земля отцов наших: Путешествие по родному краю.

Пра сівую даўніну і сённяшні дзень роднай зямлі, пра яе самыя ўнікальныя мясціны, пра непаўторную прыроду Беларусі, праблемы экалогіі, а таксама пра клопаты людзей у наш трывожны і складаны час расказвае ў сваёй кнізе-эсэ пісьменнік Яраслаў Пархута.

Разлічана на шырокае кола чытачоў.

П $\frac{4702120200-051}{М 306(03)-88}$ 18—88 ББК 84Бел7

ISBN 5-345-00199-5 © Выдавецтва «Полымя», 1988

## Ад аўтара

У 1985 годзе пабачыла свет мая кніга эцюдаў «Жаваранак над полем». У аснову яе пакладзена апісанне мясцін, дзе нарадзіліся ці жылі слынныя людзі зямлі нашай — беларускі першадрукар Францыск Скарына, паэты Паўлюк Багрым, Адам Міцкевіч, Францішак Багушэвіч, Алаіза Пашкевіч (Цётка) і Паўлюк Трус, верныя саратнікі У. І. Леніна — Панцеляймон Мікалаевіч Лепяшынскі і Фелікс Эдмундавіч Дзяржынскі, мужныя барацьбіты за свабоду і незалежнасць роднага краю — Тадэвуш Касцюшка, Кастусь Каліноўскі, дзед Талаш, Сяргей Грыцавец, Леў Даватар і Васіль Корж, сусветна вядомыя вучоныя Іван Чэрскі, Яўхім Карскі і Ота Шміт, пісьменнікі Эліза Ажэшка і Іван Мележ, мастак Бялыніцкі-Біруля...

«Зямля бацькоў нашых» — кніга-эсэ з задуманай серыі пра Беларусь. У ёй апавядаецца пра самую высокую і самую нізкую геаграфічныя кропкі рэспублікі, самую паўночную, усходнюю, паўднёвую і заходнюю вёскі, Белавежу, месца здабычы беларускай нафты, калійнай солі, граніту, радону, вёсачку Полымя, якая падзяліла лёс Хатыні, рэкі Бярэзіну і Дзіва, азёры Нарач і Доўгае, канал Агінскага, самыя ўнікальныя камень, дуб і школьны музей, месца

падзення Брагінскага метэарыта, буйнейшую ў Еўропе калонію шэрых чапляў. Адным словам,— пра самае-самае...

Закранаюцца ў кнізе таксама і пытанні экалогіі, расказваецца пра стан нашых лясоў, азёр, малых рэк, помнікаў прыроды, пра выкарыстанне найвялікшага багацця людзей — зямлі, пра побыт сялян, што жывуць у яшчэ нядаўна так званых неперспектыўных вёсках, робіцца пэўны экскурс і ў гістарычнае мінулае. А хіба можна было абысці маўчаннем гераічную барацьбу нашага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны?

Спадзяюся, што кніга не пакіне чытача раўнадушным. Таму і запрашаю яго ў новае падарожжа па родным краі.



## КРУТАГОР'Е

*Старая легенда • Герой вайны*
*У Станькаўскім парку • Подзвіг Марата Казея*
*Стрэльба ці фотаапарат? • На самай высокай кропцы Беларусі*

Пасля доўгага прадвесня стала цёпла. Удзень прыпарвала, а ўночы ішоў дождж — спорны, з перунамі і маланкамі. Званчэй спявалі ручаіны, на ўзгорках паказвалася трава, жаўталоз выпускаў коцікаў, да сонца падымаліся жаваранкі. Упэўненай хадою ішла па зямлі вясна. Ужо было не ўседзець дома, не пазбавіцца ад спакуслівай задумы. І я паехаў на Дзяржыншчыну, у тыя мясціны, што людзі здаўна называлі Крутагор'ем.

Даваць такую назву гэтаму кутку нашай зямлі падстава была. Дзяржыншчына ляжыць на паўднёвым схіле Мінскага ўзвышша, рэльеф якога не параўнаеш, скажам, з рэльефам Піншчыны. Тут, куды ні зірні,— узгоркі, узгоркі. Яны то разбягаюцца, то выстрайваюцца ў дзівосныя каскады. Есць нават даволі крутыя «горы».

Дарэчы, і самае вялікае тутэйшае паселішча ў далёкія часы звалі гэтак жа — Крутагор'е. Па сведчанні гісторыкаў, такая назва існавала да сярэдзіны

XIII стагоддзя. У 1249 годзе тут адбылася бітва паміж войскамі Вялікага княства Літоўскага і татарскага хана Койдана. Татары былі разбіты, Койдан забіты і пахаваны ў Крутагор'і. Пасля гэтага паселішча сталі называць Койданавам*.

Праз нейкіх пяць з паловай стагоддзяў на гэтым месцы адбылася яшчэ адна вялікая бітва, якая ўвайшла ў гісторыю як Койданаўская.

Ішла Айчынная вайна 1812 года. Каля Слоніма стаяла руская Дунайская армія на чале з адміралам П. В. Чычаговым. Даведаўшыся пра адступленне Напалеона з Масквы, Чычагоў вырашыў пераняць французаў на рацэ Бярэзіне. Яго перадавы атрад і сустрэў пяцітысячную армію ворага каля Койданава. У баі было знішчана амаль тысяча французаў, узята ў палон звыш трох тысяч. Рускія войскі адрэзалі прамы шлях адступлення французскай арміі на захад...

Увогуле, Крутагор'е заслугоўвае ўвагі. Тут жыло і жыве шмат мужных, працавітых, па-свойму адметных людзей. У гэтых мясцінах нарадзіўся і правёў свае дзіцячыя гады Фелікс Эдмундавіч Дзяржынскі... А яго старэйшы брат Казімір з жонкай Люцыяй вясною 1943 года пераехаў з Дзяржынава ў Івянец. Люцыя ўладкавалася перакладчыцай у нямецкае гандлёвае таварыства. Людзі здзіўляліся: Дзяржынскія пайшлі да немцаў! А Люцыя і Казімір выконвалі заданне партызан. Немаладога ўжо веку, яны збіралі каштоўныя звесткі пра ворага і перадавалі кіраўніцтву Баранавіцкага партызанскага злучэння. Але фашысты натрапілі на след Дзяржынскіх, арыштавалі іх, а пасля катаванняў і допытаў там жа, у Івянцы, і расстралялі.

---

* Што датычыцца назвы паселішча — гэта толькі легенда, якую ў XIX стагоддзі распаўсюдзіў наш краязнавец П. М. Шпілеўскі без спасылкі на гістарычныя дакументы. На жаль, легенда і цяпер жыве. На самой справе, як адназначаецца ў хроніцы Быхаўца, таго хана звалі Балалай.

У Дзяржынску я сустрэўся з кавалерам ордэна Славы трох ступеняў Іванам Сцяпанавічам Шмеям. Жыве ён на вуліцы Калгаснай, а працуе намеснікам старшыні мясцовага таварыства паляўнічых і рыбаловаў. Яго «канторка» ў канцы Ленінскага завулка, насупраць крутой горкі, якіх у райцэнтры багата. З акна яе было відаць, як цвіло адразу ўсё — черомха і вішня, яблыня і каштан, груша і рабіна, язмін і бэз.

Іван Сцяпанавіч адышоў ад акна, прыкурыў і доўга моўчкі смаліў цыгарку.

...Фашысты былі ў Дзяржынску на шосты дзень вайны. Іван убачыў, як «гаспадарылі» прыхадні на роднай зямлі, і не вытрымаў — паклаў у торбачку акраец хлеба, схаваў за пазуху камсамольскі білет, развітаўся са сваімі і ноччу падаўся на ўсход. У Магілёве далучыўся да атрада апалчэнцаў і ўжо з імі дайшоў да Смаленска. Потым былі баі пад Масквой, раненне, шпіталь. А тады — зноў фронт, толькі Іван ужо быў не апалчэнец, а камандзір разведаддзялення.

Усе тыя гады для яго — як даўні, жудасны, незабыўны сон. Цяпер, калі расказвае пра тое, колішняе, нават у старонняга чалавека па целе прабягаюць мурашкі. А як было яму тады?

— Малады быў, дужы і адчайны. Інакш не стрываў бы, не выжыў,— сказаў Шмей.

Я глядзеў на Івана Сцяпанавіча і думаў: а які ты як чалавек? Што хвалюе цябе? Чым жывеш? Чым захапляецца душа твая?

І тут у размове выявілася: ён у дадатак да ўсяго і мастак, і музыкант. Дзве яго работы — партрэт цялятніцы Яніны Бандак і карціна «Сабор у Койданаве» захоўваюцца ў раённым краязнаўчым музеі. Піша эцюды. Пейзажы роднага краю надзвычай цёплыя, хвалюючыя.

А калі здарожыцца ў шматлікіх паездках па лясах ці рука прытоміцца трымаць пэндзаль, Іван звяртаецца да свайго вернага сябра — баяна. Расцягне мяхі, пальцы прабягуць па чорна-белых «гузіках» і загу-

чыць трапяткая, шчымлівая мелодыя тых, ваенных, гадоў. Услед за ёю ўзляцяць і словы:

Бьется в тесной печурке огонь...

Аднак толькі зрэдку Іван можа даспяваць да канца гэтую песню. Раптам да горла падкоціцца даўкі камяк, а сэрца напоўніцца пякучым болем за сяброў, якія не вярнуліся з вайны. Тады ён змоўкне, пакіне ў спакоі баян і будзе смаліць цыгарку, вось так, як цяпер.

Цыгарка апякае пальцы. Іван Сцяпанавіч пазірае на яе, нібы здзіўляецца, чаму яна так, і, папляваўшы на вочка агню, паволі апускае ў попельніцу. Праз хвіліну твар святлее, на ім з'яўляецца летуценная ўсмешка:

— Хачу вось напісаць карціну «Апошняя вайна». Мяркую ў аснову пакласці подзвіг юнага героя Марата Казея.

...У Станькаўскім парку — цішыня. Мы ідзём шырокай алеяй, і я пытаюся:

— Кажуць, тут ёсць дрэва, што дагары каранямі расце...

Ала Анатольеўна Церахава, дырэктар мясцовай дзесяцігодкі, а на той час добраахвотны экскурсавод, вывела мяне на паляну і сказала:

— Вось яно!

На невялікім узвышшы, сапраўды, стаяла дзіўнае дрэва. Здавалася, нехта выдраў яго з каранямі, адрэзаў крону, перавярнуў і зноў уваткнуў у зямлю. Сплеценыя і пераплеценыя, скручаныя і перакручаныя «карані» сапраўды звісалі долу.

— Як так можна? — здзівіўся я.

— Каханне здатна на ўсё,— усміхнулася экскурсавод і расказала наступнае.

Даўным-даўно тое было. У графа Чапскага, якому належаў тады станькаўскі маёнтак, служыў садоўнікам мясцовы хлопец. Ён у такім парадку ўтрымліваў парк, што навакольнае панства, бываючы тут, дзіву

давалася: мастак! Ды бяда напаткала хлопца: у графіню закахаўся. Каб хоць неяк выліць свету бяду сваю, садоўнік вырашыў супраць пакояў графіні стварыць тры незвычайныя кампазіцыі дрэў — сімвалы веры, надзеі, любові. Доўга ён штукаваў у парку, шмат дзён правёў там, а калі нарэшце зняў пакрывала, усе ўбачылі: такім можа пахваліцца толькі Станькаўскі парк!

Першай апамяталася графіня. Яна кінулася да садоўніка і на вачах усёй знаці абняла і пацалавала.

Граф разгневаўся і загадаў прыкаваць садоўніка да вялізнага каменя...

Мінулі гады. Не стала ў Станькаве Чапскіх. Памёр і садоўнік, але памяць засталася. Ёсць і сведкі тых далёкіх падзей: камень, да якога прыкоўвалі хлопца, і незвычайнае дрэва. Два іншыя загінулі — адно ў час вайны, калі гарэлі харомы Чапскіх, другое фашысты вывезлі ў Нямеччыну як рэдкі экспанат.

— Прыгожая легенда?

Ала Анатольеўна паціскае плячыма, падыходзіць да цуда-дрэва, паказвае на мудрагелістыя нарасты, спляценні галін-«каранёў» і тлумачыць:

— Вось гэта — галава паўліна. А тут вось пітон. А там леў. А вось русалка. Ці бачыце хоць русалку?

Углядаюся пільней і сапраўды бачу і русалку, і льва, і пітона, і паўліна. Урэшце не вытрымліваю:

— А што вучоныя кажуць?

— Да вяза нібыта прышчэплены аўстралійскі арэшнік. А ўсё астатняе — справа рук садоўніка. Маўляў, глядзіце, здзіўляйцеся і ўспамінайце майстра.

Дырэктар пайшла (яе чакалі школьныя справы), а ў мяне ўжо другі экскурсавод — старшыня мясцовага сельсавета Мікалай Сцяпанавіч Зенчанка. Ён таксама ведае парк, Станькава і тутэйшых людзей. Мы ішлі па вёсцы, радаваліся заможным сялібам, якія патаналі ў зеляніне садоў. Нарэшце Зенчанка сказаў:

— А вунь і хата, дзе жыў Марат Казей.

Пабудова яшчэ моцная, уся ў прысадах, шыбы

адсвечваюць сонцам. А пад вокнамі, што выходзяць на вуліцу, сядзіць на лаўцы невялікага росту бабулька.

— Гэта баба Вера, цётка Марата,— сказаў Мікалай Сцяпанавіч.

Падыходзім, вітаемся. Слова за слова — і баба Вера расказала, як здарылася тое, страшнае.

Яе сястра, Ганна, адразу ж, як толькі фашысты ўвялі ў Станькаве «новы парадак», стала падпольшчыцай. Пра гэта даведаліся ворагі, Ганну арыштавалі і павезлі ў Мінск. Яна трымалася мужна. Нічога не дамогшыся, каты павесілі Ганну. Гэта было ў лістападзе сорак першага.

А праз год яе дзеці — Арыядна і Марат, якому тады не споўнілася нават і трынаццаці, пайшлі ў партызаны. Марат стаў разведчыкам брыгады імя Ракасоўскага. Быў не па гадах кемлівым і смелым, удзельнічаў у шмат якіх баявых аперацыях. А ў маі сорак чацвёртага, за два месяцы да вызвалення, юнага разведчыка не стала.

Ён і камандзір разведкі атрада Ларын адправіліся на чарговае заданне. У вёсцы Хароміцкія, што на суседняй Уздзеншчыне, іх выявілі карнікі. Завязаўся няроўны бой. Забіты Ларын. Упаў пад Маратам конь. Хлопец адбегся, залёг у хмызе і пачаў адбівацца. Калі скончыліся патроны, зубамі вырваў кальцо ў «лімонцы»...

Юнаму герою не было і пятнаццаці.

Мінула больш за сорак гадоў, а зямля наша не залячыла ранаў, нанесеных вайной. Яны перасцерагаюць: чалавек, будзь пільны, беражы найвялікшы здабытак — мір! І не глумі таго, што засталося, ашчадна адносься да зямлі і вады, поля і лесу, птушкі і звера, ахоўвай іх.

А як бывае крыўдна, калі іншы думае: я — цар прыроды, мне дазволена рабіць з ёю ўсё, што пажадаю... Памыляецца такі чалавек! Ён усяго толькі цаглінка дзівоснага храма — прыроды... А пры такіх

адносінах рана ці позна гэты храм дасць трэшчыну, а потым ператворыцца ў бясформенную гару друзу...

Гэтак думалася, калі назаўтра ехаў у Негарэльскі лясгас да фанатычна ўлюбёнага ў родную прыроду чалавека — старшага інжынера-паляўнiцтвазнаўца Віктара Ярашука.

А ён пры сустрэчы, нібы ў адказ на мае думкі, загаварыў:

— Сапраўды, ёсць яшчэ браканьеры. Аднак тут ім не разжыцца! Мы забаранілі нават паляўнічым карыстацца машынамі, браць з сабою карцеч, а там, дзе водзіцца казуля,— паляваць з ганчаком. Вызначылі зоны спакою, строга караем парушальнікаў. Часам даводзіцца чуць: «Ваш лясгас — забароненая зона...» А што рабіць, калі трапляюцца і «турысты», пасля якіх рукамі разводзім: дзе раслі-гадаваліся? Нейкую гадзіну пабудуць на прыродзе, а лесу ад гэтага даводзіцца хварэць не адзін год. На месцы вогнішча доўгі час не расце і трава. Шкло ад разбітых бутэлек ці не сотню гадоў будзе ляжаць. Шкодзяць лесу бляшанкі ад кансерваў, поліэтыленавыя мяшочкі, папера. Быў я нядаўна сведкам такога. Паехалі мы ноччу на рэйдавую праверку. Выбраліся на дарогу, што на Узду ідзе, як бачым: падскоквае бляшанка на асфальце! Што такое? Спыніліся. Глядзім: у бляшанцы з-пад згушчонкі — вожык. Улезці ўлез, а выбрацца не можа. Вызвалілі небараку, а ён ледзь жывы.

— На маю думку,— працягвае Віктар,— варта нешта грунтоўнае прыдумаць і наконт арганізацыі дзейнасці фотапаляўнічых. Колькасць іх расце. Кожны хоча нешта «ўпаляваць». А як гэта зрабіць — не заўсёды ведае. Таму многія і памылкі дапускаюць, і прыродзе шкодзяць. Добра было б аб'яднаць іх, скажам, на базе таварыства паляўнічых і рыбаловаў, стварыць там і фотасекцыі.

У адзін з выхадных мы займаліся менавіта фотапаляваннем. І вось вынік. Шасцёра аматараў «здабылі» трох зайцоў, казулю, трох ласёў, аленя, ваўка, шэрага жураўля. Праўда, не ўсё, што бачылі, легла

на плёнку. Валодзя Шарэпа, напрыклад, толькі за адзін дзень сустрэўся з сямю ласямі, пяццю аленямі, трыма казулямі, двума зайцамі і лісам. А колькі прынеслі хлопцы з «паляванне» свежых, непаўторных уражанняў! Гэта не паддаецца ніякаму ўліку...

На развітанне Ярашук павёў мяне ў Музей прыроды, што насупраць канторы лясгаса. Арыгінальная арка, за якой не менш арыгінальны будынак музея, а галоўнае, экспанаты ў ім — гэта тое, што і павінна выхоўваць у чалавека любоў да роднай прыроды. Больш бы такіх музеяў — у лясніцтвах, вёсках, раённых цэнтрах.

Кінуўся ў вочы плакат са словамі сусветна вядомага эколага Жана Дорста: «У чалавека вельмі шмат аб'ектыўных прычын, каб імкнуцца захаваць дзікую прыроду. Але прырода будзе абаронена ад небяспекі толькі ў тым выпадку, калі чалавек хоць трошкі палюбіць яе проста таму, што яна цудоўная».

Гэтыя словы быццам падсумоўвалі нашу з Віктарам гаворку.

У той дзень з раніцы насунуліся хмары і пачаў церусіць дождж-грыбасей. Надвор'е хоць і не спрыяла, але чарнявы хлопец Сямён (сакратар камітэта камсамола, галоўны эканаміст саўгаса «Камсамолец») спрытна спраўляўся з машынай — вёз мяне туды, дзе на Крутагор'і «самая крутая гара».

Не праехалі і паловы шляху, а я ўжо ведаў амаль усё пра яго камсамольскую арганізацыю — і што іх, камсамольцаў, у саўгасе за семдзесят, і што трэцяя частка — механізатары, і што там ёсць клуб на трыста месц, выдатны спартыўна-культурны комплекс, і што моладзь, як правіла, застаецца пасля школы ў вёсцы, не бяжыць у горад па доўгі рубель.

Мінулі Навасёлкі, пачаў аддаляцца і ўказальнік з цікавай назвай сяла — Піяніна, падняліся яшчэ на некалькі пагоркаў, спусціліся ў лог, поўны сівога туману, зноў апынуліся на ўзвышшы, праехалі паблізу нейкіх пабудоў — ні то складоў, ні то гаражоў, і Сямён выключыў матор.

— Прыехалі,— бадзёра сказаў ён.— Адсюль уся Беларусь як на далоні. Мы на самай высокай кропцы рэспублікі — гары Дзяржынскай, на трыста сорак шостым метры над узроўнем мора.

Прызнацца, не верылася. Меркавалася так: будзем яшчэ нейкі час падымацца з узвышша на ўзвышша, потым на шляху з'явіцца каскад узгоркаў, наверсе якіх, як піраміда, і ўстане тая гара. А тут — на табе! Наўкол — роўная, раскіслая ад нядаўняга дажджу пляцоўка, а пабудовы, што хвіліну таму назад мы міналі, не што іншае як саўгасныя майстэрні...

Свежы ветрык даваў аб сабе знаць.

— Гэта вам не Дзяржынск, тым больш не Негарэлае,— працягваў Сямён.— Тут вясна і тая на два тыдні пазней пачынаецца... Адсюль яшчэ бяруць пачатак ажно шэсць рэчак. Уса з прытокамі бяжыць у Нёман, а Пціч — у Дняпро кіруе...

У цэнтр саўгаса, вёску Скірмантава, дабіраліся самакатам. Матор у машыне працаваў толькі трошкі — пакуль выбіраліся з машыннага двара на дарогу, а там Сямён павярнуў ключ, і легкавік бег па схіле сам па сабе.

— Во як у нас! — смяецца ён.— Іншы раз можна вёрст колькі на дурніцу праехаць...

А вось і кантора, уся ў зеляніне. Заўважаю: бэз толькі пачаў паказваць гронкі, а яблыня ледзь выкінула сям-там па кветцы. Які кантраст у параўнанні, скажам, са Станькавам, Негарэлым ці тым жа Дзяржынскам!..

Дырэктар саўгаса Анатоль Пятровіч Радзюк сустрэў прыветна, пачаў расказваць:

— Многія жартуюць: саўгас «Камсамолец» — на полюсе. Яно нібы і так. Пазней за ўсіх і сеем, і жнём. Лясы ў нас змешаныя, але сасна не расце. Затое маліны процьма. Мы вунь як высока, а крыніц не пералічыць. Ля кожнай вёскі сажалку выкапалі. Ужо кілаграмы па тры карп трапляе, стронга пракідаецца. Той жа бабёр, андатра перасяляцца сюды пачалі. А на схілах узвышша звера шмат. Іншы раз да двац-

цаці ласёў на руні ўбачыш. А вось вужа ці гадзюку, хоць тыдзень хадзі, не сустрэнеш...

— А зімы ў нас! — праз хвіліну дадаў ён.— Мароз заўсёды на два-тры градусы большы, чым у Дзяржынску. І наледзь бывае вялікая — ад туманоў. Неяк пад Новы год на правадах да васьмі сантыметраў лёду нарасло. Толькі за адну ноч зваліла сорак высакавольтных апор... Скірмантава ніжэй гары Дзяржынскай усяго на якіх сорак метраў, а вада ў калодзежах — на глыбіні сямі-васьмі кольцаў. А ў вёсцы Нарэйкі, напрыклад, што за сем вёрст адгэтуль, каб да вады дастаць, трэба метраў на дваццаць у зямлю ўкапацца.

Я сказаў:

— У Скірмантаве, бачыў, усе хаты новыя...

Радзюк спахмурнеў:

— Новыя. Бо старыя вайна змяла. Разам з людзьмі. Скірмантава ж — гэта Хатынь наша. Толькі Скірмантава аднавілася, а Хатынь — не.

Вечарэла. Далёкае сонца паволі клалася на лес. Было ціха. У расчыненае акно наплываў пах бярозавага ліста.



## У ЖЫЦЕ ЦВІЛІ ВАСІЛЬКІ

*Трагедыя на ўскрайку сяла ● Беларускі «Артэк»*
*Ліпічанскі Сусанін*
*На Рыбацкіх Хутарах ● Тутэйшы радон*
*Што будзе з Паніквай?*

Быў чэрвень. З кароткімі і цёплымі дажджамі. Трава, ярына, азіміна — усё ажно буяла. Жыта неяк адразу, за якія дні два, выкінула пляскатыя каласы і закрасавала. Уздоўж палеткаў, абочын сцяжын пасталі, быццам дзеці з блакітнымі вачанятамі, васількі.

Нечакана гармонія парушылася. У нядзелю, на досвітку, прыпаўзлі з захаду нізкія хмары і пачаўся страшэнны лівень. Круціла жыта, ламала дрэвы, з каранямі вырывала вербы ўздоўж дарог. Ціхаплынная і спакойная Караўка, што палавініць вёску Вензавец, раптам уздыбілася, пазносіла кладкі, масткі, хлынула на палеткі, лугі, агароды. Людзі толькі плячыма пацiскалі: «А што гэта робіцца на свеце?!».

Бусел, што каторы год жыў на тэлеграфным слупе паблізу аселіцы, мокры, брудны і нейкі паніклы неаднойчы спрабаваў падняцца на гняздо, але вецер не даваў зрабіць гэтага — заломваў крылы, а самога адносіў-да-ляска-і-бязлітасна кідаў на кусты.

А ў гняздо буслу во як трэба было! Калі пачалася тая непагадзь, бацяніха — што прыліпла да гнязда, старалася сагрэць слабых яшчэ бацянят. Вецер калашмаціў на ёй пёры, разгойдваў слуп, выдзіраў з гнязда зляжалыя шматкі травы, і бацяніха баялася нават падняць галаву.

Бусел зноў заходзіў з падветранага боку і рабіў новую спробу. Аднак падняцца на гняздо, каб пакарміць сваіх, не ўдалося яму ні ў пяты, ні ў дзесяты, ні ў дваццаты раз. Знясілены, ён усё роўна як скамянеў там.

Тым часам ішоў ад ракі чалавек і вёў за сабою каня. Калі яны параўняліся з бацянам, той не ўцёк, а, наадварот, ступіў крокі два-тры насустрач, як бы хацеў запытацца: «Дзе паратунак?»

Чалавек спыніўся, кінуў яму пад ногі скарынку, а конь — толькі ўздыхнуў, і, угінаючыся ад ветру, яны абодва пайшлі ў сяло.

Назаўтра дождж сцішэў, а пад вечар аціх і вецер. Бусел кінуўся на лугавіну, глынуў некалькі жаб, а калі ўрэшце падняўся на гняздо, зразумеў: позна. Бацяніха была нежывая, нежывымі пад ёю ляжалі і дзеці.

Бацян кранаў дзюбаю то бацяніху, то бацянят, нібы стараўся разбудзіць іх, але дарэмна. І тады ён кінуў у неба журботны кароткі клёкат...

Тады быў таксама пярэдадзень лета: буялі травы, красавала жыта, ускрай палеткаў цвілі васількі.

17 чэрвеня сорак першага года сасновы бор абудзіўся звонкім дзіцячым смехам. Сюды, у Наваельню, на адпачынак у беларускі «Артэк» акрамя савецкіх школьнікаў прыехалі дзеці зарубежных рэвалюцыянераў — чэхі, славакі, кітайцы, карэйцы, аўстрыйцы, балгары і іншыя — сыны і дочкі тых, хто змагаўся на барыкадах Вены, у інтэрбрыгадах на іспанскай зямлі, у антыфашысцкім падполлі.

Але... праз пяць дзён пачалася вайна. З Масквы ў Мінск, Баранавічы, Навагрудак паляцелі трывож-

ныя тэлеграмы. У Наваельню быў пасланы спецыяльны аўтобус для эвакуацыі дзяцей. Аднак было позна.

Фашысты, як толькі прыйшлі ў Наваельню, адразу выгналі дзяцей з піянерскага лагера і зрабілі там казарму. Меншых людзі разабралі па сем'ях, а к восені дамагліся, каб нямецкія ўлады адкрылі прытулак для астатніх. Неўзабаве сюды пачалі звозіць дзяцей з-пад Смаленска, Вязьмы, Арла і іншых месц.

У студзені сорак другога, даведаўшыся пра разгром фашыстаў пад Масквой, дзеці спалілі партрэты Гітлера і сталі збірацца ў партызаны. На дапамогу прыйшлі мясцовыя падпольшчыкі — вывозілі з прытулку каго куды.

У сакавіку сорак трэцяга акупанты занялі прытулак у Наваельні пад свой ваенны шпіталь. Выкінутых на вуліцу дзяцей патрыётам удалося перавезці ў будынак былой Дзятлаўскай школы.

У гэты час на станцыю Наваельня прыбыў эшалон з дзецьмі з Краснага Сяла, што пад Ленінградам. Іх везлі ў прытулак, якога ўжо не было. Тады сто дзяцей з эшалона адправілі ў Навагрудак, а дзвесце — у Дзятлава. Яны былі знясіленыя, абарваныя, босыя, а галоўнае — хворыя. Жыхары Дзятлава і навакольных вёсак дапамагалі ім чым маглі — прыносілі абутак, адзенне, прадукты. Мясцовыя медыкі змагаліся з эпідэміяй тыфу. Але ўсё ж больш за паўсотню дзяцей загінула.

Ініцыятарам выратавання дзяцей была настаўніца Валянціна Рыгораўна Кэп, якая ва ўмовах акупацыі ў Красным Сяле сабрала дзяцей загінуўшых, арганізавала прытулак, а потым вывезла іх у Дзятлава. (Подзвіг гэтай жанчыны ўвекавечаны. Яе імя высечана на мармуровай дошцы ў 416-й школе горада Петрадварца.)

У сакавіку сорак чацвёртага ў Дзятлава прыбыла брыгада СС. Гітлераўцы выкінулі дзяцей у старое гумно Вензавецкага лясніцтва, прыкрыўшы імі свой гарнізон ад магчымага нападу партызан з боку лесу.

Перад самым вызваленнем Вензаўца фашысты

тайна перавезлі дзяцей у Наваельню, пагрузілі ў вагоны і некуды адправілі. Лёс многіх застаўся невядомым. Але за пасляваенныя гады адшукалася больш за дваццаць дзяцей з міжнароднага лагера і дзіцячага прытулку. У маі 1985 года некаторыя з іх пабывалі ў Дзятлаве, Наваельні і Вензаўцы. Гэта — італьянка Поллет Глюкозіо, карэец Уладзімір Марсін, кітаянка Чы Ін, славак Юры Герэ і іншыя. Яны наведалі Мемарыял дзецям, якія памерлі ў Дзятлаўскім прытулку і пахаваны на старых праваслаўных могілках.

Сярод магілак дзяцей, прозвішчы якіх засталіся невядомымі, узвышаецца помнік чалавеку мужнага сэрца — Валянціне Рыгораўне Кэп.

Нельга не расказаць пра лёс двух хлапчукоў — Ігара Кандакова і Яшы Барынава.

Фашысты схапілі іх недзе пад Ленінградам і вазілі па франтавых дарогах, беручы кроў для параненых нямецкіх салдат. Што чакала Ігара і Яшу праз месяц-другі — здагадацца не цяжка. Выручыў выпадак. Цягнік, у якім ехалі «донары», пусцілі пад адхон партызаны. На шчасце, дзеці засталіся жывыя. Іх падабралі народныя мсціўцы дзятлаўшчыны, завялі на хутар каля вёскі Рыбакі і перадалі партызанскай маці — Настассі Восіпаўне Васюкевіч, хата якой была явачнай кватэрай мясцовых падпольшчыкаў. Старэйшы сын Настассі Восіпаўны, Кастусь, узначальваў маладзёжнае падполле на Рыбацкіх Хутарах; сярэдні, Мікалай, ваяваў на фронце; малодшы, Іван, быў разведчыкам партызанскай брыгады імя У. І. Леніна, дзве дачкі — Люба і Ліда — партызанскімі сувязнымі. Так што Яша і Ігар апынуліся сярод надзейных людзей. Потым яны і самі сталі разведчыкамі аднаго з партызанскіх атрадаў. Ваявалі адважна. Былі ўзнагароджаны. Пра юных партызан ведала ці не ўся Ліпічанская пушча.

Гадоў колькі таму назад дзятлаўскі краязнавец Міхаіл Хведаравіч Петрыкевіч зрабіў гісторыка-

геаграфічную даведку пра Ліпічанскую пушчу. Паколькі яна нейкім чынам пралівае святло на падзеі тых далёкіх дзён, дазволю сабе коратка перадаць яе змест..

Ліпічанская пушча раскінулася на велізарных прасторах у сутоку Шчары і Нёмана. Першымі пастаяннымі жыхарамі пушчы ў незапамятныя часы былі славяне. Па Шчары лёгка пранікалі сюды з Палесся дрыгавічы. Гэта пацвярджаецца аналізам тутэйшых тапонімаў, а таксама гідронімаў. Усе яны славянскага паходжання, толькі назвы вёскі Шаўдзіні і ўрочышча Ройста — балцкага.

Багатая гісторыя пушчы. Шмат яна бачыла на сваім вяку. Тут хаваліся беглыя прыгонныя сяляне. У пачатку XVIII стагоддзя ў гэтых лясах супраць арміі шведскага караля Карла XII змагаліся партызаны. Былі ў пушчы базы паўстанцкіх атрадаў Кастуся Каліноўскага. Пры буржуазнай Польшчы ў Ліпічанскіх лясах дзейнічаў легендарны герой, арганізатар партызанскага руху ў Заходняй Беларусі Кірыла Арлоўскі.

Надзейную схову знаходзіў тут дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі Сяргей Прытыцкі, які ў 1935 годзе ўзначальваў падпольны Слонімскі акруговы камітэт камсамола. Яшчэ сёння некаторыя жыхары вёскі Воля Крупіца памятаюць Сяргея Восіпавіча.

А Ліпічанская пушча ў дні Вялікай Айчыннай вайны? Тут базіравалася некалькі партызанскіх брыгад і асобных атрадаў, былі два партызанскія аэрадромы, на недаступным балотным востраве дзейнічаў партызанскі шпіталь. Гэты кавалак вольнай савецкай зямлі з усіх бакоў акружалі акупанты. На дарогах пры ўездзе ў пушчу ў тыя гады стаялі слупы з надпісам: «СССР».

Фашысты тройчы спрабавалі «ачысціць» Ліпічанскія лясы ад партызан. Не здолелі. Акружылі пушчу ланцугом сваіх гарнізонаў — у Накрышках, Казлоўшчыне, Дзярэчыне, Востраве, Галынцы, Жалудку, Орлі, нават у цэнтры пушчы — Рудзе Явар-

скай двойчы стваралі свой умацаваны пункт і двойчы яго знішчалі лясныя байцы.

Толькі адна партызанская брыгада імя У. І. Леніна, якая дзейнічала ў гэтых лясах і была амаль уся з мясцовых людзей, пусціла пад адхон сто пяцьдзесят варожых эшалонаў, узарвала дваццаць сем чыгуначных мастоў, семдзесят шэсць аўтамашын, разграміла больш за дваццаць гарнізонаў, знішчыла каля сямі тысяч фашыстаў. У брыгадзе было чатыры атрады, тысяча сто шэсцьдзесят дзевяць партызан. Загінула за час вайны дзвесце дваццаць адзін чалавек.

Гэтыя радкі пра аднаго з іх — пра загінуўшага, вобраз якога будзе жыць вечна ў сэрцы кожнага пушчанца.

Яго хутарок стаяў паблізу Шчары. А сам ён з маленства ведаў пушчу, як сваю далонь. Таму калі ўвосень сорак другога партызаны звярнуліся з просьбай адшукаць надзейнае месца для шпіталя, чалавек доўга не думаў — паказаў на астравок сярод багны за чатыры кіламетры ад свайго жылля. Прайсці на востраў можна было толькі патаемнай кладкай.

І вось лясны шпіталь дзейнічае. Там былі зямлянкі для хворых, амбулаторыя, кухня, лазня, пякарня, склад — адным словам, усё, што ў тых умовах можна было зрабіць. Лячыліся ў шпіталі партызаны, што базіраваліся ў Ліпічанскіх і Налібоцкіх лясах.

У снежні сорак другога пачалася першая блакада пушчы. Фашысты знішчылі разам з людзьмі вёскі Вялікая Воля, Трахімавічы, Гарадкі, Дубраўка, шмат якія хутары. Карнікі з'явіліся і на яго хутарок. Яны адразу загадалі паказаць партызанскі шпіталь. Стары здзівіўся: адкуль ведаюць пра шпіталь? Адкуль знаюць, што толькі яму вядома кладка, затопленая ў багне?.. Але фашысты ўжо ставяць да сцяны нявестку і ўнука Федзьку. Бачыць стары: ворагі не жартуюць, загубяць нявінных. І тады ён сказаў: «Не страляйце! Я сапраўды ведаю сцежку на той востраў. Павяду!»

І павёў. Толькі ў іншым кірунку. Сотні тры фашыстаў пасунулася следам. Доўга вёў іх па лесе пушчанец. Нарэшце і незамярзаючыя балоты. Падводы і коні пачалі правальвацца ў багну. А вось ужо і поцемкі сталі апускацца. І тады фашысты ўсё зразумелі.

...Зрашэчанае кулямі цела Іосіфа Юр'евіча Філідовіча партызаны знайшлі толькі ў сакавіку сорак трэцяга, калі пачаў раставаць снег...

У Дзятлаве старому пушчанцу пастаўлены помнік-манумент, адзіны на Гродзеншчыне, які прысвечаны чалавеку, што паўтарыў подзвіг Івана Сусаніна. Высокі, барадаты, з непакрытай галавой, у кажусе наросхрыст і ботах, дзед абапёрся на сукаваты кій і пільна пазірае на захад...

Сабраўся я і на Рыбацкія Хутары, у хату, дзе некалі жыла Настасся Восіпаўна — партызанская маці.

Каб трапіць туды з Дзятлава, трэба праехаць спачатку гасцінцам у бок Навагрудка, а калі злева застанецца ціхая вёсачка Баравікі, і мінуць масток цераз Моўчадзь, то справа, у засені старых дрэў, і будзе стаяць тая хата.

Гады далі аб сабе знаць. Хата пакасілася, аселі вокны, ліштвы пачарнелі. Яна нагадвае старое, але добра збітае гняздо. Ды паразляталіся, куды каму наканавана было, птушаняты з яго. Адзін толькі Настасін сын — Мікалай, як вярнуўся з вайны, так і асеў тут, паціху дажывае свой век.

Можа б, і ён не кантаваўся на старым хутары, але так ужо сталася — не мог іначай. Яго, сувязіста, перад канцом вайны скалечыў фашысцкі снайпер. Было тое ў Венгрыі, у горадзе Секешфехервар, што азначае «Белы прыгожы горад». Дык у тым белым прыгожым горадзе снайпер упёк яму разрыўной у паясніцу. Увесь жывот парвала, парэзала, пакрышыла. Дактарам цудам удалося ўратаваць салдата. А вярнуўся дамоў, патоўкся трошкі каля хаты

і пайшоў у леснікі. Пятнаццаць гадоў леснікаваў. Потым на ферме падвозчыкам працаваў. Усім тром дочкам вышэйшую адукацыю даў. Але яны паразляталіся з роднай хаты і толькі зрэдку возьмуць з сабою ўнукаў ды прыедуць праведаць бацьку.

І тады дзед Мікалай як на сёмым небе. Радуецца гасцям, расказвае малым пра тутэйшыя мясціны — асабліва пра Панікву, Моўчадзь ды крыніцы, якіх не злічыць.

— Былі тут некалі ого якія рэкі! — здаля пачне дзед.— Чыстыя, рыбныя, ра́чныя. Нездарма нашы продкі рыбакамі слылі, а хутары нашы так і зваліся — Рыбацкія. Мы, дзеці, найболей любілі ракамі забаўляцца. Возьмем таптуху ці звычайны лазовы кош — і на Панікву ці Моўчадзь. Як бачыш торбу натопчам. А потым скупшчыку здаём. Не так ужо каб і плаціў, але прыварак мелі. І на цукеркі перападала. Толькі як зацвітаў лён, мы не чапалі рака. Ён тады нерастуе.

— А крынічкі ў нас якія харошыя! — ужо зусім расчуліцца стары.— Ні табе ўлетку не перасыхаюць, ні табе ўзімку не перамярзаюць. А вёрст пару адсюль, ва ўрочышчы пана Ясінскага, некалі такая крыніца была — усе дзіву даваліся. І так бухтавала, так бухтавала! За адзін выбух цэбраў дзесяць вады выкідвала. Халоднай-халоднай — ажно зубы ламала... Пагнаў аднойчы туды пастух кароў паіць. А тыя ўзялі і патапіліся: берагі асунуліся, кароўкі як шухнулі ўглыб, так і прапалі. Тады пан сабраў мужыкоў і загадаў камяні вазіць да крыніцы. Вазілі мо з месяц тыя камяні і ўсё кідалі ў бездань. Утаймаваць не ўтаймавалі крыніцу, але трохі супакоілі. Хоць і бухтавала ў ёй вада па-ранейшаму, але скаціна не тапілася болей. Яна, тая крыніца, і цяпер б'е, толькі болей сцякае ў раку ды яшчэ ніколі не замярзае...

Але дзеці ёсць дзеці. Ім падавай яшчэ. І дзед Мікалай, падумаўшы, пачынае пра камяні:

— У нашым краі ёсць тры вя-а-лізныя камяні. Такія вялізныя, што ні абняць, ні падняць. Адзін ляжыць каля Кушлянаў і завецца Багушэвічавым, дру-

гі — пад Карчэвам, па той бок Навагрудка, і завецца Міцкевічавым, а трэці — вось тут, паблізу, ля Васявіч. Яго называюць Камень-волат. Ён самы большы з іх. Амаль як хата наша — такі будзе. Во які каменьчык! Яшчэ яго Чортавай печчу завуць. На ім можна ноч праспаць, не накрываючыся,— такі цёплы. Ну, тут зразумела: сонца за дзень нагрэе. Але як той волат мог апынуцца ва ўрочышчы Гаравата ды яшчэ на самай макаўцы Максімавай гары? Вакол жа іншыя горы — Замкавая, Лісіная Нара, Капліца, Навінка — і не горшыя, а ён упадабаў Максімаву. І ляжыць сабе, грэе плечы пад сонцам ды людзей здзіўляе. Нездарма яго ў помнікі прыроды рэспубліканскага значэння запісалі...

— Дзед, а ты яшчэ пра лячываду не казаў,— не супакойваюцца ўнукі.

— Пра лячываду? Ну, тады слухайце. Вы ўжо ведаеце, што зямліца наша ўсім багатая. Ёсць у ёй і лячывада. Раней, калі хто занядужае, пойдзе да якой крынічкі, апусціць ногі ў вадзіцу, пасядзіць трошкі і дадому ўжо можа подбегам бегчы. А не так даўно прыехалі да нас вучоныя людзі, пачалі дзіркі ў зямлі свідраваць. Адну нават паблізу нашай хаты выкруцілі. Я тады цікаваў за імі. Думаю, што ж гэта будзе? Як там, у сховах зямных? Спачатку ішоў пясок. Чысты-чысты. Потым — мел. Бялюткі-бялюткі. А тады гліна цёмна-жоўтая палезла. І толькі як прабілі пласт каменю, тады і засвістала лячывада, радонам каторую называюць. Яна і цяпер свішча са скважыны. Метры на чатыры б'е і адразу ў зямлю ўцякае. Вучоныя тады сказалі: тут будзе беларускае Цхалтуба! І праўда. Прайшло колькі часу, і ў нас вунь што робіцца! Лякарню будуюць! А прабяжыць гадок-два — тут лепшы санаторый краіны будзе. І ўсё дзякуючы ёй, лячывадзе...

Іншы раз прыязджае ў родную хату і малодшы брат Мікалая Ігнатавіча — Іван Ігнатавіч Васюкевіч. Ён таксама даўно на пенсіі, жыве ў Мінску, але часам

возьме і заскочыць у родныя мясціны, дзе прайшла маладосць, праляцелі суровыя партызанскія будні.

— Здароўце ў хату! — скажа з парога, нібы там не адзін чалавек, а вялікая і дружная сям'я.

— Здароўце, здароўце! — адкажа брат, быццам прыехаў не адзін Іван, а ўся, нават далёкая радня.

Слова за слова, коратка пра навіны, і пацячэ гамонка пра самае дарагое і блізкае — тутэйшыя мясціны.

— А ці захавалася зямлянка, дзе малалеткі-партызаны Ігар Кандакоў і Яша Барынаў хаваліся ў вайну? — цікавіцца Іван.

— Уга! — скажа Мікалай.— Там, пад кручай, зараз бабрыныя норы.

— А Малая Азяровіна? Змянілася, пэўна.

— Ды не, скажу табе. Як паходзіла на месяцавы кратэр, так і паходзіць.

— А мне заўсёды здавалася, што гэта метэарыт урэзаўся ў пясок. Ты тады на фронце быў, не ведаеш: паўз Малую Азяровіну бегла партызанская сцежка, што злучала Ліпічанскую пушчу з Налібоцкай.

— А Паніква? Ці хоць помніш яе? Мо ў тым горадзе і забыў пра Панікву?

— Ну як ты можаш, браце! Хіба яна сатрэцца з памяці?

Іван Ігнатавіч аблакочваецца на стол, а думкі яго далёка-далёка адсюль.

...Правы прыток Моўчадзі — Паніква — не мае і дваццаці вёрст. Але ў нізоўі паспявае ўтварыць арыгінальны каньён з пясчанымі даволі высокімі берагамі. Яны ўкрыты сасновым лесам з густымі зарасцямі ядлоўцу. А над самай вадою стаяць вольхі, вербы, ліпы, чаромха, кусты парэчак. Вада ў рачулцы чыстая, улетку — халодная, узімку — цёплая. Нават у ніжнім цячэнні ніколі не замярзае. Гэта адзінае месца, дзе збіраюцца на зімоўку чароды дзікіх качак. Сюды прыходзяць на вадапой ласі, казулі, вепры. Тут добра адчуваюць сябе бабры і выдры, норкі і андатры. А стронга? Гэтае дзіва прыроды спрадвеку ў Паніксе — там нерастуе, жыве, а часта скочваецца

для нагулу ў Моўчадзь. Некалі трапляліся ніпто сабе рыбіны. Вось толькі б не дакучалі браканьеры...

— Слухай, браток! — раптам ажыўляецца госць.— А што, калі б тут, на Панікве, стварыць запаведную зону? Як мяркуеш? Падтрымае раённае кіраўніцтва такую прапанову ці адхіліць?

Мікалай сказаў:

— Падтрымае. Як жа інакш. Іначай нельга. Бо зглуміцца тое, што вякамі нажывала зямля.

...Караўка зноў стала ціхай рачулкай, палавініла Вензавец без таго буйства і напорыстасці, якія былі яшчэ ў мінулую нядзелю.

Прыпарвала. Падымалася азіміна, ярына, бульба. Моцна пахла аерам. Людзі радаваліся: скончылася непагадзь.

Ускрай жытнёвага палетка зноў пасталі, быццам дзеці з блакітнымі вачанятамі, васількі.

Праходзячы аселіцай, я сустрэў таго самага бусла. Ён, як і тады, сіратліва стаяў ля тэлеграфнага слупа і пазіраў у неба. Мілы бацянок! Я разумею самоту і гора твае. Іншы раз над нашай зямлёю праносіліся і не такія вятрыскі, уздымаліся і не такія буры, ад якіх гінула ўсё жывое. Але пасля зноў распрамлялі дрэвы галіны, уставалі палеглыя травы, ярка свяціла сонца.

Прыйдзе час, і ў тваім гняздзе зноў пачуецца малады клёкат. Яму ты будзеш радавацца: жыццё ўзяло верх!



## ПАД ВЫСОКІМ СОНЦАМ

*Уздоўж Агінскага канала*
*Вясковыя змеяловы ● У пошуках буслоў*
*Выганаўскае возера ● Забітыя вёсачкі*
*Развітанне*

Яшчэ свяцілі зоркі, а на ўсходзе ўжо бралася лёгкая ружовасць.

Людзі, што стаялі на прывакзальнай плошчы, не-не ды і кідалі позірк на неба, гадалі: а які на сёння выдасца дзень — з дажджом ці з сонцам? У кожнага быў свой клопат: не ўсе яшчэ назапасілі сена і, едучы да сваіх, не хацелі марна траціць час; паспелі суніцы з чарніцамі, і таму-сяму не набраць іх, хоць вядзерца, было недаравальна.

Нарэшце пачалі падыходзіць да сваіх пляцовак аўтобусы, і людзей на плошчы менела. Пад'ехаў і аўтобус «Івацэвічы — Бабровічы», адчыніў дзверцы, прыняў пасажыраў і, пастаяўшы трошкі, таксама рушыў. Хвілін колькі язды па гарадскіх вуліцах, і ён ужо выскачыў на гладкую асфальтаваную дарогу.

Мінулі Козікі, і я ажно дзіву даўся: за сялом, абапал дарогі, жыта амаль белае стаяла. А не даязджаючы Святой Волі трапілі ў такі густы туман, што, здавалася, аўтобусу не прабіцца. У іншых

месцах туман то нібы скручваўся ў сувой, то нібы падымаўся з лугавіны, і з яго былі добра відны копкі.

Неўзабаве туман знерухомеў і цяпер ужо нагадваў спакойнае возера. На страсе хлеўчука, які яшчэ быў толькі напалову відзён, стаяў бусел ці, як іх тут называюць, бусько,і то так, то гэтак закідваў дзюбу на спіну.

— Клякоча! — сказаў хударлявы мужчына і, каб лепей было відаць бацяна, адняў ад акна пучок вудзільнаў.

Калі аўтобус выскачыў на паваротку, мы ўбачылі сонца. Вялікае і чырвонае, яно нейкі час ляжала на краі зямлі, а тады паднялося і паволі пачало набіраць вышыню. Пакуль стаялі на прыпынку, пакуль бралі новых пасажыраў, сонца было ўжо амаль над вёскай. Для пеўняў гэта з'явілася як бы сігналам. Яны так раскрычаліся, што, здавалася, звар'яцелі ад радасці.

— На пагоду! — прамовіў мужчына з вудамі.

Цётка, якая толькі што ўвайшла ў салон і садзілася насупраць, запярэчыла:

— У нас зямля — што рэшата падранае. Хай бы яшчэ ўліло. Картоплі не пашкодзіць.

— А сену? А ярыне? — абураліся і справа, і злева.

Дзяўчаткі з вёдрамі, што ехалі па чарніцы, таксама скоса зірнулі на цётку і адвярнуліся. Маўляў, чаго захацела — дажджу! Цяпло патрэбна, цяпло!.. Былі яны аднолькава апранутыя, расточку аднолькавага і, хоць адна ў адну глядзіся, такія падобныя з твару! Падумалася, няйначай блізняты.

А яны, толькі ад'ехалі вёрст пару ад Святой Волі, падхапіліся і пачалі ўпрошваць шафёра спыніць аўтобус, каб выйсці якраз насупраць ляска. Той акінуў дзяўчатак спакойным позіркам, усміхнуўся і тармазнуў.

У Целяханах ніхто не падсеў.

Неўзабаве ўскрай дарогі бліснула паласа вады, а потым пабеглі ўздоўж яе, дзе з прамежкамі, а дзе і суцэльным ланцугом, гонкія вольхі.

— Агінскі канал,— нібы сам сабе зазначыў рыбак.— Зусім абмялеў. Адна толькі назва і засталася.

Пра гэты канал я чуў нямала. Амаль дзвесце гадоў таму назад па сваёй ініцыятыве і за свае сродкі пабудаваў яго слонімскі магнат Міхал Казімір Агінскі, дзядзька вядомага кампазітара. Канал, даўжыня якога каля паўсотні кіламетраў, злучаў Шчару з Ясельдай. Некалі па ім ганялі плыты. Цераз яго водным шляхам можна было трапіць з Балтыйскага мора ў Чорнае... Ведаць-то ведаў усё гэта, а ўявіць канал вось такім не мог. Цяпер іншы меліярацыйны калектар шырэйшы і глыбейшы!

Дарога ўвесь час ішла паўз канал, і з акна аўтобуса можна было добра разгледзець яго. Чыстай вады было мала. Канал нагадваў старое, пакрытае раскаю рэчышча. Часам траплялася нешта накшталт масткоў або кладак — з парэнчамі і без парэнчаў. Там, дзе канал перасох, бачны былі сляды падвод, машын. Іншы раз такія ўчасткі былі ўтаптаны сотнямі капытоў. І толькі перад Выганашчамі пачалі часцей трапляцца палосы вады, але зноў-такі ўкрытай дзе жоўтымі гарлачыкамі, дзе травой-разаком, а дзе трыснягом ці звычайным хвашчом. Яшчэ кінулася ў вочы: на беразе канала сям-там узвышаліся шэрыя бетонныя збудаванні — дзоты часоў той, імперыялістычнай, вайны. Яны чарнелі праваламі байніц і выглядалі недарэчнымі на гэтай залітай ранішнім сонцам зямлі.

А вось і самі Выганашчы. Аўтобус пайшоў далей, на Бабровічы, а я стаяў пасярод вуліцы і ўслухоўваўся ў яе цішыню.

Таптацца пад таполяй у чаканні, пакуль адчыніцца сельсавет, было не з рукі, і я паволі пайшоў уздоўж вуліцы. Па ўсім было відаць, што яна цэнтральная. На ёй і магазіны, і будынак праўлення калгаса, і помнік-абеліск тым, хто загінуў у гады мінулай вайны, і новыя будаўнічыя пляцоўкі. Збочыў на суседнюю вуліцу, што цягнулася ажно не-

куды да лесу, і міжволі залюбаваўся: ладныя адна ў адну хаты, прасторныя панадворкі, хлявы, паграбы. На кожным дворышчы — кастры яшчэ летась складзеных дроў, трошкі воддаль, за гародамі — стажкі сена, саломы. Сялянская заможнасць не крычала, не рвалася напаказ, а спакойна адзначала сваю прысутнасць.

Далей ад цэнтра і на тым беразе Агінскага канала будынкі як бы ўроскід. Відаць, некалі сяліліся хто дзе мог, дзе было зручней, бо вакол, куды ні ступі, уладарыла адно балота. Вось грудкі і сталі дворышчамі, абнесенымі парканам, за якім цяпер на градах цвіла бульба, кусцілася цыбуля, вілася на альховыя тычкі фасоля, распаўзалася па доле лапушыстае гарбузінне. Тут гарбузам не шкадавалі месца, і яны цвілі раскошна — падымалі ўгору буйныя, як грамафонныя трубы, жоўтыя кветкі.

— А чаго ўсталі заранне?

Я азірнуўся. На беразе канала, ля кладкі, што перакінута на той бок, сядзіць дзед, які нейкі час аглядае мяне, а потым пачынае нібы апраўдвацца:

— Я таксамо паперад сонца ўстаў...

Сядаю побач. А дзед Лукаш працягвае:

— Майго бацькі бацько расказваў, як гэты канал да ладу даводзілі. Яму тады за семдзесят було. Казаў, чатыры дні ў тыдзень на пана працавалі, тачкамі зямлю вазілі. З усіх сёл нашага брата палешука зганялі. А работай кіравала пані — Агыньская звалася. Казаў яшчэ, не аднаго ў магілу загнала непасільнай працай. Во якая пані була!

Памаўчаў хвіліну і дадаў:

— А я помню, як тутака параходы хадзілі. З Пінська да Слоніму. А рыба, бувала, як пойдзе!.. А цяпер...

— Вы мо і плыты ганялі?

— Не. Я меў чатыры гектары сейнай зямлі, то ўсё на ёй калупаўся. А пасы ганялі тут многія! Вунь Палуяновіч, Рыгорам каторага зваць, а па бацьку

Гнатавіч. Дык ён доўга хадзіў на пасы, доўга бурлачыў...

Хата Палуяновіча трошкі воддаль кладкі, па той бок вулачкі. Вялікае дворышча застаўлена калодамі пчол. Сам Гнатавіч, каржакаваты і шырокай касці чалавек, таптаўся ля ганка, а даведаўшыся, чым цікаўлюся, пачаў расказваць:

— Ага. Ета праўда. Бурлачыў. На пасы хадзіў, лічы, да самай вайны. Лінку цераз плячо — і пайшоў памаленьку, і пайшоў берагам. Тады гэных вунь альховін не було, берагі булы чыстыя. А лес ішоў у асноўным з Залужанкі. Мы і цягнулі яго па канале ажно да Целяхан. Там нашы пасы пераймалі і валаклі ў Пінськ ужо іншыя бурлакі. Праўда, плацілі замала, лічы, што лямку цягнуў чалавек дармова. Але дзе выйсце? Хоць які ды прыробак буў. А ўзімку на невад хадзіў. Наймаўся да купца Гольдзіна. Цалюткі дзень прападаў на Выганаўскім возеры. За днёўку па злоту зараблялі. Таксама мізэрная плата.

— Праўду Гнатавіч мовіў наконт заробкаў тых,— казаў сусед мае гаспадыні, калі мы ўвечары сядзелі на лавачцы і вялі гамонку пра мінулае гэтага кутка палескай зямлі.— За злот можна було толькі паўпуда хлеба купіць. Гэта не тое што цяпер. Зараз не кожны і за чырвонец пойдзе ў прыробкі. А за такія грошы, палічы, колькі буханак возьмеш? І ў калгасе людзі сталі зарабляць ладна. Далёка не пабягу, пра сябе скажу: пасвіў я калгасных нецеляў — і хлеб меў, і да хлеба.

— А чаго ж тады ў змеяловы запісаўся? — кінула, нібы дакор, з парога Кандратаўна, гаспадыня.

— Бо загарэўся! — адразу знайшоўся Сцяпанавіч і ўзяўся тлумачыць: — Прыехалі, значыць, з Фрунзе некалькі чалавек і пачалі гадзючак лавіць. У нас наўкол балатэ, на балатах імхі, а на імхах — безліч гадзючак було. Дык тыя людзі лоўляць і лоўляць. І ўсё туды, у Фрунзе, адпраўляюць. Там з іх

яд біруць і людзей тым ядам лечаць... Напаследак змяловы кажуць: «Можаце і вы лавіць і высылаць нам самалётам». Спакусіліса многія. Паўло Мялік, Грыша Кандратовіч, Якаў Ярмаловіч з жонкаю Верай, нават падлеткі. Я таксама рашыўса. Набыў начынне — пінцэт медыцынскі, драцяны прыжым, мяшэчкі з каблучком заместа завязак і пайшоў. За дзень іншы раз кіламетраў дваццаць пратэпаеш. Бувала, гадзючак сорак і падымеш. Тады ў пасылку іх і ў Івацэвічы, на пошту. За два гады адправіў дзесяткі скрынак. Тэлевізар купіў, тое-сёе з драбязы ды яшчэ соцен колькі навару меў.

— І няўжо ніякая не куснула? — зноў кінула з парога Кандратаўна.

— Мяне — не. А вось Грышку Кандратовіча аднойчы за руку цапнула. Нешта з тыдзень апухлы хадзіў. А потым нічога, ачомаўса.

— Дык яны, кажуць, на пару з Мялікам тысяч восем гадзючак паднялі!

— А паднялі! Мо нават і болей. За адзін дзень, казалі, каля чатырохсот узялі. Во гэта ўлоў буў!

Сцяпанавіч памаўчаў, нібы ўзважваючы вартасць такой удачы, а тады працягваў:

— Некалі толькі і чуеш: гадзюка, гадзюка... А яна не такая ўжо і страшная. Кусала ж у нас і каровак, і авечак, і сабак, і людзей — і нічога, ніхто не ўмёр. Толькі, кажуць, пагана пераносіць кусанне тое. У суседніх Радзялавічах дзядок адзін жыве, Васілько, па-вулічнаму Буйда. Дык ён спецыяльна дае сябе куснуць гадзючцы. Казаў, калі першая куснула — гарачка паднялася, рвала, ногі ператалі гнуцца. Куснула другая — лягчэй було. А трэцяя — усё адно як пчолка пацалавала. Аднойчы ля яго хаты леспрамгасаўцы вялі лесасеку. Бачаць: Васілько босы ля іх круціцца. «Абуйса, дзеду,— кажуць яму,— змяя ўкусіць!» А ён: «Мяне столькі іх перакусала — не пералічыць. Не баюса я гадзючкі!» «Не верым»,— кажуць лесарубы. А Васілько: «То нясіце каторую, пакажу». Паймалі хлопцы змяю, кінулі яму пад ногі, а ён узяў і злёгку наступіў на яе. Ну, тая, вядома,

і ўчапіласа. Хлопцы ад дзіва такога раты паразяўлялі. А Васілько... Ён і цяпер недзе ходзіць па балоце, гадзючку шукае.

— У вас жа не толькі гадзюк многа, а і буслоў.

— Ага,— пагадзіўся Сцяпанавіч.— Буськоў багата. Каб абышоў хаты — ого што пра буськоў нашых уведаў бы!..

У пошукі птахаў я адправіўся назаўтра. Ішоў вуліцай, што перасякае канал і знікае вунь ажно дзе, пазіраў у двары, дзе чарнелі на хлеўчуках гнёзды буслоў, і вагаўся: у які перш зайсці? Выручыў Гена, Івана Лукашэвіча сынок. Ён толькі перайшоў у сёмы, але пра ўсё, што адбывалася ў сяле, дазедваўся раней за іншых.

— Буськоў шукаеце? Тады да нас хадземце.

Адчынілі веснічкі, увайшлі ў двор. Не паспелі азірнуцца — нас акружыла басаногая дзетвара, прыбегла некалькі маладзіц, аднекуль з'явіліся дзве жанчыны ў гадах, мужчына. Усе дзівуюцца: чалавек буськамі цікавіцца!

Генаў бацька зазначыў:

— Харошы птах. Без яго дворышча не дворышча.

І расказаў пра сваё.

Іван Лукашэвіч і Кастусь Лукашэвіч — суседзі (не браты — адно прозвішча). Адначасна будаваліся, адначасна на іхніх хлявах прыладзіліся і буські. Ніхто нікому не рабіў шкоды, жылі ціха-мірна. Выйдуць, бывала, мужчыны на свае ганкі, паслухаюць буськоў клёкат і скажуць адзін аднаму:

— Любата!..

Гадоў праз дваццаць Лукашэвічы ўздумалі перакрыць шыферам свае хлявы. Дачакаліся, пакуль буські паляцяць у вырай, і ўзяліся за работу. Перакрыць хлявы перакрылі, а з гнёздамі як? Не завалачэш назад! І тады рашыў Іван прыстроіць да шыферу веласіпеднае кола. Маўляў, няхай і буськам абнова будзе! Кастусь жа толькі раму з аполкаў збіў і кінуў на яе трошкі галля.

Вясной прыляцелі буські, доўга тапталіся на шыферы, правяралі і раму, і кола. Раму ўпадабалі, а веласіпеднае кола — не. І так, і гэтак прыглядаліся да тае жалезіны, а прыстроіцца не змаглі. Не засталіся ў Івана яны і сёлета. У гэтым ён вінаваціць сябе.

Гена заўважыў, што бацька спахмурнеў, стаў камячыць шапку, і сказаў мне на вуха:

— Да бабы Марылі хадзем...

Баба Марыля ўзрадавалася хадакам, адразу ўзялася расказваць пра сваіх буськоў:

— Авой! Што аднойчы было з імі! Ссунуўся быў адзін з гнязда. Яшчэ не лётаў, а толькі хадзіў. Убачылі таго буська мае ўнучаняты — Аля з Анжэлаю, прынеслі ў хату, сталі тварагом карміць, каўбаскаю, вадою паіць. Ды дзе там! Лёг на падлогу і мёртвы зрабіўся. Ні крылом не варухне, ні нагою. Тады яго на панадворак вынеслі, паклалі ў цянёк, ля плота. Праз хвіліну якую бачым: расплюшчвае вока, галаў прыўзнімае, а тады — на ногі і да сваіх, пад хлеў. Мусілі людзей прасіць, каб у гняздо падсадзілі. Так і ўратавалі. А то было б, як у Волькі Палуяновіч. Кажуць, адзін бусько зімаваў у яе. Калі з выраю вярнуліся іншыя і ўбачылі яго, то доўга не думалі — узялі і задзяўблі.

Гена такога не чуў і тут жа павёў мяне ў процілеглы канец вуліцы.

— Цётка Волька,— сказаў ён,— а чаму вы далі буськам зглуміць таго, што з курамі зімаваў?

Жанчына са здзіўленнем зірнула на Гену, а потым здагадалася, у чым справа:

— Не, дзіцятка,— прамовіла яна.— Байкі ўсё гэта. У нас ніколі буські не зімавалі. Праўда, калі яшчэ ў Козіках жылі, то адно лета падабралі скалечанага. Мой гаспадар шыну на ножку яму наклаў, карміць стаў. А потым, калі ножка спраўная зрабілася, і на балоцейка вадзіў — люгашкамі частаваць. Не раз там пакінуць хацеў, дык бусько хутчэй за яго дамоў вяртаўся. Аднойчы ўсё ж застаўся там, з суседскімі буськамі. Назаўтра прыляцеў, пакружыў над хатай і — назад, на балоцейка. Праз колькі дзён

зноў з'явіўся. Па ножцы пазнавалі: трошкі крывіла, калі ляцеў. А ў вырай адправіўся разам з усімі буськамі.

У той дзень мы з Генам абышлі яшчэ нямала двароў. І ўсюды людзі з любоўю расказвалі пра сваіх буськоў, шкадавалі, што ім цяпер не так лёгка прыстроіцца на новых хатах і хлявах, спачувалі, што і на жыроўку даводзіцца далекавата лётаць (асушылі ж бліжэйшыя балоты), што іншы раз шкодзяць буськам навальніцы. Адным словам, гаварылі пра іх, як пра самых блізкіх.

Дамоў вярнуўся позна. Цямнела, калі ў двор увайшла Кандратаўна. Паходка стомленая, на плячах — каса, у руках — сетачка з мянташкаю і бутэлькаю ад малака. Села на лавачку, паслухала, як заходзіўся ў канцы вуліцы нейчы бусько, сказала:

— І ў іх дзень даўгі...

Папраўіла на галаве белую хустку і нібы скінула з сябе стому.

— І дзятва наша ўсё адно як памяшалася на буськох,— усміхнулася Кандратаўна.— Іншы раз птахі зарана прылятуць, снег пойдзе, зямлю ўкрые, а дзеці — плачуць. Маўляў, а што буські есцімуць?.. Яшчэ дужа любяць яны гуляць у буськоў. На дзоце гняздо пабудуюць, белых камянёў наносяць і пасядуць. Адно сядзіць, другое стаіць побач і «клякоча», а потым з дому пячэнне «буську» подбегам носіць. А тады чарадой лятуць на лугавіну, размахваючы рукамі, нібы крыламі. Усё адно як буські!..

Раніца абяцала сонечны дзень.

— Ну то і добра,— шчыра сказаў Рыгор Андрэевіч Кандратовіч, які ўжо чвэрць веку егерам на Выганаўскім возеры.— Як бачыш агледзім усё.

Матор на карме лодкі заклекатаў, нібы той бусько, а потым запрацаваў роўна і ўпэўнена. Выбраліся з затокі на адкрытую ваду, і егер узяў курс на Дзесяты шлюз, які злучае Выганаўскае возера са Шчараю.

Я сядзеў супраць Кандратовіча, на перакладзіне, пазіраў, як разбягаліся за кармою буруны ўспененай вады, і думаў: нарэшце трапіў у цэнтр аднаго з самых унікальных гідралагічных заказнікаў рэспублікі.

Успаміналіся і словы Гены-сямікласніка: «У нас, бадай, самы значны водападзел з усіх, што маюцца ў рэспубліцы. Дажджына ўпадзе на дарогу — а не ведаеш, куды трапіць: ці ў Балтыйскае мора, ці ў Чорнае».

Сваё сказаў і Кандратовіч.

— Мы зараз на высокім месцы! — прыглушыўшы матор, крыкнуў ён.— На ўзроўні Пінскага манастыра!..

Не згледзеў нават, як увайшлі ў шырокі і роўны рукаў, справа і злева якога стаялі гонкія вольхі, бярэзіны, асіны. Здавалася, трапілі на незвычайны праспект і не на лодцы — на таксі імчым...

— Гэта пачатак Агінскага канала! — зноў крыкнуў егер.

Праз хвілін колькі матор сціх, лодка пачала траціць інэрцыю і, нарэшце, мякка шарганула днішчам аб пясок.

Ступілі на бераг. Адтуль вада — як вялікае, пакладзенае на дол люстра. Усё ў ім бачыцца — кожны камель, кожная жалезіна шлюза...

Дзесяты шлюз — старое, яшчэ тых часоў, збудаванне, але служыць людзям надзейна. Гэта адзіныя вароты, праз якія вясною трапляе са Шчары вада ў возера.

— Ну, а калі б прывесці ў належны стан Агінскі канал — ачысціць, паглыбіць, узвесці патрэбныя гідразбудаванні, карысць ад гэтага была б? — пацікавіўся я.

— Яшчэ якая! — ажывіўся Кандратовіч.— І ў гаспадарчым плане, і ў эстэтычным, так сказаць. Турыстам цікавейшы маршрут адкрыўся б. У наш век не такія аб'екты ўзводзяць.

Па той бок шлюза бегла руплівая Шчара. Ад Калдычэўскага возера, дзе яна бярэ пачатак, сюды

не так і далёка, але як змянілася рака, узмужнела! Ёй пад сілу як найлепей служыць людзям.

Вярталіся, калі сонца стаяла ў зеніце. Але яго не адчувалася. На вадзе, ды яшчэ пры такой скорасці, было самы раз. На паўдарозе натрапілі на брыгаду рыбакоў. Стоячы ў лодках, яны круцілі калаўрот — цягнулі невад. На паверхні пацеркамі паблісквалі белыя паплаўкі, а над імі з енкам і піскам насіліся чароды чаек.

Сядзім у цяньку, пад разгалістымі вольхамі, што густа пасталі на берагах канала і ўтварылі над ім як бы зялёнае скляпенне. Рыгор Андрэевіч гаворыць:

— Наша возера яшчэ і птаствам адметнае. Хто толькі не жыве тут!

Падышоў Мялік, Павел Рыгоравіч, таксама егер. Прысеў, памаўчаў і не вытрымаў, стаў і сам пра Выганаўскае возера расказваць. Ён больш гаваркі, чым Кандратовіч, і, відаць, натура яго болей уражлівая і эмацыянальная.

— Во,— казаў ён.— Каб трапілі сюды вясною, калі турухтаны такуюць! Відовішча, скажу вам!.. Час вялікай вады на Шчары, а яны адшукаюць сушэйшы грудок — і туды. Да сотні іншы раз зляцяцца. Куркі па афарбоўцы амаль аднолькавыя, а пеўнікі! У кожнага свой колер — чырвоны, жоўты, белы, чорны... Такуюць звычайна на ўсходзе сонца. А ў гадзін дзесяць — разбягаюцца. На Шчары, ля Залужжа, я частаназіраў за іхнімі ігрышчамі.

— А пра арлана-белахвоста помніш?

— А як жа! — яшчэ болей узгарэўся Мялік і пачаў тлумачыць. — На тым беразе за вярсту ад вады стаяла сухое дрэва. А на ім гняздо чарнела. Пачалі прыглядацца: чыё? Аказваецца, арлан-белахвост пасяліўся. Залезлі туды, бачым, у гняздзе малое. Цікава стала: чым усё ж яго кормяць бацькі? Надзелі чахол на дзюбу арланчыку, самі — на дол, чакаем. А бацькі носяць і носяць здабычу, носяць і носяць. Праз нейкі час мы зноў палезлі. І што вы думаеце?

Не толькі рыба ў гняздзе была, а і розная птушка! Нават крыжанка.

— Я не пра тое,— перабіў Мяліка Кандратовіч.

— А! — тут жа скеміў егер і дадаў: — Было гэта гадоў мо дзесяць таму. Я тады на возеры наз іраў за качкамі. Бачу: нясе арлан крыжанку. Ну, думаю, нясі, калі ўпаляваў. Малое карміць трэба! А ён, белахвост, гляджу каменем кідаецца ў возера, хапае лысуху, падымаецца і ляціць да сухадрэвіны. У правай лапе — крыжанка, у левай — лысуха.

— Так-так,— ажывіўся Кандратовіч.— Здараецца падобнае. У жніўні звычайна да нас ластавачкі збіраюцца на начлег у чараты. Зляцiцца, бывае, тысяча, дзве, а то і тры, можа. Доўга не заснуць — усё шчабечуць. А рана падымацца не спяшаюцца. Туман над возерам, над берагамі стаіць — дзе ты тую мошку ці мушку зловіш! І вось аднойчы ўранні з'явіўся над чаратамі ястраб-цецяроўнік. Скіраваў туды, скіраваў сюды, убачыў птушак і шухнуў у чарот. Схапіў у лапы па ластавачцы і — як бачылі яго.

— Хо! — не ўтрымаўся Мялік.— А я вось аднойчы вясною... Сяджу, гэта, у лодцы, назіраю, як жыруюць на возеры качкі, а тут — чарацянка. Сагнула чараціну ледзь не да самай вады і просіць: «Піць-піць! Піць-піць». Ах, думаю, падражніцца ўздумала? Вунь колькі наўкол вады, а яна — «Піць!» Ды раптам тарпедаю выскаквае з вады шчупак, хапае чарацянку і тут жа знікае. Толькі кругі па вадзе пайшлі.

Кандратовіч правёў рукою па валасах, нібы расчэсваў пальцамі кранутыя сівізною пасмы, бліснуў вачыма. Аказваецца, і ён можа загарэцца, яго таксама можа ахапіць паляўнічы азарт:

— Аднаго разу нашы рыбакі на санях невад пакінулі. А там, у вочках, ёршык застаўся, плотачка, іншая драбяза. Унюхала гэта норка і, каб меней клопату мець, пасялілася тут жа, у невадзе. Жылося ёй добра. Рыба — побач, выбірай, якую хочаш, ніхто не трывожыць. Дзён праз дзесяць рыбакі зноў пацягнулі сані з невадам на возера. Норка адчула,

што не тое нешта, і як выскачыць з невада, як сігане па лёдзе! Чорнай маланкай так і паляцела на бераг.

— Прызнацца,— праз хвіліну дадаў ён,— я дык шкадую ўсялякую жыўнасць. Не лёгка ёй. Узяць, хаця б, жорава таго. Як яму цяпер трудна! Толькі ў глухіх месцах і сустрэць можна. Зводзіцца птах. Як і глушэц.

— Што праўда, то праўда,— падтрымаў яго Мялік.— Даўней колькі па Шчары гнёздаў знаходзілі! Падыдзеш, зірнеш: яечкі большыя за гусіныя і трошкі сіняватыя. Палюбуешся — і сваёю дарогаю. А ў касавіцу колькі выпадкаў, бывала, сустрэнеш! Сутыкнешся вось так, нос у нос, то жоравіха не ўцякае, прапусціць наперад малых, а потым і сама за імі пойдзе. І ў час вясенняга пералёту соцень пяць-дзесяць убачыш. А вось гэтай вясною ля Шчары толькі дзве пары ўсяго і бачыў...

— І гэта пры ўмове, што нашу мясціну, лічы, на дваццаць кіламетраў вакол меліярацыя не кранала.

— А людзі? Цяпер чалавека дзе хочаш убачыш. Круглы год. А пойдуць ягады ці грыбы — увесь час таўкуцца па лясах-балотах. Вось, скажам, у нас ва ўрочышчы Дарашанка ці ў Пагоні дужа багата журавін. Ва ўрадлівыя гады баба чатыры-пяць вёдзер набярэ за дзень. І не чакае, пакуль журавіны паспеюць, а яшчэ зялёнымі здзярэ. Тут меры прымаць трэба! Інакш які гэта заказнік.

Зайшоў у сельсавет. Алег Іванавіч Кушняроў, старшыня, пацікавіўся, што чуў-бачыў на Выганаўскім возеры, і прапанаваў:

— А на Бабровіцкае не жадаеце?

Я ўзрадаваўся такой прапанове, і неўзабаве мы паехалі на суседняе возера.

Спраўна вёў машыну Алег Іванавіч. Ужо даўно застаўся ўбаку жывёлагадоўчы гарадок мясцовага калгаса «Радзіма», машына бегла паляснай дарозе, а Кушняроў нават і слова не прамовіў — моўчкі кру-

ціў баранку. Раптам збавіў скорасць і тармазнуў. Я толькі цяпер убачыў на невялікай палянцы, пры самай дарозе, сціплы помнічак. «Улетку 1942 года на гэтым месцы было знішчана нямецка-фашысцкімі захопнікамі 90 савецкіх грамадзян і спалена вёска Красніца»,— прачытаў я.

Заводзячы матор, Кушняроў прамовіў:

— Гэтага ўжо не паправіш. Гэта ўжо, так сказаць, у мінулым. А ёсць рэчы, якія чалавек можа яшчэ прадухіліць. Вось будзем праязджаць Бабровічы — там зусім нядаўна спраўная была вёсачка. А зараз? Трапіла ў свой час у «неперспектыўныя» і гіне. На вачах знікае,— ён крыва ўсміхнуўся.— І выдумалі ж слова: неперспектыўная! Вёска кожная павінна быць перспектыўнай. Бо яна ж пры зямлі! І людзі там жывуць, працуюць, у іх дзеці нараджаюцца, падрастаюць, вучацца таксама гаспадарыць. Раптам усім ім аб'яўляюць: не вельмі старайцеся, ваша вёска неперспектыўная. І што вы думаеце? З'язджаюць з такіх вёсак людзі...

А вось і яны, Бабровічы. Вуліца — шырокая, месцамі парасла травою, а дзе-нідзе парэзаная, нібы траншэямі, трактарнымі коламі. Хаты стаяць рэдка, прагалы — як шчарбіны. Аднак асобныя сядзібы — у вялікай раскошы. Там і агародчык вунь які, і садок — вока радуецца. Здагадваешся: гэта гаспадарка таго, хто з самага пачатку не прыняў тую «неперспектыўнасць», а насуперак усяму жыў на падворышчы бацькоў, як і яны, працаваў, не адрываўся ад зямлі, верыў у найвялікшае — справядлівасць.

— А ці ўдасца выправіцца?

— Калі збанок разбілі, то як яго ні склейвай, а трэшчыны застануцца,— адказаў Алег Іванавіч і скіраваў машыну ўправа.

Там, за невялікім полем, віднелася Бабровіцкае возера.

Яно меншае за Выганаўскае, але таксама ў нізкіх берагах, сям-там укрытае зялёнымі лапінамі трысьнягу, чароту, а то і «палянкамі» белых гарлачыкаў.

— Па той бок, на груду, некалі вёсачкі стаялі —

Вяда і Тупічыцы. У вайну загінулі, як і Красніца,— казаў Кушняроў.— Разам з імі і трыста шэсцьдзесят чалавек... Там цяпер выган. На ім Іван Кірыльчык з вясны да маразоў бычкоў калгасных пасе. Дарэчы, на яго вачах і паміралі тыя вёсачкі.

Мінут пятнаццаць ходу на маторцы, і мы на тым беразе.

Кірыльчык, відаць, даўно заўважыў, што да яго едуць, бо ішоў насустрач. Мы павіталіся. Пастух у гадах ужо, невысокага росту, сухарлявы і ажно чорны ад штодзённых вятроў і сонца. Ён спачатку маўчыць, калупае пужальнем прыбярэжны пясок і толькі потым кажа:

— Балюча ўспамінаць, як тое было. Я тады пасвіў каровак пры дарозе, што на Вяда. У полудзень чую: і ў Тупічыцах, і ў Вяда сабакі брэшуць. З чаго б? А людзей — як не стала. Ніхто ні сюды, ні туды не ідзе, не едзе. Стаю, гадаю, што да чаго, а тут, бачу, Валодзя Чырко на быках едзе. Я яму: часам ці не карнікі наляцелі? Учора ж Красніцу забілі! Покуль не позна — уцякайма. А Валодзя: «Бykoў шкода». І паехаў далей, у Вяда. А я скіраваў у балота. Адышоўса добра-такі. Ускорасці бачу: гараць і Вяда, і Тупічыцы, і мае Бабровічы. Такі дым, такі дым валіў — страшна ўспомніць. Неба ўчарнела, сонца патухла. Думаў, канец свету!.. А я ўсё бягом ды бягом. Ажно да Святой Волі дабег. А гэта дзесяць вёрст адгэтуль... Ноч ужэ была. Прашуса пераначаваць у дзядзькі, а ён: у нас начаваць няможна! Я тады ў нечы пограб. І заснуў як забіты. Рана куры крычаць сталі, я — хоаду. Чамусьці зноў у Бабровічы прыбег. А там — адны каміны, адны печы голыя стаяць. Каровы равуць. Свінні квічаць. Сабакі выюць... Пакруціўса перад вёскай і зноў у балота. Прыходжу ў Бярэзіну — урочышча ў нас е такое, а там — маці, брат меншы, Косця. Убачылі мяне — галосяць: ад пагібелі ім удалоса ўцячы... Ну, сталі мы качаваць. Перш у Вялікую Гаць кінуліса, потым у Раздзялавічы, зноў

у Вялікую Гаць, а тады — у лес, у лагер сямейны прыбіліса, што ва ўрочышчы Качэржын стаяў. Да канца вайны там і кантаваліса. Балота мы ўсе добра ведалі, яно нас і выручала... А Валодзю Чырко і зараз шкода. Не паслухаў, паехаў і страціўса. У Вяда, разам з усімі вядаўцамі. А я вот жыву...

Іван Кірыльчык змоўк, зноў стаў калупаць пужальнем пясок, нібы вагаўся: казаць далей пра тую бяду, ці не казаць.

Мы разумелі яго. Успамін не прыносіў чалавеку палёгкі, толькі варушыў даўні незагойны боль.

Развітаўся з Кандратаўнай, падзякаваў за прытулак і пайшоў на аўтобусны прыпынак, што супраць магазіна пад старой разгалістай таполяй.

Быў выхадны, і там тоўпілася шмат людзей. А ўздоўж сцяны стаяла вунь ажно колькі дзіцячых калясак. У магазін то заходзілі, то выходзілі з яго па-святочнаму апранутыя маладзіцы. А мужчыны, радыя, што за тыдзень пагоды справіліся з сенам, вялі між сабой спакойную размову пра свае штодзённыя справы. Дзед Лукаш казаў:

— Во жызня! Кожны займаецца толькі сваім. А колісь не ведаў за што і хапацца — ці то за плуг, ці то за пугу, ці то за невад, ці то за лінку...

Да гурту ішоў маладжавы мужчына, за ім — чародка дзяцей.

— Ухце мне! — хіхікнуў Гнатавіч, былы бурлак.— Адкуль у цябе, Іване, набралася гэтулькі?

Маладжавы ўсміхнуўся:

— Буські не паскупіліся!

— А ці хоць помніш, як іх завуць, падшыванцаў тваіх?

— По-омню! — горда адказаў той, спыніўся і пачаў загінаць пальцы правай рукі: — Сярожа, Юра, Толя, Вова, Саша...

— Бач ты яго! Адны хлопцы.

— А ў мяне, гэтае самае, адны дзяўчаткі,— уставіла маладая кабета, што таўклася паблізу мужчын,

і таксама стала загінаць пальцы: — Шурка, Валька, Жэнька, Зінка з Нінкаю і Аленка. Буські таксама не скупяцца!..

— Эт! — нібы абурыўся сусед маёй гаспадыні, Сцяпанавіч.— Вось некалі буські прыносілі то прыносілі! Мой дзед казаў: на тым беразе канала некалі сябрук яго жыў. Дык той вечна з ліку збіваўся. Папросіць яго ўраднік назваць дзяцей, а ён падумае, падумае, а тады і кажа: «Яська, Адаська, Змітрачок ды Несцерка, трошкі меншых шэсцерка і тры дзеўчынкі...».

Людзі смяяліся.

Аднекуль з'явіўся Гена, мой нядаўні спадарожнік па буськовых справах, і паведаміў:

— А баба Лізавета, што на вуліцы нашай жыве, ажно васьмярых выгадавала. А колькі ўнукаў мае — не злічыць. У адной толькі дачкі Евы шасцёра...

Нарабіўшы пылу на ўсю вуліцу, пад'ехаў аўтобус. Трэба было развітвацца.

Я пакінуў Выганашчы.



# ГАРЫВАДА

*На гасцінцы за Рэчыцай*
*Паданне пра нафту ● Фальварак на гары*
*Урочышча Смыньга ● Брыгадзіраў клопат*
*Факел у начным небе*

Звычка заходзіць у рэдакцыі райгазет выпрацавалася даўно. Бо дзе знойдзеш лепшага дарадчыка, як не сярод калег-журналістаў. Яны і зразумеюць з паўслова, і параяць, і падкажуць, каб, як гаворыцца, не блукаў у трох соснах.

Але на гэты раз атрымалася не так. У рэдакцыі, акрамя машыністкі, нікога не застаў. Ужо хацеў быў пайсці, ды адчыніліся дзверы, і парог пераступіў пажылы чалавек.

— Курбацкі, Павел Рыгоравіч,— назваўся ён.

Назваўся і я. Тут вочы Паўла Рыгоравіча загарэліся, твар засвяціўся:

— То, відаць, і Барыса Іванавіча Сачанку ведаеце? — сказаў ён.— Я яго некалі вучыў, калі ў Вялікаборскай школе працаваў. У Сачанкаў, помню, сям'іска была — ой-ёй! Жылі, праўда, небагата, але дружна. І дзеці вучыліся добра. Адзін аднаго трымаліся і потым усе ў людзі выйшлі... Дык з якой гэта нагоды ўспомніў? Я Барыса вучыў, а цяпер сам у

яго вучуся. Чалавек мовы роднай не страціў, збярог яе, матчыну мову! Іншы раз сяду чытаць яго кнігу — усё роўна як у Вялікім Бары апынуся. Усё такое роднае, такое блізкае!.. А гэта, скажу вам, не кожнаму ўдаецца, каб так вось, ад душы...

Курбацкі добрым словам успомніў яшчэ аднаго свайго земляка — Івана Паўлавіча Мележа, які так заўчасна пайшоў ад нас,— паздзіўляўся хуткабежнасці часу і, нарэшце, быццам спахапіўся:

— А вы чаго ў нашы мясціны?

— Паглядзець, як дрыгавічы жывуць! — паспрабаваў пажартаваць я.

— Добра жывуць! — сур'ёзна адказаў Павел Рыгоравіч.— А вось як жылі?..

Ён на хвіліну задумаўся, а тады прамовіў:

— Адзін паэт вельмі трапна сказаў наконт гэтага. Прозвішча яго не помню, а радкі — усё адно як учора вычытаў:

Там, дзе прэў у дрыгве барадаты арэшнік,
Дзе Лясун з Балацянікам дружбу вадзіў,
Дзе не праходзіў ні конны, ні пешы —
У краіне легенд, забабонаў і дзіў...

— Во характэрны малюнак жыцця колішняга! — дадаў Курбацкі.— А цяпер... Нашу Рэчыцу бачылі? Нічога не скажаш — сучасны горад! І вёскі таксама...

— Мне б у Гарываду трапіць...

— А ці праблема! — падбадзёрыў былы настаўнік.— Калі напрасткі — кіламетраў шэсць, не болей, адгэтуль будзе. А дарогаю — круг не малы. Лепш за ўсё аўтобусам, што на Першамайск ідзе. Як бачыш на месцы будзеце...

На першамайскі аўтобус я не паспеў і пайшоў за пераезд, на гасцінец, у надзеі на спадарожную машыну. Думалася: летні дзень даўгі, быць не можа, каб хто не падвёз. Але з гадзіну ўжо таптаўся на абочыне, а машыны ўсё не траляліся. Прабягала, праўда, нямала і грузавых, і легкавых, аднак яны ішлі не туды — на Хойнікі.

— Дабрыдзень! Мо ў адну дарогу?

Да мяне набліжаўся высокі, у карычневым касцюме, мужчына. Падышоў, апусціў на пыльную траву скураны партфель, дадаў:

— Мне на Калінкавіцкі бальшак, да павароткі, што на Гарываду.

— А мне ў Гарываду.

— Ну во! — узрадаваўся ён.— Разам паедзем.

Мы ўжо на пару тады-сяды «галасавалі», аднак машын у наш бок па-ранейшаму не было.

— Вось так заўсёды,— сказаў мой спадарожнік.— Калі трэба, то іх не дачакаешся, а не трэба — цугам бегаць будуць.

Сышлі з сонца ў цянёк.

— У госці да каго ці па справах? — зноў запытаўся ён і, не чакаючы адказу, дадаў: — Я ж сам родам з Гарывады! А жыву па суседству, у Перасвятой. Там і працую — у школе. Дырэктарам.

«На лаўца і звер бяжыць!» — ледзь не выказаў я сваю радасць, успомніўшы і Курбацкага, аднак стрымаўся. А дырэктар ужо казаў:

— Вось жа бывае! — вочы яго свяціліся, як тады ў Паўла Рыгоравіча.— Каб раней мне хто пачаў даводзіць, што ля мае Гарывады выявяць сапраўдную «гарываду», ні за што не паверыў бы. А тут на табе: свідравіна, што бурылі паблізу вёскі, і дала першую нафту ў рэспубліцы. Ды яшчэ якую нафту! Яна нічым не горшая па якасці за бакінскую... Але ж,— ён памаўчаў трошкі, нібы вагаўся, казаць ці не.— Але ж, калі ўспомніць дзеда Антося... Ён у вайну памёр... На байкі розныя спец быў — у наваколлі не знойдзеш. Нам, дзецям, колькі паданняў розных расказваў, казак ды легендаў! Адну і да гэтага часу помню. Хочаце паслухаць?

І стаў расказваць:

— Даўным-даўно тое было. Калі Падняпроўе ляжала суцэльным царствам тумаоў, лясоў ды балот, калі тут адны чэрці вадзіліся, а наўкол стаяла мёртвая цішыня. Той спакой толькі іншы раз тур лясны парушаў ды пугач крыкам сваім абуджаў...

І вось аднойчы аднекуль з-за Воўчай Гары люд павaліў. І малы, і стары. Якая бяда гнала іх — ці то мор, ці то яшчэ што — ніхто не ведае. Ішлі, ішлі, а тут і ноч захапіла. Цемрай куды пойдзеш? Пасталі і думу думаюць: як быць, што рабіць? Раптам бачаць: засвяцілася нешта ў балоце, зашугала агнём-полымем. І так светла зрабілася — як удзень. Людзі тыя стаяць, дзівуюцца, шкурамі звярынымі засланяюцца. А полымя то падымецца, то ападзе і сцелецца, усё адно як крывавы туман. Застагналі людзі, загаласілі: «Канец свету, канец свету!». І кінуліся хто куды. Перапалох пачаўся несусветны. І тады наперад ступіў самы дужы, самы смелы, самы кемлівы падняпровец і сказаў: «Дрыгавічы мае! Апамятайцеся! Не канец свету гэта, а гарывада ў балотным акне палыхае. Напоўнім ёю гліняныя гаршкі, панясём перад сабою, шлях асвецім, выйдзем з твані на груд і атабарымся». Так людзі і зрабілі. А ў знак таго, што ўратаваліся, што ў гэтым ім дапамагла гарывада, паселішчу свайму найменне далі: Гарывада.

Рыпнулі тармазы — насупраць спыніўся грузавік. Адчыніліся дзверцы, з кабіны паказаўся вадзіцель:

— А чаго гэта вы седзіцё тут, Сяргеевіч? Мо дадому падкінуць?

— Цімох з Гарывады,— падхапіўся спадарожнік.— Гайда! Вы ў кабіну, а я наверх, у кузаў. Люблю на ветрыку!..

Праз хвіліну мы імчалі асфальтам — абганялі пешаходаў, веласіпедыстаў. З вясёлым шухканнем беглі насустрач прыдарожныя дрэвы, і добра было адчуваць хуткую язду. Шафёр нейкі час маўчаў, а тады запытаўся:

— А ці доўга вы тут пыл глыталі?

Я адказаў. Пахваліўся нават, што паспеў пачуць ад Васіля Сяргеевіча легенду пра гарываду.

Цімох ледзь прыкметна ўсміхнуўся:

— А тое магло быць і праўдай. Магла ж выбіцца на паверхню нафта? Магла. А мог і балотны газ

гарэць. Вось і перадавалася з пакалення ў пакаленне тая байка. Адных яна палохала, другіх захапляла сваёй рамантычнасцю. Але зноў-такі: факт застаецца фактам. Упершыню адкрылі нафту не абы-дзе, а ля Гарывады!

Ён збавіў скорасць, крутнуў баранку ўправа і скіраваў машыну на грунтавую дарогу.

— Напрасткі як бачыш даімчу.

Ужо недзе далёка застаўся асфальт, злева праплылі крайнія хаты Воўчай Гары, насустрач пабеглі палеткі скошанай збажыны, як Цімох загаварыў зноў:

— А і я помню адну байку дзеда Антося. Некалі казаў ён, што назва вёскі пайшла ад гары, на якой дужа цікавая азярынка стаяла. Гара тая вунь якая, а на макаўцы заўсёды шкельца вады паблісквала. Яшчэ баяў ён, што тая вада святая, здароўе дае чалавеку, калі пап'е яе.

Цімох хітравата зірнуў на мяне і працягваў:

— Святая яна ці не святая, не скажу, але што там ніхто ніколі ніводнай рыбінкі не бачыў — гэта точна. А ў чым прычына — загадка, таямніца. Ды вось яна, гара тая! — ледзь не крыкнуў шафёр.— Направа, дзе кукуруза сцяною стаіць. А балота, дзе гарывада гарэла, будзе злева, ва ўрочышчы Смыньга.

Ці даравальна было б абмінуць тыя мясціны? Таму і папрасіў я Цімоха спыніцца.

— А што такое? — занепакоіўся Васіль Сяргеевіч і саскочыў з кузава.

— Ды вось,— паказаў я рукою на лог.— Там некалі гарэла вада, а там,— паказаў направа,— на гары вада...

Васіль Сяргеевіч усміхнуўся. Засмяяўся і шафёр:

— Ну ладна. Калі на тое пайшло, я пагазую. Бывайце!

Прабіраюся густымі зарасцямі кукурузы ўслед за Васілём Сяргеевічам, адчуваю пад нагамі даволі

круты пад'ём і думаю: колькі таямніц хавае наша зямля! Адкрыць бы іх, дакрануцца сэрцам — і чалавек пабагацеў бы душою! Але кожны з гэтых скарбаў няўмольны час замкнуў на дзесяткі, сотні замкоў, адамкнуць якія, відаць, не змогуць ні Цімох, ні Васіль Сяргеевіч, ні я, ні хто іншы — ніхто.

А недзе ж тут, зусім побач, на Дняпры, некалі спыняўся на кароткі пастой рускі падарожнік Афанасій Нікіцін. Гэта тут віхурай праносіліся адважныя коннікі казака-вальналюба Севярына Налівайкі. На гэтай зямлі адпачывалі пасля нялёгкіх пераходаў воіны Гаркушы і Нябабы. Гэтымі дарогамі праязджаў у сваю паўднёвую ссылку найвялікшы паэт свету — Пушкін.

Падзеі, імёны. Імёны і падзеі. Колькі вас? І колькі нязведанага не данеслі вы да нашых дзён!

Калі ехаў з Калінкавічаў у Рэчыцу, па левую руку на абочыне дарогі, якраз насупраць Гарывады, убачыў сапраўдны помнік тым, хто адкрыў адну з таямніц зямлі гэтай. І ўзрадаваўся за людзей, якія зрабілі такое. На помніку-стэле надпісы:

«17 октября 1964 г. здесь открыта первая промышленная нефть Белоруссии».

«29 апреля 1965 года белорусская нефть введена в международный нефтепровод «Дружба».

А ў мясцовым краязнаўчым музеі даведаўся імёны першаадкрывальнікаў беларускай нафты: Герой Сацыялістычнай Працы Галка Уладзімір Мікітавіч, буравы майстар. Зайцаў Валянцін Аляксандравіч, майстар па складаных работах. Багіна Уладзімір Антонавіч, галоўны геолаг. Гірдзюк Алег Пятровіч, начальнік геалагічнага аддзела...

— Вы далёка? — гукнуў Васіль Сяргеевіч.— Сюды ідзіце. Вось яно, азярцо!

Праз хвіліну быў побач з ім, стаяў на самай вяршыні гары. Дакладней, на беражку «сподка», аздобленага зелянюткай травою, пасярод якога спакусліва паблісквала вада. Васіль Сяргеевіч казаў:

— Мясціна гэтая Фальваркам завецца. Мо калі сапраўды маёнтак які тут быў. Умовы ж выключныя.

Вышыня, а зямля, бачыце, урадлівая, да таго ж азярына ніколі не высыхала — са дна крыніцы білі. І цяпер вада б'е з-пад зямлі. Сорак сёмы год быў вунь які засушлівы, Дняпро ажно перасох, яго ў іншых месцах пераходзілі нават, а тут вада стаяла і, як крышталь, чыстая была.

Далёка-далёка відаць адсюль. І сіні грэбень лесу, і лог, за якім на ўзвышшы выгінаецца падковаю Гарывада. Хаты ў вёсцы стаяць густа. Над імі падымаюцца кроны дрэў, і здаецца, што там, на фоне жнівеньскага неба, узвышаюцца стажкі зялёнага сена.

— Дзіва што ў сорак трэцім годзе на гэтым Фальварку фашысты акапаліся,— расказваў далей Васіль Сяргеевіч.— Меркавалі, відаць, надоўга зачапіцца. Нешта з тыдзень нашы не маглі выбіць іх адсюль. І тады ў Гарываду прымчалі «кацюшы» і так усмалілі ім, так далі прыкурыць, што... Потым мы прыбягалі глядзець. Немчуры набіта было — жах! Некалькі дзён гарыводцы закопвалі, тут жа, пад гарою гэтай.

Вярнуліся на дарогу, спусціліся жнішчам ніжэй, у лог, і нам адкрыўся іншы малюнак: куды ні зірні — кусты, кусты, кусты. Ляшчына, вольха, лаза. Урочышча Смыньга!

З берага ішлося яшчэ сяк-так. А потым пад нагамі захлюпала, забялеў сфагнавы мох між купін, дол пачаў угінацца, паказваючы «чортавы вочы» — плямы ўчарнелай тлустай вады. У іншым «воку» і цяпер дна не намацаць. Карова каторая здуру ўваб'ецца — толькі булькне. З тутэйшых людзей ніхто і не рызыкуе тут лазіць.

Не сталі рызыкаваць болей і мы — пачалі паволі, сваім следам, выбірацца з гэтай прорвы на сушэйшае.

Сонца ішло на спад, а смаліла — не давядзі як. Смага даймала. Мы ішлі ў сяло асушаным выганам. Колішняя лугавіна была, як той бубен, голая і выглядала мёртвай.

— І чаму не давесці да ладу? — нібы ў мяне пытаўся Васіль Сяргеевіч.— Хоць бы траву якую пасеялі! Успароць зямлю ўспаролі, а пабачылі, што глеістая, і закінулі. Гэта ж не гектар, не два — вунь якая плошча!

Мне адразу ўспомнілася Мерачоўшчына — урочышча паблізу роднага сяла, што на Косаўшчыне (там некалі ў фальварку нарадзіўся Тадэвуш Касцюшка). Тое ўрочышча ў свой час акаймоўвалі невялікія стаўкі, у якіх гадаваўся люстраны карп, серабрысты карась. Вядома, нейкі прыбытак быў ад гэтага. Да таго ж куточак зямлі выглядаў слаўна. К вадзе падступаў лісцевы лес. Шмат расло чаромхі. Там увесь час трымалася і птушка. Адных салаўёў было... Ды аднойчы з'явіўся дужа рухавы гаспадарнік, абышоў стаўкі і вырашыў, што яны нерэнтабельныя. Неўзабаве прыпоўз бульдозер і развярнуў дамбы, патрушчыў шлюзы. Калі сышла вада, усе ўбачылі: на дне стаўкоў не іл, як гэтага чакаў той гаспадарнік, а звычайны пясок. І што? Памылка была выпраўлена? Адноўлены дамбы? Пастаўлены новыя шлюзы? Ніхто нават і пальцам не варухнуў, каб хоць прыкрыць ад людскіх вачэй сляды «дзейнасці» таго разумніка. Мінуў не адзін дзесятак гадоў, а там па-ранейшаму ні вады, ні травы. Ці не падобнага гаспадарніка і тут работа?

— А відаць, што так,— пагадзіўся са мною Васіль Сяргеевіч.— Часам нашы шаноўныя меліяратары рабілі толькі асушэнне. Адным словам, спускалі ваду, а лічылі, што праводзяць меліярацыю. І атрымлівалася: не паляпшалі ўгоддзі, а... пагаршалі.

Ужо мінулі жывёлагадоўчы двор, што раскінуў свае прыземістыя будыніны перад самай вёскай, як Васіль Сяргеевіч прапанаваў зайсці ў брыгадны дом — папіць з дарогі. Звярнулі ўлева, да брыгаднага дома, які нагадваў звычайную вясковую хату — быў абгароджаны акуратным плотам, меў пры сабе ганачак, а побач — студню.

Гаспадар яго Міхаіл Мароз быў якраз на месцы. Ён узрадаваўся земляку, здзівіўся, што ў такую, як

сказаў, глухмень, прыехаў чужы чалавек, адразу адклаў паперы і пабег выкруціць свежай вады. Потым сядзеў насупраць нас, абапёршыся на край стала, і распытваў, што чуваць новага. Па тым, як адказваў мой спадарожнік, не цяжка было здагадацца, што яны даўно ў сяброўскіх адносінах. Ды і дзіва тут ніякага не магло быць. Абодва ж і нарадзіліся ў Гарывадзе, і ліхалецце вайны пераживалі разам, і пасляваенную нішчымніцу. На іхніх вачах ішло аднаўленне, падымалася родная вёска. Мо яны і зараз былі б разам, ды лёс распарадзіўся па-свойму: Васіль Шатон стаў настаўнікам, а Міхаіл Мароз — брыгадзірам саўгаса. Сустракаюцца яны часта і заўсёды любяць успомніць мінулае, абгаварыць надзённае, памарыць. Вось і цяпер сядзяць адзін насупраць другога і здзіўляюцца: як змяніўся іхні кут! Раён стаў цэнтрам беларускай нафтаздабычы. Да земляроба прыйшла заможнасць. Падняліся гаспадаркі. Заробкі сталі надзейныя...

— А мяне трывога адна не пакідае,— задумліва прамовіў Мароз.— Што будзе заўтра? Мая брыгада гародніну вырошчвае, рук ды рук патрабуе. А ў ёй усяго чатыры мужчыны і дваццаць жанчын. Моладзь апошнім часам не затрымліваецца — узяла за моду ўцякаць да нафтавікоў, у Рэчыцу ці ў Гомель... Мо цяпер павернецца справа? Як ты мяркуеш?

Шатон заварушыўся, хацеў, відаць, нешта сказаць, выкласці сваю думку, але не паспеў — брыгадзір зноў загаварыў:

— Не думайце,— паглядзеў ён у мой бок.— Я не выношу смецця з хаты. Я кажу так, бо баліць, бо не магу раўнадушна глядзець, калі робіцца не тое, што трэба. І ўсё таму,— падумаў ён трошкі,— што не прывучылі маладых да зямелькі. Ды зноў-такі: колькі гадоў усялякімі шляхамі-спосабамі адбівалі ў чалавека ахвоту працаваць на гэтай зямельцы! А яно вось і дало знаць. Праз колькі год!..

— Тут не толькі мы, бацькі, вінаваты, не толькі школа...

— Сяргеевіч! — ажывіўся брыгадзір.— Вось і я

кажу! А цяпер паспрабуй, вярні павагу, любоў да зямліцы. Ого колькі часу спатрэбіцца! Але ж трэба. Бо без гэтага нічога не будзе. Адна машына рабіць не стане.

Відаць было, што Васіль Сяргеевіч адчуваў сябе няёмка, нібы ён быў галоўным віноўнікам таго, што здарылася, чаму ў Мароза гэтак складіся справы, так натамілася душа.

Выйшлі на ганак. Брыгадзір нібы цяпер толькі заўважыў нашу запыленую вопратку, сказаў:

— А няхай вас! — і засмяяўся сваёй шчырай і, як падалося, стомленай усмешкай.— Каня запражом — і хутчэй, і зручней будзе.

Васіль Сяргеевіч Шатон жыве ў даволі прасторнай хаце, пры самай школе, што патанае ў зяляніне, можна сказаць, на ўскрайку Перасвятой.

Перш чым запрасіць у хату, ён рашыў пазнаёміць мяне са школьнай гаспадаркай. А ёй пазайздросціць не адзін дырэктар. Усё на сваім месцы, усё як мае быць і адрамантавана, і прыбрана, і дагледжана — хоць заўтра пачынай заняткі. Ва ўсім адчувалася рука кіраўніка. Добрая ў яго і асабістая гаспадарка. Гэта — агарод з садком, праўда, яшчэ маладым, некалькі вуллёў пчол, карова, два бычкі — пярэзімак і сёлетні, куры, гусі, нутрыі...

— А як жа! — нібы апраўдваецца гаспадар.— На зямлі жывём. Да таго ж у сельмагу ўсяго гэтага не купіш.

Да нас падышла Валянціна Іванаўна, жонка дырэктара, і пачала бедаваць:

— У мяне ёсць адна індычка, дык яна такая мама, такая мама! І гусянят выводзіла, і качанят. А гэты год мой Сяргеевіч куранят прывёз. Падкінулі пад яе — прыняла. Але вось шашок убіўся — спасу няма. За трыццаць куранят зарэзаў. Ды каб хоць з'еў. А то зарэжа і пакладзе, зарэжа і пакладзе. Бяда з ім. Як тут рады даць — і сама не ведаю.

Выйшлі на школьную алею.

— Даўся табе шашок той,— далікатна папракнуў жонку Васіль Сяргеевіч.— Не было б горшай бяды. Вось што рабіць, каб маладыя ў вёсцы заставаліся...

— Ролю тут павінна адыграць і школа,— нечакана сказала Валянціна Іванаўна.— Мала яшчэ прывучае дзяцей да працы, а ў сельскай мясцовасці — да зямлі. Бо глядзіш іншы раз: і ў сяле беларучкі...

Слухаў я і думаў: і саўгасны брыгадзір, і дырэктар школы, і яго жонка — людзі ад зямлі, мо болей як хто адчуваюць яе патрэбы. І рады быў, што яны такія, гэтыя людзі.

Непрыкметна апусціліся на зямлю прыцемкі. Старыя прысады нібы драмалі — не варухнецца нават лісток. На небакраі стаяла ружаватае зарыва.

— А горад яшчэ не спіць,— прамовіла Валянціна Іванаўна.

Лявей ад горада, пры самай зямлі і, відаць, далёка адсюль час ад часу ўспыхвала неба — усё адно як там жахалі маланкі. Васіль Сяргеевіч сказаў:

— Ці не новы газавы факел запалілі?

І дадаў праз хвіліну:

— Значыць, яшчэ адна свідравіна «гарываду» дала...



## БУЖАНЕ

*Ля самага Буга ● Тут пачыналася вайна*
*Навасёлкаўскія салдаткі ● Гаспадар зямлі*
*Сказ пра рачулку Паненку*
*Уцекачы ● Хто жыве ў крайняй хаце*

За Высокім, калі браць на захад, знаходзіцца вёска, якая на першы погляд нічым асаблівым не вызначаецца, нават назваю: Навасёлкі (іх жа ў рэспубліцы за трыста!). Але гэтыя Навасёлкі —на самай заходняй кропцы Беларусі. Далей — Буг, мяжа, а там — нашы суседзі, палякі.

У далёкім мінулым гэта была невялічкая вёсачка і называлася на паляшуцкі лад — Сельцэ. Пасля эпідэміі чумы (памора) жыхароў у Сяльцы стала яшчэ менш... Міналі гады, гора патроху забывалася, вёска расла. Але новыя хаты людзі будавалі не ў Сяльцы, а вакол яго, і ўсё паселішча сталі называць Навасёлкамі. А цяпер у іх уваходзяць як бы пяць вёсачак, і кожная мае сваю назву: Сяльцо, Гнедзькі, Карнілікі, Гара, Падол.

Зараз у Навасёлках за дзвесце пяцьдзесят двароў, шмат вуліц, вулачак, завулкаў. Сядзібы з прасторнымі панадворкамі (у асноўным пасляваеннай забудовы), хатамі, муравацкамі, агародчыкамі

пры іх, садкамі, кветнікамі. Есць сельскі Дом культуры, бібліятэка, магазіны, пошта — адным словам, усё, у чым мае патрэбу селянін. Навасёлкі да таго ж цэнтр калгаса, аднаго з лепшых на Брэстчыне. У гаспадарцы свабодных грошай пяць мільёнаў рублёў. Кожны чацвёрты калгаснік мае аўтамашыну.

Гэта — ява. Ява Навасёлак сённяшніх.

Вядома, змены тыя не з'явіліся самі па сабе. За імі стаіць нялёгкая сялянская праца, нават жыцці людскія.

Васіль Мікалаевіч Гарбуноў — былы начальнік 2-й заставы 17-га Чырванасцяжнага пагранічнага атрада. Застава тады размяшчалася адразу ж за вёскай. Вось што ён расказвае ў кнізе «Буг у агні» пра падзеі, што адбыліся ў Навасёлках вечарам 21 чэрвеня сорак першага і назаўтра, 22 чэрвеня, у першы дзень вайны.

«...Нарад заўважыў, як мужчына падбег да Буга, кінуўся ў ваду і паплыў да нашага берага. Неўзабаве ён знік у кустах. Гэта быў мельнік — даўно вядомы назіральнікам як гаспадар невялікага млына сяла Стары Бубель. Убачыўшы нарад, ён, задыхаючыся, прамовіў:

— Хутчэй да начальніка.

Расказваў мельнік блытана. Відно было, што вельмі хваляваўся, голас яго дрыжэў, у вачах стаялі слёзы:

— ...Пераправу яны, відаць, будуць узводзіць ля старой шасейкі, дзе быў паром. Другую пераправу, магчыма, падрыхтуюць каля вялікага каменя і, можа быць, трэцюю — каля броду.

«На ўчастку суседа, справа»,— падумалася мне.

— Калі ж яны пачнуць перапраўляцца?

— Здаецца, у 4 гадзіны раніцы па вашаму часу».

Чэрвеньская ноч кароткая. Але і некалькі гадзін хапіла пагранічнікам, каб падрыхтавацца.

Далей Гарбуноў паведамляе:

«Пагранічнікі кінуліся ў акопы, занялі свае агнявыя кропкі. Старшына раздаў увесь боезапас камандзірам аддзяленняў знешняга кальца — вакол Навасёлак, унутранага — на самой заставе.

На тым баку цішыня. Немцы прыціхлі. Прытаіліся. Рыхтуюцца кінуцца.

А праз гадзіну артылерыйскі і мінамётны агонь накрыў Навасёлкі. Загарэлася вёска. Людзі забегалі з канца ў канец, не ведаючы, што рабіць. Плач. Крык. Шум. Як успомніш увесь той малюнак, нават цяпер валасы ўстаюць дыбкі».

Са зборніка дакументаў «Пагранічныя войскі СССР у Вялікай Айчыннай вайне»:

«Застава вяла бой з праціўнікам у раёне вёскі Навасёлкі на працягу 14 гадзін. За гэты час вораг страціў 300 чалавек забітымі і параненымі. Нашы страты: не вярнуліся з нарада чырвонаармейцы Сяргееў, Чыгрэеў і Урдэнка; забіты пры абароне заставы снайпер Капінос, стралок Бузін, станкакулямётчык Саўчанка, кавалерыст Трафімаў; паранены яфрэйтар Брычоў, чырвонаармейцы Пятроў, Багданаў і капітан Кандрацьеў».

А вось радкі з «Гісторыі заставы»:

«Звыш роты праціўніка наступала на заставу. Шлях ім пераняў Пётр Капінос. Не адзін дзесятак фашыстаў знайшоў сабе смерць пад яго трапным агнём. Неўзабаве гітлераўцы акружылі пагранічніка і загадалі здацца. Капінос зрабіў яшчэ некалькі выстралаў па ворагу, апошнюю кулю пусціў сабе ў сэрца. Ён вырашыў лепш загінуць у баі, чым жывым трапіць у рукі ворага.

Цяпер яго імя носяць піянерская дружына, школа ў Навасёлках і адна з вуліц вёскі».

Пахаваны пагранічнікі, што прынялі на сябе варожы агонь у першыя гадзіны вайны, на ўскрайку Навасёлак, насупраць школы-васьмігодкі. Над іх магілай помнік, ля падножжа якога заўсёды кветкі. Сюды часта прыбягаюць дзеці. А ў той на сходзе

восені дзень да помніка прыйшла пажылая жанчына, пастаяла і прыклала да халоднага каменя некалькі каліўцаў бяссмертніку.

Хто ж яна будзе ім — загінуўшым героям?

А ніхто. Яна — салдатка.

У Навасёлках іх, салдатак, нямала. Марыя Кірылаўна Кушнер і Вера Ільінічна Громік, Марыя Дзімітраўна Паўлючык і Лідзія Фёдараўна Каліховіч, Марыя Іванаўна Дарафеева і Вера Сцяпанаўна Лысюк, Марыя Мікалаеўна Песенка і Надзея Міхайлаўна Рогач, Марыя Лукінічна Гардзяюк і... Кожная з іх і цяпер верыць у цуд: а раптам адчыняцца дзверы, і парог пераступіць... Але цуда няма. Ёсць балючая праўда вайны.

Глядзіш на маўклівыя твары, на шырокія і вузлаватыя, нібы ў мужчын, рукі гэтых жанчын і думаеш: літасцівы божа! Калі б ты быў, дык ці дапусціў бы такую страшную кару...

— Цяпер хоць жытка людскаю стала,— нібы разважае Марыя Лукінічна Гардзяюк.— Калгас і соткі пасадзіць, і картоплю ад жука агорае, і выбраць выбера, і прывезці ў паграбок прывязе... З сянцом і саломкаю таксама ніякіх клопатаў. Усім наш старшыня, Пятровіч, забяспечвае! А бывала...

У першыя пасляваенныя гады ў нашых вёсках нярэдка можна было назіраць такое. Збяруцца жанчыны, упрагуцца ў плуг і з раніцы да вечара — на сотках. Сёння ў адной, заўтра ў другой, а там — у трэцяй. Страшна, прыкра, балюча было бачыць тое.

— Ат! — махне рукою Марыя Мікалаеўна Песенка.— Ужо і забылася.

А ў самой вочы — поўныя суму, тугі ды несхаванай трывогі:

— Толькі б зноў ліханька не ўсчалося!

У якую навасёлкаўскую хату цяпер ні зойдзеш, пачуеш адно:

— Мы — людзі прыбужныя, усё маемо. На свеце толькі б ціха было...

І яшчэ ў кожнай хаце пачуеш пра яго — старшыню, «нашага Пятровіча». Самая высокая павага?

Так. Бо чалавек заслужыў яе мазалём сваім. І адносінамі да зямлі, да людзей.

У кабінеце няма тае шыкоўнасці, якую мы, часам, бачым у іншых кіраўнікоў,— усё мяжуе недзе са звыклай сялянскай прастатой. Сам гаспадар — каржакаваты, у рабочай куртцы... Прысеў за стол усё адно як забег на хвіліну. Удумлівы, сур'ёзны твар. Позірк светлы і чысты. Душою адчуваеш: такія людзі, калі аддадуцца справе — дык поўнасцю, і не саступяць, пакуль свайго не даб'юцца.

Дзверы то адчыняліся, то зачыняліся. У кабінет заходзілі спецыялісты калгаса, механізатары, жывёлаводы, пажылыя жанчыны, мужчыны. І ўсе да яго, старшыні:

— Пятровіч, парай!

— Пятровіч, памажы!

— Пятровіч, я да вас, як да свайго...

А яно так і ёсць — свой ён, іхні. Разам гадаваліся ў Навасёлках, разам пераадольвалі пасляваеннае бясхлеб'е, разам падымалі калгас, радаваліся агульным поспехам.

Васіль Пятровіч Яцкевіч да старшынёўства прайшоў доўгі шлях. Працаваў у хаце-чытальні. Пасля арміі пайшоў у вучылішча механізацыі. Рабіў прычэпшчыкам, трактарыстам. Затым завочна скончыў тэхнікум, потым акадэмію ў Горках. Быў інжынерам. І вось ужо дваццаць гадоў старшынёю.

— Хапае клопатаў? Вядома! Усё трэба прадугледзець, нават, калі хочаце, прадбачыць. Але, галоўнае, працаваць трэба — і самому і людзям. Толькі тады будзе толк. А людзі, скажу, працавітыя ў нас. Землі тут — пяскі ды супесі, аднак амаль па трыццаць сем цэнтнераў з гектара збажыны маем.

Ён падумаў трошкі, дадаў:

— Цяпер мы цвёрда на нагах стаім! У нас і самая высокая аплата працы ў раёне. Трактарыст у дзень зарабляе ў сярэднім дванаццаць рублёў, даярка — дзесяць. А ў асобныя месяцы ого якія заработкі

ў людзей! Гады чатыры як прыехаў з Украіны адзін механізатар — Мікалай Паўлаў. Ну, пасяліўся, стаў працаваць. Рабіў добра, не нахваліцца было, не нарадавацца. У канцы месяца прыходзіць у калгасную касу. Падалі яму ведамасць. Зірнуў чалавек, і аўтаручку адсунуў. «Опыска,— кажа касіру.— Такога буты не можа». Ледзь пераканалі Паўлава, што тыя семсот рублёў — яго, што ён іх зарабіў сумленнай працай, што няма тут ніякай ні апіскі, ні памылкі.

Старшыня зірнуў неяк па-новаму, спадылба, строга, нібы з дакорам. І крэсла пад ім ажно рыпнула.

— Ад дабра, кажуць, дабра не шукаюць,— сказаў ён.— Аднак на справе бывае інакш. Малады іншы ні з таго ні з сяго раптам падхопіцца — і ў горад. Прыстроіцца абы-куды і абы-кім і ў Навасёлкі прыязджае ўжо гогалем... Тут вінавачу сябе. Нешта недагледзеў, недзе прамашку даў. А ў нас жа, да ўсяго астатняга, мясціны якія прыгожыя! Працуй і адпачывай — радуй душу сваю маладую. Аднак...

Старшыня задумаўся.

Яцкевіч праўду сказаў пра тутэйшыя мясціны. За тыя дні, што давялося жыць у Навасёлках, неяк па-дзіцячы хінулася да гэтага краю і мая душа. Палі вакольныя — не суцэльная роўнядзь, на якой няма за што воку зачапіцца. Наадварот, нізінкі мяжуюць з пагоркамі, пагоркі — з пералескамі. То там, то тут віецца рачулка. А варта трапіць ва ўрочышча Кіскі — сэрца замрэ ад дзівоснага краявіду: сярод поля прытаілася блакітная азярына, дзе шмат рыбы. У прыбярэжных лозах і травах улетку сапраўднае птушынае царства. А ўзяць урочышча Дубіна ці Вербалоцце? А возера Круглае ці Зімнае? А рачулку Паненку?

Пра Паненку ходзіць сярод людзей такое паданне. Было тое ў даўнія часы, калі яшчэ на зямлі гэтай паны гаспадарылі. Дык вось, адзін з іх пачаў то так, то гэтак прыглядацца да Паненкі. Начэй не спаў, усё думаў, як падступіцца да яе. Нарэшце сам сабе ска-

заў: «Усе сілы пакладу, а прымушу, каб яна служыла мне!». І стаў насупраць двара свайго запруду рабіць. «Пабудую вялізны млын,— марыў пан.— Паненка будзе мне жорны круціць, жыта малоць. Пацягнецца сюды люд з усяго наваколля — з-пад Сіўкоў, Вялічкавіч, Паніквы, Крынак, Воўчына, нават і з-пад самага Высокага. А я буду пазіраць ды грошы за памол браць».

Толькі закончыў пан узводзіць тую запруду, як ноччу яму страшны сон прысніўся: нібы да яго ў пакоі рачулка Паненка ў выглядзе простай сялянкі з'явілася. У лапцейках лазовых, у сукенцы кужэльнай, а на галаве вянок з васількоў. Стала перад ім, узяўшыся ў бокі, і сказала:

— І не думай, пане, і не гадай. Не буду слугаваць табе. Лепей назад мне пацячы, чым табе жорны круціць. Не для таго на свет з'явілася! Вольнай хачу па зямліцы гэтай бегчы, простых людзей прыгажосцю сваёй цешыць.

Спалохаўся пан. Маўляў, дзе хто бачыў калі, каб рака ды чалавечым голасам гаварыла? Ды яшчэ гэтак гразілася!

Тры дні не выходзіў ён з пакояў. А выйшаў — за галаву схапіўся. Паненка, як і абяцала, прабіла сабе ля запруды новае рэчышча, абагнула панскі двор і бегла, пазваньваючы, у Буг...

Цяпер на берагах Паненкі, бадай, самае любімае месца адпачынку навасёлкаўцаў. Побач лес. Прырэчная лугавіна з вясны да восені ўсыпана кветкамі. Да вады збягае некалькі яроў. Плаціна, якую не так даўно пабудавалі, утварыла азярыну, з дна якой б'юць крыніцы. У выхадныя дні тут шмат людзей. Нават здалёк прыязджаюць. Хто пасядзець з вудай, хто проста так — адвесці душу на ўлонні прыроды.

— Аднак,— зноў паўтарыў Васіль Пятровіч,— у тым, што моладзь пакідае сяло, мне здаецца, вінаваты перш за ўсё бацькі. Я пра сябе ўжо казаў! Знядужыліся яны, пакуль выйшлі ў заможнікі. А ста-

лі імі — рашылі: няхай хоць дзеці адпачнуць! Грошай ім не шкадуюць, і тыя едуць па лягчэйшае, як ім здаецца, жыццё. Такі «клопат» бацькоў не зусім апраўданы, думаю. І яшчэ. Калі чалавек стаў заможней жыць, то іншы, мне здаецца, не ведае ўжо, што яму і трэба. Помню гады, калі прыходзілі да мяне і казалі: плаці па рублю ў дзень і нічога болей не трэба. А зараз па пяць даём — гэта тым, што на агульных работах, і, аказваецца, мала. Трэба па дзесяць-пятнаццаць!.. Раней казалі: пабудуеш клуб — моладзь і не зрушыць з месца. Пабудавалі. Кіно амаль штодзень, нярэдка артысты прыязджаюць, шэфы-пагранічнікі. А людзі толькі калі-нікалі ў той клуб заходзяць. Дык у чым жа справа?

— Мне думаецца,— сам сабе адказаў старшыня,— ці не першую скрыпку тут іграе псіхалогія селяніна. Асабістая гаспадарка яго трымае. Памяркуйце самі. Кароўка, свінні, авечкі, птушка розная — усё гэта дае сям'і дзвесце-трыста рублёў прыбытку. Плюс нейкіх сем соцень у месяц зарплаты на сям'ю. Гэта спакушае? Спакушае. І селянін упрагаецца ў работу, ён заняты па вушы. Для адпачынку — толькі сон.

— І, галоўнае, не адрачэцца ад свае гаспадаркі!

— Не. Традыцыя! І, я лічу, добрая. Не развучыліся працаваць на зямлі, не адвыклі ад яе. Але...

— Моладзь?

— Непаседлівасць яе часам падводзіць,— разважліва сказаў старшыня.— Паглядзіць іншае дзяўчо тэлеперадачу і загарыцца: ах, там гэтак, там так! Сарвецца з месца (пры дапамозе тых жа бацькоў) і паедзе. А неўзабаве вяртаецца, угнуўшы галаву. Аказваецца, і там тое ж: працаваць трэба!

Вочы Яцкевіча зноў зірнулі светла і чыста:

— Каб моладзі даць тут занятасць, як у горадзе, упэўнены: ніводзін не рыпнуўся б адсюль!

І паспрабаваў развіць думку:

— Мець бы ў калгасе філіял прамысловага прадпрыемства! Маладыя, асабліва дзяўчаты, папрацавалі б год-другі, перагарэла б у іх тая няўрымслі-

васць і далей усё ў сваю каляіну стала б. Бо чалавек ад зямлі доўга не зможа без яе. Яшчэ наконт механізацыі скажу. Не ўсюды і не ўсялякую работу машынамі выконваем. А трэба. У гэтым і задача, каб механізмы і ў полі, і на ферме працавалі на ўсе сто. Тады і чалавек уздыхне з палёгкаю. Бо праца на зямлі, як ні кажыце, усё ж цяжкая.

...Пакідаў кабінет старшыні і, прызнацца, думаў: такія раз на раз не трапляюцца. І словы яго не скаргай гучалі, а падобныя былі на праграму, праграму на наступныя гады. Яшчэ думалася: ён мэты сваёй, безумоўна, дасягне, таму што на жыццё глядзіць не павярхоўна, а дабіраецца да яго каранёў, да самай існасці.

Ноччу выпала пароша, а дзень выдаўся ціхі, сонечны.

Хадзіў вясковымі вуліцамі, хацеў вызначыць, якая прыгажэй глядзіцца, як раптам думка ўзнікла: у крайняй вёсцы і крайняя хата ёсць! Якая яна? Хто ў ёй жыве?

А хата тая за невялічкай пярэрвай, па той бок Сяльца, стаіць раскошна, вокнамі на ўсход, і ў чырвоны колер пафарбавана. Па ўсім відно: будаваў чалавек па-сялянску надзейна, каб і стаяла доўга і жылося ў ёй добра.

— Дык гэта Пятровіча хата! — сказала кабета, што ішла аднекуль з Гнядзькоў.— Старшыні нашага! Пабудаваў, калі яшчэ трактарыстам рабіў.

— А дзе вы жывяце? — пацікавіўся я.

Адказала неяк мякка — па-паляшукоўску, часам у множным ліку і адразу пра ўсё, што на душы мела:

— Мы таксамо бужане, таксамо ў Новосёлках жывэмо. На самой межы Белорусі. Жывэмо добрэ. А робімо ў колхозе «Усход» — самому богатому ў Каменецкім раёне. У колхозе «Усход»!

І пайшла, горда ступаючы па шырокай вуліцы.



# ГРАНІТ ПАЛЕССЯ

*Мікашэвічы ● Няўлоўны Муха-Міхальскі*
*Справаздача доктара ● Першы партызанскі атрад*
*Рызыкуючы жыццём ● Лёс вёскі Ленін*
*Прыгоды дзеда Панаса ● У Еўропе няма роўных*

Некалькі стагоддзяў таму назад тут стаяла тваністае балота і непраходны лес. Кажуць, першымі, хто адважыўся пасяліцца ў гэтым краі, былі ўцекачы з тэрыторыі сучаснай Літвы, Латвіі, Эстоніі, Расіі, якіх сагнала з родных мясцін цяжкая доля. Адваяваць у прыроды палоску зямлі было не так лёгка. Трэба было спляжыць лес, асушыць балота. На гэта трацілiся гады. Але вось ужо на высеках вырaслі першыя прыземістыя курныя хаты — з глінянай падлогай, чаротавай страхой. Хоць як, а жыць можна было.

Такія хаты з'явіліся і на беразе звілістай рачулкі Валхвы, што бегла ў матухну Прыпяць між Случчу і Ланню. Першым пасяленцам тут, як сцвярджаюць мясцовыя людзі, быў чалавек па прозвішчу Мікаш. Адсюль, відаць, і назва паселішча — Мікашэвічы.

Мікашэвічы, магчыма, і засталіся б глухой вёсачкай, каб не будаўніцтва Палескай чыгункі. Яе пачалі класці тут у канцы мінулага стагоддзя. На будаўніцтва дарогі з навакольных паселішчаў пацяг-

нуліся сотні, тысячы людзей. Палешукі як бы ўваскрэслі: з'явілася магчымасць зарабіць капейчыну.

А работа была нялёгкай — па пояс у тарфяной жыжцы. Не адзін загінуў тут, так і не ўбачыўшы таго дзіўнага каня, што есць вугаль, дыхае парай і цягне за сабою вунь ажно колькі вялізных вазоў.

Успамінаецца някрасаўскае:

...Видишь, стоит, изможден лихорадкою,
Высокорослый больной белорус...

І далей — як спагада, як вера, як надзея:

...Вынес и эту дорогу железную —
вынесет все, что господь ни пошлет!

У мястэчку Ленін, цэнтры воласці, па суседству з Мікашэвічамі, жыў памешчык Агаркаў. Ён быў увішным дзялком. Паколькі ўсе навакольныя лясы ад Случы да Хорастава, Мілевічаў, Гоцка былі яго ўладаннямі, памешчык пабудаваў у Мікашэвічах (чыгунка ж побач) тартак і фанерны завод. Прадпрыемства здаў у арэнду другому дзялку — Чудневу. У час рэвалюцыі Чуднеў уцёк за мяжу. У 1921 годзе, калі Мікашэвічы адышлі да Польшчы, зноў з'явіўся Агаркаў. На гэты раз, каб перадаць прадпрыемства франка-бельгійскай кампаніі «Ольза». Завод стаў самым буйным у Заходняй Еўропе.

Фірма «Ольза» праклала вузкакалейкі, каб лягчэй было падвозіць лес да завода. Але і гэтага, лічыла, мала. Пачалі капаць каналы. Таксама ўручную. Добраўпарадкаваннем мястэчка кампанія не займалася. На шмат якіх вуліцах стаяла непралазнае балота, па ім можна было прабрацца хіба што на чаўне. Улетку мікашэвіцкая дзетвара там кашамі лавіла ўюноў.

Людзі праглі іншага жыцця, змагаліся за іншую долю.

У памяці народнай і зараз яшчэ жывуць падзеі, звязаныя з імёнамі чырвоных партызан дваццатых

гадоў, асабліва з імем камандзіра атрада Мухі-Міхальскага (у сапраўднасці — Кірылы Арлоўскага).

Шмат баявых аперацый было на рахунку атрада. Партызаны разграмілі паліцэйскі ўчастак у вёсцы Чучэвічы, напалі на маёнтак у Кажан-Гарадку, разагналі паліцэйскіх, якія ахоўвалі панскія харомы ў Хораставе, уварваліся ў кантору акцыянернага таварыства «Лес» у вёсцы Навасёлкі і нарабілі там шуму-грому.

Аднак самы вялікі перапалох сярод белапольскіх акупантаў выклікаў налёт атрада Мухі-Міхальскага на пасажырскі цягнік, які ішоў з Брэста ў Лунінец. У цягніку знаходзіліся палескі ваявода Даўнаровіч, сенатар, епіскап, інспектар паліцыі і іншыя чыны, афіцэры і паліцэйскія. Было гэта ў верасні дваццаць чацвёртага года на раз'ездзе паміж Парахонскам і Лоўчай, за нейкіх сем вёрст ад Лунінца. Састаў быў затрыманы на некалькі гадзін. Палітычна скампраметаваны ваявода вымушаны быў накіраваць у Варшаву прашэнне аб адстаўцы. У народзе тады хадзілі розныя чуткі, а адбылося вось што. У прысутнасці ніжэйшых чыноў пан начальнік паліцыі Мянсовіч па загаду Мухі-Міхальскага публічна «пачаставаў» пана ваяводу Даўнаровіча «бярозавай кашай».

Польскія ўлады, якія былі не ў стане адшукаць няўлоўных партызан, помсцілі мірнаму насельніцтву. Па ўсяму Палескаму ваяводству дзейнічалі карныя экспедыцыі. У выніку чарговай аблавы, праведзенай паліцыяй, толькі ў вёсцы Сітніца неўзабаве было арыштавана дваццаць чатыры чалавекі. Аднак задушыць партызанскі рух белапалякі не маглі.

У Дзяржаўным архіве Брэсцкай вобласці захоўваецца справаздача ўрача Лунінецкага павятовага староства, складзеная 11 красавіка 1927 года. У ёй расказваецца, што амаль увесь павет размяшчаўся ў вялізнай забалочанай нізіне з цеснымі, раскіданымі

сярод балот, як астраўкі, населенымі пунктамі. А вакол іх — багна і лісцевы лес. Сельскае насельніцтва займалася выпасам жывёлы, а таксама працавала ў розных дрэваапрацоўчых кампаніях у цяжкіх умовах у лесе. Гарачай ежы не было, адпачывалі людзі ў цёмных бараках, на голых нарах. Гэтае насельніцтва насіла на сабе ўсе рысы фізічнага і інтэлектуальнага выраджэння.

У такіх жа ўмовах знаходзіўся палескі селянін і ў сваёй вёсцы. У сувязі з занадта малой плошчай сухой тэрыторыі, неабходнай людзям пад палі, самі паселішчы звычайна знаходзіліся ў нізінах, дзе жыццё магчыма было толькі ў сухое лета. Хаты будаваліся нізкія, малыя, звычайна з аднаго памяшкання, з невялікімі адтулінамі для акон і дзвярэй, каб не трацілася цяпло. Большасць такіх пабудоў падлогі не мела, яе замяняў пясок. Сцены, вядома, зусім не тынкаваліся. Мэбліроўка такога жылля складалася з дзвюх лавак уздоўж сцен, невялікай дошкі на козлах, якая служыла сталом, і драўляных нар для ўсёй сям'і без якой-небудзь пасцелі, толькі прыкрытых саломай.

Чацвёртая частка такой хаты звычайна была занята вялікай печчу. У такіх бедных хатах утрымлівалася зімою і хатняя жывёла. Ежай служылі амаль што выключна хлеб, бульба і невялікая колькасць саланіны як «афарбоўка» да ежы...

Нарэшце векапомны верасень трыццаць дзевятага прынёс збавенне. Толькі не доўга давялося радавацца. Над краінай навісла пачвара вайны...

Ужо ў канцы чэрвеня сорак першага Пінскім падпольным абкомам КП(б)Б па ініцыятыве Васіля Захаравіча Каржа быў арганізаваны партызанскі атрад Камарова (псеўданім Каржа). На базе яго ўзнікла пазней і Пінскае партызанскае злучэнне.

У злучэнне ўваходзіла сем партызанскіх атрадаў — Камарова, імя Кірава, Васільева, імя Шыша, Дамброўскага, імя Шчорса і імя Чапаева. Першая

сур'ёзная аперацыя была праведзена па разгрому варожага гарнізона ў мястэчку Ленін у верасні сорак другога. Пасля яе ўвесь былы Ленінскі раён быў ачышчаны ад акупантаў і стаў асноўным месцам дыслакацыі партызанскіх атрадаў.

А недзе праз месяц партызаны ўварваліся на станцыю Сінкевічы, што па той бок Мікашэвічаў, на лініі Брэст — Гомель, узарвалі чыгуначны мост цераз раку Лань. Вынік: забіта паўтары сотні гітлераўцаў, знішчаны эшалон з боепрыпасамі, выведзена са строю ўсё станцыйнае абсталяванне. Каля двух месяцаў па чыгунцы не хадзілі варожыя эшалоны.

Баявых аперацый на рахунку партызанскага злучэння сотні, тысячы. Не дзіўна, што яго камандзіру, партызанскаму генералу Васілю Захаравічу Каржу, яшчэ тады прысвоілі высокае званне Героя Савецкага Саюза.

Імёны многіх партызан пакрыты неўміручай славай. Шмат хто ўвайшоў у гісторыю як легендарны герой.

...У студзені сорак трэцяга ў невялікую вёсачку Навіна ўварваліся карнікі. Яны загадалі братам Цубам, немаладога ўжо веку людзям, каб тыя паказалі, дзе базіруюцца партызаны. Старэйшы, Міхаіл, адразу адмовіўся і быў тут жа забіты. Малодшы, Іван, згадзіўся. «Пакажу,— кажа,— калі вам так хочацца. Толькі ісці давядзецца даўгавата...». І павёў. Але зусім у іншае месца...

У Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ёсць карціна «Подзвіг Івана Цубы». Яна адлюстроўвае імгненні, калі гітлераўцы здагадаліся, што праваднік падмануў іх, што іх чакае пагібель. У вачах ворагаў разгубленасць. Погляд старога палешука спакойны: ні страху, ні шкадавання ў вачах яго. Толькі рашучасць...

Іван Самуілавіч Цуба пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Леніна. Вобраз мужных братоў увекавечаны ў камені. Помнік ім стаіць пры дарозе, што ідзе на Мікашэвічы. Імем Цубаў названа адна з вуліц у

мястэчку. Вёска Навіна перайменавана ў вёску Цубы.

Увогуле, тыя гады былі цяжкімі для Палесся. Толькі ў наваколлі Мікашэвічаў былі расстраляны многія вёскі.

...Лістападаўскім вечарам сорак другога ў Мікашэвічы прыехалі карнікі з суседняй вёскі Сітніцкі Двор (той самай, назву якой праз дзесяцігоддзі наведвальнікі Хатыні знойдуць на адзіных у свеце могілках вёсак) і ўсім гуртам — у кінатэатр. А там працаваў кінамеханікам Іван Канапацкі. Ён запрасіў паноў афіцэраў заняць цэнтральныя месцы, даручыў дэманстрацыю фільма свайму памочніку — немцу, а сам непрыкметна пакінуў памяшканне.

Не паспеў Іван дабегчы да суседняга лесу, як пачуўся выбух. Пазней, ужо ў партызанскім атрадзе, даведаўся: сорак тры фашысты забіты, астатнія — паранены.

У Мікашэвічы Канапацкі вярнуўся толькі пасля вайны, з баявымі ўзнагародамі. Да канца сваіх дзён працаваў там кінамеханікам.

У свой час кінастудыя «Беларусьфільм» зняла дакументальную стужку «Даешь кино!», адным з яркіх эпізодаў якой і з'яўляецца гісторыя подзвігу камсамольца Канапацкага.

Калі кінастужка паказвалася ў Мікашэвічах, колішні партызан-падпольшчык Іван Канапацкі быў у апаратнай і... на экране. У зале, як гаворыцца, не было дзе яблыку ўпасці. Глыбокая павага да адважнага земляка прывяла сюды гэтулькі людзей.

...Колькі слоў варта сказаць і пра Барыса Мікалаевіча Цельпука з вёскі Бострынь. Яшчэ ў першую сусветную вайну за храбрасць, праяўленую ў баях, ён быў узнагароджаны трыма Георгіеўскімі крыжамі. І ў Вялікую Айчынную паляшук не доўга думаў, як быць. Сам, жонка, пяць сыноў, пяць дачок — усе пайшлі ў партызаны і ваявалі на славу. Сем членаў сям'і Цельпукоў, у тым ліку і сам Барыс Мікалаевіч, за мужнасць і гераізм у барацьбе з акупантамі ўдастоены ўрадавых узнагарод.

Многія сотні іншых людзей Палесся, як маглі,

дапамагалі народу нашаму скінуць камень фашысцкага прыгнёту.

Нельга абысці маўчаннем і чалавека, які шмат гадоў аддаў удзячнай справе — пошукам дакументаў, пісьмовых і вусных сведчанняў пра гісторыю, развіццё і лёс населенага пункта Ленін, што ў васемнаццаці кіламетрах ад Мікашэвічаў. Імя яго Уладзімір Уладзіміравіч Баярын. Былы партызан, настаўнік, а цяпер старшыня савета Ленінскага народнага музея, ён жыве там жа, у вёсцы Ленін.

Давялося мець з ім хоць і не працяглую, але цікавую гаворку пра гісторыю Палескага краю. Трошкі пазней, дачуўшыся, што працую над кнігай-эсэ пра Беларусь, Баярын даслаў мне ліст, у якім прывёў нямала цікавых фактаў.

Першае ўпамінанне аб населеным пункце Ленін, піша Баярын, вядзе нас да XIV стагоддзя.

На карце адміністратыўна-тэрытарыяльнага дзялення «Беларусь у сярэдзіне XVI стагоддзя» таксама значыцца мястэчка Ленін.

У 1863 годзе тут было адкрыта Ленінскае аднакласнае народнае вучылішча.

У 1912 годзе ў склад Ленінскай воласці ўваходзіла пяцьдзесят сем населеных пунктаў.

26 кастрычніка (8 лістапада) 1917 года на тэрыторыі Ленінскай воласці была ўстаноўлена Савецкая ўлада.

18 сакавіка 1921 года ў адпаведнасці з вядомым дагаворам частка населеных пунктаў Ленінскай воласці, у тым ліку і яе цэнтр, адышлі да буржуазнай Польшчы.

17 верасня 1939 года ў мястэчку Ленін была адноўлена Савецкая ўлада, а на базе колішняй Ленінскай воласці ўтвораны Ленінскі раён з цэнтрам у гарадскім пасёлку Ленін.

У Вялікую Айчынную фашысцкая акупацыя гарадскога пасёлка працягвалася ўсяго нейкіх чатырнаццаць месяцаў. Але і за гэты час ворагі знішчылі звыш 3250 яго жыхароў.

12 верасня 1942 года партызаны разграмілі фашысцкі гарнізон у пасёлку і аднавілі Савецкую ўладу на тэрыторыі ўсяго Ленінскага раёна, дзе базіраваліся Пінскі падпольны абком КП(б)Б, абком камсамола, друкарня абласной газеты «Палеская праўда», Ленінскі і Лунінецкі райкомы партыі і райкомы камсамола, штаб Пінскага партызанскага злучэння. У цяжкую для нашага народа зіму сорак другога— сорак трэцяга гадоў у Ленінскай партызанскай зоне праходзіла нарада кіраўнікоў беларускіх і ўкраінскіх партызан. Тут нараджаліся планы чарговых рэйдаў, абмяркоўваліся пытанні каардынацыі баявых дзеянняў на тэрыторыі суседніх рэспублік, распрацоўваўся графік выкарыстання беларускіх партызанскіх аэрадромаў.

16 лютага 1943 года фашысцкія карнікі зноў уварваліся ў гарадскі пасёлак Ленін, ператварылі яго ў груды камянёў і попелу, спалілі 1200 жыхароў. Гэта былі ў асноўным дзеці, старыя і жанчыны, якія не змаглі ўцячы.

Пасля вайны адміністратыўным цэнтрам Ленінскага раёна стаў пасёлак Мікашэвічы, які цудам уцалеў. Паколькі гарадскі пасёлак Ленін не адбудаваўся, то на пачатку пяцідзесятых гадоў страціў статус гарадскога пасёлка, а ў 1960 годзе быў ліквідаваны і Ленінскі раён. Тэрыторыя яго была «расфарміравана» па трох абласцях — Брэсцкай, Мінскай і Гомельскай.

Цяпер вёска Ленін адраджаецца. З'явіліся новыя вуліцы — Ленінская, Рэвалюцыйная, 17 Верасня, Інтэрнацыянальная, Камсамольская, Савецкая, Лясная, Садовая, Маладзёжная, Новая. Пабудаваны магазіны, сталоўка, Дом культуры, пошта, камбінат бытавога абслугоўвання, сярэдняя школа, інтэрнат, участковая бальніца, аптэка, філіял музычнай школы, лясніцтва, ашчадная каса, народныя музей і бібліятэка. Насыпаны Свяшчэнны курган, устаноўлена некалькі мемарыяльных дошак, абеліскаў, якія прысвечаны гераічным падзеям, што адбываліся тут.

Мінула больш за чвэрць стагоддзя, як сышоў з

карты гістарычны Ленінскі раён, а людзі ніяк не могуць даць веры гэтаму. Думаецца, калі ўжо так сталася, што нельга вярнуць паселішчу статус райцэнтра, то, можа, варта стварыць тут Ленінскі народны музей пад адкрытым небам. Нашы нашчадкі (блізкія і далёкія) змаглі б убачыць доты, акопы, аэрадромныя пляцоўкі, адноўленыя партызанскія зямлянкі, партызанскую друкарню... Змаглі б дакрануцца душою і сэрцам да гэтай суровай і добрай зямлі. Прайшліся б па ёй у розныя поры года, убачылі б яе прыгажосць. Зразумелі б, як нялёгка было людзям у гады цяжкіх выпрабаванняў. На гэтай жа зямлі знітаваны ў адзінае і гераізм абаронцаў Брэсцкай крэпасці, і боль Хатыні...

Прыехаў у Мікашэвічы на зазімку. Браўся лёгкі марозік. Сонца хоць і не бачна было, але яно адчувалася — неба неяк нязвыкла свяцілася. Ціха апускаліся на зямлю сняжынкі, нібы выбіралі месца, дзе лепей легчы.

У старым паселішчы можна натрапіць яшчэ на хаціну, што дажыла да нашых дзён з даўніх часоў. Урасла ў зямлю па самыя вокны і побач з новымі дамамі здаецца прывідам. Убачыш там і Пангаласаўскі канал, пракапаны яшчэ некалі, каб сплаўляць па ім лес у Прыпяць. Берагі канала параслі альшынаю, лазою, парэчкамі. Усё гэта перавіў-пераплёў хмель. Вясною тут многа птахаў. Набрыдзеш і на сляды конак — даўжэзных насыпаў, што цягнуліся з лесу да рачных румаў ці на мясцовы тартак. А на вуліцы Партызанскай звернеш увагу на дзіўную прыземістую будыніну ў форме шматкутніка, з каптуром-стрэшкаю наверсе. Гэта — лядоўня, пабудаваная ў тыя часы, калі пракладвалі па тутэйшых балотах Палескую чыгунку. Убачыш і тыповыя паляшуцкія сядзібы, абнесеныя парканам, са стажком сена і балоцейкам у канцы дворышча.

Але не такая «панарама» характэрна для сённяшніх Мікашэвічаў. На тым беразе Пангаласаўскага

канала, на былым выгане, вырас у апошнія гады сапраўдны горад. Шырокія асфальтаваныя вуліцы. Светлыя пяціпавярховыя дамы. На ўскрайку — шыкоўны (пазайздросціць і абласны цэнтр!) Палац культуры. Трошкі далей, пры ляску, бальніца, а глыбей у лес — прафілакторый. Афіцыйна гарадку імя яшчэ ніхто не даваў. Ды людзі апярэдзілі ўрачыстасць — назвалі самі: Гранітны. Тут жыве за пяць тысяч чалавек, у асноўным сем'і гранітаздабытчыкаў.

А пачалося з таго, што за шэсць кіламетраў ад Мікашэвічаў геолагі адшукалі паклады граніту. Пласт у дзевяноста метраў! І на невялікай глыбіні. Здабычу яго адразу пачалі адкрытым спосабам. Нядзеля, 21 кастрычніка 1973 года, увайшла ў гісторыю Палесся: прагучаў першы выбух, у выніку якога быў атрыманы будаўнічы граніт.

Міналі дні, тыдні, месяцы, і на былым балоце, дзе раслі чэзлыя сасонкі, бярэзінкі, а на вышынках заўсёды было безліч грыбоў, дзе між купін асакі вадзіліся крыжанкі, утварыўся глыбокі кар'ер. Побач вырасла прадпрыемства па перапрацоўцы граніту. Па магутнасці яно самае буйное ў Еўропе. Дае ў год каля сямі мільёнаў кубічных метраў нярудных будаўнічых матэрыялаў.

Да аб'яднання «Граніт» вядзе шасейка. Гадоў пятнаццаць таму назад тут і дарогі такой не было, і лес быў інакшы, і пералескі, і балоцістыя нізінкі не такімі выглядалі. Неруш ляжала вакол. А цяпер то там, то тут падступаюць да шляху падцярэбленыя вольхі, сосны. Іншы раз стане і дуб. Нізінкі змяняюцца сухімі вышынкамі, з якіх на схілах высвечвае пясок-плывун. А елак не відно. «Тут не месца для елак,— успомніліся словы Баярына,— не растуць на гэтай зямлі».

Яшчэ ўспомнілася прыгода, што адбылася з тутэйшым дзедам Панасам, які аднойчы паехаў да кума пагасцяваць.

Пасядзеў за кумавым сталом Панас, а сцямнела — сабраўся дадому. Усеўся ў сані, ляснуў пугаю, і кабылка пабегла. Бяжыць яна, бяжыць, а Панас «Лявоніху» сабе насвіствае. Неяк нечакана агарнула дрымота. Дзед аслабіў ляйчыны, павярнуўся на бок і захроп. Раптам адчуў: зямля пад палазамі — круць! Потым яшчэ раз — круць! А тады і сані, і кабылка, і ён разам з палукашкам як паляцяць некуды, як паляцяць! Ні супыну, ні прыпыну.

Ці доўга імчаў гэтак — нікому невядома. А калі раптам сані спыніліся і Панас расплюшчыў вочы, то ўбачыў: кабылка спакойна стаяла пад... агромністай скалой. Справа да саней таксама падступалі высокія скалы. Яны вострымі пікамі ўпіраліся ў чорнае неба. А зверху лілося незямное святло.

Дзед пацёр вочы, але ўсё гэта і не думала гінуць.

— А куды ж гэта я, людцы мае, трапіў?!

Ад суседняй скалы аддзялілася нейкая істота і засмяялася:

— Вядома, на Месяц!..

У Панаса ажно мову адняло. Пазіраў на істоту ў бліщчастым скафандры і не мог уцяміць, што да чаго. А яна прымошчвалася ўжо на сані, побач з ім, і цікавілася:

— Адкуль жа ты ўзяўся тут?

Голас спакойны, спагадлівы. І пачало ў Панаса адлягаць ад сэрца.

— З Сітніцы еду. Ад кума.

Істота ажно зарагатала:

— Нямала адмахаў! Ой, нямала!

Панас зірнуў на месяцавы скалы і ўздыхнуў:

— Бачу, што нямала, бачу...

Калі на душы трошкі паспакайнела, запытаўся:

— А вы што? І поначы працуеце?

Адказу не пачуў, бо ля падножжа самай высокай скалы загрукатала нейкая аграмадзіна і, пыхкаючы дымам, пачала ўгрызацца ў каменную камлыгу, а тады стала кідаць тыя камяні ў вялізную скрыню. Заварушылася скрыня, папаўзла ўгору, на самы край неба.

Калі грукатня трошкі спала, дзед пачуў:

— Вось такімі «лунаходамі» і вывозім граніт з кар'ера. Наверсе патрушчаць яго, прасеюць і атрымаецца шчабёнка. Пагрузяць у вагоны і павязуць, куды трэба.

— А ў вас і чыгунка е?

— А як жа! І порт у дадатак. Канал ад ракі праклалі...

Каб не выглядаць недасведчаным чалавекам, Панас прамовіў:

— Каналы — любата! У нас на Палессі таксама іх нямала. Яны ваду рудую сцягваюць, балаты асушаюць.

Але той нібы і не слухаў:

— І людзі, скажу, во як працуюць! Многія ў вялікай пашане ходзяць. Экскаватаршчык Мажараў, машыніст Караўка, узрыўнік Чайкоўскі...

— Глянь ты! — ускрыкнуў Панас.— І прозвішчы, як у нас, на Палессі!

І раптам стаў прасіцца:

— Браток, а як жа мне дадому вярнуцца?

— А мы цябе зараз назад і адправім! — зноў засмяяўся хлопец у скафандры і ўзяў у рукі лейцы.— Нно-о, Гнядая! Уключай трэцюю касмічную!..

Ад прадчування новай нечаканкі стары Панас заплюшчыў вочы, стаіўся. І зноў адчуў неверагоднае. Сані спачатку паволі крануліся, потым падскочылі і паляцелі ўгору. Раптам — стоп! І чуецца той жа вясёлы голас:

— Вось ты і на сваім Палессі!..

Панас зірнуў туды, сюды і нарэшце зразумеў, у якую канфузію трапіў. Ён сарваў з галавы аблавушку і кінуў вобзем:

— Ах, ядры цябе корань! Хіба ж так жартуюць?!

Зірнуў на хлопца і ўжо дабрадушна дадаў:

— І чуў жа не раз пра вашу работу, а, бачыш, і сапраўды быў падумаў, што на Месяц трапіў...

А вось і я на тым месцы, дзе гадоў колькі таму назад адбылася вясёлая прыгода з дзедам Па-

насам. Стаю на краечку кар'ера і дзіўлюся: за гэты час ён набыў памеры неверагодныя. Уявіце сабе місу, дыяметр якой каля дзвюх тысяч метраў, а глыбіня — каля сотні. То з кар'ера, то ў кар'ер па спецыяльнай дарозе ідуць самазвалы. Там, глыбока ўнізе, працуюць магутныя экскаватары. З даўжэзнай стралой экскаватар увіхаецца і на тым краі «місы» расшырае яе — адносіць каўшом пясок-сыпун далей ад гранітных выступаў. Процілеглы схіл таго агромністага катлавана парэзаны на тэрасы. На іх таксама ўвіхаюцца экскаватары, самазвалы, якія здаюцца цацачнымі.

Спускаюся па дарозе ўніз. Дзесяць метраў, сто, трыста. Не вытрымліваю, спыняюся, пазіраю ўгору. Над галавою, вунь ажно куды, падымаюцца стромыя скалы, усе ў трэшчынах, стыках, нібы складзеныя з вялізных гранітных камлыг. Відовішча незвычайнае. У сонечных промнях кожная скала па-свойму свеціцца, мае свой колер. Па шчылінах злятаюць да падножжа дзесяткі малых і не вельмі малых вадаспадаў. Гэта там, наверсе, на балоце, пачаў раставаць сняжок.

У адным месцы, на самай кромцы гранітнай скалы, стаяць бярэзінкі, сасонкі. Нібы таксама цікавяцца: а што тут, унізе? Адсюль яны выглядаюць маленькімі і танюсенькімі — як запалкі. У сэрцы нараджаецца спачуванне: прыйдзе час, кар'ер пашырыцца, і дрэў гэтых не стане...

А самазвалы ідуць, ідуць. Паражнякі імчаць хутка, а гружаныя падымаюцца цяжка і паволі. Граніт адсюль ідзе ажно ў пяцьсот адрасоў, у асноўным у гарады нашай рэспублікі. Ужо адпраўлена каля шасцідзесяці мільёнаў кубічных метраў гэтага каштоўнага будаўнічага матэрыялу.

Параўноўваю лічбы, аналізую ўбачанае і міжволі ўзнікае думка: як такое пад сілу чалавеку?

Выходзіць, пад сілу.

Вяртаўся дадому, і з найвялікшай павагай успаміналіся імёны першапраходцаў гэтага краю, тых, хто ў

ліхую часіну не скараўся няволі, хто жыццём, працай краю свайму маладосць вяртаў. Згадаўся верш паэта, якога дала нам палеская зямля,— Віктара Гардзея. Сімвалічна гучаць сціплыя радкі:

Тут, у лясах, быў вораг часта біты,
І не было людзей за нас цвярдзей.
Цяпер не дзіўна:
Гэта ад граніту
Такая моц і мужнасць у людзей.

Знайшлі паклады выкапняў карысных:
Руда і соль, і цвердзь падземных скал...
Стаяць майму Палессю непахісна,
Калі такі трывалы п'едэстал!



# БЕЛАВЕЖА

*Дзе жылі ятвягі ● Трагедыя насельнікаў пушчы ● Вернасць дынастыі Нараў ● Зімовыя грыбы ● Людзі адкрытых сэрцаў Страшны сон*

Ноччу выпаў сняжок. Прыкметна пабялелі і без таго белыя бярэзіны. Выразней сталі глядзецца камлі сосен. А чорная вольха так і крэсліць неба графікай галін.

Пасвятлелі ельнікі. На кожнай яліне вунь колькі снегу! Белы колер у спалучэнні з зялёным вельмі пасуе дрэвам. Дубровы таксама выглядаюць урачыста. Ствалы дубоў імкнуць увысь, і кожны з іх заканчваецца нібы каронай — мудрагеліста перакручанымі галінамі. Снег, што наліп на іх, ажно ззяе ў сонечных промнях.

На доле таксама ўсё выглядае казачна. Колькі колераў адразу бачыцца ў лесе! Нібы там папрацаваў удумлівы мастак, На белым фоне залаціцца лушпавінка сасновай кары. Прабіваецца скрозь снег пажоўклы пучок зуброўкі. Схілілася і паблісквае серабрыстымі вочкамі колішніх кветак галінка верасу. Аднекуль апусціўся кляновы ліст, чырвоны, як гусіная лапка. Рабінавы камялёк абвіла зелянюткая

ліяна, што не скінула лісця нават узімку. Хораша глядзяцца імхі. На дрэвах, на пнях, на каранях выварацняў яны, прыцярушаныя снегам, здаюцца аксамітнымі.

А хто асыпаў сняжок з яловай лапы? Дык гэта ж вавёрка! Натапырыла кутасікі вушэй, прыкрылася хвастом-пухавічком і паблісквае чорнымі вачанятамі: маўляў, не падыходзь! Шышкамі закідаю!

Суседнюю паляну перасекла сям'я вепраў — чорная матка і паласатыя падсвінкі. Следам, горда трымаючы галінастыя рогі, з асінніку выйшаў алень. Ён вывеў за сабою аленіху, двaix ладных ужо алянят. Усе чацвёра пастаялі, прыслухаліся да пушчанскай цішыні і пайшлі назад, у асіннік.

Хвілін колькі не было відно нікога. Ды вось падняла лямант сарока. Яна паведамляла: на паляну імчыць статак зуброў! Яны яшчэ на прасецы, а тупат ужо чуцён. Зямля гула гудам. Трашчаў, ламаўся падлесак. Карані векавых дрэў ажно стагналі.

А статак ляцеў, гатовы сцерці на сваім шляху ўсё. Ды раптам, як хто яму каманду падаў, спыніўся. І толькі натужнае, адрывістае хэканне чулася над палянай.

— Гоп-гоп! Гоп-гоп!..— данеслася з другога боку.

Гэта прасекаю ехаў егер і клікаў зуброў. І яны паслухаліся. Пастаяўшы трошкі, паважна пайшлі туды, дзе мільгалі за дрэвамі сані з духмяным сенам.

Тады толькі ў «каронах» дубоў, верхавінах елак і бярэзін пачулася ўсё адно як музыка — зімовы вецер гуляў там адкрыта, вольна.

Сын палясоўшчыка Мікола Гусоўскі больш за чатыры стагоддзі таму назад пісаў:

Музыка нашых лясоў мілагучнасцю строгай
Вуху і сэрцу мілей за літаўры і ліру...

Яно так. Дзіва што калісьці пад шатамі гэтых дрэў вясну і лета правёў вялікі рускі пейзажыст

Іван Іванавіч Шышкін і зрабіў некалькі эцюдаў з натуры. Дзіва што ў пушчы ствараў вядомыя літаграфіі Антон Іосіфавіч Каменскі. Дзіва што ўжо ў нашы дні працаваў тут Мацвей Захаравіч Беляніцкі і даў свету серыю жывапісных карцін.

Яна, Белавежа, у кожнага пакідае след, свой, адметны, непаўторны. Едуць сюды літаральна з усяго свету. А потым жывуць ёю доўга — ці не ўсё жыццё.

«Ты даруеш, адна — усім, такія незабыўныя сустрэчы, слаўная прамаці лясоў нашых — векавечная Белавежа... Каб сэрцы тваіх наведвальнікаў раптам забіліся радасна, узнёсла ад сутыкнення з жывой дзявочай тваёй даўніной». Гэтыя словы ўдзячнасці пакінуў у кнізе ганаровых гасцей Белавежы паэт Алег Лойка. Там ёсць і запісы тройчы Героя Савецкага Саюза маршала авіяцыі А. І. Пакрышкіна, касманаўтаў А. С. Елісеева, У. А. Шаталава, П. Р. Паповіча, В. У. Церашковай, П. І. Клімука, вядучага тэлеперадачы «У свеце жывёл» М. М. Драздова... «Упершыню наведалі гэты сапраўдны цуд прыроды, жамчужыну нашай Радзімы — Белавежскую пушчу. Перажылі непаўторнае пачуццё захаплення і радасці...» — так напісалі ў кнізе Аляксандра Пахмутава і Мікалай Дабранраваў. Тыя пачуцці радасці выліліся потым у цудоўную музыку і не менш цудоўныя словы ўсім вядомай песні пра Белавежу.

А што ўяўляла сабою Белавежа некалі?

Гісторыкі сведчаць: пра гэты кут зямлі нашай ведалі ў старажытныя часы. Яшчэ Герадот пісаў аб Нурскай зямлі і неўрах, якія сяліліся па рэках Нараву, Лясной, Нараўцы. Тады пушча займала значна большую тэрыторыю, багатым быў яе жывёльны свет. Тут жыло выключна адважнае і мужнае племя ятвягаў — група заходнебалцкіх плямён, этнічна блізкіх да сучасных літоўцаў. Насялялі яны тэрыторыю, якая ляжала між сярэднім цячэннем Нёмана і верхнім цячэннем Нарава. Суседнічалі з ятвягамі крывічы, дрыгавічы, бужане, мазаўшане.

Пасля ўтварэння Русі пачынаюцца паходы кіеўскіх і іншых рускіх князёў на ятвягаў. У старажытным летапісе запісана: «...иде Владимир на Ятвязи и победи Ятвязи и вся землю их...» Кіеўскі князь забіраў ятвягаў у палон тысячамі, а на месцах знішчаных лясоў сяліў сваіх людзей.

У XIII стагоддзі на пушчу нападаюць татары і нямецкія рыцары. Татарскія полчышчы Батыя дайшлі да Гродна, Ваўкавыска, Слоніма. Літоўскі князь Міндоўг пацясніў іх і неўзабаве сам заняў Белавежскую пушчу.

Для абароны сваіх уладанняў ад нямецкіх крыжаносцаў і літоўцаў князь Уладзімір Валынскі рашыў на заходнім памежжы пабудаваць горад-крэпасць. Выбраць месца ён даручыў рускаму дойліду Алексу. У Іпацьеўскім летапісе пра гэта гаворыцца: «И посла Володимиръ мужа хитра именем Алексоу, иже бяше и при отци его многы города роубя... Князь же сам еха с бояри и слоугами, и оулюби место то над берегом рекы Лесны и отреби е, и потом сроуби на нем город, и нарече имя емоу Каменець, дане бысть земля камена... Създаж вь нем столпь каменъ высотою 31 сажней. Подобен оудивлению всем зрящим на нь». (Вежу потым сталі называць Камянецкі стоўп, Белая вежа. Там цяпер філіял Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея.)

Цяжкія паражэнні ятвягам у тыя часы наносілі выключна ўсе — і татары, і крыжаносцы, і літоўцы, і палякі, і рускія. Але калі па пушчанскай зямлі пракацілася хваля страшэннага голаду, горды народ папрасіў дапамогі не ў каго-небудзь, а ў рускіх — накіраваў сваіх паслоў да князя Уладзіміра Валынскага. Паслы заявілі: прыехалі мы да цябе ад усіх ятвягаў, спадзеючыся на бога і тваё здароўе. Не памары нас, пашлі нам жыта сваё на продаж, і мы з радасцю станем купляць, што хочаш, тое і будзем даваць: воску, вавёрак, баброў, чорных куніц і зуброў...

Як мужна ні трымаліся ятвягі, усё ж не змаглі абараніць права на сваю зямлю, на пушчу, на месца

пад сонцам. Шматлікія і больш увішныя суседзі перамаглі. Літоўскі князь Тройдэн у 1281 годзе нанёс ятвягам канчатковае паражэнне. А ў самым канцы трынаццатага стагоддзя апошніх ятвягаў, якія хаваліся маленькімі групамі ў нетрах пушчы, знішчылі палякі. Аб гэтым мужным народзе засталіся толькі ўспаміны ды назвы паселішчаў і ўрочышчаў: Вялікая Ятвезь, Малая Ятвезь, Язвінская Гара, Язвіны, Язвінка і іншыя.

Потым пайшло знішчэнне звера.

Апошняя турыца загінула ў 1627 годзе.

Еўрапейскі высакародны алень поўнасцю знішчаны ў пушчы ў другой палове васемнаццатага стагоддзя. Таксама засталіся толькі назвы ўрочышчаў: Аленева гара, Аленеў бор.

На пачатку дзевятнаццатага стагоддзя ў пушчы зніклі бабры.

У 1878 годзе забіты апошнія тры мядзведзі.

Астатні зубр, які жыў на волі, быў забіты ў Белавежы браканьерам у 1919 годзе.

Знішчалі звера хто хацеў, калі хацеў і колькі хацеў. Дазволю сабе прывесці некаторыя лічбы. За два дні ў кастрычніку 1860 года цар Аляксандр II і яго світа забілі 28 зуброў, 23 вепры, 36 казуль і шмат іншых звяроў. Цар Мікалай II у час палявання з 18 па 30 жніўня 1900 года таксама вызначыўся: адных толькі зуброў было забіта 40.

Зубр — сімвал запаведнага краю — заўсёды быў гордасцю нашага народа. Не дарма ж Мікола Гусоўскі яшчэ ў XVI стагоддзі напісаў пра яго класічную паэму — «Песню пра зубра». Вось пакладзенае на беларускую мову Язэпам Семяжонам апісанне велічы зубра:

Волатным целам сваім ён настолькі вялікі,
Што, калі раняць смяротна і ранены ўкленчыць,
Трох паляўнічых садзіцца ў яго між рагамі.

Лютасцю больш небяспечны, чым люты
драпежнік,
Зубр для людзей не страшны, не чапай —
не зачэпіць...

Ходзіць спакойна і раптам у бегу імклівым
Ён, як рысак, пралятае праз гала лясное.

А вось пра паляванне на яго:

Стрэламі ўтыканы ў скабы і ў грыву,
як пер'ем,
Зубр вокамгненна рвануўся ў гушчар, а з засады
Коп'і і пікі шыбнулі лаўцы, і ўпілася
Сталлю булатнай у цела звярынае зброя.
Ён страсянуўся — не строс,
і на ўсю сваю пашчу
Сіпла рыкнуў, закружыўся, падскочыў і — ходу.

Нарэшце, пасля доўгай пагоні:

Вось ён, удар сакрушальны! Схіснуўся і пысай
Тыцнуўся ў снег і прыкленчыў, нібы пакланіўся
Шумнай дуброве: «Даруй, мая родная, ўсё мне».
Недзе сябры зараўлі, пракацілася рэха —
Нават і ў пушчы свой звычай,
свой звон памінальны.

І як загад, як просьба, як заклён, як малітва:

Спынім забойствы! Сумленне, і розум, і гонар
Уладна загадваюць кніжніку: як са званіцы,
Бі ў сваё звонкае слова, узбройвай народы
Супраць разбою!

Намеснік дырэктара Дзяржаўнай запаведна-паляўнічай гаспадаркі «Белавежская пушча» Мікалай Іванавіч Буднічанка расказаў мне, што задача навуковага аддзела, якім ён кіруе, заключаецца ў тым, каб вывучаць дынаміку развіцця расліннага і жывёльнага свету, уплыў гаспадарчай дзейнасці на комплексы пушчы, тэрыторыя якой (савецкая част-

ка) складае амаль 88 тысяч гектараў. З поўначы на поўдзень пушча працягваецца амаль на 70, а з усходу на захад — ад 10 да 30 кіламетраў. Тут каля 900 відаў раслін, 285 відаў звяроў і птушак. Самыя буйныя рэкі — Нараў і Лясная. Але найважнейшы клопат вучоных, усіх работнікаў гаспадаркі — аднаўленне і павелічэнне пагалоўя зуброў...

Пра ўсё гэта не раз чулася, не раз чыталася. Таму хацелася папрасіць Буднічэнку стаць не нейкі час маім гідам, каб сваімі вачыма пабачыць усё. Выказаць такую просьбу я не мог: заняты ж чалавек! А ён узяў і сам прапанаваў: «Лепш раз убачыць, чым сто разоў пачуць!..». І неўзабаве мы адправіліся ў падарожжа.

Шафёр Юрась, малады яшчэ хлопец, спраўна вёў машыну. Насустрач, уздоўж прасекі, беглі высокія дрэвы. Там, уверсе, кроны іх перапляліся, і здавалася, што едзем незвычайным тунелем. Лес трапляўся розны: то меднаствольны сасновы бор, то ельнік, то асіннік, то альшыннік. З'яўляліся і прагалы, сям-там устаўленыя, нібы для акрасы, маладымі елачкамі ды бярэзінкамі. А потым зноў выскакваў насустрач карабельны бор.

Нарэшце Юрась тармазнуў. Па левы бок ляжаў паламаны, пакручаны сасоннік — след нядаўняй буры, справа сцяною стаяў магутны дрымучы лес. Пад яго шатамі было як шарай гадзінай. Мы выйшлі з машыны.

Вось яна, сапраўдная Белавежа! Не адну сотню гадоў настойліва, упарта цягнуцца да сонца дрэвы. Іхнія верхавіны перапляліся ў небе, ловяць промні, прымаюць на сябе вятры, умываюцца дажджамі. І служаць зямлі: даюць ёй цень, укрываюць ад маразоў іглiцаю і лісцем. А прыйдзе час — прыкрыюць і сабою. Праз год-два абрастуць зялёным імхом і будуць ляжаць вунь ажно колькі — пакуль зямля не прыме іх канчаткова. А побач пачнуць падымацца, цягнуцца да сонца маладыя дрэўцы — наступнікі тых, што палеглі. І будуць, як і яны, лавіць промні, прымаць на сябе вятры, умывацца дажджамі, каб

потым, праз сотні гадоў, таксама ўсё аддаўшы зямлі, пакланіцца ёй у апошнім паклоне...

Вернасць дынастыі?

— То ж мо так і людзі палясоўныя...

Мікалай Іванавіч пазірае на мяне, кажа:

— Тут, сапраўды, традыцыя існуе: калі бацька быў лесаводам — лесаводам будзе і сын, і сынаў сын. Узяць хаця б Смактуновіча, што з Нямержы. Бацька яго, Сямён, калісьці ў леспрамгасе працаваў. Сам Анатоль сорак гадоў лесу аддаў. На пенсію з пасады ляснічага пайшоў. Цяпер там яго сын, Яўген, працуе ляснічым. У Яўгена два хлапчукі растуць — Дзіма і Павел — малыя, а туды ж, у лес, пазіраюць. Дынастыя! — ён усміхнуўся.— А Саевічы з Ясеня? А Шахалевічы? Ды і дырэктар наш, Сяргей Сяргеевіч Балюк. Сын лесаруба, сам працаваў лесарубам, завочна закончыў тэхналагічны інстытут, дзесяць гадоў працаваў памочнікам ляснічага, столькі ж ляснічым і вось ужо сем гадоў як узначальвае Дзяржаўную запаведна-паляўнічую гаспадарку. Заслужаны лесавод рэспублікі. А сын яго, Аляксандр, пасля інстытута працаваў ляснічым, зараз — старшы інжынер упраўлення лясной гаспадаркі аблвыканкома. Другі сын, Мікалай, таксама тэхналагічны заканчвае. Так што, бачыце, традыцыю даўнюю не парушаюць і Балюкі...

Нашу гаворку чуў Юрась. Калі селі ў машыну, ён, нібы між іншым, прамовіў:

— Дык і ў вашай сям'і, Мікалай Іванавіч, традыцыя гэтая не парушаецца. І вы лесавод, і сын ваш, Сяргей, і абедзве дачкі пасля тэхналагічнага працуюць па профілю... Таксама дынастыя!

— Усё ты ведаеш! — засмяяўся Буднічэнка і пасяброўску паляпаў Юрася па плячы.— А вось ці можаш трапіць да нашага волата?

Да дуба-веліканa Юрась трапіў. Праз колькі часу мы стаялі ля незвычайнага дрэва і дзівіліся. Вышыня ж якая! Ажно трыццаць метраў. Дыяметр — два метры. Узрост — шэсцьсот пяцьдзесят гадоў! Не адна маразабоіна прайшлася па камлі гэ-

тага волата. Не раз яго хвастаў пярун. Памерыцца сілаю спрабаваў і вятрыска. Аднойчы ўсё ж удалося яму — адкруціў галіну. Знізу яна — так сабе, здаецца, рукою абхопіш. А на зямлі ляжыць абломак — бервяно ды яшчэ якое!

— Каб дрэва магло гаварыць! — раздумліва прамовіў Юрась.

Хацелася пацікавіцца, што ён меў на ўвазе, але пачаў расказваць Мікалай Іванавіч:

— Два гады таму назад я сабраў пад ім пуды са два жалудоў. Буйных, адзін у адзін. Пасеяў. Узышло за чатырыста адборных саджанцаў. Ужо так падняліся — вока радуецца!..

— Выходзіць, слаўнай дуброва будзе! З дынастыі волатаў,— сказаў Юрась і сам узрадаваўся сваёй дасціпнасці.

Неўзабаве пад'ехалі да зубрынай паляны. Я адразу пазнаў яе, сказаў, што ўжо быў тут, бачыў, як імчаў па ўмёрзлай зямлі статак зуброў. Буднічэнка толькі скоса зірнуў, аднак папрасіў Юрася прыпыніцца.

То там, то тут бачны былі зубры. Адны ляжалі і здалёк здаваліся кучамі торфу на белым полі. Другія, сабраўшыся па два-тры, стаялі, набычыўшыся, нібы штосьці абдумвалі. Гэта зубрыцы. Паблізу іх круціліся цяляты — ад пярэзімкаў да зусім яшчэ малых. А там, далей, пад векавым дрэвам застыў чорнай камлыгай стары зубр. Няўжо адзінец?

Калі зубр састарыцца, калі карагодзіць пачнуць маладзейшыя, ён, умудроны жыццём, раптам адчуе, што страціў галоўнае, моўчкі пакідае тое месца, дзе нарадзіўся, жыў, і ідзе прэч ад свайго і сваіх. І ходзіць-блудзіць па пушчанскіх лясах ці доўга стаіць дзе-небудзь пад старой ялінай, як скала, як цень. І днём, і ноччу, і тыдзень, і месяц. І гады — адзін. Яго і завуць адзінцом...

А вось і язярцо. Яно завецца ўсё роўна як на ятвяжскі лад — Ляцкія. Невялікае, усяго якіх дзвесце пяцьдзесят гектараў. Ужо ў наш час зроблена на Пераваloцы — прытоку Лясной. Мае з дзесятак

астраўкоў. Здаецца, для пушчы гэта дробязь. А як змянілася жыццё ў яго наваколлі! Пасяліліся тут бабёр, андатра, выдра, норка, амаль усе віды качыных, лебедзь. Паблізу аблюбаваў сабе дрэва чорны бусел. У суседнім балоце жывуць журавы. Сёлета засяліўся і шэры гусь. Бачылі яго з вывадкам.

Азярцо — запаведнае. Тут вядуць свае назіранні пушчанскія навукоўцы. Зараз яно пакрыта тонкім лёдам, прысыпана сняжком і здаецца раўнюткім полем.

Колькі тае язды на машыне, і мы ўжо на рацэ Нараў. Яе, адзіную ў Белавежы, не закранула меліярацыя. Свой выток бярэ, як і Ясельда, на паўночным усходзе пушчы, у заказніку «Дзікае», і перасякае ўвесь лясны масіў. Ясельда, наадварот, імкне направа, з пушчы, у кірунку Бярозы і Целяхан. Там, на «Дзікім» — водападзел.

На левым беразе ракі Нараў стаяць вёсачкі Нямержа, Ціхаволя. На правым — Рудня, Дабраволя. А далей ад іх — Ятвеск, Ятаўцы. Тубыльцы лічаць, што рака ў тым месцы некалі падзяляла ўладанні палешукоў і ятвягаў.

Нараў яшчэ не стаў. Імкліва гнаў сваю ваду між палогіх берагоў. Да самай ракі падступалі то лес, то лугавіна, то зарасці лазавіння, укрываючы яе ад сонца. Некалі, яшчэ да вайны, Нараў славіўся рыбаю. Сані з марожанымі шчупакамі, увязаныя-перавязаныя вяроўкамі, можна было сустрэць сярод зімы пад Поразавам, Ружанамі, Косавам — даволі нават далёка ад гэтых мясцін.

— Цяпер не тое,— задумліва прамовіў Буднічэнка.— Дзейнасць чалавека паўплывала!

Надыходзіў вечар. Трэба было вяртацца. Аднак Мікалай Іванавіч сказаў Юрасю:

— Заскочым у Жаркаўшчыну, праведаем Ткачовых, а тады — прамым ходам дадому, у Камянюкі.

Жаркаўшчына з'явілася неяк адразу. Пушча быццам адсунула векавечныя дрэвы і паказала сядзібы. За дамком мясцовага лясніцтва і стаяла хата Ткачовых. Васіль Андрэевіч быў у двары, каля машыны.

Высокі, шырокай касці, у фуфайцы і аблавушцы, ён ладкаваў нешта ў маторы. Убачыўшы нас, прывітаўся, кінуў слова-другое пра жыццё-быццё, выцер пакляю далоні і сказаў:

— Хадзем у хату!

Буднічэнка аднекваўся, казаў, што заехаў праведаць, ці жыў-здароў былы ляснічы, аднекваліся і мы с Юрасём. Выйшла на парог гаспадыня:

— А ў нас сёння свежына! — паведаміла яна.— Грыбочкі ўстаяліся. У печы вунь кашанка млее. Работа — работай, а пра естку таксама забываць нельга!

Гэта падзейнічала, і мы здаліся.

Хата Васіля Андрэевіча — прасторная, на дзве палавіны. Куды ні зірні — усюды сведчанні таго, што гаспадар паляўнічы. На сценах — трафеі: ласіныя і аленевы рогі, пад столлю лунае арол, на суку, пры сцяне, прымасціўся чорны, як смоль, цецярук, на падлозе — распластаная шкура дзіка.

— А ён у мяне такі! — кроячы хлеб, хваліла мужа гаспадыня.— На пенсіі не паспеў і трошкі пабыць, зноў на работу пайшоў. Начальнікам пажарна-хімічнай станцыі. У сваім жа лясніцтве.

Гаспадар перабіў яе:

— Ну то сядайце. І як дома будзьце!

Сапраўды, адчувалася, нібы трапіў дадому — да маці. Стол устаўлены рознай ядою. Пасярэдку — міса бульбы. Побач — патэльня свежыны. За ёю — міса кашанкі. Трошкі далей, у літровым слоіку — грыбы.

Блакітныя вочы гаспадара ўспыхнулі радасна: ну і Апанасаўна! Не падвяла!

А Лідзія Апанасаўна, сядаючы з краечку, казала:

— Частуйцеся. Ешце. Усё свежанькае. Усё смачненькае.

Праз хвіліну пачала хваліцца:

— Мы ўсяляк робім грыбы — і сушонымі, і салонымі. Толькі не марынуем. Бо марынаванне — што марнаванне. Я болей раблю па-тутэйшаму, папушчанску. Перабяру грыбочкі, злёгку адвару, залью

тамацікам са смажанай цыбулькай, солі трошкі ўкіну, лісціку-перчыку, алеем запраўлю. І ўсё гэта яшчэ гарачанькім — у слоікі. Адкрыеш потым — ці хоць так бяры еш, ці з бульбай.

Сапраўды, грыбы па-пушчанску з сопкай пушчанскай бульбай былі — смачней не трэба. Мікалай Іванавіч хваліць, хваліць Юрась, хвалю і я. Гаспадыня задаволена, гаспадар — таксама. А вось яна ўжо і пра кашанку расказвае:

— У нас завядзёнка такая: калі заколем кабанчыка, то спярша вантробкі спажываем. У іншых мясцінах, чула, іх выкідваюць. А я — не. Я з вантробак часцей кашанку раблю. Адвару лёгкае, сэрца, касу, ныркі, а пячонку — не, яна гаркавіць ды цвёрдасць дае кашанцы. Дык, значыць, адвару ўсё гэта, потым пакрышу дробненька, дабаўлю туды кашы грачанай ці, як няма грэчкі, ячнай, перамяшаю — і ў тоўстыя кішачкі. Пазавязваю канцы, каб не ўцякло, і ў печ. Потым — на лаву і пад гнёт. А тады рэж ды еш. Хочаш халоднай, а хочаш падсмажанай. Толькі парэзаць трэба лустачкамі. Кашанка і такой, і такой смачная. Ну, ці не праўду кажу? Як вы, спадабалі кашанку маю?

Кажу: яшчэ як спадабаў! У нас, кажу, некалі мама рабіла такое смакоцце. Яна родам з таго, паўночнага, краю пушчы, што Ружанскаю завуць. Таксама ў сям'і палясоўшчыка расла... Толькі не кашанкаю называла — вантрабянкаю. Бо кашу дадавала толькі ў крывянку.

Апанасаўна слухае ўважліва, ківае ў знак згоды галавою, але аддае перавагу кашанцы — яна не прыядаецца. Улучае момант і на маю талерку кладзе яшчэ два кусы кашанкі — такой і падсмажанай. Паспрабуй, адмоўся!..

Пакідалі гасцінную хату, калі добра ўцямнела. Ехалі ў Камянюкі напрасткі, аднаму Юрасю вядомымі ляснымі дарогамі. Пушча спала. Дарога праз лес здавалася зноў як доўгі і звілісты тунель. Фары вырывалі з цемры то таўшчэзны камель сасны ці дуба, то паркан беластволых бярэзін, то растапы-

раныя, як пальцы казачнай пачвары, карані вываратняў, то зялёную сцяну ельніку, пабеленую наліплым снегам. Ноч неяк па-свойму, гратэскава падкрэслівала веліч і таямнічасць Белавежы.

У тыя дні, што жыў у Камянюках, на пацеху сабе вырошчваў... зімовыя апенькі. Паказаў іх мне зусім яшчэ маленькімі Павел Кірылавіч Міхалевіч — старшы навуковы супрацоўнік, дырэктар тутэйшага музея прыроды. Грыбы мелі мядовы колер, былі тугія на вобмацак і нагадвалі залацістыя манеткі. Пакольκі «манеткі» былі яшчэ невялікіх памераў, я вырашыў падгадаваць іх.

Тады ж Міхалевіч адкрыў такія-сякія сакрэты. Растуць зімовыя апенькі групамі, на лісцевых дрэвах — ліпе, лазе, вязе, вярбе,— часцей на іх пнях ці ўздоўж маразабоін. Паяўляюцца ў Белавежы пасля першых замаразкаў. Растуць ўрыўкамі. У адліжныя дні. Ядомыя.

Расказаў і такую гісторыю:

— Пад Новы год да нас прыехалі з тэлебачання. Снегу вакол наваліла, а хлопцы жартуюць: усім ты можаш, Павел Кірылавіч, здзівіць нас, а вось скажы: зімою грыбы растуць? Я нічога не адказаў, узяў кош, і мы паехалі ў пушчу. І што думаеце? Назбіраў!

Я не здзівіўся. Міхалевіч усё свядомае жыццё займаецца грыбамі, ведае іх як ніхто, бадай. З мэтай прапаганды «грыбных» ведаў ужо дзесяць гадоў запар праводзіць выстаўкі грыбоў. Спачатку тут, на пушчанскай паляне, правёў. Потым — у сельскай бібліятэцы, мясцовай дзесяцігодцы, Камянцы, Брэсце, Мінску і нават у Маскве, на ВДНГ.

— Цяпер і за рубеж пара! — пажартаваў Павел Кірылавіч.

Нічога дзіўнага ў гэтым няма. Чалавек павінен ведаць усё і пра грыбы. Але закончу пра сваё.

Стаяла адліга. Ноччу падкідала патрошкі сняжку. Апенькі, хоць і марудна, а падымаліся. Я рада-

ваўся. На трэці дзень паблізу таго пянька натрапіў яшчэ на адзін. Ён быў таксама ўсыпаны грыбамі-манеткамі. «Во будзе радасць,— думаў я, правяраючы ўжо два пні.— Прынясу гаспадыні гасцініцы мяшэчак грыбоў і скажу: «Смаж на здароўе!».

Але ў намечаны дзень з маімі апенькамі (яны ўжо мелі сантыметраў па чатыры ў дыяметры) атрымаўся канфуз. Выйшаў з гасцініцы на досвітку, як звычайна робяць сапраўдныя грыбнікі. Не даходзячы мо сотню метраў, дастаў з кішэні поліэтыленавы мяшэчак, нож-складанчык. Ну, думаю, цяпер нарэжу! Падыходжу бліжэй і спыняюся ў здзіўленні. Пні стаяць, а грыбоў на іх няма. Ніводнага! Няўжо Міхалевіч пажартаваў? Толькі я дарма так на яго. Пажартавалі з нас абаіх... лясныя казачкі. Прыйшлі ноччу і акуратненька «састрыглі» грыбкі з пнёў. Толькі на памяць пакінулі сляды капытоў на снезе.

У Белавежы мне шанцавала на цікавых людзей. Адзін з іх — Мікалай Максімавіч Марчук, таксідэрміст, спецыяліст па вырабу чучал. Прафесія ў наш час даволі рэдкая. Ён аддаў ёй ужо трыццаць пяць гадоў. Яго работы можна сустрэць па ўсёй Беларусі. Экспанаваліся яны на шматлікіх выстаўках у нас і за мяжою. Узнагароджаны Марчук медалём ВДНГ.

Мікалай Максімавіч запомніўся мне як чалавек тонкага складу, чуткай душы, бязмежна ўлюбёны ў родную прыроду. Ён бачыць прыгажосць зямлі, адчувае яе сэрцам. Помняцца яго словы: вучыцца ў прыроды — галоўнае для чалавека...

Марчук шмат расказваў пра пушчу, пра хвіліны, праведзеныя ў ёй. У яго было нешта ад ятвягаў-язычнікаў — так ён пераўвасабляўся, калі гаварыў пра дрэвы, сонца, зямлю.

— Лес мудрасць дае,— казаў ён.— У ім адчуваеш сябе найлепш. Там душою адпачываеш, хоць, бывае, і стомішся за дзень. Даўней ні выхадных, ні свят не ведаў, усё на Лясной або ў пушчы прапа-

даў. Выходзіў з хаты поцемкам і вяртаўся поцемкам. Як вобла, бывала, усохнеш, а радасна: пабыў не адзін — з прыродаю!

Памаўчаў трошкі і зноў казаў:

— Світанкі дужа люблю. Яны ў нас асаблівыя. Прыгажосць невыказная, калі ўстае сонца. Зямля яшчэ сонная, а яно — вунь ужо, усхапілася і залівае праменнямі. Вечарам таксама хараша ў нас. Дрэвы нібы дрэмлюць. Усе велічныя. А ў кронах — зоркі пабліскваюць або маладзік з галіны на галіну скача... А вось у завіруху — неяк не па сабе ў Белавежы. Елкі ўсё адно як згаварыліся — шумяць, шумяць... А на доле круціць, меле снегавую муку завея. Каб падняўся над пушчаю ў такія хвіліны — жахнуўся б: не лес пад табою — мора, на якім разгуляўся страшэнны шторм.

— Усё ж,— дадаў Марчук,— душою адпачываеш і тады...

А Дворак, Людміла Яўгенаўна? Колькі ў ёй любові, замілавання да гэтага краю, гордасці за людзей, што ахоўвалі і ахоўваюць унікальны куток зямлі нашай з яго жывёльным і раслінным светам. Пра Белавежу яна таксама можа расказваць і расказваць. Сама Дворак — батанік. Таму і героі расказаў яе — расліны. Яны ў яе жывуць, думаюць, мараць, радуюцца, крыўдуюць, здзіўляюцца, спадзяюцца, вераць — як людзі ўсё роўна, з душою, сэрцам. І калегі, слухаючы Людмілу Яўгенаўну, зайздросцяць такому ўмельству харошай зайздрасцю.

З захапленнем слухаў і я:

— Ой, даўняй любоўю люблю вясну! Яшчэ не агоркне бярозавік, а ляшчына з вольхаю пазасыпаюць лужыны ці не па ўсёй пушчы. І тут з наіўнасцю дзетак пазіраюць на ўсё гэта сінія вочы пралесак. То там, то тут яны, нібы невялічкія азёрцы, адлюстроўваюць блакіт неба. Але ў нас ёсць не толькі блакітныя ці сінія пралескі. Часам трапляюцца ружовага, нават белага колеру. Дзіва дый годзе!

Я заўсёды бягу ў пушчу па вясну. Адшукаю

кветкі, укленчу, але яны пазіраюць так даверліва, так па-дзіцячы, што рука не адважыцца сарваць. Наіўна? Толькі іначай не магу...

Бадай, самыя каляровыя месяцы ў нас — гэта чэрвень з ліпенем. І нібы для таго, каб ярчэй палалі смолкі, ярчэй цвіў казялец, ружавей здавалася канюшына,— над пушчанскімі лугавінамі ўстаюць рамонкі-нівянікі. Сваімі бялюткімі пялёсткамі кветка расплочваецца за чалавечыя сумненні ў каханні, вянкамі — на галоўках дзяўчатак, букетамі — на нашым стале. Рамонак-нівянік не хаваецца ў гушчары, ён увесь навідавоку. Пад гарачым ліпеньскім сонцам растае рамонкавы снег. І толькі адна-другая кветка будзе цвісці да самай восені...

Штогод, перш чым запаліць кастры на бярэзінах ды асінах, восень упрыгожвае пушчу дыванамі верасоў. Бэзавага колеру, яны відны то там, то тут. Вяртаючыся з грыбнога паходу, я заўсёды прыхаплю з сабою галінку верасу. Яна доўга будзе захоўваць свой колер, свяціць нейкім дзіўным, амаль няўлоўным, восеньскім сумам, падобным на дарагі ўспамін...

Цвіце пушчанская зямля і зімою... Глуха шуміць лес, апусцеюць лугі і палі, а я жыву надзеяй, што прыйдзе адліга. І яна прыходзіць. Тады бачу: зацвітаюць кветкі! У агародчыку ўспыхваюць драбнюткія зорачкі макрыцы, мініяцюрныя фіялкі-браткі, кветкі стрэлак... Стукне мароз — заледзянеюць кветкі. А прылашчыць сонейка — і быццам зіма не зіма для іх: зноў цвітуць! Ажываюць да апошняй жылачкі... Мужнасць? Так. Дакладней, сімвал неўміручасці, стойкасці, мужнасці. Нахіляюся над імі заўсёды, як у паклоне...

— Вам бы вершы пісаць, Людміла Яўгенаўна!

Гэта я не сказаў, гэта я так хацеў тады сказаць ёй, Дворак. А праз колькі дзён, гартаючы падшыўку раёнкі, натрапіў на знаёмае прозвішча. Пад ім былі такія радкі:

Праплывуць-пралятуць гады,
Пройдзе час, што мне лёсам адпушчаны.

Адрадзіцца хацела б тады
Хоць маленькай часцінкаю пушчы.
Стаць хачу векавою сасной,
Што прапахла гаркавай жывіцай,
Ці звычайнай лясной травой
На губах крутарогай зубрыцы.

Аўтобус адыходзіў на Мінск у пятай гадзіне вечара. У снежні гэта ўжо даволі позні час.

Неўзабаве Камянюкі засталіся ззаду, а насустрач ужо беглі іншыя пушчанскія вёсачкі — вялікія і малыя, пералескі, белыя ад снегу палеткі, лугавіны. «Ікарус» імчаў роўна, закалыхваў. Хіліла на сон. Недзе за Пружанамі заснуў. Сніліся, чамусьці, ятвягі. Дакладней, той, апошні, ятвяг. Крадучыся, з-за дрэў ён сачыў за аленямі. І раптам ятвяг некуды знік, а паляўнічым-сокам стаў я. Белабрысы, высокі, у лазовых лапцях з валасянымі аборамі, апяразаны шкурай расамахі, ляжу, затоены, за вываратнем, у чаканні звера. Нарэшце на паляну выходзяць алені. Ён і яна. Яна ўжо зусім блізка. Але ці будзеш парушаць закон продкаў? Матку не забіваюць! Падымаю цяжкі лук, да звону нацягваю цеціву — цэлюся ў яго, рагаля. Цэлюся доўга. Каб не змыліць. Каб потым не сорамна было перад сабою.

Страла, ціўкнуўшы, прарвала паветра і ўпілася аленю пад лапатку. Ён спружыніста падскочыў, нібы хацеў дастаць рагамі сонца, аднак не дастаў і бразнуўся вобзем. Я закрычаў ад радасці, выскачыў з-за вываратня, але...

З таго краю паляны на паджарым тарпане ляцеў на мяне мой даўні вораг.

Пушча старалася абараніць мяне. На яго шляху паўставалі дрэвы, завалы, балотцы, рачулкі, аднак ён ляцеў, не зважаючы на ўсё гэта. Мяне ратавалі ногі. Я быў лаўчэйшы і мог выбіраць шлях. Бег і думаў: таму, хто ў пагоні за мною, патрэбна мая пушча. Патрэбны вось гэтыя дубы, сосны, елкі, ясені, бярэзіны. Патрэбна дзіва-трава зуброўка, што аздаб-

ляе пахам ежу, чалавечае жыллё. Патрэбна чароўная сон-трава, што дае бадзёрасць душы і целу. Патрэбен сонечны зверабой, што лечыць раны. Патрэбен звер, птушка, рыба, што жывуць побач са мною. Патрэбен зубрыны рог, у якім нават самы страшны яд губляе сваю сілу. Патрэбна, нарэшце, зубрыная скура, знятая з ілба,— рабіць магічныя паясы для цяжарных жанчын, каб тыя часцей і лёгка раджалі... І каб усё гэта забраць, усім гэтым валодаць, ён, што імчыць на тарпане следам, павінен забіць мяне, гаспадара пушчы, усяго жывога і нежывога ў ёй...

Я зразумеў усё і спыніўся, наструніў цеціву. Аднак было позна. Маланкаю бліснула кап'ё, балюча ўдарыла ў грудзі. Я хіснуўся, ухапіўся за дрэўка, хацеў вырваць страшнае джала, ды яно раптам хруснула — пераламалася. І я, хістаючыся, стаў асоўвацца на дол.

Перавёў пагляд на неба. Яно было чырвонае, палову яго засланіў коннік — у шаломе, жалезных латах, з жалезным шчытом у левай руцэ.

Вораг мой рагатаў. І рогат яго цяжкім валам каціўся пад шатамі пушчы...

...Я прахапіўся.

Сэрца заходзілася ад болю. На душы было цяжка.

Натужна працаваў матор «Ікаруса»: машына брала пад'ём.

Заснуць болей не змог.



## ПАЎНОЧНАЕ ПАМЕЖЖА

*Побач — Вялікарусія ● Песні бабкі Просі*
*Боль Асвейшчыны ● Успаміны вязня нумар 217*
*Поле аралі жанчыны ● Курган Дружбы*
*Зямля па-латышску — «земя»*

Вёска Прошкі — самая паўночная на тэрыторыі Беларусі. Яна адметная перш-наперш арыгінальнасцю забудовы. На Палессі, Панямонні ці Пабужжы, калі чалавек сяліўся яшчэ на «палосках», забудову дворышча рабіў «пад шнур» — эканоміў зямлю. За хатай, што стаяла ўпрытык да вуліцы, ляпіліся адзін да аднаго ўсе гаспадарчыя будынкі — хлеў, пуня, абора, куратнік, дрывотня, скляпок... Іншы раз у тым «шнуры» налічыш да дзесяці будынкаў. Новыя ж пляцы забудоўваюць інакш. Хата — асобна. Кожны хлявок — асобна. І каб кветнік быў не горшым як у суседа. І каб усё пад шыферам. І абавязкова каб свая студня была. Не кажу пра садкі і грады. Там гэта лічыцца ці не галоўным паказчыкам заможнасці гаспадара.

На поўначы — інакш. Тут часцей за ўсё і цяпер забудову вядуць даўнейшым спосабам — каб усё было ўкруг дворышча і ледзь не пад адным дахам. Прасветы паміж будынкамі наглуха зашыты аполка-

мі. Вароты і веснічкі — таксама «глухія» і высокія. З вуліцы не ўбачыш, што робіцца ў двары, і са двара не ўбачыш, што робіцца на вуліцы. Садкі, кветнікі, грады — як бы асобна, звычайна справа ці злева дворышча. Праўда, навейшыя сялібы ў Прошках і ў цэнтры калгаса — сяле Ігналіна — маюць і прасторы болей, і сонца, і кветак.

Своеасаблівая і мова паўночнага памежжа. Вось, скажам, першая фраза, пачутая ў Прошках:

— Іван вам наказаўшы ноч начаваць да ягоісці!

Праз хвіліну — зноў знаходка для слыху:

— Ейны мужык таксама таманька пагібшы...

Скончылася вуліца, а працяг яе — дарога — бяжыць далей, да лесу. Цяпер бабка Прося тлумачыць:

— Там ужо Вялікарусія! Першае сяльцо будзе Ляхава, а за ім — Дзедзіна. А калі ўзяць лявей дарогі — як бачыш у Латвію трапіш. Але хадзем у хату. Пра жыццё сваё раскажу. Яно ў мяне такое...

Хата бабкі Просі на ўзгорку і воддаль вуліцы. Будавалася, відаць, на скорую руку ці, як кажуць, на нейкі час, а прастаяла вунь колькі! Мае ўсяго адзін пакойчык. Печ, пафарбаваная ў зялёны колер, займае чвэрць жылой плошчы. Пры адным акенцы — стол, пры другім — ложак. Трошкі воддаль печы — кухонны столік, ля сцяны — тры табурэты.

Гаспадыня заўважае, што я разглядваю ўсё гэта, адмахваецца:

— Хіба чалавеку многа трэба? А мне ж скора восем дзесяткаў стукне!..

Памаўчала, прысела на табурэт па той бок стала і загаварыла:

— А мой, Рыгор Цітавіч, старшыняваў тут, у Прошках. Нялёгка тады было. Людзі жылі бедна. Ды і культуры, можна сказаць, ніякай. Ні клуба, ні кіна. А жыта сеялі з гірсою! З гірсою і малолі, не адвейвалі. Вядома ж які хлеб выходзіў. А мой, Рыгор Цітавіч, паглядзеў за ўсё гэта і паехаў, разжыўся недзе добрага насення і сем гектараў ужо без гірсы пасеяў. Во радасць была, калі зжалі! Зернетка ў зернетка. Адно ў адно. Рыгор Цітавіч тады сказаў: усё

пакладу, а даб'юся, што жыта людскае сеяць будзем. Але на вайну з белафінамі пайшоў і не вярнуўся.

Бабка Прося выцерла далоняй слязіну, сказала:

— Я тады і днямі і начамі плакала. Як жа, думаю, жыць буду? Як дзяцей падыму? Пяцёрка ж мела!.. З тае вайны да падружак мужы вярнуліся, а майго — як не было. З гора бабскага песню тады жалобную склала. Паслухайце, калі хочаце:

— Вы, кумушкі-галубушкі,
Сястрыцы мае,
Куміцеся, любіцеся,
Любіце і мяне.
Вы пойдзеце ў вішнёвы сад —
Завіце і мяне.
Вы будзеце цвяточкі рваць —
Сарвіце і мне.
Вы будзеце вяночкі віць —
Савіце і мне.
Вы будзеце ў раку пускаць —
Пусціце і мой.
Усе вянкі паверх плывуць,
А мой патануў,
Усе дружкі з вайны прыйшлі,
А майго няма ш.
Усе дружкі з гасцінцамі,
А мой хоць бы й так...

Яна сцяла вусны, прыжмурыла вочы і сядзела хвіліну-другую моўчкі. Думалася: не загаворыць болей бабка Прося пра тое, даўняе. Загаварыла. Толькі пра дзяцей.

— А як я іх, дзетак сваіх, раджала, каб вы ведалі! Смяхоцце адно! — яна шырока і добра ўсміхнулася.— Марысю радзіла у полі, рвучы лён. Феню — на балоце, канаву капаючы. Івана — на таку, калі пранікам лён калаціла. Аліка — ва ўрочышчы Блінаўка, як каровы даіць бегла. А самую меншанькую, Вальку,— па дарозе ў Асвейскую больніцу, у санях, на азярові. Прыбеглі тады з Вострава бабы,

нас удваіх і ўнеслі ў хату на полцы. І нічога. Ні я, ні малая нават прыхварнуць не ўздумалі.

Успамін пра дзяцей, пра тое, як яны раслі, падымаліся, быў для бабкі Просі нібы перадых, ніба адгародак ад таго, страшнага, што называецца вайною. Ды ён неўзабаве адышоў на другі план, а на першы выступіла тое ж — удовін лёс.

— Адна толькі праца чалавека не порціць,— у роздуме прамовіла яна.— Кім я за гэты час не была! І свінаркаю, і даяркаю, і пастухом, і важдаём-вазаром, і сторажам... І ўсюды са мною жыло яно — гора маё. Не адмахнуцца было ад яго, не ўцячы. Толькі песняю іншы раз прыглушала горанька сваё. Аднойчы склала яшчэ адну — удовіну. Мо паслухалі б і гэтую?

І бабка Прося ціхутка, як бы толькі для сябе, пачынае:

— Зашумела, загудзела
Дубровушка зеляная.
Заўдавела-заўдавела
Удовушка маладая.
Поле маё шыракое
Засталося не ратое,
Лугі мае зяляныя
Засталіся не кашоны.
Дзеткі мае ды малыя
Засталіся не рашчоны.
Прыходзілі-прыходзілі
Таварышы маладыя,
Прыносілі-прыносілі
Ды напіткі дарагія.
— Выпі, выпі, удовушка,
Той напітак дарагі.
Забудзь-забудзь, удовушка,
Ты на роднага мужа.
— Хоць я вып'ю, хоць не вып'ю,
Но на мужа не забуду.
Хоць забуду-незабуду —
Дзеткі мае не забудуць.

Стаяць яны ў варотах,
Плачуць як сіроты.
Стануць яны ў другея —
Будуць як чужэя.

Скончыла пець, і ў хаце стала ціха-ціха. Тую цішыню не з рукі было парушаць, і таму я таксама маўчаў. Думалася чамусьці не пра словы, што ў песні, а пра голас, якім пела бабка Прося. Ён яшчэ меў моц, не страціў адчування рытму, душэўнасці, мілагучнасці. Але чуўся ў ім нейкі надлом. Бабка, відаць, таксама думала пра тое ж, бо праз нейкі час прамовіла са шкадаваннем:

— А перасядае мой голас! Адчула гэта яшчэ тады, як фашысты прыйшлі!..

Збярог час адзін дакумент — яскравае сведчанне таго, што адбылося тады на гэтай зямлі. На ружовым лістку паперы, уверсе, напісана: «Смерць нямецкім акупантам!» Ніжэй — загаловак: «Асвейская трагедыя». Далей — тэкст, а ўнізе — прыпіска: «Прачытай і перадай другому». Вось радкі з тае лістоўкі: «...Жудасная крывавая трагедыя разыгралася нядаўна ў Асвейскім раёне Віцебскай вобласці. У страшэнную пустыню ператварыўся гэты прыгожы куток зямлі беларускай. У ім нельга пазнаць ранейшы цудоўны азёрны край, шчодры і багаты. Усё, што доўгія гады стваралі тут асвейскія калгаснікі, загінула пад цяжкім ботам нямецкіх катаў-акупантаў».

Тады фашысты за некалькі дзён спалілі ўсе 158 населеных пунктаў Асвейскага раёна, раённы цэнтр Асвею і мястэчка Кахановічы, больш за сотню школ, дзіцячыя сады, бальніцы... Карнікі спалілі жывымі і ўтапілі ў рацэ Свольна каля чатырох тысяч мірных жыхароў. Яны вывезлі з раёна на катаргу ў Германію каля трох тысяч мужчын і жанчын...

Тыя, каго цудам абышла бяда і хто мог трымаць у руках зброю, змагаліся з ворагам у падполлі, у партызанскіх атрадах. У тутэйшых лясах стаяла брыгада

імя Фрунзе, якая дзейнічала на тэрыторыі Беларусі, Латвіі, Расійскай Федэрацыі. У складзе яе былі людзі многіх нацыянальнасцей.

Лясныя байцы не давалі акупантам спакою ні ўдзень ні ўночы.

Рускія, беларускія і латвійскія партызаны разам адбівалі і наступленні карнікаў. Плячом к плячу стаялі яны ў час фашысцкай блакады на рубяжы ракі Свольна ў лютым — сакавіку 1943 года, не прапусціўшы 35-тысячную армію праціўніка ў сваю зону.

Нас у хаце ўжо чацвёра. Прыехала з Красава, суседняй вёскі, Ніна Бурак, знаёмая бабкі Просі. Бабчына дачка, Марыся, тупае ля печы, тады-сяды кідае якое слоўца, але болей слухае Ніну. Слухаем і мы з бабкай Просяй. А Ніна Бурак расказвае пра тое, як яна некалі не чалавекам была, а нумарам 217. Высокая, з зялёнымі і на дзіва добрымі вачыма жанчына гаворыць, а з павек сыплюцца слязіна за слязінай.

— Ой, людцы мае! — кажа яна.— Адно праходзіць, другое находзіць. Са сну выбілася. Пралящела колькі часу, а не магу забыцца. Гэта ж я ў вайну дзве іхнія «экспедыцыі» пержыла, а падчас трэцяй усё ж трапіла ў пастку. Мы тады ў лесе хаваліся, як і ўсе. І вось аблаву, як на звяроў якіх, зноў зрабілі фашысты. Нас, маладых, аддзялілі ад старэйшых і пагналі ў канцлагер, ажно ў Саласпілс, што ў Латвіі, ля Рыгі. Цяжка было каранцін прайсці. Раздзелі нагала і трымалі так, не карміўшы, не паіўшы. Чуць хто аслабеў — у печ. І ўсё тут. І канец гамане... А потым апранулі ў іхняе — і ў барак. Трое сутак на голых дошках... А кармілі — не давядзі бог. Баландою! Бачу аднойчы: з катла нешта вытыркаецца. Прыгледзелася, а то ж конская нага з падковаю!..

Твар жанчыны перасмыкнуўся:

— А на работу ого як ганялі! Я дзяўчом яшчэ была, малалеткай, а цягнула, як вол. Было, наглядчыца крычыць: «Дзвесце семнаццаты, сюды! Дзвесце

семнаццаты, туды!» і дзвесце семнаццаты бяжыць то туды, то сюды, хапаецца то за тое, то за гэта. Бо крый бог што не так — у печ. І ўсё тут. І канец гамане... Потым развезлі нас каго куды. Я трапіла ажно пад Брэмен, да бауэра. Тут ужо трошкі лягчэй стала. Сам бауэр у васемнаццатым у пляну нашым быў, то спачуваў. А так — прапаў бы дзвесце семнаццаты! Як піць даць, прапаў бы.

Яе твар зноў перасмыкнуўся:

— Гадоў пяць таму назад ездзіла ў той Саласпілс. Усё пазнала: дзе якія баракі былі, дзе што. На месцы дзіцячага барака — падмурак. Агонь вечны гарыць. І аднекуль з зямлі гук сыходзіць такі, нібы сэрца там б'ецца. Жах! Я там слязьмі залівалася. Стаяла і думала: а я ж, людцы мае, перажыла ўсё тое. Перажыла!..

Твар жанчыны спахмурнеў. Вочы глядзелі строга:

— А там жа і цяпер не сунімаюцца,— паказала яна рукою некуды за дзверы.— Усё бразгаюць аружжам. О, каб магла, то не зважала б на гады, узяла б такую страшную аружыю і пайшла б. Я іх навучыла б, як бразгаць!..

— Не кажы, Нінка! — падсела да яе Марыся.— Тое да смерці насіцьмем. Не забудзецца тое ніколі.

Памаўчала трошкі ды працягвала:

— Тут жа ўсе, як хто мог, ваявалі... У нас сусед быў — Рыгор Машкетаў. Ён да вайны кавалём працаваў. Справядлівы быў, нікому благога слова не сказаў. Прыйшлі немцы — і прызначылі Машкетава старастам. А ён і тады служыў народу, партызанам дапамагаў. Ды ў фашыстаў падазрэнне ўзнікла, сачыць за ім сталі. Аднойчы ўварваліся да яго ў хату і знайшлі рознае дабро, што ён партызанам сабраў. Дома Машкетава не было, якраз сенакос стаяў, дык фрыцы на балота кінуліся, збілі да паўсмерці чалавека, прывязалі да каня і павалаклі ў сяло. А ззаду яшчэ сабакі рвуць. Баб, дзяцей пазганялі і кажуць: так будзе ўсім, хто партызанам памагаць пачне! А потым адцягнулі Машкетава за сяло і застрэлілі.

Бабка Прося заварушылася:

— Фашыст і ёсць фашыст. Нарабіў ён бяды на зямлі, ох, нарабіў!..

І яна ўжо нібы мне аднаму расказвала:

— Было тое ў маі сорак пятага. Рашылі мы, жанкі, узараць клін зямлі, каб пшаніцы трохі пасеяць. Узялі плуг і ва ўрочышча Каменны Рог падаліся. Сем баб у плузе ідзе, а я — за плугам. Успаролі сяктак тыя пяць гектараў, а назаўтра прычапілі дзве бараны і зноў туды. У адзін канец прайшлі, а назад цягнуліся — падарваліся на міне. Я і не згледзела, як вухнула з зямлі. Ды так моцна! Марыю Фралёнак — адразу... Падняло ўгору, кінула ўніз і ўсё. Лізавеце Лукашонак вырвала плечы... Соні Машкетавай, старасцісе, руку адарвала. А Куліна Фесіна, Аня Блінова, Алена Лукашонак і я, Ефрасіння Новікава,— жывымі засталіся. Не зачапіла нават...

— І яны, жанкі нашы, у памяці народнай жывуць,— сказала Марыся.

— Жывуць! Ніхто не забыты! — падтрымала Ніна Бурак.— Вунь які Курган Дружбы ўзвялі за Прошкамі, у лесе! Гэты Курган і жанкам нашым, і падпольшчыкам, і партызанам, і Машкетаву — усім помнікам вечным будзе.

Яна праўду казала.

Днём раней прошкаўскі брыгадзір Іван Новікаў, сын бабкі Просі, угаварыў суседа, лесніка Івана Шандава, пад'ехаць на санях на той Курган Дружбы. Меціў туды і сам брыгадзір, але яго выклікалі ў праўленне калгаса. Паехалі мы ўдваіх.

За ноч падкінула снегу, і кабылка ніяк не магла ўзяць разгон. Напачатку ляснік стараўся падбадзёрыць яе, панукаў, а потым аслабіў лейцы — маўляў, я табе сёння не ўказ, вязі як хочаш. І кабылка болей плялася, чым бегла.

Абапал дарогі стаялі высозныя дрэвы — бярэзіны, елкі, асіны. Часам траплялася старое ляда, парослае кустамі. Іван Шандаў расказваў:

— У нас, куды ні ступі,— усё лес ды лес. Суседняе

азяро і тое завецца Лісно. Гэта значыць, Лясное.

Ён панукнуў кабылку, хацеў, каб яна трошкі шпарчэй пайшла, але зноў палічыў марным, заткнуў у сена пугу і працягваў:

— Прабягае тут дзве рачулкі: Сінюха і Нявера-вец. Абедзве з Асвейскага азяра выцякаюць, а злучаюцца якраз там, дзе зямля вялікаруская, латышская і беларуская сходзіцца. Сінюха бяжыць потым уздоўж памежжа з Латвіяй, перасякае яе і ўпадае ў раку Вялікую, што ў Вялікарусіі... Улетку прыгажосць тут — ого! Грыбоў, ягад многа. Ёсць лось, выдра, вепр, норка, ліс. Трапляюцца і глушцы, але рэдка. Нават мядзведзь жыве! Бачыў нядаўна сляды. Што лапці! Зіма, а, бач ты яго, не ўлёгся. Валацужнічае!

І тут ляснік стаў нібы падводзіць рыску пад усім сказаным:

— А на сутоку Сінюхі і Няверaўца Курган Дружбы ўзвышаецца. Там і Музей баявой садружнасці. Штогод у першую нядзелю ліпеня сюды збіраюцца былыя партызаны, з'язджаецца і моладзь з усіх трох рэспублік.

Наперадзе паказаўся прасвет, усё адно як там паляна была. Ляснік сказаў:

— Вось і прыехалі!

Праз якую хвіліну мы былі ў цэнтры мемарыяла. На Кургане, што насыпаны рукамі рускіх, беларускіх і латышскіх партызан, узвышаецца ладны ўжо дубок — сімвал адзінства і дружбы трох братніх народаў. Ад падножжа Кургана адходзяць тры алеі. Алея з клёнаў — ідзе ў Расію, алея з бярэзін — у Беларусь, алея з ліпаў — у Латвію...

Па дарозе дадому Шандаў казаў:

— І цяпер мы ў дружбе жывём. Наш калгас «Камінтэрн» спаборнічае з вялікарускім калгасам імя Чапаева. А наш Верхнядзвінскі раён — з Лудзенскім раёнам, што ў Латвіі. Узнікне, бывае, патрэба — і дапамагаем адзін аднаму. Тэхнікай, кармамі ці яшчэ чым. Бо як жа інакш? Інакш нельга. Суседзі!

Раптам Іван Шандаў хітравата зірнуў на мяне:

— А ці ведаеце, як будзе вось гэта па-латышску? — ён паказаў пужальнем на дол.

Я зразумеў, пра што ён. Кажу: і па-беларуску, і па-руску будзе аднолькава — зямля. А па-латышску, прызнаўся, не ведаю.

Вочы лесніка свяціліся:

— Земя! — горда сказаў ён і дадаў: — Адным словам, адна зямля ў нас, адны планы і адны жаданні: каб ніколі такое не паўтарылася, што было.

...Вечарэла. Ніна Бурак развіталася і пайшла ў сваё Красава. Пабегла ўпраўляцца па гаспадарцы і дачка бабкі Просі — Марыся. Зняў з цвіка шапку і я. Бабка Прося, як і тады, удзень, напомніла:

— Іван вам наказаўшы ноч начаваць да яго ісці...

Парыпваў пад нагамі сняжок. Над Прошкамі апускалася ноч. Недзе адтуль, з-за лесу, што падступае да сяла з Вялікарусіі, падымалася поўня, фарбуючы снег у лёгкую ружавінку. А з боку Латвіі па зорным небе плылі рэдкія і лёгкія аблачынкі. Балтыка ж побач!



## СОЛЬ ЗЯМЛІ

*Ён быў шахцёрам і паэтам*
*Песня пра Чуклая • Лёс Юргена Шмідта*
*На глыбіні 420 метраў • Самы буйны руднік*
*Як захаваць кветку*

Ну і раніца — ўся з'інелая!
Па калені загрузла ў снег
І застыла снягуркаю белаю
У чароўным і дзіўным сне.

Сапраўды, горад толькі прачынаўся. Круціла вея, і снег ажно «плыў» уздоўж вуліцы. Праходзілі аўтобусы, поўныя людзей. Спяшаліся некуды прахожыя. Гаслі на слупах ліхтары. Днела. І рабілася на душы светла:

Нараджаемся не для смерці,
Нараджаемся мы, каб жыць.

Радкі нібы для гімна прызначаны, для гімна Радасці, Любові, Жыццю. Яны не сатруцца з памяці, яны — назаўсёды, як сам ён — высокі, усмешлівы, дваццацігадовы.

А вея круціць, вея меле снегавую муку і ў небе, і на зямлі. Вея лютуе. Люты!

І зноў не адарвацца ад радкоў, у якіх — прызнанне, роздум, спадзяванне. Нібы яны не вычытаны, не ўчуты некалі, а народжаны толькі што, у тваім сэрцы:

Мой кожны дзень — у роздуме глыбокім,
І кожны дзень мне дорыць адкрыццё.
Жадаю ўбачыць свой паверх высокім
У звонкім доме з назваю: Жыццё.

А ўздоуж вуліцы — камяніцы, камяніцы. Мо ў адной з іх і жыў бы ён. Мо нават у той, што з прыветным акном. За шыбай гарыць ліхтарык жывой кветкі, нібы запрашае: не мінай, заходзь!

А сцежка бяжыць, бяжыць. Там, пад наледдзю, халодны асфальт, а тут — белая бель, прыцярушаная свежым сняжком. Ён рыпіць пад нагамі, і добра адчуваць лёгкую хаду. Ісці б так ды ісці.

Якою далёкай ні будзе дарога,
Якім бы шырокім ні здаўся прасцяг,—
Вяртайся сюды, да святога парога:
Адсюль твой пачатак і тут твой працяг.

Многае мы далі б, каб ты вярнуўся да нас, ты — паэт і шахцёр. Бо нават тое, што сказаў пра адносіны да літаратурнай працы (я не кажу пра вершы!), сведчыць: пайшоў ад нас чалавек вялікага таленту. Вось яно, яго выказванне: «Жыта заўсёды жнуць, калі яно добра выспее, калі зярняты, здаецца, звоняць пад жнівеньскім ветрыкам. Так павінна быць і ў пісьменнікаў: брацца за пяро толькі тады, калі адчуваеш, што ўжо ўсё выспела ў душы для новага твора — так і звоніць добрымі вобразамі, добрымі думкамі».

Аднак...

Леаніда Якубовіча не стала яшчэ ў 1970 годзе. Яго жыццё абарвалася на працоўным пасту — у салігорскай шахце, калі юнаку ледзь споўнілася дваццаць два. Ды засталіся яго вершы і заўсёдная памяць сяброў аб ім.

Яму, Леаніду, не было і года, калі ў гэтыя мясціны прыйшлі геолагі. Паблізу вёскі Чыжэвічы, на беразе мелкаводнай Руткі, прытока Случы, яны паставілі першую буравую і сталі даследаваць нетры зямлі. Старанні людзей не прайшлі дарэмна: неўзабаве натрапілі на паклады калійнай солі. А трошкі пазней былі вызначаны і межы, і аб'ём тых пакладаў. Выявілася, што тутэйшае радовішча калійных солей — адно з буйнейшых у Еўропе і другое па велічыні ў нашай краіне. На базе яго потым пачалі ўзводзіць першы ў Беларусі калійны камбінат. Тады ж у чыстым полі і быў закладзены Салігорск — горад беларускіх шахцёраў.

Пра тое, што нетры беларускай зямлі багаты многімі каштоўнымі выкапнямі, геолагі выказвалі думку яшчэ да Вялікай Айчыннай вайны. Яны сцвярджалі, што Палессе — не толькі край балот і лясоў, што тут павінны быць каменны і буры вугалі, гаручыя сланцы і нафта, жалезная руда і граніт, каменная і калійная солі. Гэты прагноз пацвердзіўся, калі ў 1941 годзе паблізу вёскі Давыдаўка Гомельскай вобласці была прабіта свідравіна і на глыбіні 844 метры выяўлены даволі вялікія паклады каменнай солі. Больш чым на дзвесце метраў паглыбілі свідравіну, а пласт солі не канчаўся. Меркавалася пашырыць геалагічную разведку ў рэспубліцы, у тым ліку і ў раёне цяперашняга Салігорска, але работа была спынена нашэсцем гітлераўскіх захопнікаў. Перад народам паўстала іншая задача — бараніць родную зямлю.

Неўміручай славай пакрыў сябе ў тыя гады просты сялянскі хлопец — Іван Чуклай. Ён добраахвотна ўступіў у першы партызанскі атрад, які быў створаны на Палессі Васілём Захаравічам Каржом. Ужо ў баі, што адбыўся на шосты дзень вайны каля вёскі Пасенічы, Іван паказаў прыклад гераізму. Партызаны падбілі два варожыя танкі. Трэці — пачаў адступаць. І тады Чуклай кінуўся да падбітай агра-

мадзіны, штыком і прыкладам прыкончыў танкістаў, зняў з танка кулямёт і адкрыў шалёны агонь па ворагу.

Праз тыдзень партызаны зрабілі новую засаду і знішчылі атрад кавалерыйскай разведкі ворага. У баі быў паранены камандзір аддзялення. Чуклай вынес яго з поля бою.

Вясной сорак другога, калі атрад налічваў каля двухсот чалавек, партызаны абралі Івана Чуклая сакратаром камсамольскай арганізацыі. Ён узначальваў і групу падрыўнікоў, на рахунку якой дзесяткі ўзарваных варожых эшалонаў.

Улетку сорак другога атрад перарос у брыгаду, якая дзейнічала ў Ленінскім і Старобінскім раёнах. Непадалёку ад таго месца, дзе цяпер знаходзяцца Салігорскія калійныя камбінаты, у той час стаяў варожы гарнізон. Камандаванне брыгады вырашыла знішчыць яго.

Бой працягваўся шэсць гадзін. Партызаны перамаглі. А пад вечар, калі вярталіся на базу, зноў вымушаны былі ўступіць у бой. Ад фашысцкай кулі ўпаў камісар атрада Бандаравец. На дапамогу кінуўся Чуклай. Ратуючы камісара, ён быў смяротна паранены. Таварышы пахавалі іх на месцы бою — на ўскрайку вёскі Мецявічы.

У сорак трэцім, калі ў брыгадзе быў арганізаваны новы атрад, партызаны рашылі прысвоіць яму імя камсамольца Чуклая. І неяк сама па сабе нарадзілася тады песня пра героя:

Там, дзе рэчка Случ гамоніць
З ветрам шумным на Палессі,
Пра Чуклая слава ходзіць —
Баявая наша песня...

Нядаўна давялося сустрэцца з аўтарам слоў песні пра Чуклая, былым партызанам, ураджэнцам гэтых мясцін, цяпер рэдактарам Камянецкай райгазеты Уладзімірам Яфімовічам. Ён прапанаваў мне «інфармацыю для роздуму»: у перыяд фашысцкай акупацыі Беларусі на тэрыторыі цяперашняга Салі-

горскага раёна было спалена і расстраляна звыш 10 000 мірных жыхароў. Звыш 2000 чалавек было вывезена ў Германію на катаргу. Спалена 38 вёсак, 4 з іх не адноўлены. Гэта — Дуброўна, Сухая Міля, Ямнае і Хадыка. На франтах Вялікай Айчыннай загінула каля 3400 ураджэнцаў Салігоршчыны.

Выпадкова мне трапіла ў рукі пісьмо Мікалая Пятровіча, напісанае 9 мая 1945 года ў Берліне, якое было адрасавана жонцы Марыі, што жыла ў вёсцы Зажэвічы на Старобіншчыне. Салдат пісаў:

«Добры дзень, Маня!

Дазволь цябе павіншаваць з Днём Перамогі, з Днём 9 мая. Словы нашага любімага правадыра тав. Сталіна збыліся. Ён у пачатку вайны сказаў: наша справа справядлівая — мы пераможам! І мы перамаглі. Вайна, Маня, скончылася... Сёння мы святкуем Дзень Перамогі, адзначаем нашы дасягненні, што мы зрабілі за перыяд вайны ў разгроме ворага. Большасць таварышаў гарыць жаданнем хутчэй сустрэць сваё сямейства, а я, калі падумаю, што прыеду і сваіх любімых дзяцей не сустрэну — Колькі, Любкі і Нінкі,— то сэрца абліваецца крывёю, а вочы слязьмі... Здароўе ў мяне моцна пахіснулася пасля таго, калі я атрымаў паведамленне, што дзеці мае загінулі... Я буду прасіць, каб накіравалі мяне лячыцца...»

На гэтым пісьмо салдата абрываецца.

Не адшукаў я Пятровіча на Салігоршчыне. Ён не вярнуўся з вайны дадому. А падрабязнасці гібелі яго дзяцей уведаў.

Было гэта ў лютым сорак трэцяга. Тады фашысты праводзілі на Палессі самыя жудасныя «акцыі». Марыя Пятровіч, жонка воіна, жыла ў той час у Капацэвічах. І вось фашысты сагналі ўсіх жыхароў у стадолу і падпалілі. Хто спрабаваў вырвацца з агню — таго тут жа расстрэльвалі з кулямётаў. Марыі Паўлаўне пашанцавала. Яна, уся зраненая, цудам ўратавалася. А дзяцей — Кольку, Любку і

Нінку — уратаваць не змагла. Яны загінулі разам з усімі...

А вось выпадак, які адбыўся не на нашай зямлі, а там, у Германіі, і які пра шмат што гаворыць нам.

Быў адзін з майскіх дзён пераможнага 1945 года. Сяржант Скалабан, які зусім нядаўна са сваім узводам штурмаваў Берлін, вышаў на прыціхлую вуліцу горада. На шляху трапілася фотаатэлье. Чаму не зайсці, не зняцца на памяць? Там, у атэлье, да яго падбег хлопчык і нешта пачаў гаварыць па-нямецку. Сяржант падняў яго на рукі. Так і атрымаліся яны на здымку: савецкі воін прыціскае да грудзей хлопчыка, а той даверліва паклаў яму на плячо ручаня.

Гэты здымак беражліва захоўваецца ў Скалабана. Разглядаючы яго час ад часу, ветэран вайны ў памяці вяртаецца ў тыя мясціны, дзе апалілася яго маладосць, дзе загінулі яго таварышы, пралілася яго кроў...

У 1974 годзе Аркадзь Скалабан удзельнічаў у віктарыне «Ці ведаеце вы ГДР?» Удача не адвярнулася ад былога воіна. Ён выйшаў пераможцам і атрымаў узнагароду — турысцкую пуцёўку ў ГДР. Там перадаў замежным сябрам фатаграфію. Нямецкія журналісты ўключыліся ў пошукі хлопчыка. Ім аказаўся Юрген Шмідт. І вось гэты малады чалавек прыехаў у Салігорск. Доўга ў той вечар не тухла святло ў кватэры Скалабана. Юрген расказваў пра сябе, як ён стаў будаўніком, затым вучыўся, быў вылучаны на прафсаюзную работу. Жыве з сям'ёю ў Дрэздэне. Аркадзь Кандратавіч і яго жонка Зоя Аляксандраўна ездзілі ў гэты горад, гасцявалі ў Юргена. Яны зноў фатаграфаваліся. Звычайнай атрымалася фотка: сядзяць перад домам на лавачцы двое мужчын, размаўляюць. У старэйшага на руках — хлопчык. Гэта Марк, сын Юргена.

Радуецца Аркадзь Кандратавіч, што ў Юргена Шмідта ўсё добра, што ён знайшоў сваё шчасце сярод тых, хто будуе сацыялізм на нямецкай зямлі.

«Сустрэча праз 29 год», «Шчаслівыя твары» — вось назвы артыкулаў у газетах ГДР, дзе расказвалася аб дружбе дзвюх шчаслівых сем'яў. Так, яны шчаслівыя і добра разумеюць цану гэтага шчасця.

Калі пад'язджаеш да Салігорска, перад вачыма адкрываецца дзівосная панарама: неба падпіраюць шахтныя капры-веліканы, узвышаюцца гмахі абагачальных фабрык, уздымаюцца карпусы іншых прамысловых збудаванняў. А там, за імі, цягнецца да сонца высокімі дамамі горад. Горад шахцёраў. Горад маладосці.

Усё гэта з'явілася на вачах Леаніда Якубовіча. І не дзіўна, што ён, чуйны па сваёй прыродзе да ўсяго вялікаснага і новага, стаў працаваць шахцёрам. Адначасова пісаў вершы, поўныя аптымізму, надзеі, веры ў чалавечнасць, дабро. Аднойчы прапанаваў іх шматтыражцы. Сябры-журналісты звярсталі падборку так, што калі выразаць вершы і скласці «гармонікам», то атрымаецца мініяцюрная кніжачка. На «вокладцы» — партрэт юнака, яго прозвішча і буйнымі літарамі загаловак: «Вершы».

У адным з іх Леанід пісаў:

Калі песня не грэе
У мароз, у завею,—
Дык нашто тая песня!
Калі рукі ніколі
Не зналі мазоляў,—
Для чаго твае рукі!..

У канцы «кніжачкі» — слова пра аўтара: нарадзіўся ў 1948 годзе у вёсцы Радкава Салігорскага раёна. Скончыў сярэднюю школу. Працуе на рудніку другога Салігорскага калійнага камбіната. Вучыцца завочна на аддзяленні журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна.

Падбівала апынуцца ў той атмасферы, у якой жыў, працаваў апошні свой год Леанід. Сказаў пра

гэта свайму даўняму таварышу, рэдактару штотыднёвіка «Калийщик Солигорска» Георгію Дубоўскаму, і ён усё ўладкаваў. Назаўтра мы ўжо былі на першым рудніку, дзе і пачалася некалі ў Салігорску здабыча калійнай солі.

Нас чакаў намеснік начальніка першага горнага ўчастка Васіль Каравацкі. Не прайшло і паўгадзіны, і мы не пазнавалі адзін аднаго. У шахцёрскіх куртках, шлемах, з ліхтарамі і «выратавальнікамі» мы падобны былі на сапраўдных шахцёраў. Мінулі пераходы, шлюзавыя і нарэшце апынуліся ля ствала, па якім павінны спусціцца ў шахту. Васіль Каравацкі казаў:

— У Еўропе няма буйнейшага рудніка, чым гэты. І па здабычы карысных выкапняў яму няма аналагаў.

Падалі клецъ. Дзверы расчыніліся, і мы ўвайшлі ў яе. (Клець — гэта нешта накшталт ліфта, што ў высотных дамах, але значна большых памераў — чалавек на трыццаць.) Паступіў сігнал, і клець павольі пачала асядаць, а потым набрала даволі адчувальную скорасць. Закладала вушы. Але здзіўляла іншае: гэтак доўга спускаемся! Калі ж той канец будзе?

Нарэшце спыніліся. Плаўна, без адзінага штуршка. Адчыніліся дзверы клеці, і мы ступілі на цвёрдае. На якой глыбіні апынуліся?

Каравацкі растлумачыў:

— Мы на другім гарызонце, на 420 метраў ад паверхні зямлі.

Зноў мінулі шлюзавыя і нарэшце ўвайшлі ў сапраўднае падземнае царства. Як яно адрозніваецца ад звыклага, наземнага! Уражанне такое, нібы трапіў у скляпенні старога замка. Тое ўражанне не пакідае цябе, пакуль ідзеш па штрэку да пляцоўкі, на якой, трошкі ў старонцы, стаіць горны аўтобус. У кожнага з нас над галавою ліхтарыкі, як зоркі, высвечваюць шлях. І раптам не даеш веры вачам. Скляпенні ўспыхваюць мільёнамі іскрын, пераліваюцца зіхатлівымі каляровымі агеньчыкамі. Зача-

раваны ўбачаным, спыняешся і не можаш адарваць ад усяго гэтага позірку.

— Сядайце, калі ласка!

Гэта шафёр, Леанід Касцян, запрашае нас у аўтобус.

Дарога бяжыць па штрэку. Фары выхопліваюць з цемры дзівосныя спляценні, наслаенні, перапляценні каляровых пражылін. Яны — то белыя, то чырвоныя, то зеленаватыя. Ужо так распарадзілася прырода, што калійная соль, спрасаваная гліна, каменная соль тут аб'яднаны ў маналіт. Гэты маналіт спецыяльным камбайнам трэба раструшчыць, транспарцёрамі падаць да ствала, выдаць на-гара, а там, наверсе, на спецыяльнай фабрыцы перамалоць, аддзяліць патрэбную калійную соль. Тады толькі яна пойдзе ў шматлікія адрасы краіны і за рубеж, каб трапіць потым на палі і даць людзям карысць — павысіць ураджайнасць збожжа, бульбы, цукровых буракоў, сеяных траў.

На нашым шляху сустракаюцца развілкі, перакрыжаванні. З абодвух бакоў да «трасы» падыходзяць іншыя штрэкі, такія ж дзівосныя, быццам пракладзены ў самацветах. Здаецца, што аўтобус імчыць не пад зямлёй, а вуліцамі незвычайнага, казачнага горада.

— Яшчэ кіламетраў пару — і будзем на месцы,— гаворыць Касцян і робіць круты паварот управа.

Здзіўляешся: як чалавек арыентуецца? Як вызначае дарогу? Штрэкі ж, як кроплі вады, падобныя.

— А я ўжо дваццаць тры гады пад зямлёй баранку кручу.

Фары вырвалі з цемры агромністую камлыгу, падобную на кіль карабля, потым калону, другую, трэцюю, слізганулі па слаістай сцяне і патухлі. Аўтобус спыніўся. Мы сышлі на дол, мінулі некалькі штрэкаў-лабірынтаў і нарэшце выбраліся да залітай святлом пляцоўкі.

Трошкі ўбаку, ля горнага камбайна, увіхаўся Віктар Талкачоў, брыгада якога ўпершыню ў гісторыі салігорскіх калійных здабыла за год з адной лавы

мільён тон руды. Такіх паказчыкаў не ўдавалася дасягнуць яшчэ нікому і ніколі.

Сам Віктар Мікітавіч глядзіць на гэта як на звычайнае: «Працавалі ж! Вось і вынік». Прысадзісты, з дужымі рукамі, прыветным тварам і з даверлівай усмешкай, ён выклікае сімпатыю. Шэрыя вочы глядзяць спакойна, у іх чытаецца сур'ёзнасць характару і душэўная дабрыня.

— Такіх людзей, як Талкачоў, у нас большасць,— прамовіў Каравацкі, калі вярталіся да аўтобуса.

Дубоўскі сказаў:

— За 25 гадоў работы гэтага рудніка шахцёры яго здабылі 190 мільёнаў тон руды. У цэлым жа па «Беларуськалію» ўжо атрымана 500 мільёнаў тон сільвініту. Падумаць толькі!

Я ішоў следам і думаў. Калі ўлічыць, што кожны цэнтнер тукаў, унесеных у глебу, дае да трох цэнтнераў прыбаўкі збожжа, то вынікае, што людзі, каб унеслі іх пад зернявыя, атрымалі б дадаткова 22 мільярды 500 мільёнаў пудоў збажыны. Сапраўды, астранамічная лічба!

Клець падымала нас на-гара, а на памяць міжволі прыходзіў яшчэ адзін верш Якубовіча:

Зайздросьце, хлопцы, салігорцам —
Маім сябрам і землякам:
Трымалі йспыты па-геройску
На горды тытул гарняка!
Яны, як выклік сутарэнням,
Ідуць дарогамі вякоў,
Чытаюць хітрыя спляценні
Імі пакораных пластоў.
І што там іншыя прафесіі —
Для іх другіх не існуе.
Свае у шахце ёсць прафесары
І аспіранты ёсць свае.
Так, не здарма іх лічаць моцнымі,
Другія гэтак ці змаглі б —
Гаспадарамі паўнамоцнымі
І пад зямлёй, і на зямлі.

Прыняўшы душ і пераапрануўшыся ў сваё, развітаўся з Васілём Каравацкім і яго сябрамі-шахцёрамі. Успаміналіся радкі Віктара Яраца, напісаныя пасля трагічнай смерці Якубовіча.

Калі заканчвалася змена,
клець плыла шахцёрская да зор,
стомлена ты вёз наверх, як веру,
свой рабочы верш пра Салігорск.

Мы разлічвалі на якую гадзіну, а прабылі ў шахце ледзь не цэлую змену.

— Уражвае?! — ні то пытаўся, ні то сцвярджаў заслужаны геолаг-разведчык Беларускай ССР Ігар Іларыёнавіч Зелянцоў, калі назаўтра мы гаварылі з ім пра змены, што адбыліся тут за пасляваенныя гады.

— А я помню і такі малюнак,— сказаў ён.— На месцы, дзе цяпер горад раскінуўся, ляжалі палі, шумеў лес. Перад вачыма і зараз шырокая пойма Случы, уся ў зеляніне, вёскі Вішнёўка — яна «растварылася» ў горадзе, Кавалёва Лаза, Пясчанка — іх знеслі, бо стала падтапляць сялібы (вадасховішча побач). Такі ж лёс і Сяльца. А з Мецявіч палова людзей з'ехала — хто ў пасёлак Мірны, што ля вёскі Пагост, хто ў горад. На вачах маіх адбылася і такая змена ландшафту, як асяданне глебы ў сувязі з падземнай выпрацоўкай. Пайшло забалочванне зямель. З'явіліся нават азярыны. Асабліва гэта відно каля вёскі Жабіна, што ў шасці кіламетрах ад горада.

— Ды нас хвалюе цяпер больш сур'ёзная праблема: як быць з адыходамі вытворчасці? — працягваў далей Зелянцоў.— Я маю на ўвазе, па-першае, солеадвалы, па-другое, шламасховішчы. Солеадвалы дасягаюць стометровай вышыні. На роўным месцы горы! І як ты іх ні аберагай, засаленне суседніх зямель адбываецца. Гэтаму спрыяюць дажджы, вятры. Не дзіўна, што ў калодзежах вёскі Тамілава Гара вада ўжо робіцца салёнай. Але горай са шлама-

сховішчамі. Гэта — адкрытыя, накшталт ставоў, плошчы, абнесеныя дваццаціметровымі дамбамі, куды зліваюць вадкія адыходы вытворчасці. Пад імі заняты сотні гектараў урадлівых зямель. І, галоўнае, растуць яны хутчэй, чым солеадвалы. Усё гэта, вядома, адмоўна ўздзейнічае на навакольнае асяроддзе. Выхад адзін: карэнным чынам трэба мяняць тэхналогію здабычы калійнай солі. Вучоныя працуюць над гэтай праблемай, робяцца першыя крокі на практыцы, аднак факт застаецца фактам: прырода працягвае адчуваць адмоўны ўплыў нашай вытворчасці.

...Гадоў дваццаць таму назад усіх гэтых праблем не было. Дакладней, яны толькі давалі аб сабе знаць, толькі «праклёўваліся». А цяпер усталі ў поўны рост, крычаць, патрабуюць, заяўляюць: людзі, звярніце і на нас увагу! Гэта ў вашых інтарэсах!.. Не дзіўна, што вялікі прыродалюб, ураджэнец тутэйшай вёскі Крывічы, заўзяты паляўнічы, журналіст па прафесіі і паэт па складу душы Хведар Гурыновіч у адным з вершаў, звяртаючыся да свайго сучасніка, пісаў:

Ты і ў космас акно прачыніў,
А ці тую спасцігнуў навуку —
Кветку як захаваць для пчалы
І паветра для нашых унукаў?

Ёмка, сур'ёзна і па-чалавечы справядліва сказана. Так можа сказаць чалавек, які не раўнадушны да таго, што вакол яго дзеецца, разумее, у якім стане знаходзіцца зямля-карміцелька, што ёй трэба, каб жыла паўнакроўным, самой прыродай дараваным жыццём, адорвала сейбіта ўраджаем, радавала старых і малых прыгажосцю лясных палян, лугоў, аселіц, рэк і азёр. Сапраўды, мы не заўсёды імкнёмся захаваць чыстымі нашы вадаёмы, здаровым — паветра, не заўсёды задумваемся, як зберагчы тую ж кветку...

Нешта падобнае я адчуў, калі на адной з плошчаў Салігорска ўбачыў Манумент шахцёрскай славы.

Аўтар яго, Генадзь Буралкін, некалі працаваў слесарам у шахце. У вольны час наведваў студыю выяўленчага мастацтва пры Палацы культуры калійшчыкаў. Потым паступіў на аддзяленне скульптуры Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута. Яшчэ студэнтам пачаў задумвацца, як уславіць шахцёра-першапраходца. І вось яна, манументальная скульптура, побач з гасцініцай «Новае Палессе»! Шахцёр нібы толькі-толькі з'явіўся з нетраў зямлі. Ля ног — чырвоныя камлыгі сільвініту. На фоне снегавею яны, здаецца, гараць. Уражвае жэст шахцёра. Ён быццам гаворыць нам: «Людзі, глядзіце, якое перад вамі багацце! Соль зямлі! Скарыстоўвайце яго, падымайце ўрадлівасць палёў, множце дабрабыт свой».

І яшчэ ў тым жэсце чыталася: «І беражыце яе, зямлю сваю. Яна адзіная ў нас!».



## КАМЕНЬ ВЯЛІКІ

*Незвычайныя помнікі ● Вёска Горкі
Легенда пра каменны крыж ● Обальскае падполле
Мужнасць Зіны Партновай ● Велікан
Зіма здае пазіцыі*

Ён, сапраўды, самы вялікі ў нас. А знаходзіцца паблізу вёскі Горкі Шумілінскага раёна, на Віцебшчыне. З'яўляецца помнікам прыроды рэспубліканскага значэння. Але пра яго трошкі пазней. Спачатку — увогуле аб незвычайных камянях, якіх нямала сустракаецца ў нашым краі.

Пра Камень-волат, што каля вёскі Васявічы Дзятлаўскага раёна, ўжо расказвалася ў раздзеле «У жыце цвілі васількі». Паўтарацца не варта. А вось пра іншыя — сказаць трэба.

Паблізу Кушлян, за якіх паўкіламетра ад дома Францішка Багушэвіча, на ўскрайку лесу ляжыць даволі вялікіх памераў камень. На ім высечана: «Памяці Мацея Бурачка. 1900 г.».

Гэты надпіс зрабілі яшчэ некалі сябры і прыхільнікі паэта.

Есць і Камень філарэтаў — каля вёскі Карчова Баранавіцкага раёна. Паводле падання, каля гэтага валуна канспіратыўна збіралася таварыства па-

трыятычнай студэнцкай моладзі (філарэтаў), адным з арганізатараў якога быў Адам Міцкевіч.

А Расколаты камень, які ляжыць на тэрыторыі Альберцінскага лясніцтва, што ў Слонімскім лясгасе. Ён нагадвае горную скалу, як бы злепленую з асобных, розных па форме і колеру валуноў. Побач ляжыць валун вышынёю ў два метры, які, паводле расказаў мясцовых жыхароў, адкалоўся ад каменя ў 1935 годзе ад удару маланкі.

Цікавасць маюць так званыя Барысавы камяні, якія знаходзіліся ў рэчышчы Заходняй Дзвіны. Чатыры вялікія валуны ледавіковага паходжання па 6—8 метраў у акружнасці — помнікі не толькі прыроды, але і эпіграфіі XII стагоддзя. На іх былі высечаны шасціканцовыя крыжы і надпісы «Господи помози рабу своему Борису». Да прыняцця хрысціянства гэтыя камяні з'яўляліся язычніцкімі фетышамі. Крыжы на іх выбіты паводле загаду полацкага князя Барыса Усяславіча ў першай трэці XII стагоддзя ў сувязі з ажыўленнем язычніцкіх вераванняў і каб увекавечыць імя князя. Збярогся толькі адзін з камянёў — у рэчышчы каля вёскі Падкасцельцы за пяць кіламетраў ад Полацка (у 1981 годзе перавезены ў Полацк да Сафійскага сабора). Насельніцтву вядомы пад назвай Барыс-хлебнік. Бытуе легенда, быццам на камені ляжыць бохан хлеба...

Камяні з падобнымі надпісамі захаваліся каля вёскі Каменка недалёка ад Вілейкі і вёскі Высокі Гарадзец Талачынскага раёна. У рэчышчы Заходняй Дзвіны вядомы таксама два камяні з надпісамі: «Сулиборь хрьст» і «Святополк-Александр».

Недалёка ад Івянца ёсць вёска Камень. На ўскрайку яе ляжыць вялікі валун, які памерамі і формай нагадвае старую сялянскую хату. У народзе пра яго такая легенда ходзіць.

Калісьці на месцы каменя стаяла хата шаўца. Майстрам ён быў умелым, але і скупяндой — такіх свет не бачыў! Прагнасць зрабіла яго і нячыстым на руку. Ён завёў дружбу з д'ябламі, разам з імі

піў ды прыдумваў, як з даверлівых сялян найболей грошай садраць.

Па старому звычаю перад кожным святам да шаўца народ валам валіў — боты заказваць. Шыў ён хутка і фасоніста, браў за гэта вялікія грошы, а тым часам д'яблы, сябрукі яго, рыхтавалі злачынства.

Надыходзіла свята. Людзі ў новых ботах ішлі на багамолле, а д'яблы, зрабіўшыся нябачнымі, ужо чакалі іх каля царквы. Нічога не падазраючы, людзі любаваліся сваім прыгожым абуткам, але дастаткова ім было зрабіць яшчэ два-тры крокі, як боты развальваліся, а падэшвы і ўвогуле знікалі.

Напачатку даверлівыя сяляне лічылі гэта божай карай за ўтоеныя на споведзі грахі і да наступнага свята, сабраўшы грошай, зноў ішлі да шаўца заказваць абутак, а на споведзі выкладвалі ўсё, у чым «правініліся» перад богам. Аднак, выходзячы з царквы, зноў аказваліся ні з чым. Боты, як і раней, развальваліся!

Так людзі гаравалі, шавец нажываўся, а д'яблы бражнічалі разам з ім і рабілі свае д'ябальскія справы, пакуль нехта не западозрыў нядобрае.

Пачалі сачыць за хатай шаўца. І аднойчы накрылі ўсю д'ябальскую шайку за чарговай папойкай.

Акружыў народ хату, стаў выклікаць шаўца на суд. А той — дзверы на засаўку і не ведае, як быць. Чэрці ўраз у падполле схаваліся.

Тут з грамады выйшаў стары, наблізіўся да акна, за якім быў відзён спалоханы шавец, і прамовіў даўнішняе народнае закляцце:

— Каб ты каменем сеў!

Кара прыйшла тут жа, разам з перуном, маланкай і страшэнным ліўнем: хата акамянела! Акамянеў і злодзей шавец, і яго сябрукі д'яблы.

Вось нібы з гэтай нагоды і ўзнікла назва вёскі — Камень...

Есць, нарэшце, у нас і музей камянёў пад адкрытым небам. У ім сабраны ўнікальныя ледавіковыя валуны, якія маюць навуковую, гістарычную, культурную і эстэтычную каштоўнасць. Знаходзіцца гэты

незвычайны музей у Мінску, на тэрыторыі Акадэмічнага гарадка. У ім больш за дзве тысячы найбольш цікавых па саставу і памерах камянёў, якія звезены з усіх куткоў рэспублікі.

Аднак пара і туды, дзе ляжыць самы вялікі валун, назва якому — камень Вялікі.

Начамі было яшчэ холадна, як зімою. А ўдзень мароз адлягаў, прабівалася сонца, і снег браўся раставаць. На дарогах паблісквалі ручаіны, на пагорках, ці, як тут кажуць, гарушках, большала чорных лапін, а на дрэвах збіраліся чародамі гракі. Іх вясенні злёт быў ажыўлены, гаманкі, нецярплівы.

Пройдзе тыдзень-другі, і вясна будзе святкаваць перамогу. Таму птахі як бы непакоіліся: надыходзіла пара нялёгкіх клопатаў. Іншы раз яны раптоўна зрываліся з дрэў, рабілі кругі над вёскаю і, выбраўшы больш-менш прыдатную залысіну на гарушцы, апускаліся ўсёй чарадой і спрабавалі пахадзіць па адталай зямлі.

Чалавек таксама пазіраў за сяло, у поле, часцей успамінаў пра свой абавязак хлебароба. Неўзабаве заснуюць туды-сюды трактары — з прычэпамі, плугамі, сеялкамі, забегаюць грузавікі. Настане для сейбіта гарачая пара. Ад таго, як ён справіцца з ёю, будзе залежаць астатняе — і яго дабрабыт, і месца яго калгаса ў раённай зводцы.

Дарэчы, тутэйшы калгас «Іскра» — першая калектыўная гаспадарка, што была створана на Шумілшчыне. Гэта было ў далёкім 1928 годзе. Узначаліў яе выхаванец камсамольскай ячэйкі — Ільінец. Калгас быў невялічкі — усяго шэсць двароў тады аб'ядналася! Меў сто гектараў зямлі, шэсць кароў і столькі ж коней. Яшчэ быў глінабітны будынак для сховы сена, саломы і ўтрымання жывёлы. Першы ўраджай склаў дзесяць цэнтнераў збожжа з гектара і дзвесце — бульбы. Ад кожнай каровы было надоена каля тысячы літраў малака. Калгас быў удзельнікам раённай сельскагаспадарчай выстаўкі і атрымаў прэмію — конны плуг і конную барану...

Цяпер калгас «Іскра» адна з буйных гаспадарак раёна. Толькі меліяраванай зямлі мае дзве тысячы гектараў. Аднак на сэрцы селяніна ляжыць той жа, найгалоўнейшы, клопат, як і спрадвеку тут было, клопат пра чысціню палёў. А іх як хто знарок засявае кожнай вясною камянямі. Здаецца, ужо і сабралі ўсе, звезлі, ссыпалі ў крушні ці адправілі на рамонт дарог, а сыдзе снег — зноў тое ж: камень на камені.

Іван Сцяпанавіч Жэдзік, сакратар партбюро калгаса, расказваў:

— Аднойчы на верталёце падняўся, агледзіны рабіў. Прызнацца, жахнуўся: камянёў на палях — усё роўна як авечак, што разбрыліся без пастуха.

Аляксандр Фірсавіч Гапееў, механізатар, кавалер ордэнаў Працоўнага Чырвонага Сцяга і Кастрычніцкай Рэвалюцыі падтрымаў яго.

— Сапраўды, камяні — бяда наша. Бывала, за змену да трыццаці лемяхоў ламаў. А наскочыць на камень сеялка ці камбайн, ці кармаўборачная машына? Усё трушчыцца. А гэта — грошы. І не малыя. Магутанькі не было з камянямі тымі. І каторы ўжо год ваюем!

На той «бой» з камянямі іскраўцы кідаюць нямала сіл. Як могуць, ратуюць зямлю ад каменнага «нашэсця».

Іван Антонавіч Сасновіч, старшыня, удакладніў:

— Толькі летась сабралі з палёў больш за тры тысячы кубічных метраў камянёў. Гэтым самым зберэглі дзесяткі тысяч калгасных грошай. Бо меней стала выходзіць са строю апрацоўчай тэхнікі. Спатрэбіцца яшчэ не менш пяці гадоў, каб сабраць усе камяні. І сабяром. Інакш нельга...

Вёска Горкі пры шасейцы Шуміліна — Бешанковічы. Мясціна там не раўнінная — уся ў гарушках. Пагоркі чапляюцца адзін за другі, на схілах іх чарнее хмыз, а за ім ляжаць балаціны.

Усюды — і на балацінах, і ў хмызах, і на гарушках, і на клінах ворнай зямлі — ішла вялікая работа.

Кроплі снегавой вады, што прасачыліся скрозь гурбы, абмацвалі яшчэ мёрзлы дол, вышуквалі шчыліны, трэшчыны, хады-пераходы, імкнуліся туды, углыб, каб напаіць зямлю, з'яднацца з ёю і потым, пад сонцам, выліцца залацістым коласам.

Вёска жыла чаканнем вясны. Гаспадары з панадворкаў саскробвалі шуфлямі мурзаты снег, гаспадыні прыглядаліся да агародчыкаў, каб дзе ўкапаць трохі зямлі пад расаду памідораў. На ўгрэвах, пры хлявах, сакаталі куры. І толькі на прагалах, дзе некалі стаялі хаты, нікога не было. Яны нагадвалі кавалкі поля, а не колішнія панадворкі. Закінутыя студні наводзілі на нялёгкі роздум.

Заходжу ў двор да старажыла сяла Пятра Восіпавіча Скамбіровіча.

— Нашы Горкі мелі некалі амаль сорак двароў, а цяпер іх тут усяго адзінаццаць,— паскардзіўся гаспадар і паволі патупаў у хату.

Хата Скамбіровіча прасторная, на дзве палавіны. Сонечныя праменні прабіваюць фіранкі, і на падлогу кладуцца светлыя квадраты ад вокан. Пятро Восіпавіч зноў нібы скардзіцца:

— І мой бацька, і бацькаў бацька — усе мы батракамі былі. Жылі ў бараках пры панскім двары, што быў вунь за таею гарушкаю,— ён паказаў некуды рукою.— Усімі камандаваў цівун. Што і казаць: нялёгка жылося! А прыйшла рэвалюцыя, батракі зямліцу ды скаціну падзялілі, баракі разабралі і пабудаваліся, дзе хто хацеў. З'явіліся пасёлкі: Вішнёўка, Бярозаўка і Замасточча. Усіх разам Горкамі называлі. Бо на гарушках... Нашы мясціны не кідкія! Хмыз, балоцейкі, а зямля — толькі ўгрызкамі. І не пяскаватая, і не глiністая, і не чарназёмная — добрая, можна сказаць, зямля. Але ўся ў камянёх. І з лесам не вельмі. Лабаза розная расці — расце, а лесу паблізу няма. Аднак жывём. Няблага нават жывём.

— Відаць, вайна тут віною? — згадаўшы пра тыя прагалы ў вёсцы, сказаў я.

— А нягож! — уставіла гаспадыня, але тлумачыць далей не стала.

Пятро Восіпавіч унёс яснасць:

— Яно, можа, усё інакш было б, але дзеці бацёк перасталі слухацца. Як падняліся пасля вайны на ногі — хто куды кінуўся. Па лягчэйшы хлеб. А хлеб, скажу вам, усюды ў поце ліца здабываецца. У поце ліца! — паўтарыў ён.— Не іначай!.. Ну, а за маладымі і старыя пацягнуліся. Хто на цаліну, хто ў горад, хто на цэнтральную сялібу калгасную. Вось і засталіся ў Горках лічаныя двары.

— А мы змяншчыкамі не хацелі быць,— зноў уставіла гаспадыня.— Зямлі сваёй змяніць не маглі.

— А дзеці? — пацікавіўся я.

Яна апусціла вочы і, як вінаватая ў нечым, прамовіла:

— Не раз казала: сынок, роб у калгасе! Не паслухаўся. І дочкам казала: робце, дачушкі, дома! Таксама з'ехалі... А Раман Халмачоў нікуды не рыпаўся. Цяпер свінаром у нас. І жонка пры ім, на ферме. Вялікія грошы зарабляюць!

— От, маці! — не ўтрымаўся Пятро Восіпавіч.— Ці ў грашах справа? Нам ад усяго гэтага нядобра на душы! Бы груз які ляжыць на ёй.

Няёмка было распытваць, куды з'ехалі дзеці Скамбіровічаў, дзе працуюць, і я перавёў гамонку на іншае:

— Кажуць, недзе тут самы вялікі камень ляжыць...

— А нягож! — нібы ўзрадаваўся Пятро Восіпавіч.— Па той бок Замасточча! За Раманавай хатаю. Мая маці, Мар'я Пятроўна, казала, што гэны камень быў некалі намнога большы. Узлезці на яго нельга было. А ўнізе — быццам прыступкі меў. Казала, ідзеш, стомішся, прысядзеш на тую прыступку — і добра. А цяпер камень гэны паменеў — у дол уехаў. Балаціна ж побач!..

— Ён у нас на ўчоце! — удакладніла гаспадыня і падціяла вусны. Але маўчала не доўга. Хітравата бліснуўшы вачыма, стала расказваць:

— Камень гэны колькі народу ў зман уводзіў! Са мною таксама было. Толькі прыйшла замуж

сюды, як нейкая патрэба пагнала мяне ў Данілава. А дарога — палявая, паўз камень. Спачатку нічога, ішлося спакойна. А паблізу каменя таго нібы хто мяне за руку ўзяў ды вадзіць пачаў, ды заблытваць. Потым і дарога недзе падзелася, і сцежкі нават аніякай не стала. Карацей, ішла ў Данілава, а трапіла ў Старану. Дзярэўні тае ўжо няма — знеслі. Прыйшла, значыць, у Старану, дзівуюся: як? чаму? І мне ўжо Данілава не ў галаве, хоць бы ў Горкі свае трапіць. Раяць добрыя людзі: а ты, маладзіца, бяжы вунь гэнаю дарожкаю! Яна якраз паўз камень Вялікі. А мінеш камень, пяройдзеш ручаіну, што праз хмыз віецца, узыдзеш на гарушку, і Горкі твае як на далоні будуць... Пайшла. Але на камень так і не выйшла.

— А ў тутэйшых мясцінах і крыж каменны ёсцека,— у роздуме прамовіў гаспадар.— Хто яго і калі высек — невядома. Сярод людзей толькі легенда ходзіць. Жыў некалі ў маёнтку сваім пан-памешчык. У таго памешчыка быў сын — гарбаты, непрыгожы. Калі гарбун падрос, бацька рашыў ажаніць яго. Толькі якая паненка пойдзе за такога? Задумаўся пан не на жарты. Ды аднойчы вока яго ўпала на маладую ды прыгожую дзяўчыну, што служыла пры двары. І надумаў памешчык ажаніць свайго гарбуна на ёй. А яна кахала простага хлопца, як і сама, беднага, але таксама прыгожага. Ды пану гэта не да галавы было. Аб'явіў ён усім, што прыгажуня будзе сынавай жонкай, і тут жа стаў вяселле рыхтаваць. А дзяўчына рукі ломіць, слязьмі абліваецца. Толькі ці слёзы ў бядзе памогуць? І рашылася яна на такое: нажом забіла гарбуна нялюбага! Памешчык у вялікім гневе загадаў слугам сваім закапаць дзяўчыну жывою ў зямлю. А каб ёй і мёртвай было цяжка, наказаў на магілу пакласці каменны крыж вялізны ды сасну на ёй пасадзіць, каб каранямі вечна спавівала-душыла непакорлівую...

Я быў у Мішневічах. Бачыў і той каменны крыж, пачарнелы ад часу, і тую старую-старую сасну. Кара на камлі — усё роўна як ралля на полі. Верша-

ліна збіта перуном, абвісае толькі некалькі галін, пакручаных вятрамі, ды тапырыцца мо з дзесятак таўшчэзных сукоў. Паблізу няма ніводнага дрэва, і сасна ўздымаецца над ускраінай вёскі, як прывід страшных даўніх часоў. Чуў і тую легенду, толькі трошкі ў іншым варыянце. Яна ўзрушыла мяне сваім зместам. Яна як рэквіем. Рэквіем нескароным...

...Гаспадар, скончыўшы аповяд, сядзіць моўчкі. Побач — жонка. Паклала цяжкія рукі на калені, таксама маўчыць. І раптам — пра тую, з легенды:

— Нібы ў Вобалі Зінка Партнова...

Пайшоў зірнуць на камень Вялікі. Мінуў некалькі сяліб, некалькі прагалаў між імі. Вось і Замасточча — адзін з колішніх Горацкіх пасёлкаў. У ім цяпер усяго чатыры хаты. Яны стаяць пры самым шляху на Шуміліна і вокнамі ловяць сонца. Адшукаў палявую дарогу, што бегла ад шасейкі ажно туды, на Данілава, і ступіў на ўбіты снег, як на насып. Ішоў, а з галавы не выходзілі словы старой жанчыны: «Нібы ў Вобалі...»

У тутэйшым сяле Обаль у цяжкую часіну для нашага народа, на пачатку сорак другога, была створана камсамольска-маладзёжная падпольная арганізацыя. Туды ўвайшлі вучні старэйшых класаў мясцовай школы і моладзь суседніх вёсак — Ушалы, Зуі, Масцішча, Ферма. Узначальвала арганізацыю Фруза Зянькова. У Обалі тады быў вялікі варожы гарнізон — дзве афіцэрскія школы перападрыхтоўкі артылерыстаў і танкістаў, камендатура, атрад паліцыі. Мясцовая чыгуначная станцыя ў той час мела вялікае стратэгічнае значэнне. Яна была на найкарацейшым шляху з Рыгі праз Смаленск на Маскву і праз Арол на Сталінград. Паралельна чыгунцы ішла аўтамагістраль Рыга — Масква. Для падпольшчыкаў тут было вялікае поле дзейнасці. (Трэба адзначыць, што ўсе яны былі залічаны ў партызанскі атрад імя Варашылава брыгады імя Леніна). Юнакі і дзяўчаты перадавалі партызанам зброю, медыкаменты, зве-

сткі аб праціўніку, распаўсюджвалі лістоўкі. Патрыёты наладзілі больш за дваццаць буйных дыверсій, знішчылі чатыры эшалоны з танкамі, узарвалі машынныя аддзяленні вадакачкі і цагельнага завода, электрастанцыю, ільнозавод, матавозы на торфазаводзе, спалілі склады ільновалакна і правіянту, правялі не адну баявую аперацыю на чыгунцы і шасейных дарогах... Аднак у жніўні сорак трэцяга фашысты натрапілі на след падполля, арыштавалі яго ўдзельнікаў і кінулі спачатку ў Шумілінскую турму, потым — у Полацкую. (Толькі па шчаслівай выпадковасці пазбег арышту Аркадзь Барбашоў. Ён і змог папярэдзіць аб правале арганізацыі Фрузу Зянькову, якая вярталася пасля выканання задання партызан з Полацка. Разам яны і пайшлі да партызан.) Арыштаваныя камсамольцы трымаліся мужна. Пасля допытаў і катаванняў паблізу Баравухі, што ля Полацка, фашысты расстралялі Ніну Азоліну, Уладзіміра Езавітава, Мікалая Аляксеева, Яўгена Езавітава, Зіну Лузгіну, Фёдара Слышанкова...

Цяпер — пра Зіну Партнову, пра якую успамінала жонка Скамбіровіча. У гісторыка-дакументальнай хроніцы «Памяць» пра яе гаворыцца наступнае: «Лёс падпольшчыкаў, якія трапілі ў рукі ворага, хваляваў партызан. Разведчыкі пранікалі ў варожыя гарнізоны, імкнуліся вызначыць знаходжанне юных патрыётаў, каб арганізаваць іх уцёкі з фашысцкіх засценкаў. Такое заданне ў снежні 1943 года атрымала і Зіна Партнова. Але ў вёсцы Масцішча паліцаі схапілі дзяўчыну. Яе катавалі, дабіваючыся звестак аб падпольнай арганізацыі, аб партызанах. Зіна маўчала. Маўчанне было яе адзінай зброяй супраць ворага. У кароткія перапынкі паміж допытамі яна ўспаміналa родны Ленінград, бацькоў, якія засталіся ў блакадным горадзе, беларускую вёску Зуі, дзе яна адпачывала ўлетку з малодшай сястрой Галяй у бабулі, камсамольцаў, якія прынялі яе ў рады сваёй падпольнай арганізацыі. Разам з імі яна жыла баявым, поўным небяспекі жыццём. З Нінай Давыдавай яны працавалі ў афіцэрскай сталоўцы. Дыверсія,

якую рыхтавалі дзяўчаты, не ўдалася. Гітлераўцы паднялі трывогу, схапілі Ніну і расстралялі. Зіне ўдалося знікнуць. З сястрычкай яна ўцякла да партызан. Стала разведчыцай...

Зіну перавезлі ў вёску Гараны, дзе следчы ад катаванняў перайшоў да задобрывання, прапаноўваў ёй супрацоўнічаць з гітлераўцамі. Упартасць юнай падпольшчыцы прывяла ў шаленства фашыстаў. Яны збівалі яе прыкладамі і гумовымі дубінкамі, выломвалі рукі, марылі голадам. Але адважная камсамолка не здавалася. На адным з допытаў следчы пачаў пагражаць Зіне зброяй. Ён паклаў пісталет на стол. Зіна імгненна схапіла пісталет і стрэліла ў свайго ката. Другім выстралам яна звaліла нямецкага афіцэра, які прыбег на шум, нагою выбіла раму і выскачыла з акна. Наперадзе быў парослы кустамі бераг ракі — туды Зіна і кінулася бегчы. Дарогу ёй перанялі вартавыя. Аднаго з іх Зіна застрэліла, прыцэлілася ў другога, але атрымалася асечка. Фашысты схапілі дзяўчыну. Іх зверствам не было мяжы. Яны выкалалі ёй вочы, адрэзалі вушы, перабілі рукі і ногі... Так загінула адважная патрыётка.

У баях з фашыстамі загінулі і падпольшчыцы Марыя Дзяменцьева, Надзея Дзяменцьева, Валянціна Шашкова. За іх помсцілі тыя, што засталіся жывымі — Ефрасіння Зянькова, Ілля Езавітаў, Аркадзь Барбашоў. Яны дажылі да светлага дня перамогі. Дажылі, каб прадоўжыць справу сваіх загінуўшых таварышаў, расказаць пра іх жыццё і подзвігі ў імя свабоды нашай Радзімы.»

...Наш народ не забыў пра подзвіг обальскіх падпольшчыкаў. Пасля вайны пяць з іх былі ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга і дзесяць — ордэнам Айчыннай вайны 1-й ступені. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена кіраўніку падполля Ефрасінні Зяньковай і пасмяротна Зіне Партновай.

У гонар неўміручага подзвігу на скрыжаванні дарог з Віцебска на Полацк і з Обалі на Лявонава ўзвышаецца каменны абеліск — помнік членам обальскай падпольнай арганізацыі «Юныя мсціўцы».

А вось і ён, камень Вялікі.

Заўважыў яго здалёк. Па правы бок дарогі, на белым снезе, здавалася, ляжыць кіт, якога выкінула на бераг марскім прыбоем. «Хвост» гэтага велікана быў схаваны для зроку, затое «галава» уздымалася высока — кіт як бы хацеў уведаць: а што тут, на сушы?..

Падыходжу бліжэй і здзіўляюся яшчэ болей: вось ты які, прышэлец з далёкай поўначы! Нямала цябе круціла, варочала між ільдоў, малола, крышыла, стругала неверагодная сіла, пакуль не прыгнала сюды. Ад гадоў і вятроў, сонца і маразоў на целе тваім з'явіліся зморшчыны і трэшчыны. Сям-там паспеў і пачарнець, і пазелянець, нават абрасці мохам. Але чырвань выступае ўпарта, у касых сонечных промнях адлівае колкім бляскам.

Так, ён самы вялікі, якіх даводзілася бачыць на зямлі нашай: даўжыня — 11 метраў, шырыня — 5,6, вышыня — 2,8 метра. А колькі будзе ўглыб? Прыглядаюся, хачу ўбачыць «прыступкі», пра якія казаў Скамбіровіч, але не відно нічога. Пэўна, і сапраўды камень «уязджае» ў зямлю. Па той бок яго, да самага «хваста», падступае нізовіна, парослая «лабазой» — кусцістай альшынай, танклявымі асінкамі, крушынай, зарасцямі казінай лазы ды іншай балотнай драбязы. Трошкі далей — ручаіна вылізала ў снезе равок, які звіваецца вунь ажно куды!..

Узлажу на каменную спіну аграмадзіны, азіраюся. Горак не відно, хоць да іх і паўвярсты не будзе, а контуры іншых вёсак угадваюцца на гарызонце. І Данілава, і Шлапакі, і Будзішчы цямнеюць прысадамі недзе там, за хмызам, на дальніх гарушках.

Назад ісці было цяжэй.

Палявая дарога-зімнік паддалася цяплу канчаткова — правальвалася пад нагамі. Болей было абапал і ручаін.

Зіма здавала свае пазіцыі.

Вясна брала першыя рубяжы.



## МУЗЕЙ У ГУДЗЕВІЧАХ

*Самы арыгінальны ў рэспубліцы*
*Слова пра родную мову ● Як жылі нашы продкі*
*За волю, за долю ● Мясцовыя паэты ● На канверце — «партрэт» хаты ● Клопат энтузіястаў*

З усіх музеяў, якія маюцца ў школах рэспублікі, самы цікавы, самы ўнікальны — Гудзевіцкі літаратурна-краязнаўчы, што ў Мастоўскім раёне на Гродзеншчыне. Створаны ён вялікім энтузіястам, настаўнікам беларускай мовы і літаратуры мясцовай школы, заслужаным дзеячам культуры БССР Алесем Мікалаевічам Белакозам і яго вучнямі. Шмат цёплых слоў можна пачуць пра гэты музей. Аднак лепш пабыць там, прайсціся па яго залах, уласнымі вачыма пабачыць экспанаты, душою і сэрцам дакрануцца да далёкага і не вельмі далёкага мінулага гэтага краю, далучыцца да падзей, што адбываліся і адбываюцца на гэтай зямлі.

Экскурсію вядзе Алесь Мікалаевіч Белакоз.

— Наш музей адчынены ў 1968 годзе, а першыя экспанаты яго датуюцца шэсцьдзесят пятым годам. Тады мы пачалі збіраць матэрыялы для літара-

турнага кабінета. Праца ладзілася, і праз пэўны час стварылі літаратурна-краязнаўчы музей, які тады размяшчаўся ў адным пакойчыку.

Чаму арганізавалі менавіта такі музей? Справа ў тым, што той стан навучання беларускай мове і літаратуры, які быў у нас, не задавальняў. Хацелася, каб вучні больш ведалі пра нашых пісьменнікаў, пра іх творы. З гэтай мэтай мы звярнуліся да Васіля Быкава, Уладзіміра Караткевіча, Зоські Верас, Аляксея Карпюка, Дануты Бічэль-Загнетавай, Аляксея Пяткевіча, Ларысы Геніюш і многіх іншых літаратараў з просьбай напісаць выказванні пра родную мову, прыслаць рукапісы таго ці іншага твора, фатаграфію з аўтографам.

Цяпер у нас музей літаратурнага краязнаўства і этнаграфіі. Пачынаем з паказу мінулага. Сёння, скажам, знайсці што-небудзь новае пра Міколу Гусоўскага надзвычай цяжка. А мы ганарымся тым, што ў нас усё ж ёсць арыгінальныя экспанаты. Напрыклад, запрашэнне на вечар да 500-годдзя Міколы Гусоўскага з подпісамі ўсіх сакратароў праўлення Саюза пісьменнікаў Беларусі, медаль, выбіты мастаком Алесем Ступенем да гэтай даты. Дарэчы, ён у адзіным экземпляры. Пасля таго, як медаль быў адліты, форма распалася...

Выклікае цікавасць і Грамата (у нас — фотакопія, арыгінал захоўваецца ў Варшаўскім універсітэце), у якой упершыню ўпамінаюцца нашы Гудзевічы. Датуецца яна 4 ліпенем 1539 года. Так што, як бачыце, хутка будзем святкаваць 450-годдзе нашых Гудзевічаў.

Матэрыялы наступнага стэнда сведчаць пра вядомасць ва ўсім свеце нашага Францыска Скарыны. Мы дачуліся, што ў Падуанскім універсітэце ёсць фрэска — партрэт беларускага першадрукара на сцяне гэтай старажытнай асветнай установы. Напісалі да Алеся Адамовіча, ці бачыў ён такую фрэску, калі быў у Падуі. Вось расказ пісьменніка, дзе ён сцвярджае пачутае. А побач экспануецца і копія гэтай фрэскі.

Не толькі Падуанскі універсітэт ганарыцца тым, што Скарына здаваў там экзамен на званне доктара лекарскіх навук. Наш зямляк, вядомы спявак Міхаіл Забэйда-Суміцкі ў свой час выслаў нам з Чэхаславакіі буклет-альбомчык, дзе змешчаны партрэты чэшскіх першадрукароў, асветнікаў, пісьменнікаў. Узрадаваў такі факт: чэхі першым змясцілі партрэт Скарыны. Значыць, яны таксама надаюць вялікае значэнне друкарскай дзейнасці нашага земляка, якую той пачынаў у Празе. Скарынам-асветнікам цікавяцца многія народы. І для нас вялікі гонар, што ўсюды ўшаноўваюць памяць пра чалавека, які, дарэчы, друкаваў кнігі на беларускай мове.

Гэтая экспазіцыя — пра паўстанне 1863 года. Вось Маніфест цара Аляксандра II пра адмен прыгоннага ладу. Гэта арыгінал і, вядома, нам нялёгка ўдалося яго адшукаць. А побач — успаміны нашага вяскоўца Язэпа Шэмета, удзельніка паўстання, які расказаў калісьці свайму ўнуку Адольфу (Адольф Шэмет быў першым бухгалтарам тутэйшага калгаса), як тут праходзіла паўстанне, што ў нашай мясцовасці дзейнічала каля трох тысяч паўстанцаў. Мы ганарымся і тым, што бацька Кастуся Каліноўскага паходзіў адсюль — з вёскі Рэпля. У музеі шмат фотакопій карцін беларускага жывапісца Пятра Сергіевіча: «Каліноўскі і Урублеўскі робяць агляд паўстанцаў», «Кастусь Каліноўскі сярод паўстанцаў 1863 года», «Партрэт Кастуся Каліноўскага» (многія называюць гэты твор так: «Кастусь Каліноўскі пад дубам»). А тут, бачыце, ручка, якою Уладзімір Караткевіч пісаў раман пра паўстанне Кастуся Каліноўскага «Каласы пад сярпом тваім».

На наступных стэндах выстаўлены матэрыялы пра Дуніна-Марцінкевіча, Францішка Багушэвіча, Максіма Багдановіча...

Часта нашы наведвальнікі цікавяцца: няўжо Зоська Верас сама пісала нам успаміны? Няўжо гэта арыгіналы? Так, пісала. Іх шмат, успамінаў Зоські Верас. Яна многа зрабіла для Гудзевічаў, краю, Беларусі...

Калі мы назвалі свой музей літаратурна-краязнаўчым, то нават кампетэнтныя асобы спачатку здзіўляліся: як гэта мы можам яго так называць, калі ў Мастоўскім раёне ніколі не было ніводнага паэта. А мы гаварылі: не было, бо не шукалі! Аказваецца, што і на тэрыторыі нашага калгаса, у суседняй з Гудзевічамі вёсцы Струга, у 1911—1912 гадах працаваў настаўнікам Сцяпан Пятэльскі, які падпісваў свае вершы так: М. Арол. Нам удалося знайсці шэраг яго твораў, а менавіта рукапісны зборнік «Лірнік», у канцы якога ён пісаў: «Калі будзеце выдаваць мой зборнік — не падпісвайце «Сцяпан Пятэльскі», а пішыце: «М. Арол».

Бюст М. Арла рабіў Алесь Ліпень. Гэтым творам ён хацеў паказаць абурэнне, жаль, крыўду паэта з прычыны таго, што тагачасная беларуская інтэлігенцыя падчас выракалася свае роднае мовы, свайго народа. Ён, М. Арол, яшчэ ў 1911 годзе ў газеце «Наша ніва» пісаў: «...нашы інтэлігенты (ёсць многа вучыцеляў) нічым ні цікавяцца, акром карт і гарэлкі. Я ўжо даўно хацеў напісаць аб іх жыцці ў «Нашу ніву», але ўсё ждаў: а мо паправяцца? Зваў іх устроіць у школі беларускі тэатр, але дзе там — ані гавары!..».

Захоўваецца ў нашым музеі і першая дыпломная праца аб творчасці М. Арла, напісаная студэнткай Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта Марынай Белакоз — былой вучаніцай Гудзевіцкай школы.

Нарэшце, успаміны Паўліны Мядзёлкі, яе фатаграфія, ліст. Шмат цікавага расказвае яна ў ім пра тагачасны перыяд нашай літаратуры, пра барацьбу ў дваццатых гадах. А гэта «Лемантар беларускі» 1918 года. У Струзе была тады адчынена першая ў нашай мясцовасці беларуская школа. Ахвяраваў нам гэты «Лемантар» Уладзімір Навіцкі. Вярнуўшыся з Чырвонай Арміі, ён вырашыў, што пачынаць сапраўднае жыццё трэба з вывучэння роднай мовы.

Для Гудзевіцкага музея вельмі шмат зрабіла Зоська Верас. Вось некалькі планшэтаў з экспанатамі, якія яна даслала. Праўда, каб мы выкарысталі

усё, што яна перадала музею, напэўна атрымаўся б не адзін зал. Аднак такой магчымасці ў нас няма... А тут здымак Гарадзенскага гуртка беларускай моладзі, спіс яго ўдзельнікаў, здымак самой Зоські Верас у ролі Ганкі з камедыі Каруся Каганца «Модны шляхцюк», яе апавяданні, напісаныя ў 1916—1917 гадах. А вось дзіцячы часопіс «Заранка», які пісьменніца выдавала на грамадскіх пачатках. «Беларуская борць»... Зоська Верас па спецыяльнасці аграном, і нічога дзіўнага, што яна выдавала ў той час і гэты патрэбны часопіс. «Колас беларускай нівы» — такая аднадзёнка-альманах выдавалася тады Гарадзенскім гуртком беларускай моладзі. А гэта ўспаміны пісьменніцы пра «Заранку», пра «Беларускі каляндар» і шмат іншых матэрыялаў.

Наступны стэнд прысвечаны паэту Міхасю Явару, які ў нашым раёне нарадзіўся, жыў і загінуў. Экспануецца яго фатаграфія з надпісам: «Здымаўся 7 ліпеня 1928 года. М. Карась». (Карась — яго прозвішча, Явар — псеўданім.) Далей — матэрыялы, якія сабралі нашы вучні, калі хадзілі ў турыстычны паход на радзіму Явара. Гэта быў вельмі таленавіты чалавек. І не толькі як паэт, але і як сталяр, як майстар-самавучка. Некаторыя рэчы, зробленыя ім, у музеі ёсць. Дарэчы, нашы вучні ўдакладнілі год смерці Явара, месца нараджэння і жыцця, што дало падставу змясціць наш артыкул пра паэта ў Беларускай Савецкай Энцыклапедыі. Гэта вялікі гонар для следапытаў школы!

А вось і фотаздымак грушы, пад якой застрэліўся Міхась Явар. Чаму такое здарылася — на гэта было шмат прычын. Ён хварэў на сухоты, якія ў той час не вылечваліся. Штуршком для самагубства была і вялікая беднасць. Паэт адчуваў, што ў сям'і ён становіцца цяжарам. Бо кожны чалавек павінен працаваць! А працаваць ён ужо не мог. Былі і іншыя прычыны — палітычнае і сацыяльнае становішча Заходняй Беларусі... Нам удалося знайсці і магілу

Міхася Явара. Яна ўжо была без ніякага знаку. У школьнай майстэрні дзеці зрабілі з дубу прыгожы помнік. Напісалі на ім: «Міхась Явар. 1903—1933». Пад партрэтам паэта, на дошцы з нержавеючай сталі — словы з яго паэмы «За сэрцам»:

Так загінуў чалавек
За тое, што ў гэты, о ў дваццаты век,
Пасмеў сказаць у вочы смела,
Што ён таксама чалавек.
Спі, мучанік. Бо твае грудзі
Ужо знайшлі спакой сабе.
Няхай жа лёгкім пухам будзе
Зямелька родная табе,
Якую шчыра ты любіў,
Дзе шмат страдаў,
Ды мала жыў.

А гэта партрэт Ларысы Геніюш. Мы ганарымся тым, што яна нарадзілася і вучылася ў нас. У вершы «Гудзевічы» паэтэса піша:

Гудзевічы! Род мой незабыты,
беларуская мая сям'я.
Дождж змывае з надмагільнай пліты
дарагое дзедава імя...

Многія дзівяцца, чаму ў музеі ёсць стэнд касманаўтаў? Адказваю тады: мы ж непасрэдна звязаны з імі! Напрыклад, Пётр Клімук прыслаў нам кнігу Ларысы Геніюш «Невадам з Нёмана» з надпісам: «Гудзевіцкай СШ ад Клімука з найлепшымі пажаданнямі. П. Клімук. 6.08.75 года». Ён быў удзячны за вершы Ларысы Геніюш. Уладзімір Кавалёнак таксама даслаў нам ліст, фота. Падпісаў яго так: «Музею Гудзевіцкай сярэдняй школы з борта станцыі «Салют-6» з павагай і сяброўствам. 12.04.81 года. У. Кавалёнак». Дарэчы, гэты здымак і шэраг іншых экспанатаў перадаў Уладзімір Кавалёнак музею тады, калі сустракаўся на сесіі Вярхоўнага Савета БССР у Мінску са старшынёю нашага калгаса Міхасём Сцяпанавічам Пронькам.

А тут вось матэрыялы пра цікавага чалавека — Агату Тарасевіч — сялянку, якая сорак гадоў таму назад яшчэ жыла на гэтай зямлі. Была амаль непісьменная, але любіла складаць вершы. Творы атрымоўваліся цікавыя, ды ёй і ў галаву не прыходзіла, што іх трэба запісваць. Проста вывучала іх напамяць, выбіраючы бульбу ці прадучы кудзелю. Складала да іх мелодыю, спявала сама, спявалі суседкі, спявала ўся вёска. І вось праз сорак гадоў пасля смерці Агаты Тарасевіч яе вершы, песні дайшлі да нас ад аднавяскоўцаў. Напэўна, мала які паэт можа пахваліцца тым, што творы, якія ён і сам ні разу не запісаў, жывуць у народзе столькі гадоў.

Бюст Агаты Тарасевіч зрабіў наш былы вучань — малады скульптар Валеры Бурак. Ён адмовіўся ад усялякай аплаты. Сказаў: Агата Тарасевіч не брала ніякіх ганарараў. І я не буду браць.

А цяпер — экспазіцыя пра Беларускую сялянска-рабочую грамаду, пра Камуністычную партыю Заходняй Беларусі. Тут партрэт патрыёта-барацьбіта, члена БСРГ, аўтара першай «Беларускай граматыкі для школ» Браніслава Тарашкевіча, апошняя вестачка ад яго да сына. Побач — партрэт сакратара падпольнага райкома КПЗБ, дарэчы, аднаго з першых грамадоўцаў у нашай мясцовасці — Мікалая Іваноўскага. Цудоўны быў чалавек! Валявы. Сумленны. Добры. Расстраляны фашыстамі ў 1942 годзе. Вось яго бюст работы скульптара Уладзіміра Церабуна.

Гэты стэнд прысвечаны пісьменнікам, якія нарадзіліся ці працавалі на Гродзеншчыне. Тут звыш трыццаці фатаграфій, партрэтаў, шмат літаратурных твораў. Выклікае цікавасць рукапіс апавядання Зоські Верас пра Максіма Багдановіча, якое яна напісала да 90-годдзя з дня нараджэння паэта. Сама яна мела тады 89 гадоў, але апавяданню гэтаму можа пазайздросціць кожны пісьменнік.

Варта прыгадаць ліст Васіля Быкава. Аднойчы мы абмяркоўвалі яго аповесць «Сотнікаў», і думкі падзяліліся. Адны казалі, што Рыбак — здраднік, ін-

шыя — не лічылі яго такім. Напісалі да Быкава. Ён адказаў: справа не ў тым, хто Рыбак — здраднік ці не, справа ў тым, што вы прачыталі, зацікавіліся аповесцю, разважалі над творам, задумаліся над праблемамі, якія ставіліся ў ім.

Шмат лістоў маем Канстанцыі Буйла, якая сведчыць, што хоць амаль семдзесят гадоў пражыла ў Маскве, але роднай мовай яе заўсёды была беларуская. Паэтэса добра ведала рускую і польскую мовы, аднак вершы атрымліваліся ў яе толькі на роднай мове.

Добрыя сувязі ў нас былі з Іванам Мележам, з ім звязаны самыя лепшыя ўспаміны.

У 1978 годзе я ўдзельнічаў у сесіі навуковага савета па праблемах навучання і выхавання ў сельскай школе Акадэміі педагагічных навук СССР, чытаў даклад пра работу Гудзевіцкага музея. На жаль, мяне здзівіў адзін з выступаючых, які так заявіў: «Таварышы! Ніякага літаратурнага краязнаўства ў школе няма і быць не можа. Мы, вучоныя, не знаходзім нічога новага. А тут раптам вучні робяць адкрыцці». Давялося запытацца ў яго, а ці напісаў ён калі-небудзь выказванне пра рускую мову? Не, не напісаў. Чаму? Не ведаў, што гэта трэба... Бо ніхто не прасіў яго пра гэта! А вось у Івана Мележа мы запыталіся, і ён адказаў нам. Паглядзіце кнігу «Жыццёвыя клопаты». На 241 старонцы напісана: «Вучням Гудзевіцкай школы Мастоўскага раёна, 1966 год. Дарагія таварышы! Кожная мова ствараецца народам, ствараецца на працягу многіх гадоў, многіх стагоддзяў. Мова — гэта вялікі народны скарб. Яе нельга не паважаць. Як нельга не паважаць родны народ. Той, хто не паважае роднай мовы, не паважае роднага народа. Трэба любіць і вывучаць родную беларускую мову, трэба любіць і ведаць беларускую літаратуру — літаратуру, што стварыла нямала выдатных твораў, якія праславілі наш народ на ўвесь Савецкі Саюз». Пытаюся у свайго апанента: а ці напісаў бы Іван Мележ, каб мы не папрасілі яго? Відаць, не. Выходзіць, наша работа не прапала

дарэмна. Няма Івана Мележа сярод нас, а яго выказванне пра родную мову — жыве.

Ліст Ніла Гілевіча. У ім першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР піша старшыні нашага калгаса: «Вельмі паважаны Міхась Сцяпанавіч! З вялікай прыемнасцю дазнаўся пра вашу падтрымку такой важнай справы, як перадача музею Гудзевіцкай школы будынка з пяці пакояў. Ад імя Саюза пісьменнікаў БССР і ад сябе асабіста хачу выказаць Вам за гэта шчырую ўдзячнасць. Вы належыце да тых гаспадарнікаў-інтэлігентаў, якія глядзяць у будучыню свайго краю і народа,— а такіх, я ўпэўнены, у нас будзе ўсё больш і больш. Я моцна веру ў тое, што сціплы школьны музей стане з цягам часу адным з відных асяродкаў беларускай навукі і культуры. І тады ўспомняць усіх, хто яго падтрымліваў. Яшчэ раз — дзякую!

Са шчырай павагай — Ніл Гілевіч».

Уладзімір Караткевіч вельмі прыгожа напісаў нам пра беларускую мову яшчэ 8 лютага 1966 года, калі мы толькі-толькі пачыналі працу ў гэтым напрамку. «Дарагія вучні — пісаў ён.— Вельмі ўзрадаваны, што ваш гурток займаецца такой добрай справай. Рабіце яе і надалей. Вывучайце, ведайце, любіце нашу вечна жывую беларускую мову і нашу літаратуру. Кніга наша за апошнія часы вырасла да сапраўдных вышынь. Літаратура наша выходзіць паступова ў рады лепшых літаратур свету. І я веру, што пройдзе час, і яе паважаць і любіць будуць на ўсёй зямлі...».

Цікавае з'яўленне ў нашым музеі наступнага ліста. Наша вучаніца Лёдзя Палавеня пісала вершы. Хацелася, каб яна паступіла на філалагічны факультэт універсітэта. Экзамены здала, конкурс прайшла, яе залічылі студэнткай, але інтэрната не далі. А дома вельмі цяжкае становішча: бацька памёр, маці хворая, многа дзяцей. Давялося звярнуцца да Максіма Танка. І ён па просьбе зусім незнаёмага настаўніка пайшоў ва ўніверсітэт да адпаведных людзей і потым напісаў нам: «Быў у прарэктара

Малышава. Гаварыў аб справе Палавені Лёдзі. Спадзяюся, што ўсё будзе добра. Са шчырай павагай — Максім Танк». А праз некалькі дзён — ліст ад Лёдзі: «Якая я шчаслівая! Мне выдзелілі інтэрнат». Як гэта прыгожа, па-чалавечы, калі пісьменнік (у той час Максім Танк быў галоўным рэдактарам часопіса «Полымя») пайшоў насустрач зусім незнаёмаму чалавеку! Толькі дзякуючы яму дзяўчына скончыла БДУ. Цяпер працуе за межамі СССР, у ГДР.

Пяройдзем у залу народнай творчасці.

Лічыцца, што і мастацтва, і літаратура чэрпаюць свае сілы з народнай творчасці... Перад вамі — пачатак яе. Гэтым экспанатам чатыры тысячы гадоў. Справа ў тым, што ў нашым і суседнім, Ваўкавыскім, раёнах знойдзены першыя на тэрыторыі Савецкага Саюза шахты часоў неаліту. У гэтых шахтах выяўлены прылады, якімі карыстаўся чалавек, здабываючы крэмень, знойдзены прадметы ўжытку — скрабалкі, малаткі, іголкі, нажы, наканечнікі стрэл і іншыя рэчы, зробленыя нашымі далёкімі продкамі. Здзіўляе тое, як мог чалавек таго часу гэтак удала апрацоўваць прадметы з самага цвёрдага матэрыялу — крэменю. Якое тонкае, можна сказаць, ювелірнае мастацтва. І тады, як бачыце, тутэйшы чалавек быў вельмі таленавіты, вельмі творчы.

А гэта шафка, якую зрабіў у 1932 годзе Міхась Явар. Яе і цяпер не сорам паставіць у любую сучасную кватэру. З мастацкага боку яна выканана выключна. Кідаецца ў вочы наступнае: на шафцы ў промнях сонца гарыць пяцікутная зорка! Па тым часе гэта было вельмі смелым выклікам існуючаму ладу. Але тут нічога дзіўнага няма — Міхась Явар быў сапраўдным патрыётам.

Цяпер мы ў аддзеле кавальства. Звярніце ўвагу на гэту падкоўку. У майго суседа Лявона Рудніка было мала зямлі і ён трымаў вельмі маленькага коніка. Сам і рабіў яму такія падкоўкі. Дарэчы, Лявон добрым быў для сябе і столяром, і цесляром, і слеса-

рам — адным словам, майстрам на ўсе рукі. А самавар? Вельмі арыгінальнае выкананне! Нагадвае знешне чайнік, а на самой справе гэта самы што ні ёсць самавар. Прас 1867 года — таксама цікавы твор невядомага майстра.

Шмат прадметаў у ткацкім аддзеле — ручнікі, паяскі, кофты, фартухі, вышываныя кашулі, хусткі, дываны, даўнішнія строі. Гэта ўсё творы нашых гудзевіцкіх майстрых мінулага і пачатку гэтага стагоддзяў.

Шырока пададзены вырабы з дрэва. Такога, напрыклад, кадаўбца вам не даводзілася бачыць нідзе. Ён арыгінальны па сваёй велічыні, па тонкасці апрацоўкі, да таго ж зроблены з аднаго кавалка дрэва. А вось і ліпавачка — таксама з суцэльнага кавалка змайстравана...

Тут шмат вырабаў Міхася Навіцкага, былога падпольшчыка, старшыні сельсавета, калгаса. Гэтай арыгінальнай прыладай ён карыстаўся, калі вырабляў абады. Доўгі час мы не ведалі, як завецца гэты інструмент. Цяпер ведаем — ярунок.

А вырабы з саломы? Такімі экспанатамі, як каробка, сявенька, кош, капялюш мог бы ганарыцца самы багаты музей свету. Якія арыгінальныя формы маюць гэтыя вырабы! Відаць, што чалавек некалі ствараў іх не толькі для практычнай патрэбы. Эстэтычны бок справы таксама ўлічвалі нашы продкі.

З гэтага аддзела мы хочам зрабіць цэлы пакой — музей зёлак. Пачалося ўсё з таго, што Зоська Верас прыслала нам шэраг апісанняў лекавых траў, іх улаҫцівасцяў і, галоўнае, назвы — па-беларуску, па-руску, па-украінску, па-польску, па-лацінску. Яна сама вялікі спецыяліст па зёлках. У 1924 годзе выдала батанічны слоўнік на некалькіх мовах. Ён у нас ёсць і абавязкова зойме пачэснае месца ў экспазіцыі. Мы тут збіраем яшчэ матэрыялы пра іншых людзей — нашых мясцовых лекараў.

Цікавыя экспанаты выстаўлены ў аддзеле ганчарства. Неяк прынесла нам бабуля Васіліса верцешку і сказала: «Яе купіў Коля мой перад тым як пай-

шоў на вайну. Гэта адзіная памяць, што па ім засталася...». Калі будзем ствараць музей баявой славы, дык мяркуем паказаць (праз твор мастацтва) кірмаш, вырабы ганчароў, як Коля, сын Васілісы (фатаграфія его ў нас ёсць), выбірае сабе пакупку.

Гэты кавалачак кафлі — пятнаццатага, не пазней шаснаццатага стагоддзя. А вось гліняны пісьмовы прыбор. Хто яго рабіў і калі — невядома. Спецыялісты кажуць, што рэч вельмі каштоўная. Надзвычай цікавая і вунь тая цагліна. Па-першае, памерамі. Па-другое, датай вырабу: 1859 год. Знойдзена яна ў муры суседняй вёскі Пілкі.

Наступны экспанат для нас вельмі каштоўны. Гэта падвойны дыван. Іх ткалі і ў трыццатых гадах, нават пазней, але сустракаюцца яны рэдка. Падаравала нам яго Ларыса Геніюш, а вытканы дыван яе свякроўю. На ім відзён надпіс: «1900 рок». У нашай мясцовасці і цяпер не кажуць «год», а «рок». Так што нічога дзіўнага ў гэтым няма. Падвойныя дываны, як сцвярджаюць некаторыя недасведчаныя людзі, ткалі толькі ў Чылі і Польшчы. Гэта не так, бо і цяпер іх у Польшчы называюць гродзенскімі. Не падвойнымі, а гродзенскімі. І сапраўды, у Гродзенскай губерні іх ткалі даволі многа.

Цяпер мы ў зале народнага мастацтва.

Тут партрэты Міколы Гусоўскага, Францыска Скарыны, Кастуся Каліноўскага. Апошняя работа — мастака Міколы Купавы. Дарэчы, ён шмат чаго ахвяраваў нам. Вось і партрэт Цёткі — таксама. Зроблены ён выключна. Алаіза Пашкевіч (Цётка) на фоне дуба — сімвала магутнасці нашага народа. Побач жытні сноп, жытні колас — сімвал жыцця... У небе той самы белы бусел — сімвал працягу роду чалавечага... А сама яна? Велічная, прыгожая. З кнігай у руках. Дбае паэтэса пра будучыню свайго краю!..

Тут жа і выказванне Алаізы Пашкевіч: «На вас, моладзі, ляжыць вялікая павіннасць развіваць далей родную мову, узбагачаць свой народ зннаннем і культурай». Так, гэта задача вялікая, і мы будзем яе выконваць.

А гэта — скульптура беларускага паэта Міхася Васілька. Дарэчы, аўтар яе — Алесь Ліпень падкрэсліў пісьменніцкую прастату і сялянскую мудрасць.

А паліцыянты некалі казалі яму, Васільку: «Пільнуй гною, быдле!». І ён сапраўды, выкідаў і вазіў гной, араў, баранаваў, касіў, садзіў бульбу, жаў, малаціў, сеяў. А вечарамі пісаў свае выдатныя вершы.

Уражвае наступны экспанат — работа мастака Уладзіміра Кіслага «Роспач». Гэта партрэт Гальяша Леўчыка. «Роспач» называецца таму, што паэт у свой час таксама вельмі перажываў нацыянальны прыгнёт нашага народа. З прычыны невясёлай гісторыі роднага краю ён пісаў:

Нічога не хочу... Нічога, нічога —
Ні грошай, ні славы, ні шчасця сляпога...
А толькі ўсё жду я, каб родная мова
Хутчэй дачакала свабоднага слова.

Яму належаць і такія радкі:

Хто адрокся сваіх,
Хто стыдацца нас стаў
І прыліп да чужых,—
Каб ён свету не знаў!
Мову родную хто
Пазабыў, асмяяў,
Загубіў за нішто,—
Каб ён свету не знаў!

У час акупацыі фашысты расстралялі Гальяша Леўчыка.

Мы ўсе ведаем пра Барадзінскую бітву. Аднак нават выкладчыкі гісторыі да апошняга часу не чулі, што ў Гудзевічах у 1812 годзе адбыўся адзін з першых баёў з французамі. Казакі атамана Платава тут сустрэлі конніцу Жэрома Банапарта — роднага брата Напалеона. Бой быў гарачы, вёска палала агнём... У кожную вайну Гудзевічы згаралі дашчэнту.

І апошняе. Вось яна, карціна Алеся Ліпеня — сялянская хата дзевятнаццатага стагоддзя. Нам

прыемна, што з выявай гэтага твора ў 1985 годзе быў выпушчаны паштовы канверт. Некалькі мільёнаў іх разышлося па Савецкім Саюзе. Нават вунь адкуль прыйшоў да нас ліст у канверце з выявай нашай хаткі-музея — з Паўночнага полюса. Гэтым сказана многае.

...А зараз мы у той хаце, якую бачылі толькі што на канверце — у памяшканні музея этнаграфіі. Хаце гэтай каля двухсот гадоў. Яна цікавая тым, што паказвае майстэрства нашых далёкіх продкаў, якім нялёгка жылося і якія ў той час умелі многае рабіць. З такой мэтай мы і захавалі гэты будынак.

Вокны ў хаце маленькія. Але тады гэта было практычна. Высадзіць які-небудзь жэўжык шыбіну, то яе лёгка было замяніць. Усяго таго і шкла ішло — пядзя на пядзю. Ды і холаду такое акно прапускала меней.

Каля парога, пры самым вушаку стаіць цэбар — сяляне клапаціліся, каб у халодны час ежа свінням была цёплай. Тут, паблізу, вядро драўлянае падвешана і кубак, зроблены з гільзы снарада. Прыгожы кубак. Добрым майстрам зроблены! Селянін умеў усё выкарыстоўваць. Войнаў было шмат у нас, і кожная рэч, што засталася ад вайны, не прападала.

А вось тая славутая сялянская паліца. На ёй — драўляныя лыжкі, гліняныя міскі, глячкі, макацёр ці, як у нас кажуць, мяліца або верцеха... Пад паліцай — дзяжа, на ёй мухалоўка. (Атруты тады ніякай не было, таму клалі трошкі твара́гу пад мухалоўку, і муха, пакаштаваўшы яго, падымалася ўверх і трапляла ў пастку.) А гэта спарыш — два гаршчэчкі, злучаныя агульнай ручкай, каб насіць у поле аратаму ці касцу яду. У адзін гаршчэчак налівалася прэсная ежа — гэта мог быць крупнік, зацірка, фасоля, локшына, а ў другі — кіслая: капуста, буракі, шчаўе... Часта карысталіся і траячкамі. У трэці гаршчэчак можна было пакласці нейкую кашу, нават і кавалак мяса. Усе тры гаршчэчкі былі аб'яднаны,

«грэлі» адзін аднаго, і яда ў іх была доўга цёплай.

А гэтыя выцінанкі на вокнах? Колькі ў іх прастаты і прыгажосці! Вунь, пад столлю, «павук» — увесь час круціцца, ніколі не спыняецца. Кветкі на покуці, за іконай... А тут, на сцяне — вешалачка. Карова збіла рог, дык гаспадар скарыстаў і яго. Ніколі ручнік не запляміцца іржою (гэта ж не цвік). Рэч практычная і прыгожая.

Між вокнамі люстэрка вісіць, над ім — футарал для гадзінніка. А гэта грыфельная дошка, зрэбная торбачка — у ёй дзеткі насілі ў школу сшыткі, кнігі... А вунь і класічны калаўротак з прасніцай...

На покуці — стол. Зрабіў яго ў 1856 годзе Міхась Кажэцкі, прыгонны селянін, зрабіў з аднае-адзінае дошкі. Стол прастаяў апошнія пятнаццаць гадоў пад сонцам, пад дажджом, пакуль трапіў сюды. Дошка патрэскалася, але не распалася: вельмі смольная. Таўшчэзная сасна была, калі з аднае дошкі стол атрымаўся... За ім многія пакаленні жаніліся, хрысціліся, спраўлялі памінкі. І хто са старых сюды ні заходзіць — хваліцца: і я, маўляў, за гэтым сталом сядзеў не раз!

Каля сцяны куфар — гонар гаспадыні. Тут сувоі кужалю, тканыя дываны, посцілкі, вышываныя ручнікі, паяскі і іншыя рэчы, зробленыя жаночымі рукамі.

У нашай вёсцы жыў калісьці музыкант Іван Улановіч. Яго брата Мікалая і сёння празываюць: «Музыкант». Мікалай іграў на гармоніку, а Іван — на цымбалах. Тыя цымбалы — пры сцяне... Іван загінуў на фронце. А і сёння мог бы з братам людзям іграць вяселлі...

За куфрам — начоўкі, у якіх гаспадыня мыла бялізну, купала дзетак. Былі і вялізныя ночвы. У іх можна было мыцца і дарослым, а у разводдзе — нават плаваць, як у чоўне. Такія ночвы стаяць у нас у каморы.

На падаконніку стаіць вельмі патрэбная рэч па тым часе — газовачка. Яна была даволі практычнай: газы зжывала мала! Праўда, і святла давала не мно-

га. Але гэта не бяда. Сялянка і ўпоцемку ўмела прасці, абы толькі бачыла, дзе кудзеля.

У кутку — печ, вялікая, з ляжанкай. На прыпеку — трыножак. Калі ўзнікала патрэба, на трыножак ставілася патэльня, пад ёй запальваліся трэскі, і на хуткую руку рабіўся сняданак ці вячэра... Каля печы ўвесь гаспадынін рыштунак. А якія клапатлівыя мужчыны былі ў нас! Усе большыя рагачы, якімі даставала жанчына з печы чыгуны, мелі калёсікі. На іх лёгка «вывозіўся» з печы нават вядзёрны чыгун. Гэта чапяла — даставаць з печы патэльню, тут — качарга. Варта сказаць і пра кацубу. Яна падобная на кульбу, загнёную пад прамым вуглом, якою гаспадыня памешвала ў печы вадкую страву, нават не апёкшы рук.

Амаль пасярод хаты падвешана калыска — лазовая, лёгкая, зручная. Калі хату наведваюць экскурсанты з дзецьмі, то малыя заўсёды просяцца ў калыску. Пасядзіць у ёй дзіця, пагушкаецца, а потым і пакідаць калыску не хоча.

Каля самай сцяны — запек ці палаці, дзе спала сям'я. Праўда, старыя звычайна займалі печ і ляжанку. Бывала, што на запеку спалі і ўпоперак — дзяцей жа тады шмат было! У маёй бабулі, напрыклад, іх было васемнаццаць. Дык, вядома, на кожнага не набярэшся ні сяннікоў, ні месца асобнага...

А зараз пяройдзем у сені ці, як у нас кажуць, прымен.

Тут таксама шмат рэчаў, якімі некалі карысталіся нашы дзяды. Гэта драўляныя плуг і барана, каменная ступа (дарэчы, важыць яна ажно дваццаць пудоў!), кублы, жорны, кола да драўлянай восі, рэзгіны — насіць сена ці салому жывёле ў хлеў...

Зазірнем на хвіліну і ў камору.

У гэтых вось саламяных корабах можна змясціць па шэсць-сем цэнтнераў збожжа. Чым яны добрыя — там заўсёды збожжа «дыхала». Цікава, што іх не чапалі ні мышы, ні пацукі. За корабамі бачыцца скрынка для засолкі мяса, вісяць кашы, у якіх улетку захоўваліся кумпякі, кілбасы, сыры...

Наша начальства вырашыла яшчэ адзін будынак адпусціць пад музей. Цяпер у нас больш за 500 квадратных метраў карыснай плошчы. Тут будуць, акрамя таго, што ёсць, музеі ці аддзелы, як хочаце назавём іх,— зёлкаў, лёну, працоўнай, баявой славы, гісторыі школы...

У музеі лёну мы пакажам сінявокі даўгунец ва ўсходах, у час цвіцення, у галаўках, рваны, у кучках, мочаны, сланы, ламаны, цёрты, трапаны, часаны, у кудзелі, прадзены, у матках, на сноўніцах, у кроснах. Наведвальнікі ўбачаць, як нашы жанчыны некалі сваімі рукамі рабілі ўсё, каб апрануць сябе, дзяцей, мужа — усю сям'ю.

У наступным пакоі мяркуем адкрыць музей зёлкаў. Тут мы пакажам не толькі як выглядаюць тыя ці іншыя лекавыя травы, раскажам ад чаго яны дапамагаюць, але і дадзім іх назвы — беларускія літаратурныя, нашы мясцовыя, рускія, украінскія, польскія, лацінскія, каб чалавек мог і сам лячыцца і параіць свайму суседу з іншых рэспублік.

Матэрыялы для гэтых музеяў ужо сабраны.

Наперадзе клопатаў шмат. Але ж нас цяпер у музеі трое — навуковы супрацоўнік Алена Пятроўна Хомка, я і дырэктар музея Новік Юрый Міхайлавіч. Ён толькі нядаўна вярнуўся з арміі, і ўчора правёў першую экскурсію самастойна. Думаю, што гэта вялікія сілы і зрабіць можна многа, каб слова пра Гудзевіцкі музей гучала надалей.

Яшчэ адна мара ёсць у нас. Хочам мець свой уласны вятрак, дзе адкрыем яшчэ адзін музей. Мяркуем перавесці сюды і гумно, і хлеўчык, і свіронак, і калодзеж з «жураўлём» — пабудовы, якімі карыстаўся колішні селянін. Хочацца таксама стварыць і музей камянёў пад адкрытым небам. Тады ў Гудзевічах будзе нібы музейны гарадок. Гэта дасць вялікую карысць нашым нашчадкам. Яны яскравей убачаць сваю мінуўшчыну.

Такі наш клопат...

...Вось і пабылі мы на экскурсіі ў далёкім і не вельмі далёкім мінулым аднаго з цікавейшых куткоў

нашага краю. Гэта падарожжа хочацца закончыць словамі Адама Мальдзіса, які пра Гудзевіцкі музей яшчэ ў 1974 годзе ў адной са сваіх кніг сказаў наступнае: «Я ўпэўнены, што літаратуразнаўцы XXI стагоддзя ды і больш блізкага часу не раз будуць выкарыстоўваць матэрыялы, сабраныя ў Гудзевічах, спасылацца на іх».

Прароцтва даследчыка збылося, хоць да XXI стагоддзя далёка.

Пра Гудзевіцкі музей літаратурнага краязнаўства і этнаграфіі, пра яго стваральніка Алеся Мікалаевіча Белакоза ў нашым друку тады-сяды з'яўляюцца публікацыі. Але амаль нічога не ўпамінаецца пра дзейнасць настаўніцы Веры Ігнатаўны Белакоз, якая дапамагала мужу ў зборы і рэстаўрацыі экспанатаў. Апошнія дваццаць гадоў Алесь Мікалаевіч часта хварэе, па тры-чатыры месяцы праводзіць у розных шпіталях. У гэты час Вера Ігнатаўна ўсю працу ў музеі і нават экскурсіі праводзіць самастойна. Яна ўжо шаснаццаць гадоў вядзе ў школе гурток народнага ткацтва. Выткана каля двухсот гальштукаў і паяскоў, сотні закладак. Усё гэта адсылаецца пісьменнікам, мастакам, кампазітарам, грамадскім дзеячам, касманаўтам, вучоным. Гудзевіцкія гальштукі берагуць, як рэліквію, блізкія Івана Мележа, Уладзіміра Караткевіча, Уладзіміра Дубоўкі, а таксама Васіль Быкаў, Янка Брыль, Пімен Панчанка, Ніл Гілевіч, Максім Танк, Юрый Семяняка, Пётр Клімук, Уладзімір Каваленак і многія іншыя.

Вера Ігнатаўна заўсёды першая дарадчыца і памагатая Алеся Мікалаевіча па афармленні музея. Выраб выцінанак, кветак для этнаграфічнага музея, бяленне сцен сялянскай хаты XIX стагоддзя, пасадка кветак у агародчыку каля хаты-музея, захаванне зімовых кветак і living рознага насення стала яе абавязкам.

Часта на справы музея патрэбны былі грошы. Бюджэт сям'і Белакоза звычайна быў не большы за 300 рублёў у месяц на шэсць душ. Аднак і з гэтай

сумы Алесю Мікалаевічу даводзілася траціць часам нават па месячнай зарплаце на розныя музейныя патрэбы. І гэта тады, калі за ўсе дваццаць гадоў свае музейнай дзейнасці ён ні капейкі не атрымаў за працу ў музеі. Старшыня мясцовага калгаса Міхась Сцяпанавіч Пронька прапаноўваў плату за кіраўніцтва музеем, але Белакоз ад яе адмовіўся.

Іншая жонка за такую трату грошай грызла б поедам, а Вера Ігнатаўна толькі пры самых крытычных фінансавых сітуацыях раілася з мужам, дзе пазычыць патрэбную суму, каб дацягнуць да новай зарплаты.

Многія настаўнікі, калгаснікі, знаёмыя Белакоза, дзеці якіх жывуць у шыкоўных кватэрах, раз'язджаюць на ўласных машынах, пасміхаюцца з Алеся Мікалаевіча:

— Дзівак! З-за нейкага музея нават родных дзяцей не забяспечыў...

Вера Ігнатаўна ніколі гэтым не папракнула мужа.



## ЦАР-ДУБ

*Служкі чалавека ● Наша невуцтва*
*Суվораўскія студні ● Чаму гінуць дубровы*
*Вяртанне буслоў ● Пажэжынскія ельнікі*
*Час бярозавіку ● Патрыярх*

Сярод дрэў, што растуць на нашай зямлі, дуб займае ці не самае пачэснае месца. Людзі спакон веку, калі хацелі, каб хата стаяла доўга, будавалі яе на дубовых падрубах. Каб студня была надзейнай і вада ў ёй не «цвіла», была заўсёды сцюдзёнай і чыстай, зруб рабіўся таксама з дубовых плашак. А страла? А дрэўка кап'я? А тапарышча? І для гэтых рэчаў не было лепшага матэрыялу як дуб. Дубовая лава ўздоўж сцяны... Дубовы стол... Дубовая ступа... У няхітрай сялянскай гаспадарцы ўсё гэта, нават дубовая калодка, лічылася найлепшым, не мела цаны. З дубу гнулі абады, палазы, рабілі бочачкі, кадушкі, дзежкі — адным словам, усё, што павінна доўга служыць чалавеку. Палі ў раку таксама забівалі дубовыя. На іх насціл моста мог ляжаць надзейна не адзін дзесятак гадоў. А мораны дуб? Які гэта багаты дарунак прыроды! Бо не знайсці прыгажэйшай тэкстуры дрэва, як з моранага дубу. Яго пускалі на самыя шыкоўныя вырабы — шафы і шафкі, канапы і

крэслы, ложкі, куфры, розную драбязу. Дуб быў не падуладны часу — ён не гніў у вадзе, яго не «браў» шашаль, не шкодзілі яму ні вецер, ні сонца. Ён нібы валодаў цудадзейнай сілай. А колькі казак, паданняў і легендаў хадзіла ў народзе пра неверагодную сілу гэтага дрэва, пра вечную еднасць яго з роднай зямлёй!

У людзей склаўся і класічны вобраз дуба: галінастае дрэва з таўшчэзным камлём і густой шапкай-кронай. Высокі зялёны стог сярод паляны ці поля!.. Такім яго малявалі мастакі, такім яго мы бачылі ў школьных чытанках. Такім і ў маім уяўленні бачыўся дуб, пакуль у далёкім сорак пятым не трапіў у Белавежскую пушчу. Упершыню ў жыцці сустрэў там зусім іншыя дубы — як гонкія сосны, з гладкім камлём і невялікай кронай наверсе. У той жа Белавежы пабачыў дуб-волат, якому больш за чатыры вякі. Ён таксама быў высокі, з роўным і гладкім камлём.

А які ты будзеш, пажэжынскі велікан? Ты ж старэйшы за самага старога дуба-палевіка, за самага гонкага дуба-пушчавіка. Падобных табе няма ў Беларусі. У знак павагі да твайго ўзросту цябе, адзінага на нашай зямлі, называюць Цар-дубам. Дык які ты будзеш, пажэжынскі Цар-дуб?

Задаваў сабе гэтыя пытанні па дарозе ў далёкі Пажэжын, што на Брэстчыне, але адказу не знаходзіў. То ўяўлялася, што Цар-дуб, як і пушчанскі яго сабрат, кронаю расчэсвае аблокі. То мроілася, што ён, прысадзісты, каржакаваты, стаіць ускрай сяла і чакае пад веснавым сонцам хвіліны, калі па жылах яго пабягуць жыватворныя сокі зямлі.

Але гэта былі толькі мроі, здагадкі.

Нічога канкрэтнага не маглі паведаміць і суседзі па купэ цягніка — людзі тутэйшых мясцін. Многія таго Цар-дуба не толькі не бачылі, але нават і не чулі пра яго існаванне. Падумалася тады: шмат страцілі мы! Пра далёкую Афрыку з яе блакітным Нілам ведаем нямала, шмат чаго чулі пра самую высокую піраміду ў свеце. А вось пра тое, што маем побач, тут, дома — нават і ўяўлення ніякага. Вось

яскравы прыклад нашага выхавання, белыя плямы якога так высвечваюць, прабачце, наша невуцтва!

У Пажэжын прыехаў на пачатку дня і адразу пайшоў у гісторыка-краязнаўчы музей мясцовай дзесяцігодкі.

— Пажэжынскі Цар-дуб сапраўды існуе,— сказаў мне Васіль Панасавіч Масюк, педагог-кіраўнік школьнага музея. Толькі ён не ў Пажэжыне, а на тэрыторыі Пажэжынскага лясніцтва. Яно таксама не ў Пажэжыне, а далёка адсюль — у вёсцы Старое Раматова.

— ???

— Ведаеце, усё гэта — вынік шматлікіх перабудоў ды перакроек не толькі ў лясной гаспадарцы... Але вёска наша можа пахваліцца не менш цікавым — Сувораўскімі студнямі.

Пажэжын — вёска не малая. Яна складаецца як бы з некалькіх пасёлкаў — Багнюкі, Вашчылы, Сэмэнікі, Луцюкі, Тарасы, Лойкі, Бэрэзкі, Чэрнакі. Дык нам трэба трапіць ажно ў тыя Чэрнакі, дзе насупраць хаты Зосіма Ігнацюка і захавалася яшчэ Сувораўская студня. Васіль Панасавіч ідзе папераддзе і кажа, што дзве такія ж студні нядаўна засыпалі, каб хто знянацку не ўваліўся туды. А гэтую — абнеслі плотам, узялі пад ахову як помнік былых часоў.

З'явіліся Сувораўскія студні ў Пажэжыне даўно — у сямідзесятых гадах васемнаццатага стагоддзя, калі тут былі раскватэраваны войскі Суворава. Салдаты рабілі тыя студні з такім разлікам, каб дакапацца да крынічнай вады, якую скарыстоўвалі для выпечкі хлеба. А каб яны служылі надзейна, не асоўваліся, шахту капалі конусную, круглую, сценкі абкладвалі каменем. Толькі зверху, над зямлёй, быў дубовы зруб з накрыўкай. Вада ў такой студні была заўсёды чыстай, смачнай і халоднай. Людзі да нядаўняга часу карысталіся ёю. Але калі ў гэтых мясцінах правялі меліярацыю, узровень грунтавых вод упаў — студня высахла. Няма ўжо і Зосіма, які бярог яе, ахоўваў многія гады.

А які ён быў музыкант! Ніводныя хрысціны, ніводнае вяселле не абходзіліся без яго. Зосім быў лесніком — стараннын і руплівым, але галоўным у жыцці лічыў музыку. Гадоў паўсотні таму назад адзін пінчук зрабіў яму гармонік — галасісты, залівісты. Дык з тым гармонікам ляснік да апошніх дзён не разлучаўся. Зосім і мелодыю мог скласці, і ў ансамблі іграць. Яшчэ і зараз у наваколлі жыве «Зосімава полька». А «Ойра» ці «Матлет»? Таксама яго музыка!..

Вось, нарэшце, і пасёлак Чэрнакі. Праходзім трошкі вуліцай, і пры самай хаце заўважаю: штыкетнікам абнесены невялікі квадрат зямлі. Гэта і ёсць Сувораўская студня!

Абыходжу вакол агароджы, стараюся зазірнуць па той бок штыкетніка, але мала што бачу: віднеецца толькі «вока», метры на тры ў дыяметры, ды некалькі верхніх радоў каменнай кладкі. Рызыкнуў узлезці на шула — ажно жахнуўся: глыбіня, як дастаць позіркам, а на самым донцы плаваюць камлыжкі ільдзін. Добра захавалася каменная кладка. Праўда, у іншых месцах пясок між асобных камянёў асыпаўся, утварыўшы невялікія лёхі, якія паспеў прыкрыць мох — дзе зялёны і на выгляд вільготны, дзе шэры і як бы сухі. Бліжэй да паверхні між камянёў пучкамі вытыркаецца леташняя пажоўклая трава. Ад зруба і следу нават няма — згніў, відаць, даўно, а труху развеяў вецер. Дзіва што! Студні болей за дзвесце!

Адсюль, з Пажэжына, як сведчаць гісторыкі, ішоў Сувораў са сваім войскам праз той Цар-дуб, праз Замшаны, Маларыту, Олтуш — ажно пад Арэхаўскае возера, дзе ў 1771 годзе даў бой польскім канфедэратам і разбіў іх. Там, паблізу возера, цяпер стаіць абеліск у гонар перамогі Суворава.

— А з Цар-дубам звязвае наш музей адна цікавая гісторыя,— сказаў Васіль Панасавіч, калі мы вярталіся ад Сувораўскай студні.— Было гэта ў васьмідзесятым годзе. Прыходзіць неяк у музей Марыя Сыч. Яна ў Старым Раматове жыве. Прыходзіць, значыць, і пачынае здалёк: у вас, кажа, група «По-

шук» існуе, то мо яна адшукала б аднаго чалавека? Яго Раманам завуць, а па прозвішчу — Рагаўцоў. Я яго ў вайну ад смерці ўратавала. А што з ім цяпер, дзе жыве — не ведаю.

І Марыя Сыч расказала, як перад самым вызваленнем, у першыя дні чэрвеня сорак чацвёртага года,ляснымі сцежкамі яна прабіралася ў партызанскі атрад (жанчына была тады сувязной) і ў самым глухім месцы, недалёка ад Цар-дуба, сустрэла абарванага, схуднелага і аброслага чалавека. Ён назваўся савецкім лётчыкам, сказаў, што яго бамбардзіроўшчык быў збіты нямецкімі знішчальнікамі, калі вяртаўся з баявога задання, і папрасіў звязаць яго з партызанамі.

Нейкае ўнутранае чуццё падказала жанчыне, што чалавек — наш, гаворыць праўду, што яму трэба абавязкова дапамагчы. І яна прывяла знясіленага лётчыка ў партызанскі атрад. А што з ім было потым, як склаўся яго лёс — не ведала.

Вывучэнне архіваў нічога нам не дало. Тады аб усім гэтым мы напісалі ў абласныя газеты. І вось неўзабаве ў Пажэжын прыязджае жонка Рагаўцова. Яна паведаміла, што Рамана Паўлавіча ўжо няма ў жывых — памёр ад ран, а тады, у тыя далёкія дні, з партызанскага атрада яго адправілі самалётам на Вялікую зямлю... Калі адбылася тая паветраная трагедыя, з ім быў пілот Мікалай Мінчанка, які адразу ж загінуў. Штурман Валянцін Чыгір застаўся жывы. Ён, як і Рагаўцоў, выкінуўся з палаючай машыны, прызямліўся недзе паблізу Цар-дуба, доўга прабіраўся лясамі і таксама трапіў да партызан. Служылі адважныя лётчыкі ў адным з авіяцыйных палкоў, які тады базіраваўся на Палтаўшчыне. А ў той дзень вярталіся з баявога задання з-пад Брэста...

Наша група «Пошук» адшукала і штурмана Чыгіра. У музеі ёсць яго ўспаміны пра той эпізод ваенных гадоў.

На развітанне Васіль Панасавіч сказаў мне:

— А да Цар-дуба дабрацца цяпер можна толькі

даўшы добрага кругаля — праз Дубічна і Раматова. Бо напраcткі, лясными сцяжынамі, цяпер не прайсці: не ўсюды яшчэ і снег растаў — бездараж. Дарэчы, у Дубічна жыве былы аб'ездчык — Мікалай Ананчык. Не мінайце яго хаты! Ён цяпер на пенсіі, але можа расказаць шмат цікавага.

Дубічна не параўнаеш з Пажэжынам. Вёска мае ўсяго адну вуліцу, але шырокую і доўгую. Хаты стаяць усё адно як абапал шасейкі. Пляцы каля іх — вялікія. Там і садочкі, і грады, а на іншых — і соткі пад бульбу. Аднак лесу паблізу няма. А думалася: Дубічна — пры дуброве...

Гутару з Мікалаем Ананчыкам.

— Некалі,— кажа ён,— так і было. Лясы стаялі наўкол. Дубіна́ расла. Цяпер бліжэйшы лес кіламетры за паўтара адгэтуль. Але ён мяшаны: альшына, елка, сасна. Дубіна́ толькі зрэдзь пракідаецца. Ды людзі ўсё ж дубровай завуць яго. Дубровай!

Ён памаўчаў трошкі і стаў тлумачыць:

— Нават на вачах аднаго пакалення мяняюцца лясы нашы. Раней на тэрыторыі Маларыцкага раёна дуброў было ўга колькі! Дубы раслі на палях, пры дворышчах таксама стаялі. Людзі садзілі іх каля хат або сяліліся пры дубах. А цяпер? Паспілоўвалі дубіну і на палях, і ў лясах, і каля дворышчаў. Ды і садзім яе мала. Расце ж марудна! Дзед, скажам, пасадзіць, а толькі прапраўнук скарыстаць можа... Балюча глядзець, як сталі абыходзіцца з дубам. На Дубічна, на ўсю вёску, лічы, усяго тры дубкі і засталося. Стаяць супраць Іванавых хат — Дземядзюка і Луцука,— як помнікі якія. Даўней, казалі, ці не кожны пляц у Дубічне сваім дубам хваліўся!.. А цяпер адно толькі чуем: Цар-дуб, Цар-дуб... Калі шчыра казаць, дык гэты Цар-дуб сам сябе і зберог. Пілы такой не было, каб спляжыць яго.

Ананчык зноў нейкі час маўчыць, а тады дадае:

— А ў нас жа е нямала дубоў, якія маглі б таксама лічыцца помнікамі прыроды. Адзін каля Цар-

дуба стаіць, яму не адна сотня гадоў будзе. Ва ўрочышчы Берастава таксама расце дуб мала меншы Цар-дуба — ажно на тры абхваты. І крону мае прыгожую. Яна нібы шар зялёны, калі ўкрыецца лісцем... У тым закутку да вайны была вёсачка Берастава. Цяпер можна толькі хатнішчы адшукаць ды колішнія студні. Вёскі не стала, а назва жыве; урочышча Берастава!.. А ўзяць дуб, што пры дарозе з Раматова на Арлянку? Дужа цікавае дрэва! З зямлі мае адзін выхад, а ў паўметры ад яе выбіўся другі камель, пасынак, напалавіну танчэй асноўнага. Праз пару метраў да пасынка дацягнулася таўстая галіна, злілася з ім і ўсё адно як падтрымлівае яго, нібы руку дапамогі падае... І што думаеце? Ад таго месца пасынак раздало ўшыркі, ён стаў удвая таўсцейшы за сваю аснову і вунь як расце! На здзіў усім. Я гэтыя дубы таксама помнікамі прыроды аб'явіў бы. Бяруць жа на ўлік не такія! А тут — і узрост паважны, і форму арыгінальную маюць...

Былы лесавод меў рацыю. Яго заклапочанасць пра стан дуброў таксама была зразумелай. У нас жа, калі шчыра казаць, сапраўдныя дубровы катастрафічна знікаюць. Мы мала саджаем дубу, а болей спадзяёмся на самасей. Але і яго пускаем на волю лёсу: выжыве — дык выжыве, не — дык не.

У Верхнядзвінскім раёне давялося быць у адной дуброве, што раскінулася на беразе быстрацечнай Свольны. Дубы ў гадах адчувалі сябе яшчэ сяк-так. А маладняк? Яго амаль не было. То каса яго зразала, то карова згрызала, і падняцца ён ніяк не мог. Нешта падобнае назіраў і на сутоку Нёмана і Шчары. У пойме гэтых рэк яшчэ захаваліся адзінокія векавыя дубы. Але іх часта знішчае агонь. Падпаліць хтонебудзь нутро старога дрэва, і яно курадыміць, пакуль вецер не пераломіць камель, не пакладзе на дол. Гэта ж бачыў і на беразе Баброўіцкага возера, што ў Івацэвіцкім раёне, і ў пойме Прыпяці, і на Сожы, Бярэзіне, у шмат якіх мясцінах Беларусі. Маркотна рабілася на душы ад усяго гэтага. Дрэва, якому цаны няма, мы не беражом...

— Вы куды цяпер? — разумеючы мой стан, запытаўся Мікалай Ананчык.— У лясніцтва? Тады кіруйце адразу ў Старое Раматова, да ляснічага Аўсяніка. Ён і Цар-дуб пакажа, і Пажэжынскія ельнікі. Бо шкадаваць будзеце, калі не пабачыце ўсё тое.

Нарэшце я ў Старым Раматове. Іду пескаватай вуліцай, прыглядаюся да сяліб, каб не мінуць канторы Пажэжынскага лясніцтва, як раптам бачу: аблакаціўся на веснічкі сярэдняга росту чарнявы чалавек, ссунуў капялюш на патыліцу і размаўляе з буслікам. Буслік па той бок вуліцы, на невысокім хляве, топчацца па ўскрайку гнязда і ніякай увагі не звяртае на чалавека. А той — зноў да яго:

— Гаворыш, прыляцеласа? Ну то й добрэ. Якраз упору, не спазнівса.

Буслік толькі цяпер як бы зразумеў, што словы тыя адрасуюцца яму, перастаў таптацца, закінуў дзюбу і клекатнуў.

— Ну во! — ужо звяртаючыся да мяне, прамовіў чалавек у капелюшы.— Буслык ныбы і повітавса з намы!.. Ён адзін-адненькі на ўсё Раматова. Спачатку жыў на Максімавай грушы. А колы грушу крутавеем зламала — мы перанеслы кубло на Іванаў хліў. Ускорасці Іван перакрываць хліў сабраўса. Тады кубло перанеслы на мой хліў. Ды і я раптам уздумаў перацягнуць сваю будыніну на другі бок вуліцы. Гняздо зноў перанеслы на Іванаў хліў, блізка да таго месца, дзе груша колысь стаяла. І нічога! Буслык прыжываўса ўсюды, не пакідаў нас. І зараз, бачыце, прылеців!..

Чалавек нібы засаромеўся, што гаворыць на мяшанай, беларуска-украінскай, мове, і як бы сумеўся.

— А нічога! — сказаў я.— Гаварыце, як маці ваша гаварыла, бацька, як вёска гаворыць.

Тады ён быццам памаладзеў, а вочы яшчэ болей блакітнымі зрабіліся. Далей ужо гаварыў — як гаварылася:

— А ў нас болей па-паляшукоўску гаворать, на мове, падобнай на ўкраінскую. А ў Новым Раматове,— кіўнуў галавою ўправа,— гаворать толькі па-

беларуску. Там усе — прыезджыя, з Пружаншчыны. Яшчэ пры цары, кажуць, памешчык тут зэмлю прадаваў. Вось і прыехалы адтуль люды. Раней,— ён усміхнуўся,— старараматоўцы называлі новараматоўцаў глячамы, а яны нас — паляшукамы. Але жылы ціхамірна, не крыўдавалы, не білыса.

Паправіў капялюш, расшпіліў два верхнія гузікі ў фуфайцы і як бы пахваліўся:

— Колысь ездыў у Днепрапятроўскую вобласць да швагра. І там гаворацъ, як у нас, песні нават пяюць нашы — «Расцвіла калына», «Канэц грэблі шумяць вербы», «Распрагайце, хлопцы, коні», «Ляцеў воран...»

Цагляны домік лясніцтва — на ўскрайку сяла, якраз насупраць калгаснай фермы. Справа падступае лісцевы лес — у асноўным альшэўнік. Дзе-нідзе пракідаецца бярэзінка, асіна. Ускрай лесу сям-там стаяць вербы, звесіўшы гнуткае голле, усыпанае коцікамі. Здаля здавалася, што гэта бялеюць буйныя кроплі расы. А на самым дворышчы лясніцтва — два таўшчэзныя дубы. У свой час іх мінула піла, абышла сякера, і цяпер яны шырока раскінулі магутныя галіны, выгравалі на сонцы пупышкі.

Леанід Аляксандравіч Аўсянік быў на месцы. Каб і не ведаў, што гэта ляснічы, усё роўна здагадаўся б. Трымаўся ён з годнасцю, у размове — спакойны, разважлівы. Па ўсім было відаць: не навічок. Запытаўся пра гэта і пачуў:

— Больш трыццаці гадоў на адным месцы! Праўда, не раз прапаноўвалі павышэнне, не пайшоў. А сам не тутэйшы — з Нясвіжскага раёна.

Тое, што ляснічы не з мясцовых, сведчыла мова. Толькі тады-сяды траплялі слоўцы тутэйшай гаворкі. Але Аўсянік стараўся пазбягаць іх — гаварыў чыста па-беларуску.

Размова неяк сама па сабе перакінулася на дубровы, на іх стан.

— Калі падумаць, то праўду казаў мой былы аб'-

ездчык,— разважаў ляснічы.— Дасталося дубровам і ў вайну, і пасля вайны. Такое было не толькі ў нас — па ўсёй Беларусі. Але скажу пра свае. Самая цікавая тут — Раматоўская дуброва. На трох гектарах амаль толькі дуб расце, на астатніх пяці — дуб у сумесі з сасной. Сярэдні ўзрост дрэў — сто гадоў. Асобныя — шмат старэй і дасягаюць метровай таўшчыні... Дык я да чаго хілю? Амаль сорак працэнтаў гэтай дубровы ў той час было высечана. І заўважце: пляжылі лепшыя дрэвы! Цяпер Раматоўскую дуброву захоўваем як насенны ўчастак.

Леанід Аляксандравіч дастаў з шафы карту-схему, разгарнуў яе на стале і пачаў тлумачыць, дзе што знаходзіцца ў яго гаспадарцы.

— Вось яна, Раматоўская дуброва! — абвёў пальцам невялікі ўчастак на карце.— А вось маладыя пасадкі дубу. А тут, бачыце, спелыя лясы, тут — прыспяваючыя. А ўсяго ў нас пад дубiнóю, як тут кажуць, трыста пяцьдзесят гектараў. Ну а гэта,— ён паказаў на невялікія плямкі трошкі іншага колеру,— для вас, можа, і сенсацыяй будзе,— астраўныя ельнікі! Унікальныя тым, што ў іх пераважае хуткарослая карпацкая елка. Дарэчы, яна ў нас — самы паўднёвы арэал распаўсюджвання. І яшчэ. У параўнанні са звычайнай (еўрапейскай) карпацкая расце намнога хутчэй. У сярэднім узросце абганяе сваю саперніцу па вышыні на 25 працэнтаў, па дыяметру — на 30 і па плошчы сячэння — амаль на 50 працэнтаў. Не дзіўна, што Пажэжынскія астраўныя ельнікі з'яўляюцца помнікам прыроды рэспубліканскага значэння. Мы іх беражом, праводзім толькі санітарную высечку.

Ляснічы згарнуў карту, паклаў на месца, прысеў да стала.

— Каб атрымаць больш поўнае ўяўленне аб Пажэжынскіх ельніках, іх унікальнасці, прывяду такі прыклад. Гадоў дваццаць пяць таму назад раматовец Сцяпан Шапялюк купіў у лясніцтве вывараценъ аднае карпацкае елкі. Купіць то купіў, а што далей? Пахадзіў ён вакол таго вываратня, пацмокаў і рызыкнуў

на такое: адрэзаў васьміметровы кавалак ад камля і папілаваў на брусы, а з тых брусоў склаў... сцяну хаты. Выходзіць, з чатырох такіх елак можна ладную хату паставіць! Во якія «елачкі» растуць у нас!

— А дубы-веліканы? Я ж мо дзеля вашага Цар-дуба і ехаў сюды! — сказаў я.

— Сапраўды, падобнага няма нідзе. Ды мала хто ведае пра яго. Стаіць у баку ад вялікіх дарог! — нібы спачувальна прагучаў голас ляснічага.— Іншы раз, праўда, школьнікі прыйдуць. Бывае, экскурсія з Брэста ці з Украіны прыедзе. А так...

Ляснічы нейкую хвіліну маўчыць, а тады бачу: у яго вачах раптам загараюцца іскрынкі:

— А некалі ж ля Цар-дуба вяселлі спраўлялі! Адразу пасля вайны там «вянчаўся» Мікалай Хамічук з Верай Кучко. Пазней — Мікалай Лойка з Волькай Юхімук. А потым — яшчэ той-сёй. Справа ў тым, што ў тыя гады людзі тутэйшыя трымаліся такога правіла: распісвацца ў сельсавеце — распісвайся, але і пра царкву не забывай. Адным словам, бацькі сілком выпраўлялі маладых пад вянец. Царква была ў Замшанах, а дарога туды паўз Цар-дуб ішла. Ну і маладыя даязджалі з дружынаю толькі да Цар-дуба.

Аўсянік расказвае, а мне бачыцца небагаты ў тыя пасляваенныя гады вясельны поезд, які пляцецца па лясной дарозе. Насупраць Цар-дуба сват азіраецца, шэпча маладым:

— Да патрыярха?

І, не дачакаўшыся адказу, наструніць правую ляйчыну, паверне ўвесь поезд на суседнюю прасеку, паставіць коней у цянёк. Маладыя з дружынаю пакінуць вазы, пойдуць туды, да Цар-дуба. І не зглёдзіш як сват апыніцца наперадзе іх і будзе казаць цяпер ужо на ўвесь голас, каб чулі ўсе:

— Бацюхна патрыярх наш! Цар лясоў нашых! Благаславі маладых на жыццё добрае і доўгае, якое ты сам пражыў. Каб над іхнімі галовамі толькі мір-

ныя вятры праляталі ды адно з жыватворнымі дажджамі...

Паклоняцца маладыя патрыярху-дубу, а за імі дружына, тады ўсе разам пойдуць на суседнюю палянку, станцуюць першы вясельны танец і, вытрымаўшы патрэбны час, вернуцца дадому. Там спытаюць, маючы на ўвазе царкву:

— І як?

— Нармалёва! — адкажуць маладыя.

І вяселле будзе працягвацца на радасць усёй вёсцы.

— Колішнія маладыя пастарэлі, сівізною пакрыліся галовы іхнія, а Цар-дуб, якім быў, такім і стаіць,— раздумліва казаў ляснічы.— Сёння позна ужо. Агледзіны заўтра зробім. А цяпер — да мяне. Вячэра недзе стыне!

— Ну, а самі як жаніліся? — нібы Піліп з канапель, выскачыў я з недарэчным пытаннем і тут жа пашкадаваў: якое права маю ў душу лезці! Аднак ляснічы ўсё адно як чакаў гэтага, адказаў ні то жартам, ні то ўсур'ёз:

— У тым, што я цяпер са сваёй Надзеяй, таксама Цар-дуб вінаваты.

Гэтыя словы былі сказаны ў сенцах, але Надзея Мацвееўна, жонка ляснічага, учула, здагадалася, пра што ён, прамовіла смехам:

— А невядома! Можа тут мая «віна» большая.

Аўсяніку не было куды дзявацца і ён стаў расказваць:

— Было тое трыццаць гадоў таму назад. Мы тады каля Цар-дуба лес валілі, упершыню «Дружбу», бензапілу, прымянялі. Я на радасцях «варон пачаў лавіць», а бервяно — бэнц па назе і перабіла. Трапіў у абласную бальніцу. А яна, Надзея мая, медсястрою якраз там працавала. Пазнаёміліся, спадабаліся адзін аднаму і пажаніліся неўзабаве. Так што, бачыце, і тут Цар-дуб...

— Цар-дуб, Цар-дуб! — незласліва кажа Надзея

Мацвееўна.— І я тады, лічы, царыцай была! І ты, не пры людзях кажучы...

Яна нібы спахапілася:

— Ат! Хопіць блазнаваць! — засмяялася адкрыта, шчыра, па-дамашняму.— Мыйце рукі ды за стол!

У пакоі, дзе мне паслалі, было ўтульна і добра. Праз адчыненую фортку плыло ў хату вясновае паветра, пахла леташнім дубовым лісцем, белымі коцікамі вярбы, маладой травой. За акном стаяла цішыня. А перад вачыма паўставалі то чорная глыбіня каменнай студні, то заклапочаны твар былога аб'ездчыка Ананчука, то спагадлівая ўсмешка раматоўскага Міхала, які так хораша размаўляў з буслікам.

Успамінаўся і другі буслік, які некалі «кватараваў» у Валодзі Харсюка, жыхара Маларыты. Звалі таго бусліка Васілёк. Быў ён рахманы, лётаць не мог з прычыны вывіхнутага крыла і... памагаў гаспадару пасвіць гусей.

...Як сёння, бачыцца незвычайны малюнак. Васілёк стаіць каля веснічак і грэецца ў промнях ранішняга сонца. Да вясны яшчэ далёка. Буслік падымае то адну, то другую нагу і хавае ў пер'і, каб хоць трошкі сагрэць.

— Васілёк! Хто ж цяперака босы ходзіць? Ідзі абувацца! — чуецца з парога.

Неахвота бусліку вяртацца ў хату, але трэба. Бабка Гапа, Валодзева маці, дастае з запечка боцікі-панчошкі, што спецыяльна пашыла яму, нацягвае на доўгія чырвоныя ногі, завязвае матузкі і гаворыць:

— Цяперака нармалёва!

Васілёк ведае, што зараз яны пойдуць у магазін. Пакуль бабка шукае сумку, ён правярае — на ўсякі выпадак — вузялкі матузкоў. Хоць у боціках і нязручна, але холаду такога буслік не адчувае, можа смела ступаць нават у сумёт... А калі яны з бабкай выходзяць на тратуар, Васілёк крочыць наперадзе, горда ўзняўшы галаву і толькі азіраецца: а ці не адстала ад яго бабка?

Правёўшы бабку Гапу да магазіна, буслік спыняецца, даючы зразумець, што далей не пойдзе, а пачакае тут, на вуліцы.

І ён стаіць і ўсё пазірае і пазірае ў неба.

...Не раз хацелася Васільку падняцца, зрабіць хоць адзіны круг над гарадком — на радасць сабе і людзям. Але... Валодзя гэта разумеў. Улетку іншы раз браў яго пад паху і нёс ажно на бераг Маларыты-ракі, дзе прыемна казытаў ногі зялёны мурог, скакалі конікі, крумкалі жабы. Бывала, прыляталі туды і буслы, але Васілька не падпускалі да сябе, быццам ён быў вінаваты ў нечым. Паходзіць буслік гадзіну-другую і — назад, на бабчын панадворак.

— Ты б, Васілёк, хоць занятак які знайшоў,— сказала аднойчы бабка Гапа.— Гусей пасвіў бы ці што...

Гусей Васілёк недалюбліваў. Дурноту сваю яны паказвалі кожны раз: то ў грады лезлі, то забіраліся ў копанку і да вечара плюхаліся ў вадзе. А бусліку стой крукам над імі, пакуль не прыйдзе бабка Гапа і не напомніць дубцом, што пара дадому...

Бабка Гапа вярнулася неяк нячутна, падышла, пагладзіла Васілька па галаве і сказала:

— Ну то хадзем ужо. Я свежанькай рыбкі табе купіла.

І яны паволі пайшлі дадому.

...Быў Васілёк перад вачыма доўга. Пакуль не прыйшоў сон.

Не паспеў певень у двары пракукарэкаць, а я быў ужо на нагах. Выйшаў на ганак. Дзень толькі нараджаўся. Верхавіны ўкрытага туманам альшынніку адлівалі ружавінкай — недзе з-за лесу ўставала сонца. На бліжэйшым дубе высвіствалі шпакі. Над дворышчам праляцеў грак і сеў на калодзежны журавель. І тады з-пад лесу, з клубоў туману, выйшаў чырвонай масці конь, паволі падышоў да студні, прыпаў да карыта і доўга піў налітую яшчэ з вечара ваду. Калі конь патупаў назад, у туман, адразу па-

чуўся грукат цягніка. Падумалася: дзе тая чыгунка, а вунь як чутно, нібы пралягае тут, побач, ускрай сяла.

Цягнік яшчэ грукатаў, як над альшыннікам узнялося сонца. Яно застыла на нейкую хвіліну, нібы зачапілася за галіну, а тады паплыло над верхавінамі дрэў, увачавідкі мяняючы колер.

Пачуліся крокі. Гэта Леанід Аляксандравіч ішоў сцяжынаю, што вілася ад лесу, і нёс вядзерца бярозавіку.

— А чаго рана так? — спытаў ён і прапанаваў пакаштаваць ляснога пітва.

Бярозавік быў на здзіў смачны.

Па той бок плоту працокала буксамі і спынілася фурманка. На возе з бідонамі сядзеў чалавек у капелюшы. Дык гэта ж учарашні Міхал, што размаўляў з буслікам! А малаказборшчык ужо саскочыў з воза, падышоў да нас, падаў руку і адкрыта і добразычліва ўсміхнуўся. Тым часам Надзея Мацвееўна вынесла дайніцу сырадою:

— Свежанькае!

Міхал выліў малако ў бідон, бразнуў накрыўкай, праверыў, ці добра закрылася, і, кіўнуўшы нам, паехаў далей.

Неўзабаве і мы з Аўсянікам адправіліся ў дарогу. Ішлі то шырокім і ўезджаным шляхам, што пралёг з Раматова на Замшаны, то звілістымі і не абабітымі яшчэ пасля зімы сцяжынамі, мінаючы сасначкі, прагалы з рэдкім ядлоўцам, нізінкі, парослыя лазою. Нарэшце перайшлі масток, зноў трапілі на дарогу і ледзь не адразу апынуліся ў змрочным чарналессі. Высокія альшыніны стаялі маўкліва. Сям-там высвечвала белым камлём бярэзіна. Траплялася на вочы і ліпа. А між імі то там, то тут кусцілася ляшчына, іншая лясная драбяза. Было золка.

Раптам па левую руку, пры самай дарозе, заўважаю нешта накшталт аркі, ад яе — сцежку ўглыб лесу. У канцы тае сцежкі цямнее штосьці таўшчэзнае і высознае.

— Ен? — пытаюся.

— Ён! — ківае галавой Аўсянік.

Мы ідзём да Цар-дуба і абодва хвалюемся. Ляснічы — ад таго, што можа ганарыцца такім цудам прыроды, я — таму, што ўпершыню бачу гэты цуд. Не даходзячы метраў дзесяць, спыняемся. Бацюхны! Дык вось які ты, патрыярх лясоў нашых!..

— Васемсот гадоў з гакам мае! — кажа Аўсянік і ўдакладняе:— А які той гак — ніхто і не ведае.

Ён не вытрымлівае, падыходзіць і спрабуе як бы абняць дуб.

Ды дзе там! Трэба амаль пяць абхватаў! Ляснічы адступае, здымае шапку, аглядае з нізу да верху ляснога асілка і тлумачыць:

— Вышыня ажно сорак шэсць метраў. Крона з дваццаці шасці пачынаецца. Дыяметр яе — дваццаць пяць, не меней.— А гэта сляды перуна. Амаль штогод хвошча маланка па ім.

І я заўважаю шырокую мецiну, якая спаўзае ад кроны да самай зямлі, нібы хто знарок садраў з дуба кару.

Здзіўляюся: як такое магутнае дрэва можа ўстояць на зямлі, не паваліцца.

— Каранямі звязана! Углыб яны ідуць метраў на пяць, а ушыркі — і да дваццаці будзе,— адказвае Аўсянік.

Зямля вакол Цар-дуба ў каляровых лапінах. Белыя, сінія, фіялетавыя... Як іх не заўважаў раней! Гэта прабіліся скрозь леташняе апалае лісце першацветы — кураслеп, лясныя фіялкі, чубаткі ці, як іх завуць тут, канёздрыкі. Яны трымаюцца надзвычай бадзёра: паднялі стаўбункі-гронкі і прагна ловяць сонечныя зайчыкі.

Аўсянік паказаў і курцінку карпацкай елкі. Яна была не так далёка ад Цар-дуба і таксама ўражвала. Лапістыя дрэвы стаялі горда — ведалі сабе цану.

Вярталіся дамоў апоўдні.

Калі падняліся на пагорак, я не ўтрымаўся — азірнуўся. Здавалася, да самага небакраю раскінулася чарналессе. Над ім падымалася, уся ў сонцы, агромністая крона Цар-дуба.



## НА ЗЯМЛІ РАДЗІМІЧАЎ

*Адтуль ішло вызваленне*
*Пчаліная вёсачка • Камунар • Ссыльны памешчык*
*Фальклорны ансамбль • За завесай мінулага*
*Слынныя людзі Хоцімшчыны*

У Ліпаўцы сама цвілі сады.

Неяк адразу ўкрыліся белымі хусткамі чаромха, вішня, яблыня. Праз дзень-два паказала сметанковага колеру гронкі рабіна. А сліва ажно пенілася ад цвету. Налятаў лёгкі ветрык, і з прысад на вуліцу матылямі ляцелі пялёсткі.

Рассыпаліся ўздоўж Уюнкі, тамтэйшай рачулкі, адуванчыкі. Падымалася над хатамі сонца, і кветкі запальвалі свае ліхтарыкі — свяцілі з травы амаль да вечара.

Стараліся бярэзіны, таполі, клёны. Укрытыя маладым лісцем дрэвы неяк па-святочнаму аздаблялі дворышчы, вуліцы — усё паселішча. Яно было як у аксамітным вянку. У гэтым вянку вызначаліся святлейшыя мясціны. Гэта — ліпа. Яна толькі нядаўна выкінула на свет мяккае лісце і цяпер бралася выпускаць прадаўгаватыя, з тугімі пражылкамі «крыльцы», пры якіх ледзь відны былі кулачкі-бутончыкі будучых кветак.

А што будзе ў Ліпаўцы, калі зацвіце ліпа!

— Усё наскрозь мёдам прапахне,— кажа Іван Мурашка, шафёр мясцовага калгаса.— Мядовы водар усюды стаяць будзе.

Ён пераводзіць позірк на вішаньку, што па той бок плоту, за лавачкай, і сочыць за пчоламі. А тыя — як пашалелі. Гудам гудуць над квеценню, снуюць туды-сюды, спяшаюцца, нібы нехта тую вішаньку ў іх адбярэ.

— А як мае хутаране? — непакоіцца Мурашка.— Даўнавата не падглядаў. Мо дзе і непарадак які здарыўся.

У Ліпаўцы пчаляроў не так і многа. Ён, Іван Мурашка, Іван Бяспалаў, Андрэй Цішчанка ды Пятро Баравікоў. Але калі палічыць, то на іх чатырох пчаліных сем'яў сотні паўтары набярэцца. У Івана Мурашкі сёння выхадны, і я спачуваю: толькі дзеля нас траціць дарагія хвіліны пры хаце, а то б даўно быў на пасецы. Кажу свайму таварышу, Яўгену Сідарэнку:

— Мо падкінем?

Неўзабаве райкомаўскі «газік» гушкаў нас палявымі выбоістымі дарогамі — вёз туды, дзе за некалькі кіламетраў ад Ліпаўкі, у ляску, стаіць Іванава пасека. Мурашка, рады, што ўсё так абярнулася, кажа:

— А ведаеце, сёлета ў мяне ніводнай сям'і не прапала. І з зімы выйшлі моцнымі. А ў ляску трымаю — каб далей ад хіміі...

Начуліся мы ў свой час пра тую «хімію» і, галоўнае, пра тых, у чыіх руках яна знаходзілася. Бо ў іх свая задача, як лічаць яны, больш важная, чым у пчаляроў. І сыплюць яны сваю «хімію» калі ўздумаюць і дзе ўздумаюць, не папярэдзіўшы нават пчаляра. А каб і папярэдзілі? Усё адно страты былі б. Пчала ж не конь, яе не стрыножыш. Пад замком таксама трымаць не будзеш. Ёй патрэбны прастор, воля, кветка. А ў іншых месцах пчаляры трымалі пчол у поўным сэнсе слова за кратамі: штораніцы падсоўвалі ім кармушкі з сіропам — разбаўленым на

вадзе цукрам, і тыя вымушаны былі перапрацоўваць такі «нектар». Але які атрымліваўся мёд? Эрзац! Толькі і ён на рынку меў збыт — пускалі па той жа цане, што і натуральны.

Іван Мурашка, яго таварышы-пчаляры пайсці на такое не маглі, а з «хіміяй» ваяваць сіл не было, таму і рашылі перанесці пасеку далей ад сяла, ад палёў. Наязджаюць туды ўрыўкамі, у вольныя гадзіны, бо працу ў калгасе лічаць асноўнай.

Рослы, шыракаплечы, загарэлы і з дужымі рукамі, Іван Мурашка здаваўся асілкам. Чамусьці падумалася, што такім, відаць, быў і той малодшы сяржант — Зубовіч, які вызначыўся пры вызваленні Ліпаўкі. Я сказаў пра гэта ўслых.

— Да нашага сораму, адно толькі ведаем: салдатам быў мужным,— адказаў Сідарэнка.

Ен як загадчык аддзела прапаганды і агітацыі райкома, відаць, таксама не раз думаў пра Зубовіча, пра тое, што, на жаль, да апошняга часу не ўстанавілі яго імя, месца нараджэння. Аднак, не схаваўся за агульнымі фразамі — сказаў, як ёсць.

Іван Мурашка нібы і не чуў Сідарэнку, паказаў праз ветравое шкло на ўзлессе:

— Адсюль тады і наступалі нашы, каб вызваліць сяло.

...Было гэта ў верасні сорак трэцяга. І як тое было, роўна праз сорак гадоў, 27 верасня 1983 года, рэспубліканская «Сельская газета» паведамляла: «Пасля залпа «кацюш» 233-ці танкавы полк з дэсантам пехацінцаў 108-й дывізіі на брані кінуўся цераз раку на захад. На пярэдняй машыне, прыціснуўшыся да камандзірскага люка, ляжаў малодшы сяржант, сын беларускай зямлі Зубовіч... Як толькі быў знішчаны нямецкі заслон і галаўны танк узяў курс на першую беларускую вёску Малая Ліпаўка, разведчык Зубовіч разгарнуў дзяржаўны сцяг Беларускай ССР і прымацаваў яго да антэны танкавай радыёстанцыі.

Роўна ў дзесяць гадзін камандзір галаўнога танка ўключыў перадатчык.

— Я — «Зара», я — «Зара»,— паляцела ў эфір. У дзесяць ноль-ноль дасягнуў граніцы Савецкай Беларусі. Разгортваемся для атакі на Малую Ліпаўку.

А ўвечары ўжо ўся краіна слухала па радыё паведамленне Савецкага Інфармбюро: «Войскі правага крыла Бранскага фронту 24 верасня прарвалі абарону праціўніка на рацэ Іпуць і ў дзесяць гадзін па маскоўскаму часу перасеклі граніцу Савецкай Беларусі».

Наступленне шырылася. 25 верасня немцы пачалі дзень контратакай з боку Хоцімска. Асабліва цяжка было перадавым часцям 108-й дывізіі. За дзень ім давялося адбіць восем варожых контратак. Але як ні імкнуліся ўтрымацца гітлераўцы, супраціўленне іх было зломлена. У штаб фронту паляцела новае данясенне: «26 верасня 1943 года ў 7 гадзін 30 мінут раніцы часці 108-й і 110-й стралковых дывізій вызвалілі першы горад на беларускай зямлі — Хоцімск»...

Машына прабегла трошкі дарогаю і спынілася. Мы выскачылі з «газіка» і адразу адчулі, што трапілі як бы ў іншы свет. Вакол стаяў малады лясок, купкамі к дарозе падступалі кусты лазы. Адны цвілі ў поўную моц, другія толькі зацвіталі. Дол быў услапаны каляровым дыванам з кветак. І ўсюды гаспадарылі пчолы.

Прайшлі трохі сцежкаю і па левую руку, на невялікай палянцы, убачылі пчалінную «вёсачку». Яна мела мо з два дзесяткі домікаў. Паблізу, пад навіссю дрэў — стары вагончык, дзе захоўваецца рознае пчалярскае начынне і падчас начуе гаспадар пасекі.

Мурашка прысеў на лавачку, у цянёк, запрасіў і нас прысесці і, здавалася, ужо не рваўся да пчол. Павярнуўшыся ў мой бок, сказаў:

— Наша Ліпаўка — самая ўсходняя вёска. Мы, як кажуць, першымі ў рэспубліцы сонца страчаем. А там вось,— кіўнуў ён галавою,— зямля Бранская,

там — Смаленская. У нас жартуюць: кукарэкне ліпаўскі певень — на ўсе тры вобласці чуваць.

— І вёска, бачылі, нішто сабе,— дадаў Сідарэнка.— Адных толькі вуліц і неравулкаў мае за дваццаць. Дзвесце двароў налічвае.

— А ці бачылі генеральны план забудовы нашай Ліпаўкі? — зноў пачаў Мурашка.— У хуткім часе і не пазнаць яе будзе.

З планам тым мы знаёміліся. Зайшлі з Сідарэнкам у праўленне калгаса, а там стаіць шчыт, на якім пазначана, якою стане Ліпаўка ў бліжэйшыя гады. Гэта будзе пасёлак ажно на чатырыста двароў. Індывідуальныя дамы з прысядзібнымі пабудовамі мяркуецца ўзводзіць толькі на сродкі калгаса. За кошт гаспадаркі вырастуць і васьмікватэрныя дамы, будынак сярэдняй школы, спартыўны комплекс, гандлёвы цэнтр, лазне-пральны камбінат, раскінецца плошча з помнікам загінуўшым у апошнюю вайну аднавяскоўцам, а паблізу пасёлка з'явіцца штучнае возера.

Сідарэнка тады сказаў:

— Усё гэта не даніна модзе, а надзённая патрэба. Калгас абмаладжваецца, і гэта радуе. Пасля службы ў арміі хлопцы вяртаюцца дамоў — садзяцца за рычагі трактара ці баранку машыны. Не гойсаюць па гарадах і дзяўчаты. Вось некаторая статыстыка,— ён дастаў блакнот, пагартаў, адшукаў патрэбную старонку і дадаў: — Большасць калгасных механізатараў мае ўзрост да трыццаці гадоў. Толькі за апошнія тры гады тут згулялі трыццаць вяселляў. За пяцігодку ў васьмідзесяці сем'ях справілі радзіны... Аднак праўленню трэба неадкладна вырашыць адну не менш важную праблему — адкрыць у калгасе ну хоць бы філіял якога-небудзь прамысловага прадпрыемства. Тады канчаткова адпадзе пытанне пастаяннай занятасці людзей, асабліва жанчын.

— А няхай бы, хто вольны,— жартам прамовіў Мурашка,— пчалярствам займаўся. Гэта ж такая выгода!

Мы адчулі, што пчаляр меў на ўвазе нешта боль-

шае, чым сказаў, і вырашылі болей не перашкаджаць яму — развіталіся і пайшлі да машыны.

Па дарозе з пасекі Сідарэнка заўважыў:

— Паважаю вось такіх, непаседлівых. Не дарма ж яму, Івану Мурашку, ордэн Працоўнай Славы далі.

Калі выбраліся з ляска і ў далечыні паказалася вёска, ён дадаў:

— Ліпаўка адметна яшчэ вось чым. У дзевятнаццатым годзе тут камуна была створана. А праз дзесяць гадоў на яе базе быў арганізаваны калгас «Бальшавік». Дарэчы, у сяле жыве Хведар Лявонавіч Арцёменка, былы камунар. Мо заедзем да яго?

Сустрэў нас высокага росту і шырокі ў плячах дзед. Сам сівенькі, белыя «будзёнаўскія» вусы падкручаны. Суконная гімнасцёрка ваеннага пакрою лішні раз падкрэслівала, што Хведар Лявонавіч быў некалі бравым салдатам.

— Ваяваў і ў гражданскую, і ў фінскую, і ў гэтую,— бадзёра пачынае дзед.— На Проні паранілі, паўгода ў гашпіталях праваляўся, а дадому вярнуўся — толькі пераначаваў і адразу ў эмтэес пайшоў. Сорак пяць гадкоў за жызню сваю на трактарах праработаў.

— Мо расказалі б, як у Ліпаўцы камуну стваралі?

— А што расказваць? Сабраліся беднякі, прыйшлі ў маёнтак да памешчыка Смагаржэўскага і стварылі тую камуну. Смагаржэўскага мы ўважалі. Ён, бывала, нікада мужыка не абідзіць, заўсёды жалеў. Еслі ў каго лашадка здохла — даваў не каня, то воліка. І лесу не шкадаваў. Зловяць, бывала, парубшчыка, а прыедзе памешчык і скажа: відаць, чалавека бяда ў лес пагнала! І не штрафаваў нікога, не караў. Добры быў памешчык. Дык мы яго таксама ў камуну прынялі, нават старшынёй рэвізійнай камісіі выбралі.

Сідарэнка удакладніў:

— Для Смагаржэўскага Кастрычніцкая рэвалюцыя не была нечаканкай. Прагрэсіўных поглядаў, ён быў сасланы ў Ліпаўку царом за «бунтарскую»

дзейнасць. Кажуць, хрэснікам ён даводзіўся цару. Аднак Мікалай II дазваляў яму выязджаць толькі ў адзін горад — Рослаў.

— Так-так,— пацвердзіў дзед Хведар.— Праўда-праўда. Наш памешчык ссыльнікам быў. У пятым годзе рэвалюцыю дзелаў. А кагда ў камуне работаў, то яшчэ і дзетак хутарскіх вучыў. Пойдзе, бывала, вечарам то на адзін хутар, то на другі, там і заначуе... Аднаго разу мяцеліца разыгралася, такая бура паднялася — проста страх адзін. Іду я з вячорак дадому і бачу: кагой-та снегам замяло! Разгроб. І што вы думалі — гэта наш Смагаржэўскі ляжыць! Я яго на плечы і дадому. На печ паклаў, і адышоў чалавек. Але жыў ужо нядоўга. На раданіцу памёр. Мы так жалелі яго, так жалелі. Лапцейкі новыя сплялі і ў лапцейках пахавалі на кладбішчы, дзе ўсіх камунараў хавалі...

Устанавілася нейкае дзіўнае маўчанне. Дзед Хведар торкаў кіем сук у падлозе, нібы хацеў выдраць яго адтуль. Сідарэнка палез у кішэню па запалкі, каб прыкурыць, я пакінуў у спакоі сваю запісную кніжку. Відаць, кожны з нас думаў пра адно: як нялёгка жылося тады камунарам. Успомнілася пачутае ў Ліпаўцы: «Бывала, жанчына як сагнецца вясною, то, лічы, да зімы не разгінаецца». Усюды была толькі ручная праца. Першы ж трактар «Інтэрнацыянал» камунары набылі толькі ўлетку дваццаць сёмага. Ён быў калёсны, малой магутнасці, але якім гэта святам было для вяскоўцаў. Ліпаўскі трактарыст Яфім Башкіраў падымаў аблог за аблогам, а следам, як у час хрэснага ходу, ішлі сяляне — ад малога да старога, дзівуючыся сталёвым канём. Пазней, калі на базе камуны быў створаны калгас, у Ліпаўку прыязджаў А. Г. Чарвякоў. Ён станоўча ацаніў працу сялян, якія сваімі рукамі стварылі адну з перадавых гаспадарак рэспублікі.

— Зараз трактарысты па паўтысячы на пасяўной палучаюць,— нібы між іншым, прамовіў Хведар Лявонавіч.

Я ўлучыў момант і запытаўся пра тое, што мяне

даўно цікавіла,— адкуль ён родам будзе. Бо мова дзеда Хведара была густа перасыпана рускімі словамі, толькі вымаўляліся яны на беларускі лад.

— Адсюль я,— адказаў Хведар Лявонавіч.— А нашчот мовы, то скажу: у нашай Магілёўскай вобласці і ў суседніх, Смаленскай ды Бранскай, гавораць адзінакава.

...Было ўтульна, неяк па святочнаму добра ў хаце Хведара Лявонавіча Арцёменкі — не скажаш, што чалавек жыве адзін. Чыста ў абедзвюх палавінах, у пярэдняй нават ходнікі засланы. І гаспадар не мог нарадавацца, што наведалі яго, што была магчымасць адкрыцца людзям, расказаць пра мінулае, пражытае, асэнсаванае за такі доўгі жыццёвы шлях. Ён жа равеснік нашаму веку!

— Вот бы пажыць яшчэ! — развітваючыся, казаў ён.— Каб да сотні дацягнуць. Каб пабачыць, якою Ліпаўка наша стане.

А Ліпаўцы і цяпер зайздросцяць многія вёскі, нават сам Хоцімск. Такі вывад не цяжка было зрабіць пасля сустрэчы з Нінай Леська, загадчыцай тутэйшага Дома культуры.

Як усхвалявана, з якой гордасцю расказвала яна пра фальклорны ансамбль, што існуе ў Ліпаўцы не першы год, пра яго ўдзельнікаў — пенсіянерак Надзею Паўлаўну Тышчанка, Марыю Крысанаўну Кузьміну; Агаф'ю Канстанцінаўну Раманенка, Ніну Аляксандраўну Грабянькову, і тых, хто працуе ў калгасе — даярку Ніну Гарохаву, галоўнага агранома Лідзію Саўчанка. А з якой цеплынёй казала пра песні, што нядаўна яны развучылі, як ездзілі з канцэртам да рускіх суседзяў у саўгас «Заіпуцкі», як тыя ў Ліпаўку прыязджалі. Пахвалілася і танцамі. Сказала, што ў іхнім сяле танцуюць лепш чым дзе, і што нават з суседніх Смаленшчыны і Браншчыны, з раённага цэнтра Хоцімска моладзь прыязджае на танцы. Іншы раз да ста чалавек збіраецца. Весела ў такія дні ў Доме культуры, хораша. А вячоркі?

Ужо традыцыяй стала праводзіць іх у Ліпаўцы. Справілі аднойчы і Свята вёскі. На ім выступалі ветэраны вайны і працы, перадавікі вытворчасці, кіраўнікі калгаса і раёна. Лепшым працаўнікам былі ўручаны падарункі, іх віталі піянеры. Свята закончылася вялікім канцэртам.

Ніна Леська на секунду змаўкае і просіць:

— Заставайцеся! Пабачыце, як у нас адпачывае моладзь.

Мы рады б застацца, але час прыспешваў: трэба яшчэ заехаць у старажытны Альшоў, дзе некалі быў рускі фарпост, з якім звязаны пэўныя гістарычныя падзеі.

Мясцовыя краязнаўцы адкрылі завесу мінулага.

Міхась Мельнікаў, заслужаны работнік культуры БССР, супрацоўнік Крычаўскага раённага краязнаўчага музея, напрыклад, у адным з нумароў «Магілёўскай праўды» за 1986 год паведамляў: «Яшчэ ў першай палове XVIII стагоддзя польскія феадалы, у тым ліку і памагатыя самага вялікага і жорсткага з іх Іераніма Радзівіла, скардзіліся рускаму ўраду на кіраўнікоў Альшоўскага пагранічнага паста. Аказваецца, праз гэты вайсковы прапускны пункт уцякалі ў Расію ад праследаванняў шляхты беларускія сяляне. Сярод іх былі і актыўныя ўдзельнікі народнага паўстання на Магілёўшчыне ў 1740—1744 гадах пад кіраўніцтвам Васіля Вашчылы...»

Валянціна Баурына, педагог-кіраўнік краязнаўчага музея школы № 1 Хоцімска, у сваёй дыпломнай рабоце ўдакладняе: «Васіль Вашчыла, селянін з вёскі Селішча, што на Хоцімшчыне, пачынаючы з 1731 года не раз узначальваў выступленні простых людзей супраць прыгнёту феадалаў. Ён аб'явіў сябе ўнукам Багдана Хмяльніцкага, імя якога было шырока вядома беларускаму народу. Як і «дзед», Вашчыла імкнуўся да вызвалення роднай зямлі і свайго народа ад чужынцаў. Паўстанне ахапіла ўсю Магілёўшчыну, ад Хоцімска да Бабруйска, і выйшла за яго межы...»

Пра само паўстанне падрабязна гаворыць краязнавец В. І. Мялешка. Падаю коратка сутнасць яго артыкула «Крычаўскае паўстанне», які быў апублікаваны ў першым нумары часопіса «Полымя» за 1971 год. Сяляне са зброяй у руках выступалі супраць шляхты, нападалі на дамы купцоў, дзялілі іх маёмасць, знішчалі судовыя і даўгавыя кнігі. У студзені 1744 года ў бітвах пад Крычавам і вёскай Царкавішча войскі Радзівіла разбілі дрэнна ўзброеныя сялянскія атрады і жорстка расправіліся з паўстанцамі. Вашчылу ўдалося ўцячы... Ён, як сведчыць той жа Мельнікаў, здолеў выйсці на тэрыторыю Расіі праз Альшоўскі фарпост.

У свой час праз Альшоўскі пагранічны пост прайшоў Емяльян Пугачоў. Ён знайшоў часовы прытулак у горадзе Ветцы (цяпер райцэнтр Гомельскай вобласці) на рацэ Сож, дзе жылі стараабрадцы. Яны былі ў апазіцыі да рускага ўрада. А ў Пугачова, напэўна, ужо да таго часу наспела думка аб арганізацыі народнага паўстання, то ён і сустрэў у лясах Веткі гасцінных гаспадароў...

А вось і Альшоў. Звычайная беларуская вёска, якіх сотні на нашай зямлі. Адзін канец яе дацягнуўся ўжо да самага Хоцімска. Яе цяпер можна лічыць вуліцай райцэнтра... Ніякіх слядоў мінулага, і дзе знаходзіўся два з паловай стагоддзі таму назад рускі пагранічны пост ці вайсковы прапускны пункт (Усходняя Беларусь у той час была яшчэ пад уладай Рэчы Паспалітай), выявіць не ўдалося.

— А ці ведаеце, адкуль пайшла назва нашага Хоцімска? — раптам сказаў Сідарэнка, калі «газік», мінуўшы масток, імчаў ужо вуліцамі гарадскога пасёлка.— Існуе тры легенды. Паводле адной, тут некалі жыў багацей — уладар паселішча. У яго была прыгажуня-дачка. Хацімай звалі. У дзень свайго вяселля яна трагічна загінула. Каб увекавечыць імя дачкі, бацька і назваў мястэчка Хоцімскам. Другая легенда. У трынаццатым стагоддзі тутэйшыя землі захапіла

Вялікае княства Літоўскае. На беразе Бесядзі сталі ўзводзіць пагранічны гарнізон. Будавалі вялікія хаты, з вокнамі, печамі, камінамі. Вырасла паселішча. Назвалі яго Хацімскам — ад слова «хата». Вакол жа, як сцвярджаюць краязнаўцы, было «бясхацімства». І, нарэшце, трэцяя легенда. Паколькі тут здаўна было пагранічнае пасяленне, то вакол яго часта адбываліся ваенныя сутычкі. Мясцовым жыхарам гэта вельмі дакучала. «Хотим миру!» — было іх адзінае жаданне. Ад гэтага і пайшла назва: Хоцімск.

Зайшлі ў краязнаўчы музей, што пры школе № 1, каб, як сказаў Сідарэнка, хоць трошачкі ў глыб стагоддзяў зазірнуць. Сустрэла нас Валянціна Іванаўна Баурына, уважліва выслухала і падала даволі аб'ёмісты рукапіс у цвёрдым пераплёце. Гэта была знаёмая нам дыпломная работа «Хоцімск. Гістарычны нарыс». Ужо на першых старонках мы адшукалі патрэбнае:

«Тэрыторыя, на якой знаходзіцца пасёлак, была заселена ў глыбокай старажытнасці. Вучоныя знайшлі тут стаянкі першабытнага чалавека, прымітыўныя крамянёвыя прылады са слядамі апрацоўкі, якімі карысталіся нашы продкі шмат тысяч гадоў таму назад...

Археалагічныя раскопкі сведчаць, што з сярэдзіны III стагоддзя да нашай эры і да II стагоддзя нашай эры тут жылі славянскія плямёны. Пазней па рачных артэрыях з поўдня прыйшло сюды ўсходнеславянскае племя радзімічаў. За кіламетр ад Хоцімска, на левым беразе Бесядзі, ёсць дваццаць курганоў. У 1892 годзе чатыры з іх даследаваў археолаг Юльян Чалоўскі і выявіў там пахаванні радзімічаў...»

Успомніліся старажытныя курганы, пра якія давялося чуць у Ліпаўцы. Яны знаходзяцца каля вёскі Узлогі, за чатыры кіламетры на захад ад цэнтра калгаса, на ўзгорыстай мясцовасці, паблізу ракі Жадунькі. Іх там каля дзесяці. Курганы пакуль што ніхто з археолагаў не даследаваў. Затое мясцовыя трактарысты з-пад іх падножжаў падчас выворваюць

старажытныя прылады працы — каменныя малаткі, тапары, гліняныя чарапкі. Хто ведае, можа ў тых курганах пахаваны таксама радзімічы — людзі адважнага племені, прашчуры сённяшніх ліпаўчан, хацімчан...

Ужо ў гасцінічным пакойчыку, аналізуючы ўчутае і ўбачанае за дзень, яшчэ раз прыходзіў да вываду: якi багаты наш край на гісторыю, падзеі, цікавых людзей. Не з'яўляецца выключэннем і зямля радзімічаў. Гэта ж тут, у колішняй вёсачцы Мужычок (цяпер яна завецца Азёрная), у сям'і панскага кухара нарадзіўся Ерафей Васільевіч Касценіч — вядомы прафесар-медык, які ў свой час рабіў аперацыю вучонаму-хіміку Д. І. Мендзялееву і захаваў яму зрок.

З гэтых мясцін Якуб Раманавіч Брайцаў, першы на Хоцімшчыне літаратар, які быў членам Усерасійскага саюза сялянскіх пісьменнікаў.

Шырока вядома не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі імя прафесара, члена-карэспандэнта Акадэміі навук СССР, астранома Сяргея Мікалаевіча Блажко — ураджэнца Хоцімска.

У вёсцы Бярозкі нарадзіўся Каралёў Хведар Піліпавіч — вучоны у галіне педагогікі.

З гэтай зямлёй звязаны лёсы беларускіх пісьменнікаў Аркадзя Куляшова, Кастуся Кірэенкі, Аляксея Зарыцкага. А Пятро Прыходзька нарадзіўся ў той жа Ліпаўцы...

Думалася і пра Яўгена Іванавіча Сідарэнку. Нягледзячы на занятасць, ён дапамагаў мне ва ўсім: маўляў, каб чаго не ўпусцілі, каб усё было ладна... Шчыра скажу: я рады быў, што пазнаёміўся яшчэ з адным добрым чалавекам.

...Нечакана прагрукатаў першы ў гэтых мясцінах вясновы гром. Адразу і дождж пайшоў — таксама першы, спорны, але спакойны. Як ён абмаладзіў зямлю! Трава на газонах адразу прыўзнялася, зазелянела ярчэй. А лужынкі, што ўтварыліся на асфальце, былі быццам снежкам прыцярушаны — столькі на іх ляжала белых пялёсткаў.



## ДЗІВА

*У пошуках лодкі*
*Урода ○ Начлег на Булыжным ○ Марылін востраў*
*Спагадлівыя тубыльцы ● «Фокусы» браканьераў*
*Запісы ў «бартавым журнале»*

З дваццаці тысяч рэк, якімі багата наша Беларусь, сапраўдным дзівам прыроды з'яўляецца рака Дзіва, што на Ушаччыне. Жывая нітка вады бярэ пачатак з возера Урода ў Лепельскім раёне, нанізвае на сябе, быццам пацеркі, яшчэ пяць азёр і ў апошнім, возеры Янова, гіне. Блакітныя каралі зямлі! Такой бачыцца рака з вышыні птушынага палёту.

У сэрцы жыло неадступнае жаданне прайсціся яе берагамі ці праплыць ад самага вытоку на чаўне — адчуць асалоду незвычайнай сустрэчы. Дзіва ж!

І вось — Ушаччына, легендарны край, край азёраў, лясоў і рэк. Сяджу ў кабінеце Валянціны Аляксандраўны Курбака, сакратара райкома партыі па ідэалогіі. Кажу пра свой намер і, прызнацца, не веру ў поспех, бо намер даволі дзёрзкі: адшукаць ва Ушачах маторку, нейкім чынам пераправіць яе на Уроду і адтуль ужо водным шляхам ісці ўніз, рабіць агледзіны і ракі, і ўсіх азёраў.

У вачах Валянціны Аляксандраўны нейкую хвіліну бачу адну толькі спагаду. Але вось сакратар рашуча падсоўвае да сябе тэлефон, набірае то адзін нумар, то другі, то трэці. З некім гаворыць як бы пасяброўску, быццам па-дамашняму — вельмі цёпла і проста:

— Зразумей, толькі ты можаш выручыць.

На тым канцы провада, відаць, зразумелі. Валянціна Аляксандраўна зірнула на мяне ўжо спакойна і сказала:

— Пытанне вырашана. Апоўдні да гасцініцы пад'едзе машына з лодкай.

Сапраўды, у вызначаны час каля гасцініцы тармазнула старэнькая машына з самаробным прычэпам на двух колах, на якім, прывязаная рамянямі, паблісквала блакітнай фарбай лодка.

— Хоць у кругасветнае падарожжа! — сказаў, выходзячы з кабіны, сярэдніх гадоў чарнявы мужчына і падаў руку: — Генадзь. А гэта,— паказаў ён на таго, што ішоў следам,— гэта Мікола. Азёрны ас! У Асводзе працуе. На час падарожжа капітанам-матарыстам будзе.

Мікола нібы засаромеўся такой пахвалы, нясмела працягнуў мне руку, а яму, Генадзю, сказаў:

— Ну які з мяне ас, Дзімітравіч!

Быў ён бялявы, з выпаленымі на сонцы брывамі і на многа маладзейшы за Генадзя. Пастаяў трошкі каля нас, праверыў, ці моцна трымаецца лодка, і як бы каманду падаў:

— Мо паехалі?

— Паколькі ўсе гарацъ жаданнем як найхутчэй сустрэцца з Дзівам, то, можа, сапраўды, рушым? — падтрымаў яго Генадзь.

Такая непасрэднасць зблізіла. Было адчуванне, быццам мы бог ведае колькі знаёмыя. Відаць, таму не маўчалі і ў машыне. Болей, вядома, гаварыў Генадзь. То пра цяжкую сёлетнюю вясну, то пра няўпраўку з буракамі, то пра пасевы бульбы, якія

ніяк не выб'юцца з-пад зямлі — каторы тыдзень стаіць гарачыня, то пра падкормку пасеваў, то пра сенакос, які з дня на дзень павінен пачацца ў гаспадарках раёна. Па ўсім адчувалася, што чалавек ён тутэйшы, мясцовы, сялянскай закваскі. Лішні раз я пераканаўся ў гэтым, калі, выехаўшы з Ушачаў, у адным месцы, паблізу дарогі, мы ўбачылі статак кароў, а пры ім, на пагорачку, пастуха з кніжкаю ў руках. Генадзь прамовіў тады:

— А ў сорак чацвёртым, пасля вызвалення, у раёне было ўсяго толькі пяцьдзесят чатыры кароўкі!

Пасля гэтых слоў ён спахмурнеў — відаць, думалася пра тое далёкае і нялёгкае, што выпала, на долю роднай зямлі.

У тым жа сорак чацвёртым, каб ачысціць ад партызан свае тылы паблізу лініі фронта, фашысты арганізавалі карную экспедыцыю, у якую былі ўключаны дзесяткі тысяч салдат з артылерыяй, танкамі і самалётамі. Амаль месяц лясныя байцы змагаліся супраць карнікаў. Аднак пятля блакады зацягвалася. І тут, як не аднойчы, партызаны на справе даказалі сваю мужнасць. У ноч на 5 мая каля вёсак Пліна і Паперына блакада была прарвана... Цяпер там мемарыяльны комплекс «Прарыў». На плітах мемарыяла ўвекавечаны імёны 1450 герояў, якія загінулі ў баях з фашыстамі ў дні блакады.

Гэта, як кажуць, эпілог. Пра тое, што папярэднічала яму, я занатаваў ў свой дарожны блакнот пазней, у тутэйшым музеі баявой славы: «Увосень 1942 года партызаны вызвалілі Ушацкі і сем суседніх раёнаў Віцебскай вобласці. У тыле ворага ўтварылася Полацка-Лепельская зона плошчай звыш трох тысяч квадратных кіламетраў са сталіцай у гарадскім пасёлку Ушачы, які партызаны ўтрымлівалі амаль два гады. У глыбокім тыле ворага жыла па законах савецкай улады партызанская рэспубліка — баявы фарпост усенароднай барацьбы з ворагам, дзе ўратаваліся ад фашысцкага тэрору і ўгону ў рабства каля васьмідзесяці тысяч мірных жыхароў. Дзейнасцю партызан і насельніцтва кіравалі Ушацкі, Ле-

пельскі, Ветрынскі, Докшыцкі, Плiскi, Бешанковіцкі і Сіроцінскі райкомы партыі».

...А цяпер — пазіраю ў спакойны твар Генадзя і думаю: яму, бадай, таксама дасталося ў тыя жудасныя дні, не магло абмінуць, хоць і быў ён тады зусім яшчэ хлапчуком. Хачу запытацца пра гэта, але ён апярэджвае мяне і кажа зусім пра іншае:

— Вось думаю, чаму тое возера назвалі так: Урода. Пра чалавека з брыдкім абліччам гавораць гэтак. Мо і яно?

— Возера яшчэ называюць і Урада. То, можа, ад слова «радасць» назва? Кажуць жа: «Такая ўрада прыйшла ка мне!...» — разважаю я.

Генадзь хмыкнуў:

— Бач ты! А і не падумалася нават!

— А можа,— працягваю выказваць меркаванні,— тут польская мова віною? «Урода» ў перакладзе на беларускую будзе «прыгажуня».

— Во дзіва! — усміхнуўся Генадзь і прыбавіў газу.

Даўно скончыўся асфальт. Ззаду застаўся і стары брукаваны шлях. Ужо ехалі то полем, то роўным тарфянішчам, то звілістымі беражнякамі, мінаючы вёскі і вёсачкі. Нарэшце выскачылі на гравійку, перасеклі яшчэ адно сяльцо, што стаяла пры возеры, на ўзгорку, і дарога за ім як бы патанула ў траве і кветках. Генадзь спыніў машыну і свіснуў:

— Аднак, прыехалі!

Сышлі на зямлю, пачалі раіцца: як быць? На карце дарога далей нібыта і была, а на самой справе...

— Не праедзеце аніяк,— узяўся аднекуль дзядзька ў кепачцы.— Ды навошта вам тая Урода здалася? Парыбаліць, калі што, можна і на нашым, Атолавым азярові. І Кугані нашы, лічы, на самым беразе.

— Не ў рыбалцы дзела! — сказаў Генадзь і пайшоў «вытоптваць» у траве дарогу. За ім пабег і Мікола. А дзядзька дадаў да сказанага:

— І на лодцы не прайсці будзе.

Аказваецца, на Уроду адсюль ніхто не ездзіць.

Патрэбы такой няма, сваё возера пад бокам. Не карыстаюцца і лодкамі. Дзіва-рака зарасла, і па ёй можна падняцца да вытоку толькі вясною, па вялікай вадзе. Сама рака тут не шырокая — не будзе і дзесяці метраў, звілістая, у нізкіх берагах. Трапляюць іншы раз глыбакаватыя віркі-ямкі, але і тыя да лета амаль зацягваюцца чаротам, рагозам, хвашчом. Балоцістыя берагі ўкрыты травой-разаком, вербнікам, іншымі кустамі. Праўда, ёсць два ўзгоркі: на першым стаяць Зямцы, на другім — амаль насупраць іх, толькі на процілеглым беразе,— Атокі. Хат па дванаццаць маюць. А Урода — і кіламетра не будзе ад гэтых вёсачак...

Само возера — у тваністых берагах, вады мо на метр, а далей — іл. Дна ніякай тычкаю не намацаеш. З Уроды выцякаюць дзве ракі: Дзіва — бяжыць на ўсход, у возера Атолава, і Пракса — на захад. Аднак, лепш туды, на тую Уроду, і не ехаць. Калі ўжо рабіць агледзіны Дзіва, то адсюль, ад Куганёў.

Пра гэта я і сказаў Генадзю з Міколам, калі тыя вярнуліся, так нічога і не «вытаптаўшы» ў траве. Яны пагадзіліся.

Неўзабаве лодка гайдалася на вадзе, і мы ўтраіх рыхтавалі яе да выхаду ў «адкрытыя воды». Калі запусцілі матор і пераканаліся, што ўсё ў парадку, Генадзь пажадаў нам шчаслівага плавання, развітаўся, сеў у сваю старэнькую машыну і паімчаў угору, на дарогу. Прычэп, на якім толькі што была лодка, ажно падскокваў на выбоінах і купінах.

Капітан-матарыст Мікола, як ахрысціў яго Генадзь, прыбавіў абаротаў, і наша «казанка» паволі зрабіла круг паблізу берага.

— А ўсё ж ахвота на раку зірнуць! — збавіўшы газ, раптам сказаў Мікола.

І, не чакаючы, што я адкажу на гэта, узяў кірунак на рэчышча, якое ледзь значылася справа ад сяла, за рэдкім прыбярэжным чаротам. Рэчышча адшукалі хутка і паволі, каб не напароцца днішчам на якую патырчаку, пайшлі ўверх, супраць цячэння. Роўна тахкаў матор. А Дзіва гнала свае воды на-

сустрач, у возера, гнала хутка, нібы спяшаючыся. На стрыжні доўгія і таўставатыя водарасці выцягваліся і ажно слаліся па вадзе. Пры берагах было не так.Каля самай кромкі вады ўставалі чараты, падымаўся хвошч. Сям-там на павароце ракі трапляўся куст лазавіння — абвіслы, распушаны, і яго трэба было абмінаць, каб не зачапіцца за каравае вецце. Месцамі сінелі чыстыя прагалы, і тады матор працаваў без натугі — не намотваў на лопасці вінта зялёны «шпагат» водарасцяў.

Нечакана лодку як хто падкінуў. Мікола імгненна павярнуў рукаятку ўправа, скінуў газ і выключыў матор.

— Рызыкуем! Вінт па дне чыркануў.

Назад, на возера, ішлі на вёслах. Было нязвыкла ціха і добра. Думалася: вось бы так прайсці Дзіва і яго азёры! І пабачылі б болей, і ўсяму жывому не перашкаджалі б траскатнёю матора. А калі спусціліся ў затоку і завялі матор — як дзеці, аддаліся імклівай хадзе і цёпламу, тугому ветру. Наша лодка ракетаю ляцела туды, дзе над вадою стаяла зыркае сонца, а ў вечаровым небе куляліся чайкі. Здавалася, канца-краю не будзе воднай прасторы.

Раптам па курсу пачалі акрэслівацца абрысы вострава. Праз хвілін колькі сярод роўнага поля вады ён узвышаўся вялікай зялёнай шапкай. Вырашылі аб'ехаць востраў. Ён быў даволі вялікі — гектараў на пятнаццаць. Нейкая незразумелая сіла цягнула паглядзець, які ён, што на ім. Заглушылі матор, прычалілі, выйшлі на бераг. Пасля лодкі ногі няўпэўнена ступалі па зямлі, здавалася, што яна раптам пахіснецца.

— Гэта востраў Булыжны,— сказаў Мікола, ідучы папераздзе.— А там вунь,— паказаў рукою на поўдзень,— насупраць вёскі Калушчына, ёсць востраў Ландышавы. Невялікі, усяго якіх два гектары, а ландышаў на ім — хоць касою касі. Калі яны зацвітаюць, назе няма дзе ступіць. Суцэльны зялёны дыван у белыя крапіны. Заказнікам аб'явіць бы астравок гэты! А з дрэў там толькі ліпа расце.

На Булыжным не было ні ліпы, ні ландышаў. Затое шмат дубоў — разгалістых, прыземістых. Уразіла колькасць першацвету веснавога. Ён падымаўся з травы то па аднаму каліўцу, то невялікімі, але густымі курцінкамі, то амаль суцэльнымі зарасцямі. Столькі не даводзілася бачыць ні на Палессі, ні ў Белавежы, ні на ўсходнім памежжы рэспублікі. Першацвет адцвітаў ужо, і толькі «чарачкі» колішніх кветак гаварылі пра тое, якое тут было хараство тыдні два ці тры таму назад. Іншы раз трапляліся кусты шыпшыны — яны сама цвілі. Кветкі гарэлі спакойным ружовым агнём. Зрэдку, амаль пры самым лазняку, успыхвала белым цветам каліна. Гронкі суквеццяў буйныя, сакавітыя. Ад паху, п'янкога і густога, аж кружылася галава.

— Тут мо і заначуем,— нечакана прапанаваў Мікола. Ён, відаць, таксама быў уражаны сустрэчай з некранутым хараством прыроды, цішынёю, што стаяла над востравам. Яшчэ раз прыслухаўся да ўсяго гэтага і сказаў, як адсек: — Вырашана!

Надыходзіла шарая гадзіна, а ў нас ужо на невялікім вогнішчы браўся закіпаць лясны чай. Зусім побач, на суседняй алешыне ажно заходзіўся салоўка. Час ад часу падавала голас крыжанка — пакрэктвала ў прыбярэжнай траве. Іншы раз праляталі над намі чыркі-свістункі. І так нізка, што чуцён быў сухі шоргат крылаў. Недзе за нашай лодкай у вадзе бухаў вадзяны бугай. А над вогнішчам стаяла хмара камароў — нахабных і вельмі кусачых. Мы стараліся не звяртаць на іх увагі. Але калі ўжо вельмі дакучалі, падкідвалі ў агонь ламачынак, сырых галінак, і камары адступалі.

Вось і зараз Мікола ажывіў касцёр. Калі шугануў агонь, пусціўшы на нас шлейф дыму, мой спадарожнік ні з таго ні з сяго пачаў нібы экзаменаваць мяне:

— А ці ведаеце, што ў нашым раёне дзвесце пяцьдзесят адно азяро?

— А чаму Дзіва Дзівам завецца?

— А дзе стаіць вёсачка Соньчын Рог?

— А ці чулі, што аднойчы адбылося на востраве Вяліжа?

Ні на адно з пастаўленых пытанняў я адказаць не змог. «Экзаменатар» быў на сёмым небе, зрабіўся нават, як падалося, болей гаваркім.

— Паблізу Чарсцвяцкае азяро,— казаў ён.— Яго праходзіць не будзем, не па маршруту. На тым азяровi ёсць таксама астравы — Вяліжа і Казлячча — нічога сабе, мо нават як гэты, Булыжны. Дык вось. Дзімітравіч казаў: уздумалі аднойчы гаспадарнікі сабе аблёгку зрабіць, лайбамі перавезлі на Вяліжа атару авечак. Перавезлі, выпусцілі, маўляў, будзьце тут, да марозаў самапасам хадзіце, а ўвосень назад пераправім. Так яно мо і было б. Авечка ж плаваць не вельмі ахвотніца, з вострава не ўцячэ. Ну, перавезлі, значыць, радуюцца: дармовы нагул будзе! Месяц праходзіць, другі, і некаму заруліла зірнуць на атару, паглядзець, як яна без людзей. Прыехалі, а там палова атары ляжыць мёртвай, астатнія авечкі каторыя куды пазашываліся. Аказваецца, пяць ваўкоў заплыло на востраў. А яшчэ Дзімітравіч казаў...

Я не пачуў, што яшчэ казаў Дзімітравіч Міколу, бо над востравам нечаканаляснуў такі моцны пярун, што аж скаланулася паветра, па дубах прайшоў шорах і тут жа сталі асыпаць дол буйныя дажджыны. Праз хвіліну зноў грукнула, і з неба абрынуліся на востраў суцэльныя патокі вады. Мы кінуліся ратаваць агонь, рэчы, перанеслі ўсю сваю «маёмасць» пад самы разгалісты і з густой кронай дуб, мяркуючы, што пад ім знойдзем збавенне. Аднак дождж не сунімаўся, і нам добра даставалася ад яго. Праз якую гадзіну лівень аціх, і ўжо ішоў роўны, але спорны дождж. Мы па чарзе выбягалі на прагалы між дрэў, падбіралі апалае сучча, ажыўлялі агонь, забыўшыся і пра лясны чай. Калі прамоклі да ніткі, спахапіліся, налілі па кубку вару, які духмяніў суніцнікам, чаборам, і пачалі вячэраць.

— Во дае! — прыхлёбваючы чай, здзіўляўся Мікола.— І адкуль нагнала такога?

Выгляд у яго быў, як у вераб'я, на якога лінулі з вядра. Валасы на галаве натапыраны, сарочка прыліпла да цела, а самога аж праймалі дрыжыкі. Відаць, і я выглядаў не лепш, бо, кінуўшы позіркам, Мікола параіў:

— Бліжэй да камля трэба. Іначай спіны застудзім.

Мы прытуліліся да камля плячыма і так сядзелі нейкі час моўчкі. А дождж не пераставаў ліць. Сіпела і курадыміла вогнішча — супраціўлялася вадзе. Мне рабілася шкада хлопца, што ён марнуецца з-за мяне, і, каб хоць неяк падбадзёрыць яго, вырашыў пачаць гаворку.

— Ты нарадзіўся ў вёсцы, Мікола?

— У вёсцы.

— А што гэта ўсё пра Дзімітравіча ўспамінаеш? Працуеце разам?

— Не. Ён начальнік пажарнікаў.

— Ты халасцяк?

— Жанаты. Двое дзетак.

Гаворка не клеілася. Я ўжо не дакучаў яму сваімі роспытамі. Прыціскаўся да камля і адчуваў, што, сапраўды, у плечы не так холадна. Але стылі рукі, ногі. Агонь амаль патух, і ні мне, ні Міколу ўжо не хацелася выбягаць пад дождж, каб наламаць або сабраць суччa. Чамусьці ўспомнілася Валянціна Аляксандраўна, райкомаўскі сакратар, якая паміж званкамі і перагаворамі наконт майго падарожжа расказала пра Марылін востраў, што прытуліўся ў адным з закуткоў возера Янова. На тым востраве жыла некалі жанчына з дачкою. Муж яе быў рыбаком, загінуў у буру. А яна ўсе роўна кожны вечар запальвала лямпу і ставіла ў акне, як пры мужу. На Марылін агеньчык не раз выходзілі рыбакі, якіх запыняла на паўдарозе непагадзь, і там мелі цяпло, лясны чай, спагадлівае і ўсцешнае слова. Плацілі старой Марылі адным — падзякай і наказам, каб бяда мінала хату яе... Даўно тое было. Не помняць людзі, калі памерла Марыля. Але востраў, дзе яна жыла, па сённяшні дзень завуць Марылін.

Думалася: вось добра было б, каб раптам з'явілася Марыля і на гэтым востраве, завяла ў сваю хаціну, дала прытулак, уратавала ад надакучлівага ветру з дажджом, абагрэла, абсушыла. Але такога і быць не магло. Востраў бязлюдны! На ім ніводнай жывой душы.

Я памыляўся. Недзе там, у глыбі вострава, у маладым дубняку пачуліся цяжкія крокі, да нас даляцела нібы пакашліванне. Счакалі хвіліну. Кашаль не паўтараўся, а крокі набліжаліся. А мо здаецца? Аднак яны чуліся ўсё выразней. Нехта ішоў проста на наша вогнішча.

— Мікола, чуеш?

— Ага,— ціха адказаў ён і нават не варухнуўся.

А крокі бліжэй, бліжэй. Потым, ці то падалося, ці то сапраўды ўбачыў: нехта, як бы ўкрыты прасцінай, сунецца кустамі. Следам тупае яшчэ хтосьці. Дастаю з кішэні запісную кніжку, выдзіраю некалькі няспісаных старонак, камячу і кідаю на вуголле. Успыхвае агонь, асвятляе круг, і на тым баку вогнішча заўважаю белага каня, а побач з ім яшчэ тры.

Божухна! Да нас прыйшлі коні!

Тузаю Міколу за рукаў, і мы ўдваіх пазіраем на незвычайных гасцей. А яны пастаялі, бліснулі чорнымі вачыма і пачалі ківаць вуглаватымі галовамі: маўляў, дзівакі людзі! Знайшлі дзе ноч начаваць! І ў непагадзь. Дадому ішлі б, у вёску!

Мікола падхапіўся, падбег да белага каня, абхапіў за шыю:

— Мілыя мае! Чаму вас учора не бачылі?

У гэтым жэсце, у гэтым парыве, у гэтых словах было ўсё — увесь чалавек. Я пачаў шарыць вакол камля, намацаў брызентавую сумку, дастаў з яе кус чорнага хлеба, што пакінулі назаўтра ў дарогу, разламаў на чатыры часткі і падышоў да коней. Яны прынялі пачастунак з годнасцю. Трапяткімі губамі асцярожна здымалі з далоні хлеб і спакойна жавалі.

Запомніцца на ўсё жыццё: мокрыя ад дажджу конскія губы аддавалі далоням цяпло...

Пачынала днець, калі мы пакідалі востраў. Матор не завёўся, і да тых самых Куганёў ішлі на вёслах. Вырашылі ў вёсцы хоць трошкі абагрэцца і падсушыцца. На душы было маркотна: так няўдала пачалі падарожжа!

Нарэшце дабраліся да берага, выцягнулі лодку на грунт і папляліся напрасткі ў сяло. Дождж не пераставаў. Зайшлі ў першую хату, што трапіла на шляху. Гаспадыня завойкала, завохкала, ацэньваючы наш стан, і тут жа загадала:

— Распранайцеся — і на печ! Адзежу сама паразвешваю.

Неўзабаве мы ўжо ляжалі на цёплай чарэні і адчувалі сябе шчаслівымі. Раптоўна падкраўся сон, і абодва праваліліся ў небыццё, як у бездань.

Прачнуўся я ад таго, што вельмі прыпякала. Падхапіўся, сеў, звесіўшы з печы ногі, і ўбачыў: на табурэце, пры стале, сядзіць дзядзька ў кепачцы і разглядвае нашу адзежу, што была развешана па ўсёй хаце. Заўважыў мяне — узрадаваўся:

— Пазналі? Я ж Яўхім Аўсееў! Учора тлумачыў пра Уроду з Дзівам.

І стаў цмокаць, бедаваць, нават дакараць, што заселі на тым востраве, далёка ад людзей. Выйшла з бакоўкі гаспадыня, кінула вокам на печ, усмешліва сказала:

— А напарнік, як блін, спіць.

— Маладыя, то і спіць,— уставіў гаспадар і пачаў пра сваё: — Нам сёння калейка выпала каровак пасвіць. То я з самага ранку на выгане. Таксама адубеў, прыбег пагрэцца.

І тут, нібы спалоханы, саскочыў з печы Мікола і пачаў хуценька збірацца.

— Куды ж гэта? — запыніла гаспадыня.— Паснедалі б хоць. Дарога няблізкая!

— Дык жа сонца прабілася! — узрадавана сказаў Мікола.

Падзякавалі гаспадарам за прытулак, развіталіся і пайшлі на прычал.

Дажджу не было ўжо. Сонца стаяла над возерам

чыстае, але як бы заклапочанае: а ці не нарабіла ўчарашняя непагадзь чаго благога?

Аднак усё абышлося. Навальніца не паваліла ў Куганях ніводнага дрэва, не пакруціла маладую яшчэ азіміну, не пабіла таксама ярыну. А зямля быццам адчула збавенне — зелянела шчодра.

Залазячы ў лодку, Мікола сказаў:

— Запішыце ў «бартавы журнал»: нас прывецілі добрыя людзі!

— Але ж я нават імя гаспадыні не ведаю.

— Няважна, хто яна — цётка Вера, Зіна альбо Таццяна. Галоўнае, добрая цётка.

— А, можа, Марыля? — успомніўшы старую рыбачку з вострава Янова, прамовіў я.

Ён не адказаў.

Як ні дзіўна, матор завёўся адразу. Мікола ўскінуў бялявыя бровы, крыкнуў:

— Паехалі!..

Калі адплывалі, заўважылі на ўскрайку сяла, на пагорку, дзве постаці — мужчыны і жанчыны. Яны пазіралі ў наш бок.

Няўжо Аўсеевы?..

Ідзём супраць ветру. Матор пад добрай нагрузкай. Хвалі няспынна б'юць у кіль нашай «казанкі», узлятаюць, абдаючы нас цёплымі пырскамі. А Мікола ўсё прыбаўляе і прыбаўляе скорасць. Расце за кармою бурун. І вось ён ужо ператварыўся ў глыбокую і доўгую баразну, нібы па возеры не лодка ідзе, а вялізная саха, якая ўздымае за сабою высозныя вадзяныя скібы.

Мы вырашылі трапіць у суседняе возера Турасы напрасткі, не заходзячы на астатнія атолаўскія астравы, у шматлікія азёрныя залівы, таму прытрымліваліся толькі ўсходняга берагу.

Ужо даўно зніклі з вачэй Куганi. Паказаліся абрысы Зарэчча. Вёска стаіць на ўзгорку, таксама амаль пры возеры, і нечым нагадвае сваю суседку. Мікола збаўляе ход:

— На берагах Атолава каля дзесяці вёсачак!

Праз хвіліну дадае:

— Возера мае сем астравоў!

Яшчэ праз нейкі час расчаравана кажа:

— А вось і запынь!..

Перад самым носам «казанкі» нечакана, як з вады, вырас масток. Ён злучаў сабою два берагі і, відаць, служыў людзям даўно і спраўна. Масток пераходны, невысокі і наўрад ці зможам прайсці пад ім паміж тонкіх паляў.

Прайсці ўдалося. Калі зноў завялі матор, праз якую сотню метраў я ўбачыў, што гэта ўжо возера не Атолава, а Турасы. Яшчэ здагадаўся: той масток злучаў берагі Дзіва. Кароткі адрэзак ракі нагадваў праліў між азёрамі.

— Давядзецца пакруціцца, пакуль выберамся з гэтых Турасоў,— сказаў Мікола, азіраючыся і да нечага прыглядаючыся.

У возера такія пакручастыя берагі, такія звілістыя, столькі там плёсікаў і заліўчыкаў, што на гэты раз адшукаць рэчышча ракі было не так проста. Аднак знайшлі і адразу трапілі ў новую пастку, якую нам падрыхтавала Дзіва: лодку зашчаміла між паляў яшчэ аднаго мастка-перахода.

Тут ужо не да матора, тут абы выбрацца. Цячэнне — шалёнае, так і верне, спрабуе нахіліць лодку. Раптам прыходзіць выратавальная думка: а што калі, сапраўды, нахіліць «казанку» і так, бачком, прасунуць яе між старых, аслізлых слупоў.

Ад кароў, што пасвяцца паблізу берага, падыходзіць да нас жанчына, нейкі час пазірае, як мучымся, і раіць:

— А сякеркі ў вас няма? Абчасалі б адну палю і прайшлі б.

Сякеркі няма. Уся надзея на сваю сілу. Каб яшчэ хоць пара мужчынскіх рук — тады б справіліся! Бачым, ідзе дзяцюк, нясе вуду і торбу з уловам. Узыходзіць на масток, тэпае на процілеглы бераг і хоць бы слова. Як заняло яму.

Жанчына абураецца:

— Як свінтух прасунуўся. Падумаў, пэўна, што вы з інспекцыі.

У нас прыбавілася злосці, яшчэ раз падналеглі, і нават наша дарадчыца выказала захапленне:

— Ну во! І без сякеркі абышлося!

Стомленыя, нейкі час сядзім і адпачываем. А жанчына не перастае спачуваць:

— Далей не ідзіце на маторы. Далей толькі на вёслах можна. Да самага Бярозавага. А нітка ракі вёрст сем цягнуцца будзе, не меней.

Парыпваюць уключыны, паволі адплываюць берагі, за паваротамі ракі знікаюць то чараты, то кусты вербніку, то высокія, усе ў кветках, травы. А сонца стаіць амаль у зеніце і смаліць нясцерпна. Мікола распрануўся да плавак і зноў налёг на вёслы.

— Можа, матор запусцім! — прапаную я.

— Паляцяць лопасці! — пярэчыць ён.

Я падмяняю Міколу, налягаю на вёслы і адчуваю, як гэта няпроста правіць такой пасудзінай. Але праз нейкі час прызвычайваюся, і «казанка» ідзе лёгка і ходка.

На левым беразе паказаліся сляды былой вёсачкі — хатнішчы, прысады, палосы колішніх агародаў. «Відаць, знеслі як неперспектыўную»,— падумалася мне.

Прайшлі яшчэ з кіламетр. Дзіва пашырэла і бегла ўжо ў высакаватых берагах, уздоўж якіх стаялі гонкія чараты. Дагэтуль было ціха, а тут — сталі чутны чарацянкі. Птушкі то там, то тут падавалі голас, і на душы рабілася весялей.

А вось суцэльная сцяна хвашчу. Цёмна-зялёнага колеру, у залацістых кольцах, ён падняўся ў рост чалавека і займаў даволі вялікую завадзь. Ускрай завадзі стаяў рэдкі рагоз, падняўшы свае вострыя лісты-шаблі, быццам ахоўваў Дзіва ад некага нядобрага.

Нарэшце пайшлі зарасці ажыны, трошкі далей і вышэй — ляшчыны. Усё буяла, радавалася цяплу і сонцу.

Нечакана спыніліся — нібы селі днішчам на мель.

У чым справа? На такой глыбіні? Аказалася, наша лодка наляцела на кол. Мікола буркнуў:

— Пачынаецца! «Фокусы» браканьераў...

Ен памаўчаў трошкі і стаў тлумачыць:

— Яны ўбіваюць у рэчышча калы, да іх шарай гадзінай чапляюць сеткі, а на досвітку здымаюць — з рыбай. Асабліва калі вугор ідзе, браканьерам тут лафа.

Мікола бярэ ў мяне вёслы і ўжо лодкай правіць сам. Я пазіраю на рэчышча і, сапраўды, заўважаю нямала калоў. Адны ля самых берагоў, некаторыя на стрыжні, а іншыя, як парканам, перагароджваюць паўракі.

— Бачыце? — пытаецца Мікола і сам ледзь не ляціць за борт.

З нашай маторкай зноў нешта сталася. Уважліва аглядаем лодку, праводзім вяслом пад днішчам і намацваем трос таўшчынёю з аловак. Ен перацягнуты з аднаго берага на другі і абодвума канцамі прымацаваны ўжо да металічных калоў.

— Пастка для інспектараў рыбнагляду! — плюецца Мікола.— Будзе ісці лодка на скорасці, зачэпіць маторам за трос, і ўсё паляціць дагары нагамі.

Пакуль адольвалі тую «пастку», Мікола казаў:

— Гэта яшчэ паўбяды! З гэтым яшчэ змагацца можна. А вось неяк прыгналі на нашы азёры электратрал. Афіцыйна, з дазволу адпаведнага начальства. І што вы думаеце? Знішчылі амаль усё жывое. Колькі тады ў берагах малявак ляжала! Жах! Цяпер, кажуць, адумаліся, не прымяняюць спосаб той. Дык затое браканьеры прыдумалі электравуды і шастаюць па начах.

Нейкі час плылі моўчкі. За чарговым паваротам наткнуліся яшчэ на адзін трос. Яго адолелі хутчэй — абвісаў болей, чым той. Яшчэ праплылі з паўкіламетра, і шлях перагарадзіла новая запынь — глухая, амаль з суцэльных калоў. Паверх іх ляжала кладка, хісткая, толькі прайсці чалавеку. Нічога не заставалася нам, як паспрабаваць даўні бурлацкі

спосаб — волакам перацягнуць маторку на той бок запыні.

— Добра, што берагі нізкія, а то б...

Мікола зноў плюецца, лае браканьераў і, калі селі ў лодку, рызыкуе завесці матор. Ішлі паволі, на малых абаротах і зусім не радаваліся прыгажосці Дзіва. Было не да экзотыкі. Гэта ж падумаць толькі! Амаль на кожным кроку — то калы, то запыні, то «пасткі».

А краявіды на Дзіве былі ўсё ж адметныя. Неяк раптоўна, з-за паваротківа паказалася маладая дуброва. На фоне нізкага лазавіння яна выглядала хараша. Па левую руку, цераз балотца, трошкі пасвяціў камлямі і знік бярэзнік.

— Скора возера Бярозавае! — не прыглушаючы матора, гукнуў Мікола.— Яно кіламетраў пяць даўжынёю, праскочым хутка.

Рака прыкметна пашырэла, і мы не заўважылі, як вырваліся на прастору. Весялей запрацаваў рухавік, і неяк спакайней рабілася на сэрцы. Свежы вецер прыемна студзіў твар. Над намі з'явілася некалькі чаек, яны пікіравалі амаль да самай вады, узмывалі ўвысь і зноў падалі ўніз.

Возера Бярозавае адолелі як бачыш. А на выхадзе, пад мостам, дзе зноў цякла Дзіва, давялося трошкі павалтузіцца. Але вылезлі з маторкі і правялі яе перад сабой, да глыбейшага. Далей ужо скарыстоўвалі толькі цячэнне ракі.

Спраўна плыла лодка між высокіх берагоў. Мы адпачывалі, цешачы вока то невялічкім і чысцюткім плёсам, то нахіленай над самай вадою чаромхай, то дашчаным насцілам, дзе жанчыны мыюць бялізну, то чародкаю дзетвары, што стаяла на самым беражку з вудамі, то хатамі, што з-за прысад пазіралі на раку блакітнымі вокнамі. Думалася пра дзяцей: шчаслівыя! Каля дому спасцігаюць тонкую навуку рыбалова.

Успомнілася мая першая рыбалка на далёкай, вёрст пятнаццаць ад роднай вёскі, рацэ Грыўдзе. Ішоў туды, хлапчуком, амаль паўдня. Закінуў

валасяную вуду, а яе ўзяў і перашчыкнуў шчупачок. Запаснога кручка не меў, так і вярнуўся дадому з пустой торбачкай, узрушаны, усхваляваны і ўжо навек прывязаны да падарожжаў, да вады.

Чарговы масток прайшлі без перашкод, і Мікола завёў маторку — перад намі раскінула свае воды возера Павульскае. Яго яшчэ завуць Павулле, Цётча. У параўнанні з Бярозавым яно цікавейшае. Калі б змог падняцца ў паветра і зірнуць на яго зверху, то ўбачыў бы агромністага блакітнага скакуна, які імчыць у кірунку Ушачаў... Такую форму мае Павульскае. На берагах — вёсачкі Гарбаціна, Павулле і Соньчын Рог. Але каторая з іх — Соньчын Рог? Мікола кіўнуў галавою ўправа. Прыглядаюся. На высокім месцы, за балоцістым хмызам і як бы на паўвостраве стаіць чарада хат. Іх там не многа — і дзесяці, пэўна, не будзе (зноў, відаць, вынік тае «неперспектыўнасці»). Узнікае жаданне прычаліць да берага, пайсці ў сяльцо і хоць бы даведацца ад людзей, чаму яно так завецца. Кажу пра гэта Міколу, а ён паказвае на гадзіннік: маўляў, трэба спяшацца, наперадзе ладны кавалак шляху.

Цяпер ужо абодва ўглядаемся ў берагі, шукаем выйсця з возера. Дзіва ж «нанізала» на сябе Павульскае і пабегла далей. Але дзе, адкуль рака выбягае з возера? Нарэшце, знаходзім выток і, не збаўляючы хады, ідзём амаль чыстым рэчышчам. Тут яно метраў сорак будзе шырынёю. Берагі невысокія і не такія звілістыя. Аднак здзіўляе іншае: і на правым, і на левым беразе Дзіва, зусім блізка ад вады, стаяць жывёлагадоўчыя будынкі.

— Хто прыдумаў такое? Гэта ж парушэнне элементарнага! — не вытрымліваю я.

Мікола махнуў рукою. Маўляў, не навіна! У вёсцы Павулле фермы яшчэ бліжэй да вады стаяць. Іншыя гаспадарнікі так і не навучыліся берагчы прыроду. Ды што з іх возьмеш? У іх і апраўданне ёсць: наўкол — вады, хоць заліся, таму няма чаго і шкадаваць яе!

Непрыкметна апынуліся ў возеры Янова. Толькі

што ішлі Дзівам, абураліся убачаным, як раптам усё тое засталося за кармою — перад намі ляжала зіхатлівае люстра вады. Сонца свяціла злева, і люстра тое пералівалася ўсімі колерамі вясёлкі.

— Зірніце на сваю «лоцыю»! — гукнуў Мікола.— Нам трэба ў Гайкі. Адтуль тэлефанаваць будзем, і за намі прыедуць!

Разгортваю аркушык паперы, на якім пазначаны маршрут нашага падарожжа, і зноў здзіўляюся: возера Янова на маёй «карце» паходзіць на чалавека! Контуры акрэслены выключна. Ёсць «галава», «тулава», «ногі». Чалавек быццам ідзе цяжкай, стомленай хадою па зямлі. А твар незадаволены, як бы ў крыўдзе за нешта. Адрываю пагляд ад паперы, азіраюся — і на сэрцы робіцца святлей. Звілістыя берагі Янова — сама прыгажосць! На крутых схілах сінее лес. Трошкі ўлева ўгадваецца паселішча. А там вунь зялёныя курцінкі чаратоў. Па правую руку відзён востраў. Няўжо Марылін? Так, гэта Марылін востраў! Яго не зблытаеш ні з якім. Ды дзе ўсё ж будуць тыя Гайкі? Зноў кідаю пагляд на паперу і, нарэшце, знаходжу. Яны раскінуліся на пагорачку за левай «нагой» возера-чалавека! Кажу пра гэта Міколу, ён робіць круты паварот і вядзе «казанку» ў самы канец заліва.

Цяпер сонца, нізкае і не такое ўжо зыркае, ляціць насустрач, слепіць вочы. Мікола зводзіць бровы, ухіляецца ад праменняў і раптам прыўстае.

Я азіраюся. Каля самай вады, на кручы, стаіць чалавек у светлым пінжачку і махае нам рукою. Трошкі воддаль віднеецца машына. Няўжо Генадзь? Пінжачок, здаецца, яго...

Гэта быў, сапраўды, Генадзь. Калі маторка ткнулася носам у бераг, ён ступіў насустрач.

— А я вырашыў раней прыехаць,— сказаў Генадзь.— Прызнацца, трошкі нават хваляваўся. Такая навальніца ноччу была!

— Усё было,— пакідаючы лодку, буркнуў Мікола.— Але мы не з такіх, каб збаяцца!

Ён як бы ганарыўся сабою.

Калі маторка была ўжо на прычэпе, ні то жартам, ні то ўсур'ёз прамовіў:

— Засталося толькі прозвішча маё ў «бартавы журнал» запісаць: Мікалай Мікалаевіч Радзевіч, як Дзімітравіч казаў, капітан-матарыст на час падарожжа.— Ён хітравата прыжмурыў вочы.

— То, відаць, трэба і прозвішча гаспадара грузавічка занатаваць? — сказаў я.

— Не варта. Я ж тут...

— Варта-варта! — не даў дагаварыць Генадзю Мікола.— Курбака іхняе прозвішча. Курбака!

Я ўспомніў Валянціну Аляксандраўну Курбака, яе «толькі ты можаш выручыць» і запытаўся:

— У райкоме ці не родзічка ваша працуе?

— Жонка,— спакойна адказаў Курбака.— Пазваніла, кажа: так і так. А ў мяне якраз адгул. Вось і ўгаварыла!..

Яшчэ большай павагай я пранікся да гэтых людзей.



## САМАЕ ГЛЫБОКАЕ

*Схаванае ад людскіх вачэй ● Перасяленцы Урочышча Чарняўшчына ● Вугорыч і стынка Зімовыя «кветкі» вады ● Тут хадзіў Драздовіч Вучань вядомага мастака*

Спачатку слова доктару геаграфічных навук Вользе Піліпаўне Якушка. У сваёй кніжцы «Край азёрны» яна расказвае пра сустрэчу з возерам Доўгім — самым глыбокім у Беларусі, якое знаходзіцца ў Глыбоцкім раёне,— наступнае.

«Гэта былі яшчэ надзвычай цёплыя дні — апошнія дні лета, ледзь кранутыя сумам блізкай восені,— піша Вольга Піліпаўна.— Раніцой выбіраліся мы са свайго самаробнага будана, узведзенага пад адзінокай старой ялінай, і беглі па слізкай ад расы траве ўніз па крутым схіле да возера. Туман ахутваў яго так, што цяжка было нават разгледзець цёмныя сцяблінь чароту. Пасля халоднай расы вада здавалася гарачай і было прыемна стаяць нерухома ў гэтай цёплай ванне, прыслухоўвацца да ранішніх гукаў. Яны прыходзілі адусюль: гэта былі галасы рыбакоў, што праплывалі на лодках недзе каля нас пасля начнога лову, брэх хутарскога сабачкі з процілеглага берага, стук шышкі, што

сарвалася з яліны. Туман не толькі глушыў гукі, але як бы размяркоўваў іх у прасторы так, што галасы з вёскі, здавалася, чуліся недзе побач, а ранішняя песня жаваранка даносілася аднекуль здалёк...

Намі кіравала нясцерпнае жаданне даведацца пра возера як мага болей, зазірнуць у яго празрыстую глыбіню, захаваць яго вобраз надоўга... Позна ўвечары ўсе мы збіраліся каля вогнішча і амаль да раніцы вялі размовы пра жыццё, пра шчасце, упаўголаса спявалі. Бывала адыдзешся за шышкамі далей ад вогнішча і адразу трапіш у незвычайны свет начной зямлі, над якой спакойна свецяць непрывычна яркія для гарадскога жыхара зоркі. Доўга-доўга глядзіш уверх, пакуль не здасца, што ты згубіўся сярод далёкіх сусветаў, і тады яркі круг вогнішча, у святле якога бачны знаёмыя мілыя твары, зробіцца яшчэ даражэйшым...»

І далей Вольга Піліпаўна піша пра тое, таямнічае, схаванае ад людскіх вачэй:

«Ад тубыльцаў можна пачуць, што глыбіня возера не меней 70 сажняў, што на дне яго ёсць высокія горы, у ямах водзяцца пачвары, а снятку — процьма. І ў гэтым шмат праўды: ну што з таго, што глыбіня возера не 70 сажняў, а 53 метры, што глыбакаводныя пачвары так і не паяўляліся. Але паўпудовы шчупак, выцягнуты з вады на нашых вачах, вельмі падобны быў на кракадзіла, а мятровы вугор нагадваў вялікага пітона. Хаця ў возеры водзяцца розныя пароды рыб, удача не часта спадарожнічала рыбакам: вельмі складанае азёрнае дно».

Дае яна і больш канкрэтнае апісанне возера Глыбокага:

«Уражвае перш за ўсе сваёй формай. Яно нагадвае вузкую (300—350 метраў) цясніну даўжынёю каля 7 кіламетраў з высокімі, амаль стромымі схіламі. Вялікая круцізна характэрная і для падводных схілаў. Толькі вузенькая мелкаводная пясчаная палоска цягнецца ўздоўж берага, а далей — рэзкі спад адразу на 15—18 метраў, куды не даходзяць промні сонца. У цэнтры возера глыбокія, па

40—50 метраў, плёсы раптоўна чаргуюцца з падводнымі ўзвышшамі-перакатамі...»

Вось якое яно, возера Доўгае! Дзіва што здаўна прыцягвала да сябе чалавека. Шмат стагоддзяў таму назад у ваколіцах Доўгага з'явіліся славянскія плямёны крывічоў. Звыш дваццаці курганоў за апошнія гады выяўлена толькі каля вёскі Бабруйшчына. Ёсць старадаўняе гарадзішча непасрэдна і на беразе возера — на паўвостраве Галубоў Хутар. Адны сцвярджаюць, што гэта след першабытнага чалавека, другія — колішняга пасялення крывічоў. Аднак раскопак тут ніхто не рабіў, і можна толькі гадаць, што ўяўляе сабою тое гарадзішча. Недалёка адсюль, на беразе суседняга возера Шо, паблізу вёскі Сшо, было таксама старадаўняе крывіцкае пасяленне. У 1928 годзе польскія вучоныя Ева і Пётр Галубовічы правялі там археалагічныя раскопкі. Знойдзены каменныя прылады, тыповыя прадметы ўжытку крывічоў. Пазней, пасля вайны ўжо, каля вёскі Свіла старажытнае гарадзішча даследаваў вядомы беларускі археолаг Аляксей Рыгоравіч Мітрафанаў. Ён выявіў шмат цікавага. Быў знойдзены і гаршчок з жытам, які праляжаў у зямлі за тысячу гадоў. Гэта сведчыць, што жыхары старадаўняга селішча былі людзьмі аселымі. А здзівіла іншае: зярняты прараслі і далі ўсходы!

Возера Доўгае прыцягвала да сябе людзей і пазнейшага часу. Сюды сходзіўся, з'язджаўся народ з далёкіх і не вельмі далёкіх мясцін, будаваўся і жыў з працы рук сваіх на яго берагах. Вакол выраслі вёскі — Каменка, Заазёрная, Доўгае, Новая Псуя, Абруб, Стуканы, Зябкі Псуеўскія.

Цікавая гісторыя засялення паўднёвага, самага ўзгорыстага берага возера. Жыхары далёкай па тым часе Мядзельшчыны дачуліся, што бераг Доўгага не абжыты, што там куды лепшая зямля за іхнюю, і рашыліся на перасяленне. (Гэта было перад уз'яднаннем Заходняй Беларусі.) Туды пераехалі сем'і

Чарняўскіх, Давідовічаў і ажно чатыры сям'і братоў Малькоў: Юстына, Івана, Андрэя і Мікалая. Зляпілі часовыя хаціны і сталі даводзіць да ладу зямлю — карчаваць лес, выпальваць ляда, матычыць. Толькі пасля такой «апрацоўкі» можна было плуг пусціць. Зямля сугліністая, цяжкая, але радзіла спраўна. Хіба толькі як падкрадалася засуха, перасяленцы амаль нічога не мелі. Зямля камянела ад сонца і была голай, што бубен. Тады людзей выручала возера.

Я сустрэўся з сынам Юстына-перасяленца Пятром Малько, які цяпер працуе загадчыкам фермы ў вёсцы Абруб, што ў саўгасе «Яблынька». Ён сказаў:

— Помню, у гады няўроду ўсе нашы на возеры прападалі. Стынку лавілі, гэта значыць, снятка. Яе і смажыць можна было, і сушыць. Таксама ляшча бралі, акуня, карася, шчупака. Іншы раз на вугорыча натрапяць, то тады ўжо як свята было. Вугорыч, ведаеце, на сваім тлушчы смажыўся.

— А стынка? Якая яна сабою?

— На мойву падобная. Пах мае спецыфічны і на сонцы ажно прасвечваецца, як шкляная. Цяпер, улетку, яе не ўлавіць: на вялікіх глыбінях трымаецца.

— А вугор?

— Пра вугорыча нешта не чуваць зараз. Пэўна, недзе на падыходах запынь узвялі, і ён трапіць не можа ў Доўгае.

Пятро Юстынавіч трывожыўся не дарма. Каб малявукам вугра дабрацца да возера, трэба прайсці з Саргасава мора (там адзіныя ў свеце нерасцілішчы вугра) даволі складаны шлях: Балтыйскае мора — Заходнюю Дзвіну — рэчкі Дзісенку і Мнюту — возера Плісы — рэчку Шоша — возера Шо — рачулку Даўжанку. Відаць, недзе, сапраўды, ёсць перашкода, а мо і не адна. Гэта можа быць плаціна або шлюз. Адным словам, нашым рыбаводам варта выявіць сапраўдную прычыну, якая шкодзіць міграцыі вугра.

Але Пятру Юстынавічу я сказаў пра іншае:

— Тут жа ў вас прыгажосць якая! Возера непаўторнае. Відаць, і гэта паспрыяла таму, што Доўгае аб'яўлена заказнікам рэспубліканскага значэння.

— А як жа! — выказаў ён згоду.— Толькі, думаю, во якая асноўная прычына будзе: у Доўгім водзіцца тая ж стынка, драбнюткі рачок, які дажыў да нашых дзён з ледавіковага перыяду, і нейкая дзіўная водарасць. Пра стынку я казаў ужо, а пра рачка і водарасць — нічога канкрэтнага паведаміць не магу. Памятаю толькі: у пяцідзесятых гадах возера даследавала адна вучоная з Мінска, Якушка яе прозвішча. То ўсё, помню, не магла нарадавацца і тымі рачкамі, і тымі водарасцямі.

Я здагадаўся, пра якога рачка і пра якія водарасці казаў Малько. Рачок той называецца лімнакалянус. Ён, сапраўды, рэлікт ледавіковага перыяду. Занесены ў Чырвоную кнігу БССР. Захаваўся ў Доўгім толькі дзякуючы чысціні вады і глыбіні возера. Сам — драбней ці знойдзеш. Даведнікі сцвярджаюць, што ў кубічным метры вады ў натуральных умовах гэтых рачкоў, можа жыць да трыццаці тысяч асобін. Вядома, убачыць такога «велікана» ды яшчэ няўзброеным вокам Малько не мог, а вось сустракаць незвычайныя водарасці, магчыма, і даводзілася.

Вольга Піліпаўна Якушка пра тыя водарасці (панавуковаму — асцыляторыя чырванаватая) расказвае ў той жа кніжцы:

«Аднойчы на пачатку сакавіка нашу экспедыцыю чакала цікавае адкрыццё. Выявілася, што насуперак устарэлай думцы аб слабым развіцці водарасцяў у Доўгім, яно «цвіце», толькі не ўлетку, як іншыя, а ў канцы зімы. У тыя сакавіцкія дні лёд на возеры быў яшчэ тоўсты, але празрысты. Праз яго прабіліся сонечныя праменні і выклікалі жыццё мікраскапічных водарасцяў, якія ўтвараюць скапленні з соцень тысяч маленькіх раслін ярка-чырвонага колеру. У час работы мы раптам са здзіўленнем і захапленнем заўважылі скрозь лёд буйныя чырвоныя кветкі, падобныя на марозныя ўзоры на вокнах. Мы разбілі

лёд, кветкі зніклі, але ў лунках з'явіліся скопішчы ярка-чырвонага рэчыва, якое нагадвала кавалачкі поўсці, што плавала ў вадзе. Такія водарасці сустракаюцца рэдка. У Беларусі яны вядомы ў невялікім, але глыбокім возеры Рудакова (яно ў Мядзельскім раёне — Я. П.). Пасля таго як сыдзе снег, водарасці знікаюць да наступнай вясны, нібы падснежнікі ў лесе».

— Пра наша возера шма-ат можна расказваць,— у роздуме прамовіў Малько.— А вось каб сваімі вачыма пабачыць! На ўсё жыццё запомнілася б.

Скарыстаў яго параду.

І ў памяці жыве, не сціраецца і, відаць, ніколі не сатрэцца дзівосны краявід. У зялёным вянку стромых берагоў ляжыць люстра вады. Чаромха, арэшнік, вольха, лазняк, асобныя яліны, ліпы, бярэзіны, дубы — усё бачыцца ў тым люстры. А што робіцца тут увосень? Калі сама прырода запальвае на берагавых схілах казачнай прыгажосці кастры? Залацістым вянком абрамляецца тады возера Доўгае. А ўвесну? Калі абуджаецца ўсё жывое? Такою парою ад самай вады падымаюцца, ідуць угору, як бы да людзей, чаромхі. Здалёк здаецца, што там яшчэ не растаў снег... А колькі тады салавак злятаецца на Доўгае, каб уславіць яго спевамі! Нават спрадвечныя дрывасекі-бабры пакідаюць працаваць. Выйдуць на бераг, пастануць слупкамі і доўга прыслухоўваюцца — радуюцца новай вясне.

Агледзіны пачаў з самага высокага месца на беразе возера. Некалі тут жылі Чарняўскія. Аралі зямлю, сеялі жыта, садзілі бульбу. Яны даўно ўжо пераехалі ў Абруб, а ўрочышча так і завецца ў памяць перасяленцаў — Чарняўшчына.

Адсюль, па правую руку, адзін за адным збягаюць пагоркі аж да небакраю. Усе яны ўкрыты зялёнай коўдрай травы. Хлебаробы разумеюць: Доўгае і прылеглыя плошчы трэба аберагаць — заказнік жа! Таму на подступах да возера зямлю не чапаюць, не

сеюць там ні збожжавых, ні прапашных, не прымяняюць гербіцыдаў, тукаў.

Паўночны бераг возера — гэта ўжо тэрыторыя саўгаса імя Дзяржынскага. Там таксама віднеецца зялёнае мора травы. Ад самай кромкі вады падымаецца лісцевы лес. Ён звілістай фальбонай цягнецца ад нейкай вёсачкі на ўсход, толькі сям-там трошкі адступаючы ад возера.

А што каля кромкі вады тут, насупраць Чарняўшчыны? Прадзіраюся зараснікамі ўніз. Траву, кусты, дрэвы — усё перавіў хмель. Ён драпае адзежу, рукі, твар. Але каб ужо і хацеў спыніцца — нічога не атрымалася б: неяк раптоўна пачаўся амаль стромы схіл. Хапаюся за вецце, каб не паляцець у прорву, і яно выручае, утрымлівае.

Ногі ступілі ў нешта слізкае і халоднае. Ручаінка! Яна збягае ўніз, да возера, вузкім касмічком. Пераступіў яе, прайшоў трошкі ўздоўж схіла, трымаючыся за кусты, і яшчэ на адну ручаінку натрапіў. Яна шырэйшая і не такая звілістая. Дабегла да кромкі вады і знікла — злілася з возерам.

Мацаю нагою азёрнае дно. Яно цвёрдае, жвіраватае. Вада светлая — усе каменьчыкі відны. Іду ўправа, паўз самы бераг, да грыўкі чароту. Пасярод яе ляжыць круглы і пляскаты камень, а на ім нешта паблісквае чорнае... Гэта вуж выграваецца! Скруціўся ў тры пагібелі і хоць бы што — спіць.

Падымаю з вады сук і, намацваючы дно, кіруюся далей ад берага. Але крокаў праз дзесяць адмаўляюся ад такой задумы: сук раптам не дастаў дна! Пабач была бездань. Успомніліся словы Малька: «Насупраць Чарняўшчыны — адзін з самых глыбокіх участкаў возера! Ён і замярзае найпазней. Іншы раз і сярод зімы ў гэтым месцы стаіць туман. Возера паруе, і мароз ніяк не можа ўзяць сілу над ім. Глыбіня!»

А вось і ўрочышча Юстынава. Схілы мае болей пакатыя, а лес — адны прагалы. На тых касагорыстых прагалах безліч красак. Здаецца ўсё, якія ёсць на зямлі колеры, сабраны там. Ні даць, ні ўзяць — луг альпійскі.

Сяліба Юстына Малька яшчэ захавалася. Да апошніх сваіх дзён жыў тут гаспадар, не кінуў наседжанага месца, хоць да сяла адсюль і далекавата. Сваімі ж рукамі тут некалі і ляда карчаваў, і хаціну ставіў, і іншыя гаспадарчыя пабудовы ўзводзіў. Час няўмольны — падгнілі ўжо падрубы, пакасіліся сцены, пачарнеў дах. Здзічэў і садок. Яблыні пагнала ў атожылкі, кроны загуслі і толькі зрэдку можна ўбачыць завязь, пабітую даўганосікам... Пакрыўся іржою нікому ўжо непатрэбны плужок, разваліўся вулей... Нават спрадвечныя спадарожнікі чалавека — вераб'і пакінулі Юстынаву сялібу... З'явіцца аднойчы Пятро, разбярэ хату на дровы, пераарэ трактарам дворышча, і будзе тут такое ж поле, як і на хатнішчах астатніх перасяленцаў.

...Урочышча Ляшчоўка — пры самай вадзе. Тут некалі, відаць, стаяла сенажаць. Аднак у наступ пайшлі альшына з лазавіннем, іншыя кусты і дрэвы, і колішняя лугавіна страціла свой выгляд.

Паблізу берага свеціць яркай жаўцізной палатка. Спускаюся туды і бачу: з чаротаў выплываюць дзве лодкі.

— З уловам! — радуюся сустрэчы з людзьмі.

— А маем трошкі! — адказаў старэйшы з рыбакоў і падняў ладную нізанку рыбы. Там былі акунь, лешч, плотка, лінь — на добрую юшку з наварам. У маладзейшага ўлоў трошкі меншы, але вязанка таксама важкая.

— Прыехалі душу адвесці,— пачаў старэйшы.

— І, ведаеце, не каемся. Райская мясціна. Толькі вось «зладзеі» спакою не даюць.

— Яноты! — паправіў яго маладзейшы і стаў расказваць: — Як толькі далей адплывем ад берага, яны на палатку набег робяць. Адзін рыжаваты і вялікі, другі меншы і чорны... Шурудзяць, каб што з харчу ўкрасці. Усё перавернуць, бывае, але мы таксама не дурныя: цяпер да вецця сваю правізію падвешваем.

— Удакладніць трэба,— прамовіў старэйшы.— Гэта не яноты, а янотападобныя сабакі. Іх тут

шмат. І лісаў многа. А бабры дык цалюткую ноч плёскаюцца. Вунь каля тых камянёў хатка!

Ён зняў з тэрмаса накрыўку, зачарпнуў з возера вады і стаў піць. Тады прапанаваў мне:

— Пакаштуйце. Не ў кожным калодзежы на такую натрапіш.

Вада, сапраўды, была халоднай і смачнай. Не верылася нават, што азёрная. А рыбак расказваў:

— Некалі на паўвостраве Галубоў Хутар, што ў самым канцы возера, панок адзін жыў. Па прозвішчу Чапоўскі. Дык ён ніякай іншай вады не прызнаваў. Нават калі ў дарогу збіраўся, то с сабою азёрнай браў.

Праз гадзіну я быў на тым паўвостраве. Ён гектараў на дваццаць, не болей. Акаймаваны высокімі дрэвамі. Шмат ліпы, пракідаецца дуб (ёсць дрэва, якому гадоў трыста будзе). Ад сялібы таго панка нічога не засталося. А вось старажытнае гарадзішча акрэслена выразна. Нашы далёкія продкі ўдала выбралі места: з трох бакоў — вада і толькі з чацвёртага — адкрытая пляцоўка. Там пралягаў абарончы вал. Прабрацца ворагу ці зверу ў паселішча было не так проста.

На выхадзе з паўвострава з пагорка добра відно суседняе возера — Шо. Яно амаль круглае і зусім не падобнае на Доўгае. Берагі нізкія, дзе-нідзе балоцістыя, парaслі рэдкімі кустамі. А далей, за возерам — лес, лес і лес.

Існуе легенда, нібы на месцы аднаго з плёсаў некалі стаяла вёсачка, якая раптоўна «пайшла» пад ваду. Цяпер там толькі азёрныя хвалі плёскаюць...

Легенда — легендай. Аднак паблізу паўднёвага берага ёсць мясціна, якую завуць Крыжы. На невялікай глыбіні бачны рознай формы валуны. Мясцовыя рыбаловы сцвярджаюць, што гэта могілкі тае колішняй вёскі.

У той дзень мне давялося трапіць яшчэ і ва ўрочышча Дубы, што на тым, паўночным, беразе возера Доўгага. Кажуць, даўней вакол дрымучыя лясы стаялі. Шмат было і дубу, таму і ўрочышча так

завецца. Але ўсё мяняецца. Лясы пераставалі быць дрымучымі, зніклі дубровы. Толькі пра тое, што яны тут былі, сведчыць наступнае. Калі ў ціхую пагоду адплыць метраў дзесяць ад берага, то можна ўбачыць у возеры счарнелыя ад часу камлі таўшчэзных дубоў. Іх, верагодней за ўсё, некалі паваліла бура. Відаць, не адно стагоддзе ляжаць яны ў вадзе, бо на беразе ніякага знаку — ні каранёў, ні пнёў іхніх. Знаходзяцца смельчакі, што, даўшы нырца, робяць спробу дабрацца да дубоў-тапельцаў. Аднак марна. Глыбіня там вялікая, і дубы як бы ўніз кронамі стаяць.

Вяртаўся ў вёску Псуя, цэнтр саўгаса «Яблынька», дзе знайшоў сабе прыстанішча на тыя дні, і ўсю дарогу быў пад уражаннем сустрэчы з возерам. Нездарма мясцовыя людзі называюць яго «наш Байкал». Па чысціні вады і глыбіні, сапраўды, возеру Доўгаму няма роўных не толькі ў Глыбоцкім раёне, а і ў Беларусі. Вось жыў бы, думалася, Язэп Драздовіч, самабытны мастак-падзвіжнік, вечны вандроўнік, цікавейшы чалавек свайго часу, гордасць беларускай зямлі,— абавязкова яшчэ і яшчэ прыйшоў бы на беразе Доўгага, как зрабіць эцюд з натуры, а потым напісаць на кужалі ці зрэб'і насценны дыван — «беларускі габелен». Такі дыван давялося пабачыць у тутэйшым школьным музейчыку. На чорным фоне — выява часткі возера, масток, перакінуты з берага на бераг, дзве маладыя жанчыны, што ідуць к мастку насустрач адна адной... Падалося, што Драздовіч узяў за аснову краявід аднаго з усходніх заліўчыкаў возера Доўгага.

Я расказаў пра сваю здагадку Валерыю Уладзіміравічу Рудаку, сакратару парткома саўгаса, у якога кватараваў. Ён выслухаў уважліва, прамовіў:

— А і я так думаў! Язэп Драздовіч з тутэйшых, нарадзіўся пры самай Галубіцкай пушчы. Вядома, не раз быў і ў Псуі, і ў Абрубе, і на возеры Доўгім. Так што... Дарэчы! — ажывіўся Рудак. У вёсцы

Бабруйшчына жыве адзін дзядзька. Сухавіла яго прозвішча. Таксама мастак. Вучыўся, кажуць, у Драздовіча...

І вось я ў хаце Фёдара Іванавіча Сухавілы. Застаў на куханьцы. Ён сядзеў на табурэтцы перад белым, распятым на сцяне, палотнішчам і маляваў. Маляваў кветкі рознага колеру — чырвонага, жоўтага, ружовага, сіняга, бурачковага, бэзавага. Злучаў іх між сабою, і ўгадвалася, што гэта будзе нешта накшталт вялікага вянка. На белым фоне кожная кветка глядзелася як жывая.

Фёдар Іванавіч выцер анучкай пэндзаль, паклаў яго на фанерку, якая служыла яму за палітру, пасунуў да сябе мыліцы і сказаў:

— Хадземце ў пярэднюю.

Ужо там, у пярэдняй, прысеўшы на ложку, а мне прапанаваўшы крэсла, кінуў дапытлівы позірк:

— Слухаю.

Я сказаў, чаго зайшоў.

Сухавіла вельмі ўзрадаваўся і расказ пачаў здалёк:

— Я сам з Крывічоў родам. На пачатку трыццатых гадоў, помню, у нашай хаце жыў Язэп Драздовіч. Ён тады хадзіў па вёсках і зарабляў на хлеб — маляваў людзям дываны, макаткі, столачкі. Іншы раз толькі за харч маляваў. Хто яек прынясе, хто сыру, хто масла — хто што. Многія з крывічан тады атрымалі ад Драздовіча аздобу на сцены... Пажыў, значыць, у нашай сям'і дзядзька Язэп і падаўся далей, як ён казаў, у белы свет. У мяне і сёння ён перад вачыма: невысокі ростам, хударлявы, з вусікамі, у аблезлай куртачцы, у скураных чаравіках. За плячыма — торбачка, на галаве — зліняплая шапка з бліщчастым брылём, а ў руках — ляска. Помню яшчэ, на рукаяці яе была выразана галава чалавека... Трошкі ўбок адкінута яго маленькая ножка, нібы выспятка збіраўся даць каму. Ляска, на канцы акаваная жалезам і з багорчыкам, была яму за другую нагу... Але на ляску Драздовіч не вельмі абапіраўся — хадзіў лёгкім, спружыністым крокам...

Сухавіла ўздыхнуў:

— Я, можа, і не ўзяўся б за пэндзаль ніколі, але выпадак прымусіў. Пасля вайны ўжо, у сорак чацвёртым, працаваў у фінаддзеле. Ішоў у Зябкі, на станцыю, і падарваўся на міне. Толькі крок ступіў з дарогі... Рванула — не давядзі бог! Падабраў мяне чыгуначны абходчык. Ну, потым бальніца. Ампутацыя. Стаў інвалідам... Чым было заняцца? І тут я ўспомніў Язэпа Драздовіча, як ён разводзіў фарбу, як маляваў. З-за пляча ўсе тое бачыў! Падумаў: а што, калі і самому паспрабаваць? Спачатку не клеілася, а потым пайшло памаленьку. За ўвесь час мо з тысячу работ выканаў. Толькі ў мяне фон не такі. У Драздовіча быў чорны, а ў мяне — белы... Хто прыедзе, той спадабае і купіць. Работы мае і ў Польшчы ёсць, і ў Вільні, і ў Рызе, і ў Ленінградзе, і ў Маскве. На выстаўках нават былі — у Полацку і Віцебску.

— А эцюды пішаце? — пацікавіўся я.

Сухавіла спахмурнеў. І я адчуў, што задаў недарэчнае пытанне. Яму ж цяжка нават на вуліцу выйсці, а трапіць, скажам, на тое ж возера Доўгае ці куды ў іншае месца... Праўда, Фёдар Іванавіч іншы раз рызыкне, папросіць каго з вяскоўцаў, каб вывезлі за сяло, у лес ці на бераг азярца, і тады на мальберце з'яўляюцца краявіды ваколіц — мілых сэрцу куткоў роднай зямлі.

З вёскі Бабруйшчына вяртаўся надвячоркам. Сонца яшчэ не села, але было ўжо над зялёным вянком возера Доўгага. Прыпарвала. Аднак у небе ні хмарынкі. Яно было сіняе-сіняе, і ў той высокай сінечы кружылі маладыя буслы. Быццам агледзіны зямлі рабілі.



## ГОЖА НАД НЁМАНАМ

*Райград ● Гумарыст з Чарнушак*
*Жанчына з Дзукіі ● Хлеб дружбы*
*Сустрэча праз сорак гадоў ● Надзённыя клопаты*

Райград ляжыць між лесу, як вялікі сподак, ляжыць спакойна, сцішана і зелянее морам атавы. Яго палавініць белая паласа мяжы, здалёк падобная на дарогу-гравійку. Па левы бок яе — зямля беларуская, па правы — літоўская. Яшчэ відзён астравок лесу. Ён узвышаецца над левай часткай Райграда і нагадвае прысады закінутага хутара.

Мы стаім на кручы, амаль на краечку таго «сподка» і радуемся сустрэчы.

— Востраў Чурлёніса,— кажа Ала Іванаўна Салей, якая згадзілася стаць маім гідам на той дзень.— Мастак любіў прыходзіць сюды... Мы пакінулі тыя пару гектараў лесу сярод балота, калі праводзілі меліярацыю, пакінулі ў памяць аб вялікім мастаку і кампазітару.

Яна нейкі час моўчкі пазірае па той бок Райграда, а тады зноў кажа:

— Вы не ўяўляеце, колькі музыкі ў Чурлёнісавых фарбах! А якімі фарбамі свеціць яго музыка!..

Я быў рады за Алу Іванаўну. Аграном па спецыяльнасці, яна гэтак трапна сказала пра творчасць вялікага мастака! Успомніўся трыпціх Чурлёніса «Райградас». Напісаны на пачатку стагоддзя, ён надзвычай дакладна перадае і настрой чалавека, які ўпершыню сустракаецца з гэтай унікальнай мясцінай, і захапленне зямной прыгажосцю, і нават, калі хочаце, думкі. Думкі пра далёкае будучае, сведкамі якога стануць нашчадкі мастака, мы, нашы нашчадкі.

Пазіраў на Райград і заўважаў змены. У трыпціху Чурлёніса на пярэднім плане звіваецца рачулка. Зараз яе няма. У творы мастака небакрай у суцэльнай зеляніне лесу. А тут у лес укроплены белыя шыферныя дахі вёсачак. На карцінах пераважаюць карычневы і пурпуровы колеры. А на самой справе ўвесь Райград заліты адным колерам — сонечным. У спалучэнні з аксамітам атавы ён так уражвае! Сонца і жыццё, жыццё і сонца! Без гэтага Зямля была б, як камень, усё выглядала б, як на Марсе або на якой іншай бязлюднай планеце.

Генрых Восіпавіч, калгасны шафёр, які прывёз нас сюды, прыжмурвае вочы, пазірае туды, дзе ўгадваецца стужка Нёмана, і гаворыць:

— Стварыла ж прырода!

— Яна мудрэйшая за чалавека,— думаючы пра нешта сваё, ціха прамовіла Ала Іванаўна.

— Не кажыце! — зноў падаў голас шафёр і заўважыў: — А як разумець тое, што людзі кажуць?

— Пра легенды Райграда? — удакладняе жанчына.

Генрых Восіпавіч прамаўчаў.

Мы наблізіліся да самага крутаяра. Там, унізе, пад нагамі, было таямнічае царства змроку і ценяў. Сонца туды не дасягала, і ў тым прадонні — як ноччу.

— Праверым? — прапанаваў я.

Ала Іванаўна паціснула плячыма, а шафёр толькі рукамі развёў: маўляў, рызыкоўна!

Давялося аднаму спускацца. А калі апынуўся ў той бездані і зірнуў угору, дзе павінны былі стаяць

мае спадарожнікі,— за галаву хапіўся: куды трапіў! Не відаць ні сонца, ні неба. Над табою густое спляценне вецця, а вакол стаіць затхлае, нібы ў старым закінутым склепе, паветра. Процьма камароў. Сям-там зеленеюць пакрытыя мохам выварагні. Дрэвы як упалі некалі, так і ляжаць, не кранутыя нікім. Пад нагамі хлюпае. Папараць старанна прыкрывае невялікія балацінкі. А за выварагнямі і балацінкамі, за густой сцяной алешын праглядваецца роўная, як стол, плошча. Прабіраюся туды. На тым «стале» ні кусточка, ні дрэўца — вынік меліярацыі!

Міжволі ўспамінаецца Крутагор'е, вёска Скірмантава, гара за ёю, на якой бетонны слуп сведчыць, што гэта самая высокая геаграфічная кропка рэспублікі. Падумаць толькі! Трыста сорок пяць метраў над узроўнем мора. А тут? Восемдзесят. Самае нізкае месца Беларусі.

Райград адсюль нагадвае звычайную лугавіну, парэзаную калектарамі, і толькі берагі-ўзвышшы вакол яго — як высокія валы, парослыя немаладым лесам. Што тут адбылося некалі? Возера зацягнула бузою? Раптоўна высахла лукавіна Нёмана? Ці мо асела зямля? Але ж плошча гэтай упадзіны не малая — паўтары сотні гектараў! Адказу на свае пытанні я не знаходзіў.

Недзе адтуль, зверху, як бы з-пад самага сонца, пачулася:

— Э-гэ-гэй!..

Трэба было вяртацца: клікалі мяне.

Толькі цяпер зразумеў той жэст Генрыха Восіпавіча. Бо кожны крок даваўся мне з цяжкасцю. Ісці па роўным было яшчэ сяк-так. А калі перад вачыма паўстала пясчаная сцяна, парослая дрэвамі і кустамі, становішча маё было незайздросным. Ісці заміналі шматлікія крынічкі-вадаспады. Яны бруілі ўніз, не выбіраючы дарогі, не зважаючы на камлі дрэў, спарахнелыя карчы. У іншых месцах вадаспады выбілі ў пяску пячоры, і трэба было сачыць, каб знянацку не трапіць у тыя пасткі. Дакучаў пясок-плывун — сачыўся з-пад ног няспынна. Мала дапа-

магаў і кіёк. Ён лез у пясок, як у масла. Адзінае, што прыходзіла на дапамогу,— гэта дрэвы і кусты. Хапаючыся за камлі, за голле, я хоць і паволі, але падымаўся. Калі нарэшце ступіў на краечак крутаяра, убачыў сонца.

А мае спадарожнікі, нібы згаварыўшыся, сказалі:

— Мы ўжо падумвалі ісці на выручку...

Паехалі на процілеглы «бераг» Райграда, у сяло Прывалка. Па дарозе Ала Іванаўна расказвала:

— Вёску завуць яшчэ і Правалка — ад слова «правал». Але Прывалка будзе болей рэальна. Бо яна — пры валу з узвышшаў, якімі як бы абнесены Райград.

— А сам Райград? — пытаюся.

Зноў паціснула плячыма, але выдалі вочы — успыхнулі вясёлым агеньчыкам:

— Пра Райград у нас такія байкі ходзяць. Нібы тут некалі стаяў багаты горад. Адных цэркваў было за сорак. А сам ён называўся Райскім. Жыхары яго пакланяліся аднаму — золату. Нават свае дамы крылі залатой бляхай. Бог чакаў, што людзі адумаюцца, адмовяцца ад прагнасці, ды не дачакаўся. Тады наслаў пакаранне — праваліўся Райскі скрозь зямлю, а на яго месцы стала вада... Казалі старыя людзі, што некалі раз у год, у дзень гібелі горада, з вады чуліся званы. Яшчэ казалі, што ў цэнтры былога горада, у багне, ляжыць ланцуг залаты. Хто яго адшукае, той можа выратаваць пакараны горад. Чалавек, які рызыкне на такое, павінен быць дужым і смелым...

— Во-во! — не ўстрымаўся Генрых Восіпавіч.— А сябрук мой Бронік Шавальскі гаварыў, што пасля меліярацыі на Райградзе знайшлі ланцуг! Толькі не залаты, а звычайны. Звенні, праўда, во якой таўшчыні былі! Яшчэ казаў: аднойчы, да асушэння, сабраліся мужыкі і давай тычкамі мацаць «вокны» ў балоце. Звязвалі, казаў, па тры латы, а не дасталі дна. Раз толькі нібы ў бляшаны дах тычка грукнула. А болей нічога і не ўчулі.

Слухаў я шафёра і гожа рабілася на сэрцы. Які багаты народ наш на выдумку! Фантазіяй таксама не абдзелены. Яго байкі-казкі не пазбаўлены і пэўнага сэнсу.

— Вы не ведаеце пра нашага Фэлека! — шматзначна сказала Ала Іванаўна і ўсміхнулася.

Пра Фэлека, яго дасціпныя жарты ці «фокусы» я чуў. Жыве ён у Чарнушках, паблізу Прывалак, працуе леснікам. Тыя Чарнушкі цяпер і вёскаю не назавеш. Усяго адна хата — Фелікса Шыманоўскага — і стаіць там. Сам гаспадар вызначаецца пакладзістым характарам і добрай душой. За дзень наб'е ногі па лесе, а вернецца дамоў ці па дарозе ў суседняе сяло зойдзе — і пацягне чалавека пагаманіць, пажартаваць. Іншы раз (каб не забываліся пра яго, каб помнілі, што ён яшчэ жыве ў Чарнушках) адколе такое — хоць стой, хоць падай.

Аднойчы яго Зося сабралася ў Гродна, а мужу сказала:

— Фэля, пакуль вярнуся, пабаранүй бульбу!

Ён ведае, што такое баранаваць бульбу. Гэта трэба вынесці з-пад навеса барану, злавіць на лужку каня, запрэгчы, а потым паўдня глытаць пыл, ходзячы за бараною. А ці не лепш удасканаліць гэты працэс? Думаў Фэля, думаў, як выкруціцца з такога становішча, і нарэшце прыдумаў. Узяў рэшата ячменю, рассеяў па сотках і выпусціў курэй. Тыя як бачыш кінуліся збіраць зерне, і праз якую гадзіну сотак было не пазнаць. Вярнулася Зося ўвечары, пытаецца:

— Фэля, а ці пабаранаваў бульбу?

— Пабаранаваў! — адказаў ён.

А сам усміхаецца: і клопату лішняга пазбавіўся, і такая работа зроблена!..

Да Фелікса цягне людзей, як магнітам. Іншы ідзе да лесніка за блізкі свет, каб разам пасмяяцца, адвесці душу дасціпным жартам. Аднойчы прыехала ў Чарнушкі мо чалавек дзесяць. Паздароўкаліся з гаспадаром, просяць:

— Фэля, даў бы папіць крынічнае. Смага даймае.

— А чаму ж не даць? — адказвае ляснік.— Дам. Вады не шкода.

Узяў кубачак (не вядро!) і паволі пайшоў у лажок, да крыніцы. Вяртаецца неўзабаве, падае крайняму і кажа:

— Піце, хлопцы, піце. Яшчэ схаджу, калі замала.

І ўсё гэта на поўным сур'ёзе.

Часам нехта на Феліксаў рахунак захоча праехацца, і тады з вёскі ў вёску пералятае такі жарт:

— Зося! — сказаў аднойчы Фэля.— А ці я сёння вячэраў?

— Не, Фэлечка! Павячэраць ты сёння забыўся.

— Тады смаж бульбу! — загадаў муж, павярнуўся да сцяны і захроп.

Або:

— Паважаны Шымаиоўскі! — звярнуўся да лесніка ўпаўнаважаны з раёна.— Чаму ў вас сёння выгляд неважнецкі?

Фэля нават і брывом не павёў.

— А няхай яго! — сур'ёзна адказаў ён.— Пакуль спланаваў сваю работу — галава ўспухла.

І зноў смех, рогат.

А вось і Прывалка. Сяло вялікае, мо з дзесятак вуліц мае. (У свой час тут здымалі фільм «Рудабельская рэспубліка»). Але мы не спыняемся, кіруем на ўскрай паселішча, дзе, амаль побач з Райградам, бялеюць будынкі птушкафермы калгаса «Іскра». Яна адна з буйных на Гродзеншчыне — дае ў год амаль тысячу тон качынага мяса.

На ферме нам трэба пабачыцца з Мальвінай Шостак, літоўкай па нацыянальнасці, якая выйшла замуж за тутэйшага чалавека і каторы ўжо год жыве і працуе тут, у Прывалцы.

Шостак засталі на месцы. Ала Іванаўна, радая, што не давялося шукаць жанчыны, жартаўліва запытала:

— Як жыццё маладое, Мальвіна Канстанцінаўна? Як дружбу народаў мацуем?

— Якое яно маладое! — нібы пакрыўдзілася тая.— Унукамі вунь абсыпалася! А дружбу — мацуем! Без яе нельга. Без дружбы людзі на ніц сыйшлі б.

І, даведаўшыся, чаго завіталі да яе, стала расказваць:

— Маё дзявочае прозвішча — Мажгерутэ. А родам з Дубалканіс, што ў Літве, за дваццаць пяць вёрст адсюль. Выйшла за свайго Пятра яшчэ ў сорак першым. Жывём дружна, чатырох сыноў маем — Эдмунда, Антося, Вацэка, Франца. Усе пажаніліся ўжо. Эдмунд узяў Таісу, кіргізку. Антось — Ніну, беларуску. Вацэк — Серафіму, польку. Франц таксама на польцы ажаніўся, на Чэсі. Інтэрнацыянал!

Жанчына смяецца. Загарэлы твар выпраменьвае дабрыню і нейкую ціхую, спакойную радасць.

— А я спачатку ніц не ведала мовы беларускай, хоць і з дзукаў сама. На поўдні Літвы ёсць край — Дзукія. Яго яшчэ завуць Дайнава, ад слова «дайна» — песня. Дык я адтуль, з песеннага краю.

Яна раптам як бы спахапляецца:

— А ці паверыце? На першым годзе замужжа было. Вару аднойчы бульбу. Ужо чыгунок закіпаць стаў, саліць трэба. А як тую соль завуць у Прывалцы — ліха яе ведае. Папытаць у свекрыві сорамна. Выскачыла з хаты, пабегла да татавага брата (ён таксама жыў у сяле гэтым), кажу: так і так. Як будзе друска па-тутэйшаму? А ён смяецца: соль!

— Вы пра ўнукаў успаміналі,— перахапіла ініцыятыву Ала Іванаўна.— А ці шмат іх у вас?

— Яшчэ не вельмі,— адказала жанчына і стала загінаць пальцы: — Сяргей, Віця, Іра, Пеця...

— Эвалюцыя ў імёнах,— шчыра ўсміхнулася мая спадарожніца. Усміхнулася і Мальвіна Шостак — таксама шчыра і адкрыта. Перавяла позірк на мяне і прамовіла так, нібы паведамляла пра самае галоўнае:

— А збяромся, бывае, усе разам, то гаворым па-просту, па-нашаму, па-беларуску...

Прыемна было чуць такое. Хаця нічога дзіўнага ў гэтым няма. Па-першае, столькі гадоў сама жыве сярод беларусаў. Па-другое, дзеці раслі тут, у Прывалцы. Па-трэцяе, дзукі — вельмі блізкія па духоўнаму складу да беларусаў. Пазней у Беларускай Савецкай Энцыклапедыі я адшукаў пра дзукаў даведку: «Ад іншых літоўцаў адрозніваюцца адметнымі дыялектнымі рысамі (у тым ліку дзеканнем). У лексіцы дзукаў, ва ўзорах і каларыце адзення, у ткацкім арнаменце, ядзе і іншых з'явах матэрыяльнай культуры і побыту шмат агульнага з беларусамі». А цяпер — пазіраў на Мальвіну і, прызнацца, зайздросціў яе Пятру: добрую жонку знайшоў сабе ў суседняй Дзукіі, у краі галасістых, раздумлівых і пяшчотных дайнаў. Сам Пятро, кажуць, крутаваты норавам, але Мальвіна ўмее правіць жыццём — дзе спагадлівым словам, дзе дасціпным жартам, дзе песняю-дайнаю, а дзе і строгім жаночым наглядам. І нічога, усё ладам ідзе ў Шостакаў. Як сама гаспадыня сказала: «Файна жылі, файна і жывём».

Пакідалі Прывалку ў добрым настроі. Ён перадаўся нам, відаць, і ад жыццярадаснай Мальвіны, і ад расказаў пра гумарыста Фелікса, і ад усяго таго, што ўбачылі на беразе Райграда. І тут Ала Іванаўна расказала адну гісторыю, вартую самай сур'ёзнай увагі. Яна, тая гісторыя, таксама з'яўляецца яскравым сведчаннем дружбы двух суседніх народаў.

— Было гэта напярэдадні святкавання шасцідзесятай гадавіны ўтварэння нашай дзяржавы. Беларускае тэлебачанне арганізавала перадачу аб дружбе двух калгасаў: нашага — «Іскра» і літоўскага — «Кірсна». У студыю былі запрошаны першыя сакратары райкомаў партыі — Гродзенскага і Лаздзійскага, старшыні калгасаў, беларускія і літоўскія камбайнеры, што вызначыліся на ўборцы Хлеба дружбы ў літоўскім калгасе. Ішла гаворка пра гаспадарчыя справы, узаемавыручку на жніве — адным словам, пра дружбу братніх народаў. І вось, калі ўжо размова блізілася к канцу, вядучая звярну-

лася да камбайнера Валянцінаса Івановаса з пытаннем: што яму, літоўцу, і яго землякам болей за ўсё спадабалася ў нашай сталіцы. «Людзі,— коратка адказаў Івановас.— А наконт літоўца... Прабачце, але і сам не ведаю, хто я. Вайна...» Ён змоўк. А потым усё ж узяў сябе ў рукі: «Не ведаю, хто я,— паўтарыў Івановас.— У час вайны мяне ўратавалі ад смерці літоўцы. Сярод іх і вырас. Усё свядомае жыццё шукаю родных. Шукаю і не знаходжу. Але я рады, што побач са мною добрыя, сумленныя людзі, ёсць другая радзіма — працавітая Літва, ёсць шмат сяброў, якія мне як браты».

...Няхай чытач даруе, што абрываю аповяд Алы Іванаўны. Тады, знаходзячыся ў «Іскры», я не змог паехаць у «Кірсну», каб сустрэцца з Валянцінасам. І вельмі шкадаваў аб гэтым. А вярнуўся ў Мінск — адразу напісаў яму пісьмо з просьбай расказаць пра ўсё, што з ім адбылося ў тыя далёкія дні.

Адказ прыйшоў хутка. Валянцінас Івановас паведамляў: «Ахвотна хачу выканаць вашу просьбу, але, паверце, вельмі мала помню аб мінулым.

Той выпадак адбыўся са мною ў 1943 годзе на чыгуначнай станцыі ў літоўскім горадзе Алітус. Эшалоны, набітыя савецкімі людзьмі, ішлі ў Германію. У адным з іх быў і я з бабулькай і малодшым братам Грышкам. Пуцявы рабочы Іозас Буравічус ведаў, што на станцыі немцы часам гандлявалі дзецьмі — абменьвалі іх на розныя рэчы. Сваіх дзяцей Буравічус не меў і хацеў знайсці падлетка, каб была помач у гаспадарцы. З такім намерам ён падышоў да канваіра і папрасіў прадаць якога-небудзь хлопчыка. Той спачатку стаў адганяць, але калі Буравічус дастаў з сумкі гусака, немец адсунуў дзверы вагона-таварняка і сказаў: выбірай!

Каля дзвярэй якраз сядзела мая бабулька і трымала мяне на руках. Буравічус прамовіў: гожы хлопчык! Бабулька стала прасіць, каб ён узяў мяне, ураваў ад голаду. І Буравічус, замест падлетка, забраў мяне. Бабулька засталася адна. Не было пры ёй і малодшага брацікa Грышкі. Яго лёс невядомы мне

па гэты дзень. Яна мо аддала брата каму-небудзь раней, а я не заўважыў, ці ён памёр,— не ведаю.

Ну а я пачаў жыць у Буравічусаў. Спачатку доўга хварэў — у першы ж дзень зашмат накармілі! Аднак праз некалькі месяцаў папраівіўся, навучыўся і размаўляць па-літоўску. У 1947 годзе пайшоў у школу. Закончыў сем класаў і паступіў вучыцца на вадзіцеля. У 1960 годзе прызвалі ў армію. Закончыў службу, вярнуўся дамоў, ажаніўся. У нас з Янінай трое дзяцей — два сыны і дачка. Працую, як і раней, вадзіцелем, а кожны сезон, у час жніва,— і на камбайне. Вельмі люблю ўбіраць збажыну. Поспехі, вядома, сціплыя, але быў некалькі разоў першым у калгасе, а таксама і ў раёне. Прыёмныя бацькі цяпер жывуць у мяне. Яны старэнькія, ім патрэбна ўвага. А месца хапае — маю свой дом.

Вы пытаеце, як знайшла мяне родная мама? Яна ўсе гэтыя гады шукала нас праз Чырвоны Крыж. Думала, што мы недзе ў Германіі. Я шукаў яе таксама, і мне было нялёгка гэта рабіць, бо ведаў толькі імя мамы, брата і сястры. Куды ні пісаў, станоўчых адказаў не атрымліваў. Дапамагло тэлебачанне. Тую перадачу глядзела былая настаўніца Вольга Васільеўна Ліпская. Яна ведала мяне дзіцем, бо мы жылі па-суседству. Вольга Васільеўна пабегла да мамы і кажа: паказвалі па тэлевізару аднаго механізатара з Літвы. Ён згубіўся ў вайну і шукае сваіх. Вельмі падобны на твайго пакойнага мужа...

У красавіку 1983 года прыехалі да мяне мама, дзве сястры і брат. Аб гэтай сустрэчы, як яна праходзіла, мне нават цяжка пісаць. Я быў узрушаны, нейкі час не бачыў нікога, не чуў нічога. Апамятаўся недзе праз паўгадзіны. І так стала хораша на сэрцы! Бачу перад сабою родную маму... А яна плача, пытаецца па-беларуску: хто цябе, сынок ўратаваў, хто гадаваў...

Зараз мы бачымся два разы ў год. Я езджу да мамы на 1 Мая і на кастрычніцкія святы. Нас у сям'і восем чалавек — мама і сямёра дзяцей: чатыры браты і тры сястрычкі. Тата ў 1977 годзе

памёр. Ён з першых дзён вайны знаходзіўся на фронце, дайшоў да Берліна, быў двойчы цяжка паранены. Вярнуўся дамоў, а хаты няма. Усю нашу вёску спалілі фашысты. Тата пабудаваў новы дом. Зараз там жыве мама і малодшы брат Коля. Я даю вам адрас мамы: Гомельская вобласць, Мазырскі раён, вёска Лешня, Мішура Антаніна Ігнатаўна. Калі ў вас будзе магчымасць наведаць маму, яна раскажа значна больш. І яшчэ пішу адрас старэйшай сястры Вольгі. Яна таксама больш памятае, чым я. Змагла ж тады ўцячы ад немцаў! Фашысты стралялі па ёй, але, на шчасце, не патрапілі. Адрас Вольгі: Масква, вуліца Новая Дарога,1, кватэра 93, Селівестрава Вольга. Вы можаце і пазваніць ёй. Нумар тэлефона — 360-38-68.

Вось і ўсё, што я мог вам напісаць. Мне зараз добра, душа радуецца. Толькі каб ніколі не было войнаў, каб нашы дзеці і наступныя пакаленні не ўведалі таго, што ўведалі мы.

Прабачце за дрэнны почырк і памылкі.

З павагай да вас — Валянцін».

...Нарэшце я ў кабінеце кіраўніка калгаса.

За сталом — старшыня, Канстанцін Аляксеевіч Кардаш, былы франтавік, трыццацітысячнік, які бяззменна на гэтай пасадзе вось ужо трыццаць чатыры гады.

А пачынаць Кардашу давялося, як кажуць, з нуля. І калі цяпер гаспадарка трывала стаіць на нагах, выйшла ў лік лепшых у вобласці,— заслуга перш за ўсё яго. Умелы кіраўнік, ён змог арганізаваць справу так, што з году ў год калгас адольвае новыя і новыя рубяжы.

Насупраць, па той бок стала, сядзяць сакратар парткома Віктар Пятровіч Аўрукевіч і старшыня прафкома Ала Іванаўна Салей. Але ні яны, ні сам Кардаш аб дасягнутым нават не ўспамінаюць. Гаворка ідзе пра іншае — аб праблемах, якія паставіла жыццё перад гаспадаркай, кіраўніцтвам калгаса,

працаўнікамі сяла. Гавораць сур'ёзна, з веданнем справы, адкрыта, не хаваючыся за агульныя фразы. Усё слушнае падсумаваў Кардаш:

— З літоўскімі суседзямі даўно дружым,— сказаў ён.— Шмат перадаём ім свайго вопыту, у нечым вучымся ў іх. Напрыклад, хацелася б у сябе мець усе дарогі, вуліцы вёсак заасфальтаванымі. Цяпер у нас пракладзены асфальт толькі з Гожы, цэнтра калгаса, у вёскі Цідовічы і Пальніца ды ад шасейкі Гродна — Друскінінкай у Прывалку. А трэба... У нас жа вунь колькі населеных пунктаў! Патрэбен Палац культуры, крыты басейн. Трэба, нарэшце, падняць рачулку Гажанку — узвесці на ёй хаця тры дамбы. Гэта дасць магчымасць не на адной сотні гектараў прымяніць паліўное земляробства. Да таго ж мелі б і штучнае возера з пляжам, лодачнай станцыяй. Яшчэ трэба падаць у калгас прыродны газ. Неабходна і жыллё новае будаваць. Усё гэта, як кажуць, у бліжэйшай перспектыве. Патрэбен толькі час.

Пакідаў Гожу на зыходзе дня.

Вёска патанала ў садах.

З машыннага двара, што па той край Гожы і бліжэй да Нёмана, далятаў перастук матораў. Механізатары яшчэ раз правяралі гатоўнасць камбайнаў.

Не за гарамі ж новае жніво!



# СТАЛІЦА ВАЛЯВАХ

*Незвычайны заказнік*
*Калі ўставала сонца ● У калоніі чапляў*
*Сляды на дзюнах ● Турботы егера*
*Бывай, Прыпяць, бывай Лань!*

Рашыў наведаць самы ўнікальны куток Палесся, дзе Лань упадае ў Прыпяць, на левым беразе якой знаходзіцца буйнейшая не толькі ў Беларусі, але і ва ўсёй сярэдняй паласе Еўропы калонія шэрых чапляў. Было ўжо сабраўся ў дарогу, ды спахапіўся: я ж не ведаю, як трапіць туды! Гэта ж не Пінск, не Тураў, не Петрыкаў, куды ходзяць аўтобусы. Там — глухамань, непраходныя забалочаныя зарасці, адным словам, Палескія джунглі. Дабрацца да іх, чуў, лягчэй за ўсё водным шляхам. Аднак зноў жа: адкуль пачынаць той шлях, на чым? І тут успомніў, што ў Інстытуце заалогіі Акадэміі навук працуе даўні сябар, які шмат гадоў аддаў вывучэнню жывёльнага свету Палесся. Званю яму і прашу:

— Эдуард! Падкажы, як лепш дабрацца да сталіцы валявах?

— Братка! — пачулася ў адказ.— Ты нібы ў ваду глядзеў! Заўтра з экспедыцыяй еду туды, у вусце Лані. Будзем працягваць вывучэнне экалогіі звера,

птушкі, і земнаводных. Зараз бягу па білеты. Магу і табе прыхапіць.

— Зрабі ласку! — я ледзь не закрычаў ад радасці.— Буду вельмі ўдзячны.

...З Эдуардам Самусенкам пазнаёміўся ў далёкім пяцідзесятым, калі жыў з ім у адным з інтэрнатаў універсітэта. Пакой быў вялікі — чалавек на дваццаць. У ім пасялілі хлопцаў з розных курсаў і факультэтаў. І, вядома, у кожнага былі свае клопаты. Бывала, прыбягуць з лекцый, пакідаюць канспекты на тумбачкі — і толькі бачылі іх. Хто ішоў у бібліятэку, хто ў кіно, а хто і на таварную станцыю — мо пашанцуе разгрузіць вагон, каб да тае невялічкай стыпендыі мець такую-сякую прыбаўку. Пасляваенныя гады не песцілі!

З біёлагаў у нас быў, здаецца, толькі ён — Самусенка. Ціхі, негаваркі, хлопец любіў ляжаць на ложку і «грызці» чарговую кніжку-падручнік. А калі яго ўдавалася «разварушыць» — мог столькі цікавага расказаць пра жывёльны свет, пра родную прыроду, што многія гуманітарнікі па-сапраўднаму зайздросцілі яму. Спрабаваў нешта пісаць, але нікому не паказваў — трымаў пры сабе. Толькі цяпер, амаль праз сорак гадоў, калі давялося выпадкова прачытаць яго кніжкі «Дзівосная птушка», «Жамчужына Палесся» і іншыя, я зразумеў: яшчэ тады, у час вучобы, у чалавека нараджалася прага дзяліцца з людзьмі ўбачаным, думкамі, ведамі.

Потым шляхі нашы разбегліся. Мяне зманьвалі ўсё новыя і новыя журналісцкія дарогі, а Эдуард поўнасцю аддаваў сябе біялогіі. Педінстытут, Акадэмія навук... Ён мог бы абараніць не адну дысертацыю, але застаўся тым жа: удумлівым, скрупулёзным першапраходцам, якія, як кажуць, з першых рук пазнаюць таямніцы навакольнага свету. Шмат піша і друкуецца. Я сказаў бы: у ім удала спалучыліся дзве якасці — біёлага-даследчыка і літаратара. А гэта не так часта бывае.

... Вечарам ужо Эдуард пазваніў мне. Сказаў што з білетамі ўсё ў парадку, і каб я заўтра быў на

вакзале за паўгадзіны да адыходу цягніка, які ідзе на Брэст праз Лунінец.

На Мінскім вакзале заўсёды людна. А ў той дзень было як у вялікім мурашніку. Людзі бегалі, мітусіліся, снавалі туды-сюды — заклапочаныя, узрушаныя. Кожны некуды спяшаўся — некага праводзіў ці сустракаў. Прабіўшыся з варухлівага натоўпу, я неяк раптоўна апынуўся на патрэбнай платформе. Да адпраўлення цягніка заставалася хвілін дваццаць. «Пэўна, ужо чакаюць мяне!» — падумалася. Аднак ля адзінаццатага вагона, пра які не забыўся напомніць Эдуард, нікога не было. Прайшло дзесяць хвілін, пятнаццаць — таксама нікога няма. Ужо быў падумаў, што экспедыцыя па нейкай прычыне сарвалася, як раптам з тунэля паказаўся Самусенка. Ішоў павольі, быццам нехаця,— на сабе цягнуў вялізны рэчавы мяшок. Заўважыўшы мяне, прамовіў:

— Ну вось і добра!

Я не ўстрымаўся:

— А дзе члены твае экспедыцыі?

Самусенка стараўся ўвапхнуць у дзверы вагона сваю ношу, але нічога з гэтага не атрымалася, і ён апусціў рэчмяшок ля прыступак.

— Адпраўленне аб'явілі! — зноў не ўтрымаўся я.

— Ага, аб'явілі,—спакойна сказаў Эдуард і выраз твару яго змяніўся: — А вось і ён! Во малайчына!

Падбегам да вагона кіраваў сярэдняга росту юнак. Ён валок на сабе не меншую паклажу. У дадатак і рукі ў яго былі заняты — у адной нёс нейкую зачахлёную станіну-трынογу, у другой — скураную сумку з фотаапаратурай.

— Паспеў! — шчыра прызнаўся хлопец і вінавата зірнуў на нас. — Я ж думаў: пазней адпраўляемся.

Самусенка нічога не адказаў на гэта, а я кінуў вокам на свой невялічкі рэчавы мяшэчак, што стаяў

каля маіх ног, і зрабілася неяк няёмка: зусім улегцы ў параўнанні з імі!

Ужо калі былі ў купэ, да нас уляцела двое дзяўчатак, вёрткіх, як ластаўкі.

— Усё ў парадку? — пацікавіліся яны.

— У парадку,— адказаў Эдуард і растлумачыў мне: — Гэта астатнія члены нашай экспедыцыі. Студэнткі універсітэта. Іра,— паказаў на русую,— будзе займацца буслападобнымі, а Таня — паказаў на трошкі цямнейшую,— амфібіямі.

«Ластаўкі» крутнуліся, акінулі паглядам беспарадак, які панаваў у нашым купэ, і гэтак жа нечакана вылецелі за дзверы. Нарэшце Эдуард пазнаёміў мяне з напарнікам:

— Сяргей Зуёнак,— сказаў ён,— старшы лабарант інстытута заалогіі Акадэміі навук. Працуе над кандыдацкай дысертацыяй. Тэма: «Меліярацыя ў пойме рэк».

Не заўважылі, як цягнік пачаў набіраць скорасць. За акном «паплылі» будынкі, дрэвы. А потым усё злілося ў шэра-зялёную палосу. І толькі тады, уладкаваўшыся, мы выявілі: не ўзялі таго, не прыхапілі гэтага, забыліся пра тое, не ўлічылі асноўнага.

— А так заўсёды,— разважліва прамовіў Самусенка.— Аднак хваляваацца не будзем. Усё ўтрасецца.

У Лунінец прыехалі сярод ночы. Выйшлі з вагона, і кожны адчуў, што, сапраўды, трапіў на поўдзень. Паветра было надзвычай цёплае. Пахла сенам.

— Ах! — сказалі дзяўчаткі.— Такую ноч і не спаўшы скаратаць можна.

Аднак усе пайшлі ў гасцініцу. Раніцой перакусілі на хуткую руку ў буфеце і адправіліся на пошукі лясгаса. Там «выкраілі» нам невялікі аўтобус, і мы паехалі ажно ў Сінкевічы, за сорак кіламетраў ад райцэнтра. У Сінкевічах адшукалі егера Андрэевіча, з якім і даехалі берагам Лані да яе вусця. Далей аўтобус прайсці не мог — дарога абрывалася.

Выгрузіліся на нізкім беразе і спахапіліся. Колькі паклажы! (Андрэевіч прыхапіў яшчэ і пасцель.) Развіталіся з лясгасаўцамі, падзякавалі за помач і, калі аўтобус знік з вачэй, пачалі навальваць на сябе прывезенае. Праз колькі хвілін паволі, нібы караван вярблюдаў, пасунуліся ў густыя зарасці. Нарадзе, з тапорыкам у руках, ішоў егер, за ім — Самусенка, потым Сяргей, следам за ім — «ластаўкі». Я плёўся апошнім.

Стаяла духата, нясцерпна смаліла сонца, не было чым дыхаць. Аднак ішлі, упарта прадзіраліся да мэты. Андрэевіч сям-там ссякаў на ходу лазіны, якія вельмі ўжоміналі, і не пераставаў падбадзёрваць:

— Нічога, рабінзоны мае харошыя, скора прывалачомся. Засталоса нямнога.

Але гэтае «нямнога» цягнулася і цягнулася. Канца-краю не было чаратам, лазавіннаю, куп'ю асакі, зарасцям крапівы, ажыны. Не пераставалі чапляцца за ногі і палескія ліяны — хмель і ліснік. У іншых месцах хмель так абкручваў алешыну, так спавіваў яе, што дрэва не вытрымлівала — памірала. Такія, мёртвыя, алешыны стаялі то там, то тут — на ўсім шляху... Здзіўляў сваёй незвычайнасцю ліснік. «Ляйчыны» ён меў не такія шурпатыя, як хмель, не такія моцныя, але ўсё ж доўгія — па некалькі метраў. Ліснік таксама стараўся аплесці якое дрэва, але гэта яму не заўсёды ўдавалася. І тады ён «ішоў» паверх кустоў парэчак, лазы ці зарасцяў ажыны, утвараючы на іх суцэльныя зялёныя лапіны. Варта ўбіцца ў тое мудрагелістае пераплячэнне — абрыдне вызваляцца. Уразіла яшчэ адно — кветкі лісніка. У іншых месцах яны звісалі гронкамі, свяцілі фіялетавым агнём і нагадвалі цвіценне бульбы-варшаўкі. Сам я з Палесся, у дзяцінстве аблазіў сваю Косаўшчыну ўздоўж і ўпоперак, але такога лісніку не сустракаў. А тут... Дарэчы, у вусці Лані і чараты незвычайнай вышыні — на тры-чатыры метры падымаліся яны суцэльнай сцяною і нагадвалі бамбукавыя зарасці.

— Не згубіцеса! — гукаў аднекуль здалёк егер.— Чаго адсталы?!

Ледзь прыкметная сцежка нарэшце павярнула налева, спусцілася з кручы і вывела на бераг Прыпяці. Нават дзіўным здалося: колькі ішлі, а не адчувалася, што побач рака. Цяпер дыхаць стала лягчэй. Ад Прыпяці плыла прыемная прахалода. Ледзь улоўны ветрык абдаваў твар. Мае спадарожнікі ішлі каля самай кромкі вады, абыходзячы кучы плаўніку, што прыгнала да берагу, дзюны, якія ажно сляпілі вочы бялюткім пяском. З-за павароткі паказаўся буксір. Ён цягнуў за сабою парожні даўжэзны рудавоз. На буксіры, відаць, заўважылі нас — павіталі кароткім гудком.

Як велічна, магутна выглядала Прыпяць! Што ў параўнанні з ёю Лань! Некалі прыгажэйшая рака Палесся, яна ператворана чалавекам у звычайную сцёкавую канаву. Лета сёлета сухое, рака ў многіх мясцінах і курыцы па калена не будзе. Па Лані нельга нават прайсці на лодцы. «Зглумілы!» — успаміналіся словы егера, якія ён сказаў, калі дабіраліся сюды на аўтобусе.— «Дарваліса! Каб на іх ліха...» Ён быў у крыўдзе на тых, хто зрабіў такое, хто дазволіў гэтак абыходзіцца з прыродай. Такой думкі былі ўсе тубыльцы — кіраўнікі лясгаса, лясніцтва, мясцовага калгаса, з якімі пры сустрэчы паспелі перакінуцца словам-другім. «Не столькі карысці з гэтага асушэння, колькі шкоды,— казалі яны.— Рака памерла».

А Прыпяць яшчэ жыла, працавала на чалавека, хоць, праўда, таксама паменела ў ёй вады ў выніку таго ж асушэння. На яе левым беразе, тут, у цэнтры Палесся, цудам захаваўся некранутым ні экскаватарам, ні сякераю дзівосны куточак. Вучоныя рэспублікі ў свой час падрыхтавалі абгрунтаванне неабходнасці арганізацыі там дзяржаўнага біялагічнага заказніка. Асновай сталі даследаванні Інстытута заалогіі Акадэміі навук. Дарэчы, Эдуард Самусенка прымаў у гэтай справе самы непасрэдны ўдзел. Вось радкі з таго дакумента:

«Мэта стварэння заказніка — захаванне ў натуральным стане унікальнага ландшафтна-біялагічнага прыроднага комплекса Прыпяцкага Палесся, дзе знаходзяцца буйнейшая ў Еўропе калонія шэрых чапляў, рэдкія і знікаючыя віды птушак, рэптылій, рыб, што занесены ў Чырвоныя кнігі СССР і БССР, рэдкія, гаспадарча-карысныя, а таксама тыповыя віды палескай флоры. Гэты прыродны комплекс мае вялікае навуковае і практычнае значэнне, уяўляе цікавасць для культурна-пазнавальных і асветных мэт, іграе важную ролю для падтрымання экалагічнага баланса, які склаўся ў пойме ракі Прыпяць ніжэй упадзення ў яе ракі Лань».

29 мая 1985 года Савет Міністраў рэспублікі прыняў пастанову, у першым пункце якой было запісана: «Прыняць прапанову Акадэміі навук БССР і Дзяржаўнага камітэта БССР па ахове прыроды аб стварэнні Дзяржаўнага біялагічнага заказніка «Вусце Лані»...

Заказнік невялікі — 228 гектараў. Знаходзіцца на землях калгаса «40 год Кастрычніка» і дзяржаўнага ляснога фонду Сінкевіцкага лясніцтва. Сама ж «сталіца» шэрых чапляў (гэтую птушку ў народзе яшчэ называюць валяваха) — у недаступным месцы, у рэдкастойнай пойменнай дуброве, далёка ад людскіх вачэй. Акрамя шэрай чаплі жывуць там сокал-сапсан, чорны бусел, зімародак, кулік-сарока, вялікі бугай, сустракаецца белая вялікая чапля, балотная чарапаха. Усе яны занесены ў Чырвоныя кнігі краіны і рэспублікі. Гняздуюцца таксама асаеды, курапаткі, перапёлкі, качкі, чайкі, кулікі — усяго каля шасцідзесяці відаў птушак. Трапляюцца выдра, еўрапейская норка, гарнастай, ласка, янот-паласкун і іншыя. А які багаты раслінны свет! Здаецца, з усяго Палесся сабраліся тут кветкі, травы, кусты, дрэвы, каб даказаць людзям, які гэта цудоўны кут на зямлі. Сотні відаў! Сустракаюцца і даволі рэдкія расліны — дуброўнік часночны, старасцень татарскі, буйміна дробнакветкавая, малачайнік бліскучы, і лекавыя — ландыш майскі, крапіва

двухдомная, піжма, крываўнік, вятроўнік... Адным словам, трэба добрым батанікам быць, каб пералічыць усё, што расце тут.

Ішоў свежым следам, каля самай кромкі вады, думаў пра ўсё гэта, а ў сэрцы, прызнацца, закладвалася няпэўнасць. Сярэдзіна ліпеня! Многія з насельнікаў заказніка пачалі самастойнае жыццё: падняліся на крыло ці разбегліся, асобныя віды сталі мігрыраваць — не вельмі каго цяпер і ўбачыш у гняздзе. Аднак, валявахі, відаць, будуць на месцы. Вунь як лятуць з-за Прыпяці. Адна за адной. Часам, следам за імі, толькі значна ніжэй і спакайней, пералятаалі раку белыя буслы. Яны заўсёды нешта ды неслі ў дзюбе: ці пучок сухой травы, ці галінку, ці рыбіну. Іншая рыбіна трапяталася, перашкаджала лёту, і бусел з усіх сіл стараўся хутчэй дацягнуць да гнязда. Пэўна, дзеці яшчэ не сталі на крыло і трэба было карміць іх...

Сядзім пад разгалістым дубам і адпачываем. На ганку цаглянага дамка, які нядаўна яшчэ насіў даволі гучную назву «Дом паляўнічага» і дзе нам давядзецца пражыць усе гэтыя дні, грувасцяцца нашы рэчы.

— А прывалаклы! — радаваўся егер.— За адну ходку, рабінзоны мае харошыя.

Яму нікто не адказаў — стома канчаткова дakaнала людзей. Але мала-памалу ўсё стала на месца. Пачуліся жарты, з'явіліся ўсмешкі. Іра з Таняю выказалі нават здзіўленне:

— Вы, Андрэевіч, нібы і не стаміліся!

— Ага,— пагадзіўся ён.— Бо ўдома ніколы не сядзеў седма. З дваццаці гадоў — майстрам лесанарыхтовак. Пры такой пасадзе на ногі толькі і спадзеўка. А што з дубальтоўкаю аблазіў!.. Страх! Дзе толькі не буў! А зараз у егеры запісаўса. Буду вось гэны куток, усялякую жыўнасць у ім ахоўваты.

Прысадзісты, шырокі ў плячах, загарэлы, егер неяк па-дзіцячы даверліва паглядзеў на нас:

— А куток гэны, лічы, дзеўсцвяны.

Ён зняў кепачку, выцер ёю твар, шыю і стаў расказваць.

— Тут Прыпэць луку робыць, абдымае і балатэ, і ліс, і прытокі і азэрыны. Самая вялыкая пратока — Касы Роў. Яна цягнецца ад вусця Лані, выхляе сюды-туды і ажно на тым краі ўпадае ў Прыпэць. Вясною ў пратоцы поўна вады, па ёй можна прайсці на якой хочаш лодцы. Тэпер яна пэрэсохла, але ў асобных мейсцах мае «катлы» да шасці мэтраў глыбынёю. Многа азэрын: Вабчына, Заграбнае, Пагасінычы, Слэпяцін, Вослэбнэ, Жалезніца... У азэрынах, як і ў пратоках, нэмала рыбы. Алэ галоўнае: частка Касога Рова і пратока Лучка — гэто «столыца» валявах, буськоў і бакроў. Там стояць старыя дубы. А хатак бабрыных — не мэнэй дэсяці будэ. На азэрынах здаўна водыцца бэзліч качок. Да вайны, «за польскім часам», спэкулянты арандавалы тыя азэрыны, трымалы пры іх вартаўныкоў, а колы адкрываўса паляўнычы сезон — з Варшавы, Вільны, Беластока, Брэста, іншых гарадоў запрашалы паноў. Одного разу одын такы пан наняў майго бацьку підыматы забітую дычыну. Пасля трохсот стрэлаў він підняў ажно дзвесце крыжанак.

— Варварства! — не стрывалі «ластаўкі», падхапіліся і кінуліся ў дамок даводзіць да ладу свой пакойчык.

— Алэ, варварство,— услед ім паглядзеў егер.— Ды і ў нашы дны, рабінзоны мае харошыя, таксама бувае. Пяць гадоў таму наша Палэссе залыло було. Бабёр мусіў на хатках мостытыса. А тут мороз вдарыў. Голымі рукамы, казалы, бралы бабра тоды. А ці то па-людску?

Андрэевіч падняўся:

— То бувайце, хлопцы! Удачы вам у дзялах вашых. А я дадому, у Сынкевычы. За пару годын добэруса. Я — бы той лось малады, лёгкы шчэ на ногы.

І пайшоў сцяжынкай між траў і кветак.

Мінулыя суткі былі для нас надта тлумнымі.

Таму і мы паспяшаліся ў адведзены пакойчык, каб прывесці яго ў парадак, распакавацца. Праз гадзіну наша памяшканне нагадвала стары гасцінічны нумар, які можна яшчэ сустрэць у глыбінцы. Але ад таго, што даўно тут ніхто не жыў, адусюль патыхала сырасцю. Мы расчынілі вокны і выйшлі на свежае паветра. Каля старога вогнішча ўжо завіхаліся нашы дзяўчаткі, стараючыся распаліць агонь. Вопыту ў іх, відаць, было мала, і галавешкі толькі курадымілі. Сяргей сказаў: «Спрадвеку гэтай справай займаліся мужчыны!» І як бачыш ажывіў агонь. Падскочыла полымя, узвіўся шызы дымок, разагнаўшы няпрошаных камароў, і пад старым дубам зрабілася ўтульна. Неўзабаве на патэльні засквірчэла сала. Самусенка прынёс з Прыпяці вядзерца вады, на хаду сабраўшы добрую жменю святаянніку, рачной мяты, лісця парэчак (для заваркі), і падвесіў яго над вогнішчам.

Вячэралі, а на зямлі гаспадарыла ноч. Неяк знянацку ўстала над намі шчарбатая поўня, а з ракі на сушу папоўз бялёсы туман. Ён клубіўся, перавальваўся праз дзюны, чапляўся за кусты, камлі дрэў, траву, але поўз і поўз. І вось ужо ўсё «па пояс» у белых клубах — трапяткіх і зіхатлівых ад святла месяца.

— Ах! Такая ноч! — як тады, у Лунінцы на станцыі, сказалі «ластаўкі». Але падняліся і пайшлі спаць. Нялёгкі дзень канчаткова змарыў дзяўчатак.

Самусенка, папраўляючы галавешкі, сказаў:

— Люблю на прыродзе. Адчуваеш сябе не такім, як у горадзе... Лепшым сябе адчуваеш, багацейшым душою нібыта.

Даўняя звычка ўставаць рана і на гэты раз не здрадзіла: падхапіўся на досвітку. Паціху пахропваў на ложку каля акна Эдуард. На другім ложку, бліжэй да дзвярэй, спаў Сяргей — па-маладому ціха і прыгожа, трошкі схіліўшы галаву да левага пляча. Па яго твары іншы раз прабягала ледзь улоўная ўсмешка. Хлопец, відаць, нешта добрае і

светлае сніў. Я асцярожна пакінуў пакой, выйшаў на ганак і прысеў на прыступкі.

Сонца яшчэ не ўстала, неба на ўсходзе палыхала ад чырвані. Недзе туды, у тую чырвань, з-за Прыпяці пасля начной жыроўкі праляцела чарада качак — спачатку цяжкіх крыжанак, а потым і быстрых чыркоў-свістункоў. Праз нейкі час следам за імі праплыў чорны каршун. І тады засвяцілася ў промнях узыходзячага сонца верхавіна дуба, недзе за дамком стала па-заліхвацку высвістваць івалга. Пачаў рассейвацца туман. Ён ужо толькі месцамі трымаўся за траву і кусты. А калі згінуў канчаткова і сонца асвяціла падвышаны бераг Прыпяці, на траве заіскрыліся павуковыя «гамачкі», у якіх пераліваліся жывым золатам безліч расін. А праз паўгадзіны ўсё некуды знікла — і расіны, і «гамачкі», нібы іх і не было там. Гэта сонца іх высушыла!

Пакуль звалакаў суччa да вогнішча, падняліся астатнія і пачалі памагаць рыхтаваць сняданак.

— Сёння,— быццам між іншым, без перавагі над намі, сказаў Самусенка,— зробім толькі разведку, здаля агледзім калонію. Як вы, не супраць?

Ніхто пярэчыць не стаў. І праз гадзіну ўсе былі ў дарозе. Апранутыя па-паходнаму, ішлі ўслед за кіраўніком экспедыцыі і здзіўляліся: як можа чалавек арыентавацца ў гэтых джунглях? Мы ж лезлі то напралом, скрозь гушчэзнае лазавінне, то брылі ў абход нейкіх азярын і колішніх праток, то прабіраліся праз неймаверныя зарасці, дзе падабралі пад сябе амаль увесь падлесак разгалістыя векавыя дрэвы, то выбіваліся на невялікія вышынкі, усеяныя мноствам кветак, то траплялі ў балаціны, парослыя двухметровай асакой ці хвашчом, то мясілі ботамі чорную, як гуталін, гразь ля бабрыных запыняў, то апыналіся перад сцяной з суцэльнага хмелю і лісніку, а Самусенка ўсё вёў і вёў. Ужо было падумалася: а ці не зблудзіў, ці не заблытаўся сам у гэтай непралазі, як раптам ён спыніўся, падняў руку (гэта быў знак збору) і, калі ўсе падышлі, сказаў:

— Вось, за кустамі, «сталіца» валявах. Пaціху наблізімся і паназіраем.

Пачалі набліжацца. Але адна з дзяўчатак, здаецца, Таня, зачапілася за нешта і ўпала. Маўклівыя дагэтуль «джунглі» як узарваліся. У неба паднялося мноства вялікіх птушак, пачуліся крыкі, падобныя на парасячы піск. Чаплі насіліся ў небе, між голых дубоў, сядалі на жоўтыя, нібы касцяныя, галіны, зноў падымаліся, зноў крычалі — доўга і пранізліва. «Дзіва што яны збіраюцца у калоніі! — падумаў я, робячы апошняе намаганне вырвацца з лазовага палону.— Гуртам надзейней. Ніякі драпежнік і падступіцца не зможа».

Нарэшце мы выбраліся на невялікі прагал. Ля самых ног ляжала ўкрытае раскаю невялікае азярцо, а па той бераг яго стаяла некалькі мёртвых дубоў. Голле дрэў было густа ўсыпана вялікімі гнёздамі. На іх і на суках стаялі чаплі. Яны цяпер не крычалі, а як бы з цікаўнасцю пазіралі на нас. Маўляў, чаго з'явіліся, парушылі наш спакой? Няўзброеным вокам цяжка было разгледзець загадкавых птушак, і я папрасіў на хвіліну ў Сяргея бінокль.

Які цудоўны свет адкрыўся перада мной! І мёртвыя дубы, і гнёзды, і чаплі — усё было як на далоні. Валявахі ў асноўным маладыя. Ад старых адрозніваліся хіба тым, што мелі не зусім чорную дзюбу— з жаўтаватай акантоўкай. Але яны спраўна лёталі, спраўна і стаялі на голлі ці хадзілі па ім. Нават дзіўным было, што такая вялікая птушка, да метра вышынёю і з размахам крылаў звыш метра, гэтак легка перабіраецца па нахіленым вецці або стаіць, як стаўбунок, на самай верхавінцы дрэва. Здзіўляла і тое, што яна зусім не шэрая, хоць афіцыйна і называецца шэрай чапляй. Крылы шызыя з пераходам у чорны колер, шыза-белыя пёры на шыі, падбрушша — таксама белаватае з шызым, чубок трошкі цямнейшы, але не шэры. Валявахі абляпілі голае дрэва і, падняўшы альбо апусціўшы дзюбы, стаялі нерухома, як нежывыя. Прыгожыя птушкі! Аднак у іхніх паставах бачылася нешта трагічнае.

...У нас некалі валявах бяздумна знішчалі. Помню, у Грудах, за якую вярсту ад роднай вёсачкі, асаднік стаўкі меў. Каб не карміць карпаў, не несці ад гэтага страт, прылаўчыўся страляць розных птушак, у тым ліку і чапляў. Днямі хадзіў па дамбах і, калі пралятaлі кулічок, чайка ці валяваха, страляў у іх з дубальтоўкі і кідаў на драцяныя сталы, што былі ў кожным стаўку. Вядома, праз дзень-два на забітых птушках з'яўляліся чэрві, якія асыпаліся праз сетку ў ваду і тым самым рабіліся спажывай для рыбы...

Трошкі ў баку, на камлі зламанага бурай дуба, чарнела гняздо буслоў. У ім тапталіся тры маладыя птушкі з чорнымі яшчэ нагамі і дзюбамі. Буські былі болей даверлівыя, чым валявахі. Пасталі на ўскрайку гнязда і, спусціўшы галовы, разглядалі мяне. А задаволілі сваю цікаўнасць — прыселі ў гняздзе, паклалі дзюбы на крылы і нібы паснулі. Толькі як прыляталі бацькі, у гняздзе пачынаўся вэрхал. Дагэтуль спакойныя буські мітусіліся, вырывалі адзін у аднаго спажыву, білі крыламі, шыпелі. Потым у гняздзе зноў усталёўвалася цішыня.

Прыкмеціў я такое: гняздо буслоў змайстравана вельмі надзейна, трывала. Яно ляжыць на камлі дуба, як вялікая шэрая шапка. А гнёзды валявах — адна назва! Прасвечваюцца і нагадваюць абярэмкі бязладна кінутых галінак і дубцоў. Некаторыя ледзьледзь ліпяць. Дзіва што валяваха амаль кожны год робіць сабе новае гняздо! Уздумаў палічыць, колькі іх на адным дубе будзе. Пяць, дзесяць, пятнаццаць, дваццаць, дваццаць пяць і... збіўся. Пярэднія гнёзды засланяюць тыя, што за імі, з таго боку кроны.

— Дарма! — чую Сяргееў голас.— Трэба хадзіць вакол дрэва. Тады толькі дакладна палічыць можна.

Вяртаю яму бінокль і заўважаю: няма побач ні Самусенкі, ні Тані з Ірай.

— Не ўтрымаліся,— тлумачыць Сяргей.— Пайшлі буслоў праведаць. Там,— паказаў ён управа,— ёсць нямала іх гнёздаў.

Недзе праз гадзіну яны вярнуліся. Іра несла цэлафанавы мяшочак, з якога прасвечвалася мо з кілаграм шчупакоў, усохлых і паскубеных, а таксама зусім яшчэ свежых. Таня ў марлевай торбачцы мела паўдзесятка жывых жабак. Самусенка трымаў нешта ў кульку з паперы.

— Пад крайнім дубам знайшоў! Гэта пагадкі,— хваліўся Эдуард.

Ішлі на сваю «базу» акружным шляхам — колішняй пратокай, а тады сцежкаю, што праклаў нам учора егер уздоўж ракі. Эдуард і «ластаўкі» былі радыя: вярталіся з першымі трафеямі! Самусенка дарогаю казаў:

— Чапля вельмі пасабляе вучоным вызначыць магчымыя ачагі інфекцыйных захворванняў. Пры дапамозе пагадак,— паказаў ён на папяровы кулёк.— Справа ў тым, што яна палюе і на вадзяных пацукоў. А гэта пераносчыкі многіх хвароб, у тым ліку і туляроміі. Аднак поўнасцю пераварыць здабычу птушка не можа і выплёўвае каля гнязда рэшткі — галушкі з касцей і поўсці. Яны пагадкамі называюцца. Вучоныя даследуюць іх мікрабіялагічны састаў і на падставе аналізаў робяць вывады: ёсць у дадзенай мясцовасці інфекцыйная небяспека ці няма.

Выбіраліся ў «разведку» на пару гадзін, а прабылі амаль да заходу сонца. Таму абедалі і вячэралі заадно. А потым, пры святле вогнішча, Таня ў злоўленых жабак брала мазкі, Іра ўзважвала на невялічкіх паходных вагах і абмервала шчупакоў, знойдзеных каля бусліных гнёздаў. Сяргей з Эдуардам вялі запісы назіранняў у палявыя дзённікі.

Наступны дзень быў не такі тлумны. Адразу пасля сняданку Самусенка з Ірынай адправіліся ў калонію лічыць гнёзды і вывучаць паводзіны валявах. З імі пайшла Таня — у старых пратоках, ля азярын лавіць сваіх жабак. Сяргей падаўся болей дакладна агледзець пойму Прыпяці. Я застаўся дня-

валіць пры дамку. Аднак доўга не сумаваў, накінуў на прабой замок і спусціўся да ракі.

Напорыста гнала свае воды Прыпяць. Часам па ёй праходзілі гружаныя рудою або гранітным шчэбнем баржы. Праляцела імклівая ракета, на борце якой ледзь паспеў прачытаць: «Якуб Колас». У сонечных промнях паблісквалі белым крыллем чайкі. За Прыпяць і туды, у калонію, няспынна снавалі чаплі.

Прайшоў трошкі ўніз па цячэнню і адразу натрапіў на дзюны. Яны мелі паверхню то хвалістую, нібы гафрыраваную, то раўнюткую, утыканую дзенідзе стралою чароту, дубцом лазы ці кволай грыўкай шчаўя. Праз дзюны ў зарасці вяло ад вады безліч вялікіх і малых слядоў. Звяры і птушкі пакінулі іх, відаць, ноччу ці на світанку, бо іх не паспела яшчэ «папсаваць» сонца.

Вось ласіха з цялём пратупала. Каля кромкі вады, дзе пясок мокры, сляды відны добра, а на дзюнах — толькі ўмяціны значацца. Тое ж і ад дзічыхі з парасятамі засталося. Ведама ж, вага не малая, а капыткі... А там вунь, вядома, праставаў бабёр. Чаго яму ўздумалася на Прыпяць хадзіць? Пэўна, купацца. Назад нібы вясло за сабою цягнуў — так хвастом правёў па пяску, што прысыпаў у многіх мясцінах свае сляды. Выдра, наадварот, не прысыпала іх — толькі рыску правяла між слядоў. І то не ўсюды. Янот кружыў на дзюнах, нібы чагосьшукаючы, рабіў петлі, вяртаўся назад, зноў кружыў і, нарэшце, каля курцінкі невысокага чароту ўзяў напраскі, у кусты лазавіння. Пакінула свае слядочкі і яшчарка. Яна друкавала іх наўсцяж, пад вываранень дуба, які бог ведае калі прынесла сюды паводкаю. Яшчарка, як і выдра, між слядочкаў таксама нібы рыску правяла — дзе-нідзе і яна чырканула хватом на пяску. Затое мыш лясная прастрачыла белае поле вельмі паспешліва. Аказваецца, наперарэз ёй ласка імчала! Ласка сігала рыўкамі, ад таго і сляды невыразныя — толькі там-сям адбіткі відны... А тут і асцярожная чапля

хадзіла. Крыжы ад ног на доле вялікія — не прыкрыць і далоняй. Толькі дзе падымалася — парушыла пясок і ад крылаў мецiны пакінула. Кулікі болей мітусіліся на водмелі: то заходзілі ў ваду, то зноў бегалі ўздоўж, то выбіраліся на сушэйшае. Палявы верабей не хадзіў, не набліжаўся да ракі, адразу ўпаў у пясок і стаў купацца. Ладную «ваннячку» выпырхаў! Ён, пэўна, зусім нядаўна тут цешыўся. Вакол вераб'я няспынна танцавала пліска, перабягала з аднаго боку на другі, нібы ўпрошвала старога хітруна не псаваць такой прыгожай дзюны, а потым некуды паляцела.

Я прысеў на жоўтую, як сланоўы бівень, галіну дуба-вываратня, і ўбачыў у чорных палосках асу. Яна імклівa, нібы ў вялікай спешцы, рыла нару. Пясок асыпаўся, і тады аса пераляцела бліжэй да вываратня, у цянёк, а там як бачыш укапалася. Толькі горачка пясчынак паблізу ўзвышалася, нібы маленькі тэрыкон. І тут са «слановага біўня» пачаў спускацца шэранькі павучок. Ён заўважыў асіны тэрыкон, гоцнуў на вяршыню, прывязаў да яе павуцінку і кінуўся па ёй угору. Некалькі разоў спускаўся то падымаўся павучок, а тады стаў кружыць пасярод павуцін — рабіць сабе «гамачок»...

Вяртаўся на нашу «базу» і думаў: сапраўды, тут надзвычай багаты жывёльны свет. На дзюнах і то вунь колькі «аўтографаў» пакінута птушкамі і звярамі. А што ў глыбі «джунгляў»!

*З дзённіка Іры:* «Як ні дзіўна, у калоніі панавала цішыня. 18 ліпеня, а чаплі амаль усе за Прыпяццю, на жыроўцы. Відаць, учора патрывожылі птушак. Было, праўда, нямала такіх, што не ўмелі яшчэ лётаць. Яны сядзелі каторыя дзе, а пры нашым набліжэнні спрабавалі падняцца. Праз пару дзён і гэтыя пакінуць калонію, будуць самастойна здабываць ежу».

*З дзённіка Сяргея Зуёнка:* «Упершыню трапіў сюды тры гады таму назад, у сярэдзіне красавіка, калі

яшчэ быў студэнтам. Уразіла незлічоная колькасць вадаплаўных. Якраз быў іх масавы пралёт да месцаў гнездавання. Чародамі, па дзвесце-трыста птушак, ляцелі на поўнач гусі шэрыя і гуменнікі. Не менш было і качак — крыжанак, чыркоў, свіязяў. Разлілася Прыпяць не вельмі, затапіла не болей двух кіламетраў поймы, але і гэта аблегчыла нашы даследаванні. Мы днямі плавалі на лодках па незлічоных пратоках і старыцах. Зрэдку рабілі высадкі на астраўкі. Бачылі там гарнастаяў, турухтанаў, белую блакітніцу — рэдкую прыгожую сінічку, іншых звяркоў і птушак. Назіралі, як палюе балотны мышалоў. У калоніі чапляў тады толькі пачынаўся гнездавы перыяд, птушкі былі вельмі асцярожнымі — чалавека не падпускалі нават і блізка».

*З дзённіка Эдуарда Самусенкі:* «Правялі ўлік гнёздаў у калоніі чапляў. Налічылі 331 гняздо. Гэта амаль удвая менш, чым у 1982 годзе, калі тут гнездавалася 608 пар. Прычына, мне здаецца, у тым, што ўжо мінуў перыяд росквіту калоніі. На асобных дрэвах, што на ўскрайку, чаплі перасталі гнездавацца ўвогуле. Аднак, калонія працягвае заставацца буйнейшай у сярэдняй паласе ад Атлантыкі да Прыуралля».

*З дзённіка Тані:* «Не магу яшчэ асэнсаваць убачанае. Я нібы апынулася ў іншым свеце. Для мяне тут што ні крок, то адкрыццё. Не ўяўляла нават, што на Палессі існуе такая прыгажосць. Трапілі на незвычайную паляну. Там было столькі кветак! А як яны духмянілі! Здавалася, мы ўвайшлі ў найлепшы магазін парфумерыі...»

Праз дзень у кожнага запісаў пабольшала.

*З дзённіка Іры:* «Зноў наведалі калонію чапляў. Зрабілі ўнікальныя здымкі. Паднялі яшчэ некалькі пагадак. Будзе над чым «варажыць» вучоным у лабараторыях!».

*З дзённіка Сяргея Зуёнка:* «У хмызах Прыпяцкай поймы сустрэў шмат птушак. Многія крылатыя насельнікі Палесся яшчэ пяюць. Гэта: зелянушка, івалга, туркаўка, садовая слаўка, пеначка-цінькаўка.

А візуальна ўдалося выявіць каля сарака відаў птушак!».

*З дзённіка Эдуарда Самусенкі:* «У 1963 годзе, калі ўпершыню трапіў сюды, не змог адшукаць уваходу ў Лань з Прыпяці — ён губляўся сярод шматлікіх рукавоў і затокаў абедзьвюх рэк. Толькі праз некалькі гадзін блуканняў выбраўся да рэчышча Лані. Уразілі гонкія вольхі, што падступалі да самай вады. На кожным павароце амаль з-пад самай лодкі ўздымаліся чароды крыжанак, лысух, іншых птушак. Цяпер усяго гэтага і не ўбачыш. Вынік бяздумнага асушэння!»

*З дзённіка Сяргея Зуёнка:* «Меліярацыя ў поймах рэк... Стварэнне польдэраў, з аднаго боку, дае магчымасць расшырыць пасяўныя плошчы, з другога — знішчае месца гнездавання многіх птушак, у тым ліку і паляўніча-прамысловых, а таксама і тых, што занесены ў Чырвоную кнігу. У выніку асушэння поймы Прыпяці ў многіх месцах звяліся лясы, сталі вельмі рэдкімі такія птушкі, як скапа, арлан-белахвост, чорны бусел. Знікаюць шматлікія віды хмызняковa-чаратовага комплексу, а з'яўляюцца ў вялікай колькасці — палявога».

*З дзённіка Іры:* «20 ліпеня. Сёння назіралі «трэніроўку» маладых буслоў. Звычайна за старой птушкай ляцелі дзве-тры маладыя. Іх можна было адрозніць па больш свежаму апярэнню і не такіх чырвоных нагах і дзюбах. Буслы мо з гадзіну кружылі над дубровай, а потым паляцелі на правы бераг Прыпяці, відаць, на лугавіну».

*З дзённіка Тані:* «Дапамагала Іры рабіць улік бусліных гнёздаў. Толькі ў «сталіцы» валявах налічылі іх ажно пятнаццаць. І гэта на такой невялічкай плошчы!».

Падвечар усе мы сабраліся ля вогнішча. Самусенка і Зуёнак толькі што вярнуліся з агледзін Царкоўшчыны і Воўчы — доўгіх і звілістых азярын, якія некалі былі рэчышчам Прыпяці, і дзяліліся ўражан-

нямі. Іра і Таня сядзелі бліжэй да агню, рабілі паметкі ў свае палявыя дзённікі. Я даварваў юшку. Было неяк па-дамашняму добра. Раптам расхінуліся кусты і на палянку выйшаў Андрэевіч.

— Здаровы булы! — нязвыкла гучна павітаўся ён.— А ці ўсё добра ў вас, рабінзоны мае харошыя! Я хліба прынэс. Думаю: мо скончыўса міньскі, то, думаю, дай свэжанькага, паляшукоўскага, прыкуплю. Спажывайтэ на здароўечка!

Андрэевіч прысеў да агню, развязаў торбачку і адну за адной дастаў адтуль і паклаў радочкам на траву ажно чатыры буханкі хлеба. Мы здзівіліся: столькі ішоў дзеля гэтага! Але егер жыў сваім:

— Усю дорогу трывожыўса,— казаў ён.— Хутко сезон паляўнычы адкрываецца. Дык бядую: каб не ўбіўса які зух у заказнычак, не ўзбунтаваў птушак-звяроў, шкоды не нарабіў.

Трывога егера была не беспадстаўнай. Заказнік, лічы, не мае ніякай аховы. Некалькі шыльдачак, якія вызначаюць межы і папярэджваюць, што на яго тэрыторыі ўсялякае паляванне забаронена, для браканьераў нічога не значаць. Наадварот, іх, як магнітам, цягне сюды. Лунінецкі ж раён займае ці не першае месца на Брэстчыне па колькасці выдры, бабра, ліса, тхара, куніцы, ласкі, а таксама рысі, якой тут удвая больш, чым у сярэднім на Палессі. Браканьеры гэта ведаюць і ўсялякімі спосабамі імкнуцца пажывіцца.

Я слухаў егера, і ўспаміналася адна публікацыя ў часопісе «Родная прырода». У Лунінцы, паведамлялася ў артыкуле, адным з аўтараў якога быў і Самусенка, народны суд разглядаў справу жыхара Каждан-Гарадка — Стахаўца. У яго было выяўлена адразу 25 шкурак баброў, замочаных у бочцы для вырабу. Браканьер атрымаў па заслугах. Але крыўдна, што такі выпадак адбыўся ў адным з самых прыгожых куткоў Беларусі.

Андрэевіч нечакана падняўся, прыслухаўся да цішыні, што стаяла наўкол, і ўсім па чарзе падаў шырокую, цвёрдую далонь:

— Пабягу. Хачу яшчэ Касы Роў праверыць.

І знік у кустах лазавіння.

Назаўтра ранютка і я развітаўся з членамі экспедыцыі. Ішоў берагам Прыпяці, сцяжынаю, якую праторыў сюды ад вусця Лані егер, і зайздросціў усім: і Эдуарду, і Сяргею, і непаседлівым «ластаўкам» і, вядома, Андрэевічу. Яны ж заставаліся тут, сам-насам з прыродай!

Праводзіць мяне ўвязалася чайка. Яна то залятала далёка наперад, то кружыла трошкі ззаду, то павісала над маёй галавой і ўсё ўскрыквала і ўскрыквала. Нібы хацела «ўгаварыць», каб я пабыў тут яшчэ які дзянёчак.



## НАРАЧ

*Як узнікла возера ● Нарач выручае з бяды У імперыялістычную вайну ● Паўстанне тутэйшых рыбакоў ● Ён вырабляў партызанскія медалі ● Славутыя людзі нарачанскага краю*

На Нарачы світаць толькі бралася.

Ветру аніякага, але ад соснаў плыў пах жывіцы, ад вады цягнула рыбай.

Нізам, па самай вадзе, поўз бялёсы туман. Ён не кучаравіўся, не клубіўся, а нібы хаваўся ад вачэй пад чараты, што віднеліся каля далёкага вострава — Выспы. Там, дзе туман адыходзіў, паказвалася сінеча вады — гладкая, быццам шкло. Неўзабаве такая ж сінява ўспыхнула і ў небе — над процілеглым берагам, за Выспаю. Праз хвіліну над ёю прабілася ружавізна з ледзь прыкметным пераходам у барвовае. І раптам адтуль як бы полымя ўстала. Языкі яго раслі, падымаліся, і, нарэшце, паказалася свету вялікае, чыстае сонца. І туман, і вада, і прыбярэжныя сосны адразу зрабіліся ружовымі. Аднекуль з'явілася чайка і пачала купацца ў ранішніх промнях.

Добра было, спакойна ад усяго гэтага. І неяк самі па сабе ўсплылі ў памяці радкі Максіма Танка:

Каб сабраць усе скарбы
І срэбра і золата,
І з усіх зор у горне
Жар распаліць,
І, сышоўшыся, усе кавалі,
Усе волаты
Узяліся каваць ранні
Золак зямлі,
Дык не выкулі б гэткай зары,
Як над Нараччу...

Нарач! Колькі пра возера складзена вершаў, песень, легендаў! Да нашых дзён захавалася і легенда пра тое, як узнікла яно.

...Даўным-даўно тое было, калі толькі лясы стаялі на тым месцы, дзе зараз плешчуцца азёры-суседзі — Нарач, Мястра, Баторына і шматлікія азярынкі, схаваныя ў Гатаўскім бары. У адным з паселішчаў жылі тады прыгожая дзяўчына Галіна і хлопец Васіль, якія моцна кахалі адзін аднаго. Юнак быў майстар на ўсе рукі. Аднойчы ён падарыў Галіне цудоўнае люстэрка, адлітае ім самім. Толькі нядоўга радаваліся каханню Васіль і Галя. Іхняе шчасце разбурыў ненавісны багацей Барына — захацеў завалодаць прыгажуняй. Ад рук яго служкаў загінуў бацька дзяўчыны, які спрабаваў абараніць дачку. Галіну сілком узялі ў палац. На выручку ёй прыйшоў Васілёк: забіў Барыну і вызваліў каханую. Але ў няроўнай бойцы са служкамі багацея загінуў сам. Узрушаная смерцю Васілька, Галіна страціла прытомнасць, выпусціла з рук люстэрка, і яно разбілася. Там, дзе ўпалі срэбныя асколкі, утварыліся азёры. Самае вялікае — Нарач. А дзяўчына з тае пары крылатай чайкай кружыць над возерам, усё шукае свайго любага.

Гэта — легенда. А на самой справе? Як утварылася возера, што сабою ўяўляе?

Нарач называюць беларускім морам. Гэта самае

вялікае з нашых азёр. Яго плошча амаль восемдзесят квадратных кіламетраў. Узнікла некалькі тысячагоддзяў таму назад, калі пачаў раставаць ляднік. Вада запаўняла лагчыны і нізіны, а прабіцца на поўнач не магла: на яе шляху паўстала Свянцянскае ўзвышша — натуральная перашкода з марэнных град (абломкаў горных парод, валуноў, камення, пяску і гліны). Утварыўся вялікі вадаём, дзе пазней узніклі азёры Нарач, Мястра, Баторына.

Шмат пабачыла Нарач на сваім вяку. Каб возера магло расказаць хоць часцінку таго, што адбылося на яго берагах! Аднак сёе-тое дайшло да нас у выглядзе знаходак археолагаў, паданняў.

На паўднёва-заходнім беразе Нарачы выяўлена стаянка чалавека каменнага веку. Знойдзены крамянёвыя разцы, скрэблы, нажы... Гэта першае на тэрыторыі Беларусі паселішча чалавека, што адшукана ў зоне ледніковых адкладанняў. Старажытныя людзі аблюбавалі і паўночна-заходні бераг возера і пасяліліся там назаўсёды.

А вось паданне. Аднойчы ў нарачанскім краі здарылася няшчасце: вялікі няўрод прыйшоў на пясчаныя сялянскія землі. Людзі слабелі, пухлі з голаду. І раптам адбыўся цуд: усхвалявалася Нарач нечакана, вырывала з каранямі прыбярэжныя сосны, адчайна білася ў берагі, а потым стала выкідваць на плёсы рыбу. Людзі збегліся да возера, пачалі збіраць дарунак яго. На наступны дзень паўтарылася тое самае. Толькі рыбу Нарач выкідвала ўжо на другі бераг... Так рабіла возера ажно дзесяць дзён — па чарзе адорвала кожны бераг. Сяляне рыбу ўжывалі ў ежу, сушылі ў запас, везлі ў іншыя мясціны для абмену на збожжа і былі ўдзячны Нарачы. Возера выручыла з бяды!

Яшчэ адно паданне.

У гэтых мясцінах некалі жыў дужа багаты пан. Усё было ў яго харомах, толькі нашчадка не ставала. Параілі пану ў Рым паехаць, самага высокага бога маліць, каб зліты ваўся. Праз тры гады вяртаецца пан дадому і бачыць: бегае ў пакоях панічок! Узрада-

ваўся пан (нездарма ездзіў у такую далеч!), узяў у двор сялянскую дзяўчыну Браніславу і загадаў вачэй з малога не спускаць. Ды аднойчы панічок, гуляючы на высокім беразе возера, аступіўся і паляцеў у ваду. Браніслава — ратаваць, але, як ні старалася, не ўдалося. Пан усё адно як звар'яцеў і загадаў слугам закаваць Браніславу ў ланцугі і жывою замураваць у каменны слуп... Доўга той слуп стаяў пры дарозе на Сабалеўшчыну.

А ў імперыялістычную вайну, казалі старыя людзі, «жахлівы слуп» разабралі (побач фронт стаяў, і цэгла патрэбна была на печкі салдатам). Чутка хадзіла, што там, сапраўды, косткі былі знайшлі, а паверх іх іржавыя ланцугі ляжалі...

Гэта ўжо мяжуе з праўдай.

А вось і яна, страшная праўда тых дзён. Паблізу Нарачы праходзіла лінія фронту першай сусветнай вайны. Вясной 1916 года нямецкае камандаванне прымяніла тут атрутныя газы. Загінула шмат рускіх воінаў. Ва ўрочышчы Гушчар было пахавана 400 салдат, паблізу вёскі Брусы — 600. Каля вёскі Вузла ў брацкай магіле таксама ляжыць 700 салдат, атручаных газам. Да нашых дзён там захавалася сціплая дошка з надпісам:

«Не шумите вы, сосны зеленые,
Не мешайте героям вы спать!»

...У Нарач упадаюць семнаццаць ручаёў, выцякае толькі рака Нарачанка.

Возера багата рыбаю. Самая таямнічая і загадкавая — вугор. Гадуецца тут, а нераставаць адпраўляецца за пяць-сем тысяч кіламетраў у Саргасава мора, што ў Атлантыцы.

Берагі Нарачы, акрамя паўночнага і паўднёвага, укрыты лесам. Там — буйнейшая ў рэспубліцы курортная зона. Яна цягнецца амаль на дваццаць кіламетраў і налічвае звыш дзесяці санаторыяў, дамоў адпачынку, турыстычных баз, піянерскіх лагераў. Адзін з іх — «Зубраня» — называюць беларускім «Артэкам». Працуе ён круглы год. Дзеці тут

адпачываюць, вучацца, ходзяць у паходы па легендарнаму нарачанскаму краю, знаёмяцца з яго гісторыяй.

Заўважаю на вадзе мноства чаек. Ці не з усяе Нарачы сабраліся перад выраем? Ужо ж сярэдзіна жніўня! Птушкі пагойдваюцца на лёгкіх хвалях — возера нібы закалыхвае іх. Іншая ўскрыкне, падымецца, зробіць круг і зноў апусціцца ў гурт. У промнях зыркага сонца чайкі на вадзе — як асколкі разбітага люстэрка.

Далёка відно з паўночнага берагу. Плёсы, і пляжы... А трошкі далей паблісква́юць мачты нарачанскай азёрнай станцыі. За ёю, у засені лесу, туляцца дамкі біястанцыі універсітэта. Бялеюць сярод баравін будынкі курортнага комплексу. А насупраць яго тупым клінам уразаецца ў Нарач каса. Яна як бы падзяляе возера на два плёсы — малы і вялікі. На касе (калі яшчэ!) «кінула якар» тыповая нарачанская вёсачка — Наносы. Вакол — сыпучы пясок, а каля кожнай хаты агародчык, уздоўж вулачак — прысады. Я нядаўна быў там, і ў памяці яшчэ жыло ўбачанае — і побыт людзей, і адносіны іх да зямлі, і нейкая задуменная цішыня, што стаяла над хатамі.

За выступам касы, на гарызонце, угадваюцца Гатавічы. Насупраць іх — самае глыбокае месца Нарачы. Даведнікі сведчаць, што глыбіня там дасягае дваццаці пяці метраў, а мясцовыя рыбакі сцвярджаюць: ёсць яміны да сарака метраў!.. А лявей касы — Выспа. Гэты невялікі астравок аб'яўлены помнікам прыроды мясцовага значэння. Укрыты непралазнымі кустамі, над якімі ўздымаецца ўсяго некалькі сосен, ён дае надзейны прытулак розным звярам і птушкам. Там гняздуецца нават крахаль вялікі — рэдкі на Беларусі від качыных.

Лявей Выспы нельга не заўважыць вёсачкі, што раскінулася на высокім беразе пры самай Нарачы. Гэта Пасынкі. Свянцянскія грады падступілі амаль да самай вады, і людзі спрадвеку змушаны былі сяліцца на кручы. Я быў у гэтай вёсцы. Хаты там у асноўным старыя, яшчэ даваеннай пабудовы, на

спадзістай вуліцы ў іншых месцах захаваўся брук. Мне трэба было пабачыцца з Нінай Сцяпанаўнай Багуцкай — сведкам падзей, якія адбыліся ў гэтым краі ў далёкім трыццаць пятым годзе. Ішоў вуліцай і здзіўляўся: Пасынкі — як вымерлі. Ні адхіліцца фіранка ў акне, ні выйдзе да студні гаспадыня, ні цяўкне шчанюк. Раптам бачу: у цяньку на лавачцы сядзяць некалькі старых жанчын. Падыходжу, вітаюся, кажу, да каго мне трэба, і тут жа ў адказ чую:

— Багуцкая? Толькі што дамоў пабегла!.. Сёння пятніца, хлеб павінны прывезці. Вось мы і сядзім, чакаем.

Хата Багуцкай на самай вяршыні Свянцянскай грады. З акон відны і сіняя вада Нарачы, і Выспа, да якой і паўкіламетра не будзе, і стужка асфальтаванай дарогі, што паблісквае па-над берагам. Мы сядзім з Нінай Сцяпанаўнай у святліцы, за вялікім, накрытым саматканым абрусам сталом, і гаспадыня пытаецца:

— Адкуль дазналіся пра мяне, што жыву яшчэ, што памятаю тыя паганыя дні?

— Уведаў. Ад людзей.

— Ага,— пагаджаецца яна.— Людзі ўсё помняць!

Памятала і яна. Камячыла ў жмені ражок абруса і ціха казала:

— Бацька мой, Сцяпан Хведаравіч, служыў у пана. Муж, Цімафей Мікалаевіч, у рыбаках хадзіў, падпольнікам быў, паўставаў разам з усімі...

Раптам як хто падмяніў яе:

— Божачкі! А я ж яшчэ тую песню помню, за якую паліцыянты пад арышт бралі, кіямі гумовымі білі. «Нарачанка» называецца песня тая...

— Рыбакі нарачанскія, сяляне,
Вы збірайцеся ўсе ў грамаду...

Голас ломкі, дрыготкі — цяжка нават акрэсліць мелодыю. Жанчына болей выгаварвала словы, чым спявала. Яна паглядала з таго краю стала — сівень-

кая, але з цікаўнымі яшчэ вачыма. Калі змоўкла, я запытаўся:

— А з чаго ўсё пачалося тады, у трыццаць пятым?

Ніна Сцяпанаўна пацiснула плячыма:

— А ліха яго ведае! Адно помню: забралі ў нас Нарочу, а мы паўсталі, бунт учынілі...

У філіяле Дзяржархіва Мінскай вобласці ў горадзе Маладзечне ёсць сведчанні тых падзей. У сакавіку 1932 года польскі ўрад прыняў закон аб нацыяналізацыі рэк і азёр, згодна якому возера Нарач перайшло да дырэкцыі дзяржаўных лясоў і было здадзена ў арэнду акцыянернаму таварыству. Гэты закон пазбаўляў сялян апошняга кавалка хлеба, рабіў іх рабамі дырэкцыі, як у часы баршчыны. Першымі забаставалі рыбакі вёсак Пасынкі, Купа, Міхольцы, Сіманы, Урлікі, Занарач. У агульнай забастоўцы прынарацкіх рыбакоў прыняло ўдзел каля сарака вёсак, амаль пяць тысяч чалавек. А сігналам для выступлення паслужыў арышт трох рыбакоў — Міхала Роліча з Наносаў, Міхала Субача з Пасынкаў і Міхала Караленка з Зялёнак. ЦК КПЗБ у жніўні 1935 года звярнуўся да сялян-рыбакоў з заклікам. У ім гаварылася: «Затрывожыліся польскія ўлады, калі над Нарочу бура паднялася. Мацней, чым хвалі марскія б'юць аб бераг, ваша ўсеагульнае выступленне ўдарыла ў аплот польскай улады. З гэтага шляху сумеснай барацьбы вы не павінны саступаць. Вы абавязкова пераможаце ворага-акупанта, калі бесперапынна будзеце мацаваць сваё адзінства ў штодзённай барацьбе...». Напалохаўшыся арганізаванага выступлення сялян-рыбакоў, польскі ўрад пайшоў на некаторыя ўступкі, але зімой улады зноў вырашылі не дапускаць сялян лавіць у возеры рыбу. Так цягнулася да 1939 года, пакуль у нарачанскі край не прыйшла Савецкая ўлада, якая аддала ў рукі працоўнага народа і землі, і азёры...

Гэтыя факты я меў пад рукою пазней. А тады, седзячы ў святліцы Ніны Сцяпанаўны і бачачы яе разгубленасць, паспачуваў (Колькі часу мінула!) і перавёў гаворку на іншае:

— А хто склаў «Нарачанку»?

Багуцкая на гэты раз адказала ўпэўнена:

— Вершык, гаварылі, напачатку як бы сачыніў Ляксей Субач, што з Мікольцаў. А потым, казалі, яго дапісвалі Чарняўскі з Пасынкаў, Субач з Чараўкоў, Зарэцкі — адным словам, усе патроху. Рыбакі склалі «Нарачанку»! І яшчэ помню: пелі яе на матыў «Марсельезы»!

Дабірацца ў Занарач давялося не вадою, а дарогаю, што як бы акальцоўвала возера. Раніца выдалася хмарная, з дажджом-грыбасеем. Іншы раз аднекуль вырываўся вецер, дождж мацнеў, і Нарач хвалявалася, білася ў берагах. Трывожна шумелі прыбярэжныя сосны. А сціхаў вецер — і спакайнела возера. Нарэшце грыбасей уняўся, хмары падняліся, нават спрабавала выбліснуць сонца.

Ішоў у Занарач, а думалася пра Нарач. Нярэдка возера здзіўляла сваімі дарункамі! У музейчыку тутэйшага лясніцтва чуў ад бывалых людзей: аднойчы злавілі вугра амаль у сем кілаграмаў вагою... А яшчэ быў злоўлены шчупак, які заважыў тры з паловай пуды... Сом на дзевяць пудоў... Гэта ўсё было некалі. Цяпер — не тое. Асабліва як з электратралам «пагулялі» па возеры. Столькі рыбы паглумілі! А ўзгадавацца ёй не дзень, не два — гады патрэбны...

Абуралі і паводзіны браканьераў. У нарачанскія лясы прыйшла аднойчы мядзведзіца. Выбрала сабе ля Млынка, азярца ляснога, што ў Гатаўскім лясніцтве, зацішнае месца і стала жыць. Нікога не чапала, шкоды аніякай не рабіла. А ўсё ж падпільнавалі мядзведзіцу і забілі. Чатыры гады прайшло, а ніхто нават не паварушыўся, каб адшукаць злачынцаў. Вельмі пакутуе ад іх і Нарачанка. На яе, не кра-

нутую меліяратарамі, усю ў травах і кветках, нібы першародную, з'язджаюцца к ночы аматары вугроваға лову. Каторы дзень я быў там, бачыў тычкі, да якіх прывязваліся донкі-закідушкі, знаходзіў бляшанкі, у якіх яшчэ звіваліся чэрві-дажджавікі. На грудках, дзе растуць вольхі, дол быў так узрыты, што здавалася: тут «гаспадарыў» статак свіней. Там «рыбаловы» здабывалі прынаду на вугра.

Прыкра было на душы ад усяго гэтага.

Настрой трошкі змяніўся, калі ў Занарачы сустрэўся з Зояй Алешка. Не шукаў, не распытваў, як у Пасынках пра Багуцкую, а пайшоў адразу на калгасны ток. Яна якраз вярнулася з поля. У сінім камбінезоне, маладая, энергічная, жанчына болей паходзіла на юнака. Заўважыла мяне, у блакітных вачах з'явіўся гарэзлівы агеньчык:

— А хто ж гэта да нас?

— Адзін добры чалавек параіў: ідзі, кажа, у Занарач, там самая прыгожая нарачанка жыве. Вось я і прыйшоў,— пажартаваў я.

— А калі сур'ёзна?

— Калі сур'ёзна, то хацеў даведацца, як Зоя Алешка трактарысткаю стала, як рызыкнула мужчынскай прафесіяй авалодаць,— адказаў я.

— Рызыкнула! — ускінула русыя бровы жанчына і, заглушыўшы матор, стала расказваць:

— Спакусы, праўда, нямала розных было. Пасля школы магла на рыбакамбінат пайсці, у афіцыянткі падацца, у пакаёўкі ці яшчэ куды. Вунь колькі ў нас санаторыяў розных набудавалі! Але ж падумала: дзед-прадзед на гэтай зямлі працаваў, бацька — на трактары з маладых гадоў, буду і я тут. Якраз у калгасе сталі набіраць на курсы механізатараў. Не вагалася, адразу падала заяву.

А праз дзень і маці прыбегла: будзем, кажа, разам вучыцца! Яна за мяне на дваццаць шэсць гадочкаў старэй, а не адставала, вучылася добра. Закончылі мы тыя курсы, спецыяльнасць механізатара шырокага профілю атрымалі, пачалі працаваць. І ведаеце? На адным трактары! Праўда, сёй-той

пасмейваўся: «Здурэла баба пад старасць!». Гэта ў адрас мамы. «Даўней жанчыны да каня падступіцца баяліся, а яны — на трактар уселіся!». Гэта ўжо і мне папрок. Але мы не зважалі. Рабілі сабе і рабілі. Зімою арганіку вывозілі, вясною мінеральныя ўносілі, улетку прапашныя даглядалі, а ўвосень — ужо на розных работах. Потым мне далі новы трактар, а мама на тым самым да пенсіі прарабіла.

Яна ўсміхнулася:

— Дык гэта ж яшчэ не ўсё! І муж мой, Мікалай, таксама... На «зіле» працуе, шафёрам. І сынок наш, Мішка... Хлопцу трынаццаць, а ў час канікулаў ад трактара і не адпрэчыш. Праўда, за ім яшчэ вока ды вока трэба, але, калі са мною, то ўсю змену, бывае, і прасядзіць за баранкай.

— А дачка? — запытаўся я на ўсялякі выпадак.

І не памыліўся. У Зоі Аляксандраўны ёсць і дачка. Але ёй усяго чатыры гадкі.

— І Людка туды ж! — з гордасцю прамовіла маці.— Лялькі ёй хоць і не падавай. А вось з прават дкамі living рознымі, жалязякамі цалюткі дзень забаўляцца можа.

— Таксама трактарысткай будзе!

— Мо і будзе.

— Зой-ка-а! — гукнула з току нейкая жанчына.— У поле пара!

— А і праўда,— схамянулася Алешка,— я на лёне сёння працую, галоўкі адвожу. Пэўна, ужо недзе прычэп не адзін намалацілі.

Паднялася ў кабіну, і «Т-40», паслухмяны яе рукам, выйшаў за вароты.

...На выхадзе з калгаснага двара мяне запыніў невысокага росту дзядок і адразу засыпаў пытаннямі:

— Да Аляксандраўны нашай прыязджалі? Бяда якая ці патрэба прывяла? А ці паабяцала помачы? Не адмовіла? Яна ж у нас у Вярхоўным Савеце. Дэпутаткай!

Прызнацца, для мяне гэта было прыемнай нечаканкай.

На гэтай зямлі адчувалася добра. Я мог гадзінамі быць на возеры, слухаць шум баравін, плёскат хваль. За гэты час бачыў яго ўсялякім. Ціхім і нібы задуменным — на світанку. Неспакойным і як бы ўсхваляваным — у дождж. Абураным і ўспененым — калі налятаў вецер. А ў буравей аблічча Нарачы так мянялася! Адна за адной, няспынна, кідаліся на бераг высокія хвалі. І тады возера, сапраўды, нагадвала мора. Колькі гневу, сілы і непакоры было ў ім!..

Нельга не сказаць і пра тутэйшых людзей. Уменне з годнасцю трымацца, беражліва адносіцца да роднай мовы, да гісторыі краю — лепшыя рысы нарачанцаў. Яны перадаюць іх з пакалення ў пакаленне, шануюць, ганарацца імі. Людзі нарачанскага краю! У гэтых словах гучыць вялікая гордасць.

У Мядзельскай раённай бібліятэцы ёсць стэнд — «Нашы землякі». Там змешчаны партрэты славутых людзей, якіх даў свету нарачанскі край. Іх шмат, гэтых людзей, але хочацца назваць хоць колькі імёнаў.

Адам Гурыновіч — беларускі паэт-дэмакрат. Родам з Кавалькоў.

Васіль Шаранговіч — савецкі партыйны дзеяч, удзельнік барацьбы за ўладу Саветаў на Беларусі, сакратар ЦК КП(б)Б. Нарадзіўся ў Качанах.

Паўліна Мядзёлка — заслужаная дзеячка культуры БССР, першая выканаўца ролі купалаўскай Паўлінкі — родам з Будслава.

Міхась Чарняўскі — гісторык, археолаг, мастацтвазнавец і пісьменнік. Нарадзіўся ў Круці.

Марыя Захарэвіч — беларуская савецкая актрыса, народная артыстка БССР — з Навасёлак.

Максім Танк — народны паэт Беларусі, акадэмік Акадэміі навук БССР, Герой Сацыялістычнай Працы — з Пількаўшчыны.

Багатая нарачанская зямля на цікавых людзей! Я тады наведаў і Хведара Валасевіча, адзінага ў рэспуб-

ліцы чалавека, які ў дні Вялікай Айчыннай вайны рабіў партызанскія медалі.

Застаў гаспадара на панадворку — нешта «варажыў» каля міні-трактара.

— Во! — пахваліўся Хведар Васільевіч.— Сам выштукаваў! На ім і араць соткі можна, і гной вывозіць, і бульбу садзіць, і дровы рэзаць, і нават плашкі калоць. Цудоўны трактар. Вось бы наша прамысловасць выпускала такія! Селянін не нарадаваўся б... Сам я да кавальскай справы з дзесяці гадоў прывучаны. Бацька ў мяне быў майстар на ўсе рукі!.. А наконт медалёў — праўда. Рабіў я.

...Кузня Валасевічаў тады стаяла пасярод Канстанцінава — прылеснай вёскі, што па той бок Нарачы. У кузні заўсёды было людна. Аднак у дні вайны асноўнымі «заказчыкамі» сталі партызаны: з усяго наваколля звозілі на рамонт вінтоўкі, аўтаматы, кулямёты. І Хведар увіхаўся каля іх, стараўся адрамантаваць як найлепш і ў тэрмін. Аднаго разу прыходзіць да яго начальнік штаба брыгады імя Ракасоўскага Негамаеў і кажа: «Трэба зрабіць некалькі медалёў для ўзнагароды партызан. І каб на тых медалях было выбіта: «За храбрасць». Ён паклаў на стол некалькі срэбных манет, даў тэкст, які павінен быць выбіты на медалях. На папяровым кружочку было напісана: **«П. БР. ИМ. РОКОССОВСКОГО. ЗА ХРАБРОСТЬ»**. На адваротным баку значылася: **«В ДЕНЬ 2-ЛЕТИЯ. 5.VII.44»**. Пакруціў юнак паперку ў руках, падумаў і пачаў рабіць шрыфт. Атрымалася. Выбіў спачатку пробны медаль на алюмініевым кружку. Камандаванне партызанскай брыгады ўхваліла. І тады Хведар стаў «чаканіць» медалі на срэбры. Да паўсотні медалёў зрабіў! Узнагароды меркавалася ўручыць 5 ліпеня 1944 года — у другую гадавіну арганізацыі брыгады імя Ракасоўскага. Але гэты дзень супаў з прыходам нашых войск, з вызваленнем ад фашысцкіх захопнікаў нарачанскай зямлі. І вось 5 ліпеня на станцыі Варапаева сабраўся ўрачысты сход прадстаўнікоў атрадаў. На ім лепшым партызанам і былі ўручаны медалі, выкаваныя

Хведарам Валасевічам. Іх атрымалі разведчыца Камарова, радыст Бармічаў, намеснік камбрыга па разведцы Казарцаў і іншыя.

Ну а ён, Хведар Валасевіч, замкнуў кузню і пайшоў з часцямі Чырвонай Арміі на захад. Першая баявая ўзнагарода, якую атрымаў Валасевіч на фронце, быў медаль «За адвагу». Сімвалічна!

Жыве былы франтавік цяпер у Старым Мядзелі, на вуліцы Міру.

Сустрэцца ў нарачанскім краі з Багуцкай, Алешка і Валасевічам мне параіў Міхал Трахімавіч Чарняўскі. Былы франтавік, па прафесіі — настаўнік, ён большасць гадоў аддаў журналістыцы. Усё жыццё збірае, як сам кажа, макулінкі з гісторыі роднага краю. Чарняўскі паведаміў мне і адкуль пайшла назва возера.

— Ёсць некалькі меркаванняў,— казаў Міхал Трахімавіч.— Першае. Існуе легенда, нібы на беразе возера жыла некалі дзяўчына Найрыта ці Нара. У яе быў цудоўны голас. Стары пан аднойчы пачуў, як спявае Нара, і ўздумаў узяць яе ў жонкі. Яна ж вырашыла лепш загінуць, чым жыць з нялюбым. Падпаліла панскія харомы, а сама ўтапілася ў возеры. З таго часу і сталі называць возера імем смелай дзяўчыны. Да нашых дзён дайшла назва: Нарач.

— Другая думка,— працягваў Чарняўскі.— Ёсць слова «нарочитый», што азначае: важны, чынны, знатны, імяніты. «Адкуль ты?» — пыталіся некалі ў тутэйшага чалавека. І ён адказваў: «З берагоў нарачытага возера!» У перакладзе на цяперашнюю мову будзе: «З берагоў знатнага возера, Нарачы!».

— І трэцяе меркаванне,— прамовіў краязнавец.— Паколькі ў возера ўпадала і выпадала рака, дык тубыльцы не раз хваліліся гэтым: «Наша возера на рацэ!». З цягам часу два словы зліліся ў адно — нарацэ, нараца, нарача. Потым замацавалася раз і назаўсёды: Нарочча, Нарач. А які з гэтых варыянтаў

больш верагодны — мяркуйце самі. Есць жа і рака Нароча!

Апошні дзень правёў у бібліятэцы. Цікава было ўведаць, што пісалі пра гэты край, пра Нарач іншыя. Пошукі, як я і спадзяваўся, апраўдалі сябе.

Леон Кручкоўскі, польскі пісьменнік:

Хто ведае, у чым яна заключаецца, магія гэтых мясцін? Здаецца аднак, што нават чалавек, цалкам пазбаўлены «філасофскіх» схільнасцей, не можа тут не паддацца пачуццю нейкай унутранай акрыленасці, падобнай да таго стану, у які прыводзіць нас, напрыклад, слуханне музыкі...*

Алексіс Парніс, грэчаскі паэт:

Нарач — возера Нарач — даліна чароўная
І паляна блакіту ў лясах беларускай зямлі.
Штосьці ёсць невыказнае тут і няўлоўнае,
Што хвалюе мяне, быццам з Грэцыі чую я кліч...

Уолтэр Мэй, англійскі паэт:

За дружбу піў я твой бальзам дзівосны.
Бярозы і разлапістыя сосны
Спявалі нада мною да світанку
Працяжную лясную калыханку.
Дарылі ў вёсках нам усім вяргіні
Дзяўчаты — грацыёзныя багіні.
Лясы, палі, азёры — дзе ні глянеш,
Залётная пясчынка ў акіяне.
Сярод сінечы ў ззянні самацветаў,
У пушчах партызанскіх між паэтаў,
Ты прагна п'еш і п'еш, прыпаўшы ніц
Да жарала крыніцы ўсіх крыніц —
Братэрства.

---

* Пераклады з польскай, грэчаскай, англійскай і ўкраінскай моў былі зроблены і апублікаваны ў розны час пісьменнікамі Беларусі.

Ніл Гілевіч:

Да хваль тваіх, і соснаў, і бяроз
Вяртаўся ў думках я не раз, бывала,
Калі без родных вечаровых рос
Мая душа, засмягшы, вандравала.
І скрозь, куды б мяне ні прывялі
Шляхі-дарогі пад высокім небам,
Ты — сімвал любае навек зямлі —
Была мне ўцехай і надзённым хлебам...

Любоў Забашта, украінская паэтэса:

На возеры Нарач, дзе вецер паўночны бушуе,
Дзе коцяцца хвалі да смолкіх ствалоў
сасняка,
Стаіць абеліск, нібы воін, надзейна вартуе
І мір, і зацішша, і добры улоў рыбака...

Максім Танк:

Трэба абавязкова пабываць у гэтым цудоўным кутку нашай Радзімы на Мядзельшчыне, каб зразумець, чаму пра яго складзена столькі песняў, чаму пра яго з натхненнем гавораць сяляне, рыбакі, людзі, якія жылі, працавалі, партызанілі ў гэтых краях, або проста тыя, каму хоць раз прыходзілася праязджаць па нашых лясных і прыазёрных дарогах.



# ПОЛЫМЯ

*Бяда дзеда Сашка́ ● Як загінула вёсачка*
*Тры бярэзінкі ● Пустая буслянка*
*Паданне пра Сіні Камень ● Крамяныя баравікі*
*Бабцы Лідзе не спіцца*

Маўкліва стаяў лес. Падчас толькі па верхавінах прабягаў лёгкі ветрык. Дрэвы пагойдваліся, чуўся ледзь улоўны пошум, апускалася на дол жоўтае лісце.

А дарога бегла і бегла. Здавалася, ёй канца не будзе сярод гэтых вось елак, бярэзін ды сосен. Іншы раз траляліся адны бярэзіны, і дарога больш акрэслівалася — уздоўж яе стаяў нібы паркан з белых камлёў. Вецце ў большасці бярэзін было яшчэ зялёнае. Аднак некаторае дрэва, на здзіўленне астатнім, ажно палыхала — так яго аздобіла матухна-восень. Птушак бы сюды! Хай бы ўславілі гэтае дзіва. Але іх не было — адляцелі ў вырай.

Нечакана пачулася песня. Яе любіла некалі, у хвіліны роздуму і журбы, спяваць маці. А я, зусім яшчэ дзіцё, сядзеў насупраць і слухаў, слухаў яе поўны жалю і нейкага непрыхаванага адчаю голас, які кранаў душу... І гэты голас быў з ноткамі жалю, у ім таксама біўся адчай:

— Між высокіх хлябоў зацяралася
Небагатае наша сяло.
Гора горкае па свеце шлялася
І на нас неўзначай набрыло,—

ліўся жаночы голас. Ён на секунду сціх, а тады паўтарыў, падалося, з асаблівай прачуласцю, два апошнія радкі:

— Гора горкае па свеце шлялася
І на нас неўзначай набрыло...

Я спыніўся. Хацелася ўбачыць, хто спявае. Азірнуўся, а бачыў адно: бярэзіны, бярэзіны... Але песня пачулася зноў — на гэты раз намнога бліжэй і выразней:

— Ой, бяда прыключылася страшная!
Мы такой і не зналі вавек...

І тут я ўбачыў жанчыну. Яна ішла між белых камлёў, ішла ў мой бок, да лясной дарогі. На згібе левай рукі вісеў звычайны лазовы кош, а ў правай жанчына трымала чырвоны падасінавік, быццам высвечвала гэтым «ліхтарыкам» шлях. Рады сустрэчы, я запытаўся:

— Скажыце, а ці правільна іду? Мне ў Полымя, а тут столькі сцежак-дарожак! Заблудзіцца можна.

Яна ступіла на дарогу і апусціла кош.

— У Полымя, кажаце? — акінула мяне дапытлівым позіркам і прызналася: — Сама я з Баброўні, за чатыры вярсты ад тае вёсачкі, дык там кожнага ведаю. А вы, прабачце, да каго?

— Да дзеда Сашка́,— адкрыўся я.— Да Дземшы. Каторы леснікаваў некалі ў мясцінах гэтых.

— А! — нібы ўзрадавалася яна.— Тады вам трэба прайсці кіламетраў пару вось гэтай дарогай, потым павярнуць управа, а напаткаеце палянку — там і будзе Полымя. А Сашко жыве ў крайняй хаце.

Дзед Сашко быў дома — пасвіў у агародчыку белае цяля. Убачыў мяне, замахаў рукою, каб наблізіўся да плоту, і падышоў сам.

— Часам, не з канторы? — запытаўся ён, азіраючы мяне.— А то нейк нядобра палучаецца! Прасіў гэты год сена, а мне кажуць: «Не паложана!». Калі сын Аркадзь у калхозі рабіў — было паложана. А калі яго трактарам забіла — не паложана стала. І хто кажа? Іван Дзячэня! Начальнік участка нашага. А чаму яму ўсё паложана, каб запытаўся.

Тут дзед Сашко зразумеў, што я не з канторы, што прыйшоў да яго з іншай нагоды, але ўсё роўна крыўду сваю да канца выклаў:

— А я ж толькі летась здаў за тону малака! І гэты год штоднёўку здаю, па дванаццаць літраў! І маладняк, і свінчо якое — таксама ў калхоз. А ён — «Не паложана!». Хоць ты выракайся і кароўкі, і цяляці.

Дзед Сашко адвярнуўся і казаў ужо быццам не мне, а таму Дзячэні:

— Носам буду падаць, але... Праўда, наша Кветка стараватая ўжо, да таго ж растлушчаная. Сёння ў хляве трымаю — прыхварэла нешта. Ды падпраўлю трошкі і здам. Тожа ў калхоз. А з гэтага,— кіўнуў на белае цяля,— выгадую новую Кветку. Бо без кароўкі няможна. Кароўка для нас — усё. Яна корміць нас.

Цяля наблізілася да плоту, пачало церціся аб шула. Дзед узяў яго за ашыйнік, адвёў трошкі ўбок, дзе кусцілася яшчэ зялёная трава, вярнуўся, абапёрся на штыкетнік і працягваў:

— А вазьміце электрыку. Да суседняй вёскі Вострава падвялі электрыку, а да Полымя — не падвялі. Зноў не паложана! — ён крыва ўсміхнуўся.— А чаму? Там, у Востраве, чатыры хаты. У Полымі — тры. А Вострава ж ад нас рукою падаць — і кіламетра не будзе, калі напраскі. Восем сот метраў! А нікому і ў галаву не цюкне, што ў Полымі таксама людзі... Быў я адважыўся напісаць у Мінск пра нашу патрэбу. Абяцаў, што грашыма паможам, сілаю, каб толькі слупы тыя паставілі. Дармо ўсё!.. А па тых жа слупах маглі і радзіва правесці. А так што палучаецца? Ні святла, ні радзіва, ні целявізара, ні халадзіль-

ніка — нічога не май. З курамі ўставай, з курамі і кладзіся. І газы тае не вельмі дастанеш. За блізкі свет магазін!.. А ці заслужыла такога наша Полымя? Паслухаць толькі, што пераржыло сяльцо, і то па сэрцы холадам пацягне. А мы...

Калісьці над ракой Котрай стаялі дрымучыя лясы. Баравіны былі — вока цешылася. Цяперашняя сасна — жэрдка ў параўнанні з колішняй. Шмат рознага звера было ў лесе. Усё тое трэба было берагчы, ахоўваць. І ўлады паслалі туды палясоўшчыкам кемлівага мужыка па прозвішчу Дземша. Ён не адзін падаўся ў глухі кут — з маладой жонкай. Пабудавалі яны там леснічоўку, а каб мець хлеб і да хлеба — сталі ляда карчаваць, дзялянку паблізу жылля выпальваць. За логам, перад узгорыстым борам вечна гарэла, курадыміла, заўсёды відно было полымя. Адсюль і мясціна, дзе пасяліўся палясоўшчык, стала звацца: Полымя... Міналі гады... У Дземшы з'явілася ажно шасцёра сыноў. Былі яны, як і бацька, працавітымі, стараннымі хлопцамі. Хто гаспадаркай займаўся, хто бортніцтвам, хто лясной справай... Усе жылі дружнай, адзінай сям'ёй. А потым пачалі абзаводзіцца і сваімі сем'ямі. Жонак бралі з Лішчыц, Бандароў, Вострава, Сіняга Каменя, Баброўні, Забярэзіны, Шкленска. Нават калі пажаніліся, доўгі час не адыходзілі ад бацькі. Пабудавалі новую хату — на два канцы, і жылі пад адной страхой. Старыя людзі казалі, што да адмену прыгону сям'я палясоўшчыка налічвала трыццаць шэсць чалавек. Потым усё ж рассяліліся Дземшы. Але зноў-такі: не раз'ехаліся, а пабудаваліся побач. Утварылася невялікая вёсачка з сямі хат. Нярэдка Полымя звалі і так: Дземшы. Бо ўсе жыхары мелі адно прозвішча — Дземша.

Дзед Сашко, ці Аляксандр Ульянавіч Дземша, не ведае, як звалі прадзеда і яго сыноў. А вось імёны тых, хто жыў да імперыялістычнай вайны,— ведае. Акрамя Ульяна, бацькі яго, у Полымі жылі Сымон, Грыша, Аляксандр, Ілья, Макар і Мікалай. Усе яны

даводзіліся дзеду Сашку роднымі дзядзькамі. Вёска тады не мела і паўсотні дзесяцін зямлі. І тая смеху варта была —суцэльны пясок ды глей. Таму амаль усе Дземшы па-ранейшаму ў лесе знаходзілі прыработак. Лес быў для іх і карміцель, і апора.

Першая бяда напаткала Полымя ў час імперыялістычнай вайны. Калі набліжаўся фронт, усе яе жыхары кінуліся ў бежанства, у Расію. А вярнуліся — вачам не паверылі: ніводнай хаты! Усе сем сяліб з дымам пайшлі. Аднак Дземшы — людзі працавітыя. На старых дварышчах зноў пабудавалі хаты, а пры іх — адрыны, хлеўчукі, паграбкі. Жыццё стала наладжавацца. Але зноў пачалася неразбярыха: улады змянялі адна адну. Да сорак першага, за дваццаць сем гадоў, у Полымі правіла ажно сем улад — царская, Савецкая, польская, нямецкая, зноў польская, зноў Савецкая і зноў нямецкая.

У Вялікую Айчынную Полымя спасцігла другая бяда. Было гэта ў нядзелю, 18 ліпеня 1943 года. Ранкам уварваліся ў вёсачку фашысты, сагналі ўсіх яе жыхароў у адрыну Мікалая Дземшы і адтуль ужо выводзілі пад сосны і расстрэльвалі. Дзед Сашко выпадкова застаўся жывы. Напярэдадні, у суботу, паехаў у Дубінку, адкуль была родам яго жонка, і заначаваў у цешчы. А раніцою прыляцела ў Дубінку жудасная вестка: знішчылі фашысты Полымя, Сіні Камень, Шкленск... Сашко — на веласіпед і ў Азёры, каб дакладней уведаць, што страслося. Бачыць: вазакі азёрскія і камчацкія (была такая вёсачка пры Азёрах — Камчатка) вязуць пад аховай паліцаяў іх маёмасць, жывёлу гоняць. Хацеў распытаць вазакоў, а тыя: нічога не бачылі, нічога не чулі — стаялі воддаль. Дабраўся да Полымя — захлынулася сэрца: за сялом, пад соснамі, магіла. Збольшага зараўняна, зверху трошкі галля накідана. А на месцы вёскі адны толькі каміны стаялі. Усе сем двароў зноў агонь спапяліў. Трыццаць пяць палымянцаў і хлапчук з вёскі Сіні Камень — Росцік Папрукайла, які прыбег пагуляць да сяброў у Полымя, загінулі тут.

У сорак пятым, калі адгрымела вайна, расстраля-

ным быў пастаўлены цэментавы помнічак. На тым помнічку выбіта: «Тут спачываюць загінуўшыя трагічнай смерцю ДЗЕМШЫ». Ніжэй, па-просту, як пісалася, як прыйшло тады ў галаву, імёны жыхароў Полымя:

Міхаіл, Люба,
Анатоль, Аркадзь,
Зінаіда, Ілья,
Агаф'я, Яўгіння,
Сцепаніда, Валянціна,
Аляксей, Мікалай,
Вера, Вольга,
Рыгор, Марыя,
Валянціна, Тамара,
Сямён, Серафіма,
Лідзія, Ніна,
Макар, Серафіма,
Георгій, Іван,
Уладзімір, Леанід,
Аляксандр, Надзея,
Гэліна, Яўген,
Аляксандр і Расціслаў.

Пад спісам імён — словы: «Мір праху вашаму, дарагія бацькі, браты, сёстры, дзядзькі і цёткі, якія загінулі пакутніцкай смерцю 18 ліпеня 1943 г.».

Мы стаім з дзедам Сашкóм каля помніка і маўчым. Нарэшце Аляксандр Ульянавіч вузлаватымі пальцамі кратае выбітыя на цэментавай пліце літары і кажа:

— Самыя старыя з іх — Агаф'я, Сямён і Рыгор. Ім было па пяцьдзесят тры гады. Гэта мае траюрадныя сястра і браты, а наймалодшы быў — Алёшка, сын мой. Яму толькі год і два месяцы было...

Дзед Сашко болей не мог вымавіць ні слова.

Мы сядзім на падмурку колішняй хаты. Захаваўся ён не поўнасцю — усяго метры два даўжынёю. Астатняе за пасляваенныя гады рассыпалася, увайшло ў зямлю. Толькі дзе стаяла печ узвышаецца нібы пагорак. Тут была сяліба Мікалая Дземшы, дзядзькі дзеда Сашкá. Хата стаяла насупраць дзедавай, вокны ў вокны. А цяпер... Толькі тры бярэзіны растуць на былым дварышчы. Іх ніхто не садзіў, яны самасейкі. Да гэтых бярэзін дзед Сашко адносіцца неяк асабліва.

— Помню іх вунь такенькімі,— раздумліва гаворыць ён.— А, бач, як падняліся за век свой!

Дзед дастае цыгарку, прыкурвае, кашляе і толькі тады прымаецца расказваць пра тое, як «вярталася» Полымя.

— Я ўжо казаў: прыбег сюды, а ў Полымі адны каміны чарнеюць ды пясок высвечвае каля магілы,— чуецца яго прыглушаны голас.— Пакруціўся на папялішчы, пакруціўся і змушаны быў назад, у Дубінку, падавацца. А калі гітлераўцаў змялі адсюль, рашыў: будзь што будзе — пайду жыць на роднае котлішча! Рашыць то рашыў, а дзе, як, з чаго пачынаць? Мая Ліда Рыгораўна (яна стрыечная сястра Валі, першай жонкі) і не пярэчыла нават. «Нейк будзе!» — казала. І праўда. Хацінку скалацілі пяць на чатыры і пераехалі. У сорак восьмым брат мой, Ляксей, з Урала, з вайсковага шпіталю вярнуўся. Хоць і не вельмі якая, але пара рук прыбавілася. І сталі мы вось гэтую хату будаваць. Самі і лес тралявалі, самі і бёрны пілавалі, самі і зруб... А потым, як Ляксей ажаніўся, і яму такую ж хату паставілі. У той час з'явілася ў Полымі і трэцяя хата — Шуркі Дземшы, па мужу Рамановіч. Шурка да вайны выйшла замуж у Стральцы, але яе чалавек з фронту не вярнуўся... І рашыла яна з сынам таксама ў Полымя пераехаць. На падмурак бацькавай хаты перавезла тую, са Стральцоў, і жыве, дзе нарадзілася. Ву-унь, па левую руку, у самым канцы яе хаціна стаіць.

Дзед Сашко зноў палез па курыва.

— Потым, само сабою, дзеткі пайшлі,— працягваў ён свой расказ.— Праз колькі год у Полымі нашым было ўжо дванаццаць душ! Бывала, вяртаешся з абходу (я палясоўшчыкам да самай пенсіі працаваў!) дык здалёк чуеш дзіцячы гоман. Душа радавалася. І нейк патроху забывалася тое гора. Аднак павырасталі дзеці ды паразляталіся, як тыя птушаняты з гнязда,— ён крыва ўсміхнуўся.— А, прызнацца, думалася: зноў у Полымі сем хат будзе! Ды ці сем? Болей! Але надзея не спраўдзілася.

Дзед Сашко адчайна зацягнуўся і зноў закашляў-

ся, на гэты раз надоўга. Відаць, пачуўшы той кашаль, аднекуль прытупала з кіёчкам бабка Ліда, прысела побач.

— Разбухікаўся! — нібы папракнула яна старога і ўжо звярнулася да мяне: — А вы ўсё гамоніце і гамоніце, і ўсё пра бяду нашу. Ды не адно Полымя перажыло такое. Вунь і Шкленск у той дзень расстралялі, і Сіні Камень. Таксама каміны адны засталіся ад вёсачак.

У хляве пачала рыкаць Кветка. Дзед Сашко падняўся і пайшоў на панадворак. Бабка Ліда быццам не звярнула на гэта ўвагі і сказала:

— Паслухайце лепей, што я пра Сіні Камень уведала! — яна павярнулася тварам да мяне, і я не мог не заўважыць на ім слядоў колішняй прыгажосці — не крыклівай, не паказной, а па-сялянску строгай і простай.— Назва сяльца пайшла ад каменя сіняга, што ляжаў на тым канцы, пры выгане. Ён быў пляскаты, круглы і ў калена ростам — як дзежка. Спрадвеку ляжаў, нікому вачэй не мазоліў. А са Шкленска адзін чалавек рашыў скарыстаць яго. Ноччу паехаў з канём і забраў. Паклаў пад вугал свае хаты і радуецца: лепшай апоры і не трэба! Ды з тае хвілі не стала шанцаваць яму: то скаціна падала, то дзеці ўміралі. Людзі пытаюцца: «Мо ты, чалавеча, зрабіў што благое?» «Не,— кажа ён,— вось толькі хіба камень сіні ад вёскі суседняй перавёз». «Яно і ёсць! — сказалі бабы.— Награшыў, таму і кара такая». І параілі яму вярнуць той камень назад. Паслухаўся чалавек, выдраў з-пад вугла камень, ускаціў на воз. Але да вёскі не даехаў (стыдна зрабілася перад людзьмі), а зваліў камень пры дарозе, паблізу сяльца. І тады ўсё памянялася ў яго. Гаспадарка наладзілася, і дзеці перасталі паміраць, адным словам, стала зноў шанцаваць... А той камень і цяпер там ляжыць. Толькі зусім пачарнеў, як вёску спалілі і сорак чалавек людзей забілі. З году ў год ён усё чарнее і чарнее. І калі глянуць на яго, то ён зусім ужо і не сіні.

— Во якая гісторыя з тым каменем была! — з

жальбою ў голасе прамовіла бабка Ліда і нечакана перакінула гаворку на іншае: — А ці любіце вы грыбочкі збіраць? У нас іх цяпер хоць касою касі!

Я не паспеў адказаць. Перад намі, быццам з зямлі, вырас дзед Сашко. Ен трымаў за почапку Кветку, а выгляд меў разгублены.

— Мамка! — сказаў ён жонцы.— З Кветкаю штойта нядобра. Ці не гадзючка яе куснула часам? Зрабі ёй! — нібы загадаў дзед Сашко і перадаў почапку ў жончыны рукі.— Мо адыдзе.

— Хіба што! — сур'ёзна прамовіла бабка Ліда, наблізілася да Кветкі і стала нешта шаптаць ёй на вуха. Я здагадаўся: бабка робіць замову! Ад змяінага ўкусу.

— На моры-акіяне,— строга і не баючыся, што я ўчую, казала бабка Ліда,— на востраве Буяне стаіць куст. У тым кусце ляжыць змей Хава. Хава-Хавіца, прыкажы сваім слугам, штоб не ўрадзілі карове пярэстай, зваць Кветка. Бо я вас не пушчу ні ў белыя бярэзіны, ні ў гнілыя калоды, а выведу вас на біты гасцінец. Там людзі будуць хадзіці, ездзіці канямі, таптаці вас нагамі. Мне святы Мікалай прыказаў, каб вашага яду нігдзе не пускала... На моры-акіяне, на востраве Буяне...

Кветка крутнула галавою, ледзь не вырвала з бабчыных рук почапку і скубанула трошкі ўсохлай ужо травы. Гаспадыня загадала:

— Сашко! Цяпер павадзі яе. У лажок схадзіце, на траўку мякенькую.

Дзед пераняў почапку і павёў Кветку. Пад бярэзінамі засталіся мы ўдваіх. Бабка Ліда была ўзрушана. Ей не сядзелася на падмурку — усё пазірала ў той бок, дзе зніклі дзед Сашко і Кветка. Я разумеў яе трывогу, гэты спрадвечны клопат сялянкі.

— Рыгораўна! Дайце кошык. У грыбы збегаю! — сказаў я.

У яе вачах з'явіліся адначасова і радасць, і недавер:

— А не згубіцеся? Лес у нас ве-елькі. Есць нават і старадрэўны.

Бабка Ліда паднялася і, пасабляючы сабе кіёчкам, пайшла ў двор. Вярнулася з ракітавым кошыкам і папрасіла:

— Далёка не ідзіце. Тут, за помнікам, у маладнячку пакруціцеся. Мо што і вытапчаце.

Нейкая сотня метраў хады, і я быў у лесе. Калісьці тут стаяў стары сасновы бор. Але яго высеклі, карчы выдралі, а ўзвышша зноў лесам засадзілі. Гадоў трыццаць яму будзе, не болей. Сасонкі стаяць радамі, а між іх пракідаюцца іншы раз то ядлаўцовы кусцік, то бярэзінка з дубам, то асінка. У тым мяшаным маладняку, на ўзвышшы, я і пачаў таптацца. Аднак выхадзіць нічога не ўдалося. Спусціўся трошкі ніжэй, як бы ў лажок, дзе болей было і прасторы, і сонца, і спыніўся. То там, то тут стаялі баравічкі, паблісквaючы карычневымі галоўкамі. Яны былі не вялікія — самы раз браць. Зрабіў крокаў дзесяць управа — і там тое ж: куды ні ступі — грыбы, грыбы. Яны то па аднаму стаялі, то парамі, то цэлымі сямейкамі. Такога, прызнацца, даўно не бачыў. Радуюся баравічкам, як жывым істотам, і не чапаю, іду далей. Там, дзе раскінуўся аксамітны дыван моху, грыбоў яшчэ болей. Яны павысоўвалі галоўкі і выгравaюцца на сонцы. Сапраўды, нібы хто насеяў іх тут! Не вытрымліваю спакусы і дастаю сцізорык.

Не прайшло і паўгадзіны, як быў ужо дома.

— О, вы добры грыбовік! — не ўтрымалася бабка Ліда.— Гэтулькі назбіралі!

Яна прыняла кошык і тут жа, на лавачцы пры хаце, стала перабіраць грыбы. Брала з каша асцярожна, каб не папсаваць, выцірала сухой анучкай, падчышчала карэньчыкі ды не пераставала хваліць:

— Такія баравічкі! Такія баравічкі!.. Відно, што і вы пры лесе гадаваліся. У мяне печ знойка натоплена — за ноч высахнуць.

Дзед Сашко, які дагэтуль сядзеў на ганку і смаліў сваю нязменную цыгарку, не вытрымаў, узяў з каша загарэлага баравіка, нюхнуў пару разоў, сказаў:

— Колісь і я неблагім грыбовікам быў. І яна, Лідка,— таксама. А дзісь? Я — сляпы стаў, яна — скульгавела. Пры хаце толькі і тупаем.

Дзед паклаў у кош баравік і вярнуўся на сваё месца.

— У мяне друг быў, можна сказаць, нават родзіч,— казаў ён далей.— Міхасём Васільком зваўся. А прозвішча ў яго было — Касцевіч. З Баброўні ён. Дык таксама грыбовікам добрым слыў. Іншы раз і баравікоў тых у лесе як кот наплакаў, а назбірае. Часта ў мой абход забягаў. Бывала, ідзеш і раптам угледзіш: сядзіць Васілёк пад бярэзінкай, каля ног — кош з грыбамі, а сам запісвае нешта ў паперку. Запытаеш: а што гэта, браток, малюеш? От, кажа, некалі нешта мо і выйдзе! Як цяпер разумею, ён вершыкі гэтак складаў. Я некалі пару вершыкаў Васілька нават назубок ведаў. А цяпер — забі, а не ўспомню. Галава дзіравай зрабілася, памяць не таею стала.

Па той бок бярэзін, каля помніка, як бы ўспыхнулі старыя сосны. Быццам полымем іх абдало — так гарэлі і камні, і верхавіны.

— Такое з імі робіцца заўсёды,— чую голас дзеда Сашка,— і калі ўзыходзіць сонца, і калі заходзіць.

Нечакана заўважаю: на крайняй сасне буслянка! Пытаюся, ці даўно пасяліліся птахі, але дзед Сашко маўчыць. Замест яго адказвае бабка Ліда:

— Буслы жылі ў Полымі да вайны, у тым канцы, на альховіне. А пасля вайны мы хацелі зноў іх развесці. Сказалі Мішку, сыну нашаму: пасоб ім! Палез на тую старадрэвіну, спілаваў верхавіну, зацягнуў туды веласіпеднае кола, кінуў трошкі галля, і мы пачалі ждаць. Ждом, ждом і, нарэшце, даждаліся. Аднойчы ўвесну прыляцеў бусел, стаў на тое кола і так заклекатаў, так заклекатаў... А потым узяўся насіць сучча, будавацца пачаў. Мы ўзрадаваліся. Але тут, як на той грэх, бяда навалілася на бусла. З Вострава прыляцеў другі бусел і стаў біць нашага, скідаць ламачча, якое той нанасіў быў. Наш не здаваўся, назаўтра зноў прымаўся за работу. Але з'яўляўся

той бандзюга, і пачыналася ўсё спачатку. Ваявалі да самай восені.

— Да восені! — паправіў жонку дзед Сашко.— Каб хоць! Паверце: чатыры гады вайна тая ішла. Чатыры гады! На пяты наш буслік ужо не прыляцеў да нас. А шкада. Кажуць, там, дзе буслы...

З печы ідзе прыемны грыбны пах. Сапраўды, бабка Ліда «знойка» напаліла печ, калі да вечара захавалася ў ёй неабходнае цяпло.

Сядзім за сталом, пры святле лямпы-васьмілінейкі і вячэраем. Сыр, масла, малако, сопкая бульба... Руплівыя рукі гаспадыні. Разважлівы голас гаспадара. Як напамінае ўсё гэта матчыну хату!

Для дзеда Сашка́ сёння даволі тлумны дзень, але ён не здаецца, як найболей хоча расказаць пра родны кут. Аказваецца, у Полымі цяпер толькі тры чалавекі і жыве. Ён з бабкай Лідай ды Шурка. Тамара, жонка нябожчыка брата Ляксея, некуды з'ехала — да сына ці дачок,— ён добра і не ведае. Праўда, зрэдку прыязджаюць у Полымя яе дзеці, сын Шуркі, іхнія дзеці — Галя і Міша. Але каб часта, то не скажаш. Бо дзе ім наездзіцца! Кожны пры справе. Галя сакратаром сельсавета ў Скідалі, Міша — заатэхнікам у няблізкім саўгасе. Улетку не тое. Улетку тут весялей. І дзеці часцей бываюць, і ўнукі. Каб трошкі іначай да Полымя адносіліся, то, пэўна, нехта б не паехаў блізкі свет, нехта б і застаўся. Тады мо і дабіліся б маладыя і тае электрыкі, і таго радзіва. А так...

Дзед Сашко нібы скідае з сябе груз нялёгкіх разваг і кажа:

— А каб вы паўзіраліся, якія вакол Полымя краявіды, якая Котра! Яшчэ пасля вайны доўгі час па ёй лес у Нёман сплаўлялі. І рыбная, скажу вам, рака. Цяпер баброў развялося — плойма. Загацілі ўсё рэчышча. Мудры звер! Плаціны будуе на рачулках, што ў Котру ўпадаюць, азярыны робіць. А выдра!..

— Ты лепш пра Святое балота раскажы,— перабівае яго бабка Ліда.

— Яно цяпер не Святым, а Светлым завецца,— удакладняе дзед.— Ад Полымя кіламетраў тры да яго. Балота як балота. Толькі дужа велькае: вёрст дваццаць удаўжкі і за чатыры — ушыркі. Рос некалі там толькі карлаваты сасняк ды лазняк. Былі, праўда, астраўкі, дзе і харошы стаяў лес. Асабліва вока цешылі Курылаў Груд і Круглае. А наўкол — балота, балота. У вайну там парцізаны базіраваліся. Я з імі павязаны быў, сёе-тое ведаю. Нават плашчадку ў тым месцы зрабілі, самалёты садзіліся, раненых бралі, зброю прывозілі. Цяпер Святое балота асушылі. Торф выбралі амаль усюды, а пасадзіць лес не ўдалося. Нічога не расце. Сіняк, а не зямля! Думалі, поле будзе — таксама не ўгадалі. Я цяпер іншы раз задаю пытанне сабе: навошта было рабіць тое — глуміць лес, выскрабаць тарфянішчы. Усё роўна зямлю па-людску не скарысталі! А так хоць якая ды карысць ад балота таго была б...

Васьмілінейка пачала чадзіць.

— Газа канчаецца,— ціха прамовіла гаспадыня.

Гэта было як бы сігналам канчаць гамонку, ісці класціся.

Перайшлі ў пярэднюю. Бабка Ліда паслала мне на ложку, што пры самым акне, сказала «Дабранач» і знікла за шафай, якая падзяляла пакой на дзве палавіны.

Не спалася. За акном, над трыма бярэзінамі, хадзіў малады месяц. На шыбіну падаў цень ад грушы-дзічкі, што стаяла каля самага плоту, насупраць акна, голая, без адзінага лісціка. Гэты цень быў нібы жывы. Праз хвілін колькі ён перайшоў да мяне на падушку і стаіўся, усё адно як заснуў.

Ціхутка рыпнулі дзверы, з кухні ў пакой зданню прасунуўся белы кот. Ён прайшоўся да грубкі, мякка ступаючы па падлозе, пастаяў, хацеў, відаць, ускочыць на яе, але раздумаў і накіраваўся да майго ложка. Імгненне, і кот ужо на пасцелі. Асцярожна наблізіўся да процілеглага краю. Вось ён ужо на

падваконніку. Пацёрся ілбом аб шыбіну, прысеў і стаў пазіраць, што робіцца там, за акном, пад тым маладым месяцам. Цяпер ужо і яго цень ляжаў у мяне на падушцы. Я хацеў быў прагнаць ката, але раздумаў — няхай сядзіць сабе!..

Чутно было,.як, божкаючы, варочалася на сваім ложку бабка Ліда. Што яе трывожыла? Ці бяда, якая так недарэчна напаткала яе сына Аркадзя, пра якога яна ні слова не сказала праз увесь дзень, ці што іншае — невядома. Спрасоння стагнаў дзед Сашко. Ціха, як дзіця. Яму, відаць, балела нешта. А мо яго душа білася ў несціханай трывозе за дзень заўтрашні? Хто ведае.

Я рашыў тады: раніцою падамся ў Галавачы, у праўленне калгаса «Перамога», што не на апошнім рахунку ў Гродзенскім раёне, адшукаю начальства і скажу: перадайце таму Дзячэні, каб адрокся ад улюбёнага «Не паложана!», каб і да чужой бяды адносіўся чула. Інакш можа здарыцца непапраўнае: згубім тое, што ўжо ніколі не вяртаецца.



## ЧУЖОЙ БЯДЫ НЕ БЫВАЕ

*На кратэры заснулага вулкана*
*Брагінскі метэарыт ● Танк з сорак трэцяга*
*Трагедыя ў суседнім Чарнобылі ● Цаною жыцця*
*Усенародны боль*

Перш чым зрабіць падарожжа ў самы паўднёвы пункт Беларусі — вёску Ніжнія Жары, што на Брагіншчыне, варта прыгадаць некаторыя факты. Вось, напрыклад, такое. У VIII—VI стагоддзях да нашай эры тутэйшыя людзі ўжо ведалі жалеза... Гэтую тэрыторыю засялялі дрыгавічы... У Брагіне перасякаўся вялікі водны шлях з «варагаў у грэкі»... Сам Брагін — равеснік Масквы. Першае ўпамінанне аб ім у пісьмовых крыніцах датуецца таксама 1147 годам... Тут, у Брагіне, пры двары князя Вішнявецкага, самазванец у 1604 годзе аб'явіў сябе царэвічам Дзмітрыем I...

Дарэчы, пра сам Брагін. У свой час Беларускае тэлеграфнае агенцтва распаўсюдзіла для друку цікавую інфармацыю. У ёй паведамлялася пра колішняе Палескай зямлі, у прыватнасці — Брагіншчыны. Інфармацыя пачыналася так: «На пытанне «Дзе жывеш?» жыхары Лоева, Брагіна маглі б адказаць: на вулкане. І мелі б рацыю.

Вучоныя Інстытута геахіміі і геафізікі АН БССР на глыбіні 900 метраў знайшлі тут рэшткі некалі распаленых вулканічных бомбаў, даказаўшы, што гэтыя гарады стаяць на кратэрах заснулых вулканаў.

Аказалася, што там, дзе на карце сёння Прыпяцкая ўпадзіна, у дэвонскі перыяд было мора. На яго дне адбываліся вывяржэнні. Пазней паявіліся наземныя вулканы. Яны паводзілі сябе спакайней. Але там, дзе цяпер Пінск і Лунінец, адбываліся падзеі, якіх, як пісалася ў старадаўніх летапісах, «ужасощася вси людье» — вогнедышныя горы выкідвалі фантаны вады, газу, попелу. У раёне Глуска і Бабруйска можна і сёння знайсці «маладыя» вулканіты, у якіх добра відаць укропванні вулканічнага шкла.

Пра назву мястэчка існуе легенда. Два браты, блукаючы па тваністых тутэйшых балотах, трапілі аднойчы ў бяду: аднаго з іх пачала засмоктваць дрыгва, другі, замест таго, каб кінуцца ратаваць,— толькі стаяў ды глядзеў, як той тоне. А потым увогуле махнуў рукою: «Эх, брат, гінь!..» Адсюль і назва балота пайшла — Брагін, а пазней і паселішча, што ўзнікла тут.

Брагін вядомы ўсяму свету. І вось з якой нагоды. Яго імя нададзена метэарыту, які некалі знойдзены паблізу. Вучоныя мяркуюць: на Брагіншчыне выпаў вялікі метэарытны дождж. Ён ахапіў тэрыторыю ў дваццаць два кіламетры даўжынёю і чатыры — шырынёю. Першыя «кроплі» таго дажджу былі знойдзены яшчэ ў 1807—1809 гадах. Усяго тых знаходак трынаццаць. Вага асобных дасягае сямідзесяці кілаграмаў, а ўсіх знойдзеных тут метэарытаў — 857,6 кілаграма.

Мне ўдалося ў гэтым падарожжы сустрэцца з чалавекам, які аднойчы знайшоў «кроплю» з таго метэарытнага дажджу. Прозвішча яго — Федасенка, зваць — Мікалай Клімавіч, працуе трактарыстам. Яшчэ зусім нядаўна жыў у Асінніку, што ўпрытык да Людзвінава. Але з гэтых вёсак людзей павысялялі,

і Мікалай Федасенка асталяваўся цяпер у Красным — цэнтры саўгаса «Краснае».

Мы сядзім у цесным пакойчыку, дзе яшчэ усё, як на вакзале, ці скідана, як схопленае з пажару. З мэблі — толькі пару табурэтак ды стол. Гаспадар просіць не зважаць на нязручнасці (нібы ў гэтым яго віна), а тады пачынае:

— Было тое вясною 1968 года,— кажа ён.— У адну з нядзель выпала нам чарада пасвіць кароў. У нашым Асінніку хат чатырнаццаць было тады, а кароў і таго меней — дванаццаць ці што... Пагнаў я каровы. За мною ўвязаліся дзеці — сын Міколка і дачка Анюта. Яны ўжо ў школу хадзілі. Ну, значыць, прыгналі чараду ва ўрочышча Дзянісава. Каровы ходзяць сабе па балоцейку, а мы паселі ўскрай жыта і пільнуем, каб каторая ў шкоду не ўбілася. Сонейка, помню, прыгравала, жаваранкі спявалі. Раптам Анюта, дачка, скардзіцца: «Цвёрдая нешта купіна трапілася!..» Правёў рукою, і, праўда, намацаў у купіне камень. Вывернуў з зямлі, а ён — з валейбольны мячык, але плескаваценькі. Ды падалося мне, што зацяжкі на памеры свае. Думаю: ці не ён? Пра нашы метэарыты не раз чуў, яшчэ калі сам у школу бегаў. Стаў калупаць, нажом шкрэбаць. Бачу: каменьчыкі шкляныя пасыпаліся. Ого, думаю, так і ёсць — Ён! Мы забралі знаходку дадому. А прыехаў з Мінска пагасцяваць мой дваюрадны брат Мікалай Касцючэнка, Анюта першая пахвалілася метэарытам. Адбілі тады ад яго кавалачак, і Мікалай павёз у сталіцу паказаць вучоным людзям. Не прайшло і пару дзён — з'явіліся тыя і забралі наш камень. А потым папера прыйшла. У ёй вучоныя паведамлялі, што мы знайшлі адзін з Брагінскіх метэарытаў. Трошкі пазней зноў прыехалі з Мінска, яшчэ паперу прывезлі, дзе гаварылася, што за тую знаходку нам паложана ўзнагарода — сто рублёў. З гэтых грошай вучоныя купілі Анюце пазалочаны гадзіннічак, на якім было выгравіравана: «За знаходку метэарыта ў 1968 годзе», астатнія аддалі мне. Я падумаў, падумаў, далажыў сваіх і набыў сыну,

Міколку, баян. Хай, думаю, на памяць хлопцу будзе! Хай, думаю, музыцы вучыцца! І праўда, навучыўся-такі сын іграць на баяне. Нават, скажу, добра іграе...

У пакойчык зазірнула Марыя Карпаўна, жонка гаспадара, паслухала, пра што мы гаворым, і звярнулася да мужа:

— А ці казаў, як да цябе Сяргей Цеслянок прыбягаў?

— Ага! — нібы спахапіўся Мікалай Клімавіч.— Пра нас загаварылі, да нас пасля гэтага сталі звяртацца, камяні розныя прыносіць. А я зірну і адразу вызначу. Я ўродзе ўжо як спецыяліст! — смяецца Федасенка і дадае: — Праўда, усіх даводзілася расчароўваць. А прыбег гадоў пару таму Сяргей Цеслянок...

Мікалай Федасенка зрабіў паузу, нібы абдумваў, як лепей перадаць той эпізод. Але толькі ўсміхнуўся і працягваў:

— Прыбег, значыць, Сяргей Цеслянок і кажа: «Знайшоў падазроны камень». «Дзе?» — пытаюся. «Ва ўрочышчы Чыстаброўскае,— адказвае.— За якіх паўкіламетра ад таго месца, дзе ты падняў. Камень не вялікі, але цяжкі дужа. Стукнуў малатком — заблішчэў метал». «А як ты яго знайшоў?» — цікаўлюся. «Рабіў культывацыю ўчастка пад грэчку і чую: зачапіў за нешта...» Поле там чыстае. Які, думаю, дзівак туды камяні насіць будзе? А калі зірнуў на Сяргееву знаходку, адразу сказаў: метэарыт! Даў адрас. Цеслянок таксама адбіў некалькі кавалачкаў і паслаў у Мінск. Неўзабаве прыехалі і да яго і забралі знаходку. Яна была трошкі большая за нашу — важыла дваццаць чатыры кілаграмы сто грамаў.

— От! — зноў не ўтрымалася Марыя Карпаўна.— Бяда ў нас з гэтымі камянямі нябеснымі. За суседняй Капоранкай іх, напэўна, нямала ў зямлі ляжыць! Бо туды штогод вельмі перуны цаляюць, а маланкі жахаюць — адзін страх. Часта каровак забівае ці якую іншую жывёлу. А, бывае, і ў чалавека патрапіць.

— Цяпер не будзе! — прамовіў Мікалай Клімавіч.— Капоранка, як і наш Асіннік з Людзвінавам, у зону трапіла...

— А мо абыдзецца? — сказаў я.— Мо пройдзе які час, і людзі вернуцца на свае сялібы?

У адказ Федасенка толькі пацiснуў плячыма.

Я быў у той зоне, пра якую казаў Федасенка. Быў і ў Людзвінаве, і ў Капоранцы. Але не сустрэў там ні душы. У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі людзей выселілі адтуль.

З нейкім дакорам пазіраюць на цябе хаты. Ад лёгкага павеву ветру рыпнулі веснічкі ў адным з двароў. Выскачыў аднекуль чорны кот, бліснуў здзічэлымі вачыма і знік за плотам у высокім чарнабыльніку. Вакол Капоранкі бульдозерам сашкрэблі верхні пласт глебы і вывезлі некуды — на «могілкі зямлі». Балюча білася думка: а то ж, каб утварыўся слой глебы ў дваццаць пяць сантыметраў, трэба чакаць ад трох да дзесяці тысяч гадоў! Хацелася выліць гэты боль хоць каму, ды адна толькі мёртвая цішыня была над вёскай...

Быў я і там, дзе Федасенка з дзецьмі знайшоў некалі метэарыт. Паблізу таго месца расце дзічка. Быў і за Капоранкай, там, дзе перуны забівалі некалі свойскую жывёлу, прыносячы няшчасце селяніну. Але суседзі ніколі не пакідалі чалавека ў бядзе. Вёска «скідвалася», і ён набываў сабе новую карову ці воліка. У наш час з бяды выручала дзяржава — выплочвала страхоўку... Пазіраў на роўную, як стол, зямлю, на якой ні ўзвышэння, ні дрэва, што магло б навальнічныя разрады прыцягваць, і недзе ў падсвядомасці пагаджаўся з Марыяй Карпаўнай: тое месца, відаць, сапраўды «нашпігавана» метэарытамі. Альбо там, глыбока ў зямлі, знаходзіцца самая буйная «кропля» — асноўная яго маса. Яшчэ думалася пра людзей, якія зусім нядаўна жылі тут і якія ніколі не кідалі ў бядзе суседа, заўсёды лічылі: няшчасця чужога не бывае...

...Анатоль Бельчанка нарадзіўся ў суседняй вёсачцы Галубоўка. Закончыў школу, адслужыў у арміі і вучыўся ў Чарнігаўскім кааператыўным тэхнікуме. Канікулы праводзіў дома: звычайна ў час жніва працаваў шафёрам у саўгасе «Краснае».

У той ліпеньскі дзень Анатоль таксама сядзеў за баранкай грузавіка. Робячы чарговы рэйс да камбайна (ён адвозіў на ток збожжа), хлопец заўважыў: уборачны агрэгат стаіць, а вакол яго палыхае агонь — гарыць збожжа. Спатрэбілася ўсяго імгненне, каб ацаніць становішча. Аказалася, што высакавольтны провад абвіс і зачапіўся за выхлапную трубу камбайна. Анатоль доўга не думаў — вырашыў адчапіць провад, адштурхнуць яго, пасля чаго той ужо сам праскочыў бы над капніцелем. І тады па-за небяспекай быў бы і камбайн, і вырашчаны хлеб.

А зрабіць такое было нялёгка. Высакавольтны провад — тоўсты, цяжкі трос. Там, дзе ён датыкаўся да трубы, нібы ад электразваркі, быў распырсканы метал. Відаць, рубільнік падстанцыі выбіла аўтаматычна. Але ў любую хвіліну ён мог уключыцца зноў... Анатоль рызыкнуў.

Пасыпаліся іскры...

Бельчанка загінуў, але адвёў бяду. Цаною свайго жыцця.

У Ілчанскай школе, дзе вучыўся Анатоль, са спецыяльнага стэнда пазірае добрымі вачыма хлопец у белай сарочцы. Пад тым партрэтам — радкі:

Чтоб стать мужчиной —
Мало им родиться,
Чтоб стать железом —
Мало быть рудой:
Ты должен переплавиться,
Разбиться
И, как руда,
Пожертвовать собой.
Готовность к смерти —
Тоже ведь оружие.
И ты его однажды примени...

Мужчины умирают,
Если нужно,
И потому живут
В веках они.

...У дні Вялікай Айчыннай вайны лінію абароны на Дняпры гітлераўская прапаганда аб'явіла «непрыступным усходнім валам». У сорак трэцім нямецкая армія тут перайшла да стратэгічнай абароны. А па гэты бераг Дняпра беларускі народ знаходзіўся ў жудасных умовах фашысцкай акупацыі. Людзей расстрэльвалі, вешалі, палілі жывымі, знішчалі цэлымі паселішчамі, вывозілі ў рабства ў Нямеччыну. Савецкае камандаванне імкнулася як мага хутчэй вызваліць наш народ ад нечувалай бяды. Трэба было зламаць супраціўленне ворага, прарваць «непрыступны ўсходні вал». І гэта было зроблена восенню сорак трэцяга. У баях за Днепр вызначыліся многія савецкія воіны, якія пакрылі сябе неўміручай славай. За мужнасць і гераізм, праяўленыя пры фарсіраванні Дняпра ў межах Брагінскага раёна, 362 воінам Чырвонай Арміі было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Паблізу вёскі Жэрднае, на месцы, дзе раней было непраходнае балота, некалькі гадоў таму назад з сяміметровай глыбіні дасталі абломкі самалёта-знішчальніка «Ла-5». Пасля доўгіх пошукаў стала вядома наступнае: у кастрычніку сорак трэцяга, калі ішлі бai за вызваленне Брагіншчыны, некалькі нашых самалётаў-знішчальнікаў суправаджалі штурмавікоў, якія ішлі на нямецкія пазіцыі за Дняпром. У сутычцы з варожымі знішчальнікамі «Ла-5» быў збіты. Яго экіпаж — малодшыя лейтэнанты Георгій Чарствоў і Васіль Ведзянееў — загінулі.

У ваколіцах вёскі Жылічы нядаўна паднялі з балоцістай затокі танк «Т-34» ...У тым жа сорак трэцім тут ішлі жорсткія бai. Пераправіўшыся праз Днепр і прайшоўшы ўсяго якіх пяцьдзесят метраў, баявая машына з роты Хлістунова 2-га батальёна 68-й асобнай танкавай брыгады правалілася ў старое

рэчышча... Амаль сорак гадоў знаходзіўся танк у багне. Машыну дасталі, прывялі ў належны стан і ўстанавілі на п'едэстал на цэнтральнай плошчы Брагіна ў пярэдадзень 39-й гадавіны вызвалення Беларусі.

Варта сказаць колькі слоў пра герояў-землякоў — Сяргея Сцяпанавіча Мацапуру і Паўла Іванавіча Шпетнага. Абодва яны родам з вёскі Гдзень, што паблізу Ніжніх Жароў. Абодва з першых дзён вайны на фронце... Сяргей Мацапура — старшына, механік-вадзіцель танка «Т-34» — 18 студзеня сорак пятага на баявой машыне ўварваўся ў горад Сахачаў, знішчыў варожую гармату, дзесяць мінамётаў і кулямёт, шаснаццаць аўтамашын. Праз чатыры дні ў горадзе Інаўроцлаў пры захопе чыгуначнай станцыі і аэрадрома праціўніка знішчыў тры самалёты, цягнік, пятнаццаць аўтамашын, нямала гітлераўцаў. Павел Шпетны — камандзір узвода бранябойшчыкаў — у дні Курскай бітвы знішчыў шэсць варожых танкаў. Калі скончыліся боепрыпасы, з процітанкавымі гранатамі кінуўся пад варожы танк і цаною жыцця сарваў атаку праціўніка... Абодвум прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Ехаў у Ніжнія Жары, а са скрыжаванняў дарог, з абочын, з пераездаў-пераходаў, з вуліц вёсак, што стаялі ўпрытык да шасейкі, білі ў вочы трывожнай фарбай шыльды, шыльдачкі, указальнікі, шчыткі-папераджальнікі: «Выезд на абочыну забаронены!», «Стой! Праезд і праход забаронены!», «Забароненая зона!».

Варта было прыпыніцца ці збочыць з асфальту, як адразу чуліся словы тых, далёкіх, ваенных гадоў: КПП, пропуск, эвакуацыя, перасяленцы... Як балюча было ўспрымаць усё гэта! Колькі часу мінула пасля чарнобыльскай трагедыі, а людзі ўсё яшчэ жылі наструненым жыццём. Але, нягледзячы на экстрэмальныя ўмовы, усе службы працавалі дакладна, выконвалі свае абавязкі бездакорна — усё рабілася

для таго, каб хутчэй нармалізаваць становішча, адвесці бяду, паставіць жыццё ў звыклую каляіну.

У Ніжніх Жарах па-ранейшаму людзі жывуць і працуюць. Бяда абышла вёску. Аднак нікога не пакідае трывога: а як там, у суседзяў? Як уладкаваліся перасяленцы? Якія створаны для іх умовы? З раёна ж эвакуіравалі тысячы чалавек. Выселены дзесяткі вёсак. Дзесяць лепшых, эканамічна моцных гаспадарак ліквідаваны. Трывожыла і такое: а што цяпер у так званых зонах адчужэння, куды невядома калі ступіць нага чалавека, невядома якое пакаленне на тых землях пачне звыклую сялянскую працу — будзе араць, сеяць, жаць?..

Так, Ніжнім Жарам пашанцавала. Хоць яны знаходзяцца на самым беразе Кіеўскага вадасховішча (калі браць напрасткі, праз Гдзень, то і Чарнобыльская АЭС — рукою падаць), але тут можна і па лесе хадзіць, і пасядзець пры дарозе, і папіць з калодзежа.

Сама вёска мае недзе за сто дваццаць двароў, не меней і вуліц, вулачак, перавулкаў ды розных завулкаў. Справа ў тым, што зямля ў гэтых мясцінах пясчаная, на пясках стаяць камлюкаватыя сосны, і толькі сям-там, між соснаў і дзюнаў, ляжаць прагаліны больш-менш прыдатнай для карыстання зямлі. Вось на іх і сяліліся здаўна людзі. Хату з прыбудовамі і калодзежам абносілі лазовым тынам. Такія плеценыя платы захаваліся і да нашых дзён.

Цяпер будуюцца інакш — на шырокую нагу. Калі хата — дык ужо хата, калі хлеў — дык з усімі зручнасцямі. А вакол дварышча — не лазовая плеценка-плот, а спраўненькі штыкетнік і абавязкова пафарбаваны ў прыветны колер. Аднак і новыя сялібы выглядаюць астраўкамі сярод пяску і соснаў. Гэтыя «астраўкі» злучаюцца адзін з адным і ўтвараецца складаная сетка вуліц-пераходаў. Нават маючы дакладны адрас, чалавеку няпроста адшукаць патрэбную хату ў гэтым незвычайным лабірынце. Але куды б ні ішоў, абавязкова трапіш на бераг вадасховішча. Якія там маляўнічыя краявіды! Якая

прастора вады! Дзіва што ў Ніжнія Жары, як толькі ўсталёўвалася цёплае надвор'е, прыязджала шмат адпачываючых — з Кіева, Ленінграда, Прыбалтыкі, Гомеля, Чарнобыля, іншых гарадоў. Прыязджалі на ўласных машынах, рэйсавымі аўтобусамі, маторкамі. А ў пятніцу звычайна сюды па тры-чатыры цеплаходы прыходзіла — прывозілі тысячы паўтары аматараў прыроды. Хто ў ягады ішоў, хто ў грыбы, хто бавіў час на беразе з вудамі. А вечарам збіралася моладзь у тутэйшым клубе ці на палубах цеплаходаў.

— Ой, у нас заўсёды гарно було! — з маладым запалам казала мне Наташа Насянок, брыгадзір тутэйшай брыгады.— А трапілі б сюды ў час сенакосу! За Дняпром — лугі-лугі!.. Сабяру сваіх жанчын з усяго сяла, граблі возьмем, у лодкі пасядзем і — туды. Лодкі ў нас вялікія, з маторамі... А вяртаемся ўвечары — здаецца, над усім светам песні нашы лунаюць. Усё болей народныя спяваем — беларускія, украінскія, рускія...

Наташа змаўкае.

— Але ў гэто лецейка,— праз нейкую хвіліну задуменна дадае яна,— не да таго було...

Я разумею Наташу.

У тую красавіцкую суботу Іван Тарасавіч і Таццяна Пятроўна, жыхары вёскі Спярыжжа, што на беразе Брагінкі, чакалі прыезду сына. Васіль працаваў у горадзе энергетыкаў — Прыпяці — пажарнікам. Ён абяцаў дапамагчы бацькам пасадзіць бульбу, а нешта бавіўся. Бульбу пасадзілі самі. А ў абед забег сусед і паведаміў, што ноччу на Чарнобыльскай атамнай быў пажар. Трывога пасялілася ў сям'і Ігнаценкаў.

Трошкі пазней пра тыя падзеі Брагінская райгазета «Маяк Палесся» пісала:

«Дазвол на два выхадныя старшы сяржант Ігнаценка атрымаў за паўгадзіны да сігнала трывогі, за тры гадзіны да канца дзяжурства.

...Асабовы састаў пажарнай часці заняў месца на пажарных машынах. Не ведаў Васіль Іванавіч, што едзе тушыць апошні ў жыцці пажар.

...Полымя — куродымнае ў вышыні і жоўтае знізу — асвятляла ўсю станцыю і недалёкую паўнаводную Прыпяць. Баявы разлік — іх спачатку было 28 чалавек,— кінуўся ў самае пекла. Першым на 70-метровую вышыню са ствалом пажарнага рукава ўзняўся камандзір аддзялення Ігнаценка, яго падначаленыя і таварышы па службе.

...Іх было вельмі мала, і не было дарогі назад, не было іншага выйсця, як толькі перамагчы. Васіль паспяваў у самыя небяспечныя месцы, на дапамогу таварышам. Пасля жорсткай і смяротнай сутычкі з агнём яны раскажуць, як Ігнаценка прабіў шлях сяржанту Уладзіміру Цішуры, які задыхаўся ад з'едлівага дыму, як вынес да лесвіцы непрытомных старшага сяржанта Мікалая Ціцянка і сяржанта Мікалая Вашчука.

...Было зроблена галоўнае — збіта полымя, выратавана станцыя, пакладзены важнейшы пачатак барацьбы з аварыяй.

...Калі бацька пракладваў першую баразну, сына і яго таварышаў везлі ў Маскву.

...Ужо ў Маскоўскай клініцы 28 красавіка Іван Тарасавіч спытае ў сына:

— Хіба нельга было паасцерагчыся?

— Нельга, тата, інакш не перамаглі б,— адказаў сын.

...А з Людмілай Іванаўнай — старэйшай сястрою Васіля — у гэты самы час гутарыў у ардынатарскай прафесар Аляксандр Іванавіч Баранаў.

— Патрэбна перасадка касцявога мозгу,— сказаў прафесар.

— Я гатова даць яго.

— Кім працуеце?

— На «хуткай дапамозе» ў Брагіне. Фельчарам.

— Тады разумею вас, калега.

...Васіль ляжаў у асобнай палаце. Яго цікавілі справы сяброў.

— Як там Віктар? — спытаў ён медсястру пра лейтэнанта Кібянка, з якім яны апошнімі спусціліся з даху рэактара ў тую трагічную ноч.

— Нармальна,— сказала сястра.

Хворы не павінен быў ведаць, што лейтэнанта Віктара Мікалаевіча Кібянка ўжо няма ў жывых».

13 мая не стала і Васіля Ігнаценкі.

На Міцінскіх могілках Масквы Васілёва магіла — чацвёртая ў новым радзе. Да яго пахавання тут ужо тройчы гучаў развітальны салют над прахам герояў, якія першымі пайшлі ў агонь...

Газета «Правда» ад 9 чэрвеня 1986 года пісала: «Яны загінулі маладымі, але паспелі здзейсніць самае вялікае, што людзі могуць зрабіць для людзей,— абаранілі жыццё».

Так. Абаранілі жыццё. Цаною жыцця.

З паведамлення ў прэс-цэнтры Міністэрства замежных спраў СССР:

...Савецкая дзяржава поўнасцю кампенсавала матэрыяльныя страты грамадзян, якія пацярпелі пры аварыі на АЭС.

...На дапамогу людзям, якія перанеслі бяду, перададзена прыкладна 500 мільёнаў рублёў з дзяржаўнага бюджэта і каля 100 мільёнаў рублёў з фондаў сацыяльнага страхавання.

...Сельскім жыхарам кампенсаваны страты ўраджаю.

...Эвакуіраваным бясплатна даюцца дзяржаўныя кватэры і дамы. Яны атрымліваюць таксама буйныя беспрацэнтныя пазыкі тэрмінам на 15 гадоў.

...Ад савецкіх людзей паступіла ў фонд дапамогі Чарнобылю ў выглядзе добраахвотных узносаў каля 500 мільёнаў рублёў, ад замежных грамадзян і зарубежных грамадскіх арганізацый — каля 1,5 мільёна рублёў...

З выступлення старшыні Гомельскага аблвыканкома А. Грахоўскага ў газеце «Правда» ад 1 верасня 1986 года:

...Неабходныя рэсурсы вобласці былі выдзелены адразу ж пасля звяртання ў Савет Міністраў БССР... Гэта дапамагло арганізавана правесці адсяленне людзей з трыццацікіламетровай зоны, разгарнуць работы па дэзактывацыі населеных пунктаў у Брагінскім, Хойніцкім і Нараўлянскім раёнах.

...На будаўніцтва жылля для перасяленцаў выдзелена 100 мільёнаў рублёў капітальных укладанняў. На гэтыя сродкі ў паўночных раёнах вобласці ўзводзіцца 3900 жылых дамоў сядзібнага тыпу з надворнымі будынкамі.

...Вялікі аб'ём работ па добраўпарадкаванню, забеспячэнню насельніцтва артэзіянскай вадой выкананы ў вёсках, блізкіх да зоны адсялення. Тут пракладзен 261 кіламетр асфальтаваных дарог і праездаў, пабудавана 98 артэзіянскіх свідравін, устаноўлена 1520 водаразборных калонак. На 255 кіламетраў працягнуліся новыя водаправодныя сеткі.

...Сярэдні памер кампенсацыі на адну гаспадарку (маецца на ўвазе асабістую — Я. П.) склаў звыш 14 тысяч рублёў.

...Значныя расходы ў першыя дні пасля эвакуацыі ўзялі на сябе калгасы і саўгасы, прадпрыемствы і арганізацыі, каб забяспечыць дарослых і дзяцей харчаваннем, медыкаментамі, пасцельнымі рэчамі, адзежай, абуткам...

Як бачыце, кожны ўспрыняў тую бяду як сваю асабістую. Праўда, былі і такія, што змаладушнічалі, кінуліся, як кажуць, у кусты. Яны нагадваюць таго баязліўца з легенды пра Брагін. Але такіх адзінкі.

Вяртаўся з Ніжніх Жароў, а па зямлі ішло бабіна лета. Свяціла спакойнае, але, падалося, нейкае журботнае сонца. Абапал дарогі стаялі сады. Ад яблыкаў ажно згіналіся галіны. А да пладоў нават не дакраналася чалавечая рука... У прыдарожных лясах, на палянках, гарэў бруснічны россып. А яго і не чапалі ягаднікі... На схілах, пры балоцейках, струменілі крынічкі. А да іх ніхто не асмельваўся

і падысці, каб наталіць смагу... Дарослых не пакідала заклапочанасць: што будзе заўтра, за якім кіламетрам супыніцца бяда, што прынясе з сабою новы подых ветру... А вочы дзяцей? У іх бачылася заўчасная сталасць...

Каго я ні сустракаў там, на Брагіншчыне, у тыя дні, на твары кожнага бачылася вялікая заклапочанасць: як быць далей? Аднак панікі — аніякай. Усюды думалі пра лёс зямлі, пра лёс людзей, што выехалі, што засталіся тут. Яшчэ адчувалася: не ўсе ведалі галоўнае — як, па чыёй віне ці па якой іншай прычыне адбылася тая трагедыя... Карацей, слова «Чарнобыль» чулася ўсюды — у самым Брагіне, у вёсках, дзе ўдалося пабыць, у аўтобусе, якім вяртаўся дадому, у Мінск.

Я тады падумаў: божухна, на якой танюсенькай нітачцы наша Зямля! Варта каму-небудзь зрабіць неабдуманы ці неасцярожны крок, нітачка тая перарвецца, і найпрыгажэйшая планета Сусвету ператворыцца ў мёртвую камлыгу.

Гэта нават уявіць страшна!..



## ЖЫВІ, МАЯ БЯРЭЗІНА!

*Рака змагаецца за права жыць*
*І лесавод, і мастак ○ Подзвіг трынаццаці*
*У Саўскім бары ● Уцёкі Напалеона*
*Французскі лётчык ● Аўтары гімна*

У хвіліны роздуму над лёсам роднай зямлі мне чамусьці заўсёды бачыцца яна бярэзінай пры вялікай дарозе: на яе белым камлі чарнеюць паметы вякоў... І тады я клічу на дапамогу слова. Мовай матчынай замаўляю яе ад бяды. Мовай матчынай суцяшаю яе: будзем жыць! Мовай матчынай зычу ёй вечнасці...

Бярэзіна... Чалавек здаўна падружыўся з ёю. Яна давала яму і цяпло, і пітво. А колькі песень складзена пра яе дзявочую прыгажосць! А назвы? У нас дзве ракі Бярэзіны (басейнаў Дняпра і Нёмана), тры — Бярозкі, пяць — Бярозавак, адна — Бяроза. Есць два Бярозавыя возеры, два — Бярозаўскія, адно — Бярэзіна. Сёл, вёсак, мястэчак, гарадоў, найменні якіх звязаны з бярэзінай, ці бярозай (гэтыя словы — сінонімы), у Беларусі аж сто дваццаць!..

Так ужо сталася, што апошняе (на гэты раз!) падарожжа па родным краі прыйшлося на Бярэзі-

ну — раку, якая пачынаецца на Віцебшчыне і аж праз шэсцьсот трынаццаць кіламетраў (такі шлях прабягае яна) яднаецца з Дняпром.

...Ускраіна Докшыцаў. Адсюль да вытоку Бярэзіны зусім блізка. Але туды можна трапіць хіба што зімою — калі скуе марозам балотца, якое пачынаецца адразу, пры вуліцы. Шкадую: зарана прыехаў. А мо запозна?

Старыя людзі расказвалі: яшчэ пры іхняй памяці там, каля вытоку ракі, стаяла бярэзіна, а з-пад яе біла крыніца. (Бярэзіны, відаць, змянялі адна другую на працягу стагоддзяў. Ад гэтага і назва ракі пайшла.) Побач узвышалася невялікая альтанка, дзе можна было пасядзець, адпачыць з дарогі. У той крыніцы, якая бруіла і ўзімку, і ўлетку была самая чыстая і самая смачная вада ў наваколлі. Да крыніцы далучаліся іншыя, і праз якую вярсту па зямлі ўжо звівалася сіняя стужка вады. Над ёю плылі белыя аблокі, па берагах стаялі белыя бярэзіны...

Гадоў дваццаць таму назад жыхары Докшыцаў рашылі мець сваё азярцо і пабудавалі на Савецкай вуліцы, што мастком злучала берагі Бярэзіны, плаціну. Усе ўзрадаваліся: дзеці — што можна пазабаўляцца з вудаю тут, дома, моладзь — што ёсць свой пляж, пажылыя — што можна адпачыць у парку, які раскінуўся за пляжам.

Упадабалі азярцо і лебедзі. Яны прылятаюць штогод, будуюць у зарасцях чароту гняздо, выводзяць малых. Людзі аберагаюць птушак, падкармліваюць, і яны тут як свойскія. Не абыходзіцца і без кур'ёзаў. Мінулай вясной на Лебядзінае возера (так назвалі жыхары рукатворнае азярцо) птушкі прыляцелі раней звычайнага. Былі, вядома, галодныя. Аднак ніхто не здагадаўся іх пакарміць. І тады адзін лебедзь вырашыў сам пайсці да людзей. На світанку выбраўся на вуліцу Даватара і накіраваўся ў цэнтр горада. Аж да канторы дзяржбанка дайшоў!

Аднак, пра раку.

Ад плаціны, што ў Докшыцах, Бярэзіна бяжыць ужо ладнай ручаінай. Разгон бярэ адразу, ад вада-

спаду, утварае на шляху сваім то роўныя прагоны, то закруціны, то віркі з плёсамі, то зноў імкне наперад, быццам жадае хутчэй вырвацца на шырокі прасцяг. Тут яна не аднолькавая па шырыні. У іншых месцах, як кажуць, бусел пераступіць можа, а дзе-нідзе і чалавеку пераскочыць не ўдасца. Следам, то па правым беразе, то па левым, ідуць дрэвы — усё болей чорная альшына. Падчас трапляе і бярэзінка. Жыве рака!

Але ад вёскі Жураўлёва да возера Медзазол Бярэзіну як падмянілі. Яшчэ ў канцы шасцідзесятых гадоў, калі ў нас ішоў самы што ні ёсць бум выпраствання рэк, спуску рачных вод, Бярэзіну на гэтым участку ператварылі ў звычайную канаву, знішчылі ўсё, што аздабляла яе берагі.

Рака не здавалася. І тады да меліяратараў «падключыліся» торфабрыкетны завод і нафтабаза, што ў Крулеўшчыне. Яны сістэматычна, з году ў год, з месяца ў месяц, з дня ў дзень скідвалі ў Бярэзіну розны бруд. Рака пакрылася слоем смярдзючай плёнкі — мазутам. А калі раптам праходзілі дажджы, мазут прыганяла аж у возера Медзазол, праз якое праходзіла Бярэзіна. Летась, напрыклад, там плавалі не белыя лебедзі, а чорныя — ад мазуту. Загінула шмат рыбы.

Усе гэтыя гады Бярэзіна змагаецца за права на існаванне. У паводкі руйнуе штучныя берагі, робіць віркі, павароты, плёсы. І людзі радыя, што рака набывае ранейшае аблічча. Горш з мазутам. З ім яна пакуль не можа справіцца. Відны яго каляровыя скалкі і цяпер, на зазімку.

Па той бераг возера Медзазол, калі рака прыме ў свае воды ціхаплынную Поню, Бярэзіна ажывае. І ўжо зусім іншай робіцца ў межах Бярэзінскага запаведніка — яна становіцца сапраўднай лясной ракой. Там у яе ўпадае больш паўсотні невялікіх забалочаных рэчак і ручаёў.

Адпаведным чынам на стан ракі ўплывае яшчэ і Бярэзінская водная сістэма. Пабудаваная ў канцы XVIII — пачатку XIX стагоддзя, яна мела шмат шлюзаў, злучальных і абвадных каналаў агульнай

даўжынёю амаль у 170 кіламетраў. Па Бярэзінскай воднай сістэме ажыццяўлялася суднаходства, ішоў вываз будаўнічага лесу ў Рыгу. Гэты штучны водны шлях з басейна Дняпра ў басейн Заходняй Дзвіны пачынаўся на Бярэзіне пры ўпадзенні ў яе ракі Сергуч. З цягам часу ў выніку празмернай высечкі лясоў, абмялення рэк і азёраў, канкурэнцыі чыгунак сістэма страціла гаспадарчае значэнне, гідратэхнічныя збудаванні разбурыліся. Аднак яна станоўча паўплывала на захаванне перш за ўсё мясцовай фауны. Не дзіўна, што па ініцыятыве вядомага вучонага ў галіне заалогіі, паразіталогіі, паляўніцтвазнаўства і аховы прыроды Анатоля Уладзіміравіча Фядзюшына ў 1925 годзе тут, на Бярэзіне, быў створаны першы ў Савецкім Саюзе бабровы запаведнік. У 1978 годзе яму нададзены статус біясфернага. Гэта адзінае месца ў паўночнай і цэнтральнай частцы Беларусі, дзе і прыродныя раслінныя комплексы захаваліся ў амаль непарушным стане. 30 відаў раслін і 9 відаў жывёл запаведніка занесены ў Чырвоную кнігу Беларускай ССР. Бярэзінскі біясферны — буйная навукова-даследчая і прыродаахоўная ўстанова, выдатная база для стажыроўкі савецкіх і замежных спецыялістаў у галіне аховы прыроды і запаведнай справы.

Рыгор Пяцько — не навуковец, не супрацоўнік запаведніка. Жыве ён у вёсцы Рачныя. Да арміі быў лесарубам, потым завочна скончыў Полацкі лясны тэхнікум і цяпер працуе майстрам лесу ў Тумілаўскім лясніцтве. Гэты чалавек увесь свой час аддае жывёльнаму і расліннаму свету роднага краю. Асаблівую ўвагу звяртае на рэдкія і знікаючыя віды. Свае назіранні занатоўвае ў спецыяльныя сшыткі. «Мо калі каму і спатрэбяцца мае запісы»,— сціпла тлумачыць Рыгор.

А іх, запісаў, у яго сотні. Гэта — неацэнная скарбонка, якой можа пазайздросціць не адзін вучоны. Сім-тым з тае скарбніцы падзяліўся Рыгор і

са мною. Вось што запісаў я ў свой дарожны блакнот.

«За возерам Медзазол у нас ёсць яшчэ адно возера — Межужол. Яно амаль такое ж па памерах, як і тое, толькі чысцейшае. Туды з Крулеўшчыны мазут не прыгоніць — возера глухое. Там аднойчы сярод верхавога балота, на сасне, мы выявілі гняздо рэдкай птушкі — скапы. Назіраю штогод, малых кальцую. У асноўным па два-тры птушаняці бывае. Вельмі асцярожная птушка скапа! Скажам, адна паляцела на паляванне, а другая будзе абавязкова дзяцей ахоўваць. А падрасце маладняк, то і абодва бацькі за спожывам лятуць. Звычайна прыносяць карасёў, шчупакоў. Разрываюць здабычу воддаль гнязда, падносяць малым толькі кавалкі. Пазней — рыбіны цэлымі ў гняздо валакуць. Во яшчэ што цікава! У скапы дужа арыгінальныя пальцы. У спакойным стане яны размеркаваны так: тры — наперад, адзін — назад. А ў час палявання, калі птах пікіруе і цаляе схапіць здабычу, адзін з пярэдніх пальцаў як бы пераварочваецца і тады атрымліваецца: два супраць двух. Такімі «абцугамі» намёртва хапае скапа рыбіну!

А вось чорны бусел зусім іншая птушка. Праўда, асцярожная таксама, але нейкая далікатная. Да таго ж надта прыгожая. Жыве ў глухамані, а на жыроўку прылятае на Бярэзіну, старарэччы ці канавы. Прылятае рана-раненька. Калі ўпадабае якое месца — кожную раніцу яе там сустрэць можна. Рыбу ловіць, падпільноўваючы. Збірае жабак, уюноў, апалонікаў — усю жыўнасць водную. Часта чорны бусел разам з белым ходзіць. Птушкі не ваююць між сабою, не б'юцца — мірна сябе паводзяць. Цікава і такое: бусляняты чорных буслоў падаюць голас — шыпяць, а дарослыя маўчаць. І не клекатне нават! Гняздо будуе не на вяршынях, а пры самым ствале старых дрэў. Сустракаў іх на сасне, альшыне, асіне, бярэзіне. Галоўнае, каб дрэва разгалістае было, надзейна трымала гняздо іхняе. Інакш... У адным квартале быў такі выпадак: бура скінула з асіны гняздо чор-

нага бусла. Здаецца, і дрэва як дрэва было, і разгалістасць мела. А вось не ўтрымала гнязда. І, думаеце, на той асіне новае пабудавалі? Ого! У іншым месцы прыстроіліся. Я тады разважыў: а што калі птушкам штучных гнёздаў нарабіць, аблегчыць клопат іхні? Падбіў суседа, Шурку Працукевіча, і мы неяк увосень пабудавалі гняздо для беркута. Вясною бачым: пасяліўся канюк! Два гады жыў там. Потым змайстравалі гняздо змеяеду. Заняў! Дзяцей вывеў... Пра змеяеда асобна хочацца сказаць. Гадоў пяць назад, у канцы чэрвеня, з Міколам, братам Шуркі Працукевіча, пайшлі мы шукаць ваўкоў. Не знайшлі звера, а на гняздо змеяеда натрапілі. Падняўся я туды і бачу: сядзіць птушаня (змеяеды толькі па аднаму дзіцёнку выводзяць), а з дзюбы хвост яшчаркі відзён. Во дык знаходка! Сфатаграфаваў я, а здымак потым паслаў Іваноўскаму, галоўнаму паляўнічаму вобласці. Неўзабаве той паведаміў, што гэта — першае гняздо змеяеда, выяўленае на Віцебшчыне!

Даўней у нас і жураўоў было, а цяпер толькі ў двух кварталах сустракаюцца. Вясною, каторыя не знайшлі сабе пары, лётаюць на палях каля вёсак Несцераўшчына і Дзезіна. Гнёзды жураўоў не на глыбёлах — лясістых астраўках сярод балот, а на галіках — верхавых, не зарослых кустамі балотах, дзе журавін многа. Я аднойчы натрапіў на два гнязды... Вельмі хораша назіраць, калі маладыя журавы крылы трэніруюць. Так ужо стараюцца, так стараюцца! Усё роўна як танцуюць. А старыя стаяць воддаль і толькі пераклікаюцца. У нас ёсць мясціна, дзе яны збіраюцца перад выраем. Іншы раз за трыццаць птахаў збярэцца. На наш час гэта не мала. Прызнацца, і радасна на душы робіцца, і неяк самотна. Не ўсе ж вернуцца! Многа ў пералётах траціцца.

Я ўсё пра птушак ды пра птушак. А вось у Ліпаўскім лясніцтве ёсць адзін чалавек — Лукасік Іван Восіпавіч. Мы яго Янкам завём. Дык ён так прывязаўся да лесу, што нічым яго адтуль не выманіш. Леснікуе даўно. Дзеці павырасталі і разбегліся,

жонка таксама ва Ушацкі раён з'ехала, а Янак — застаўся. Так і жыве адзін у лесе, за восем кіламетраў ад Ліпава. Праўда, месцейка там прыгожае. Азярцо паблізу стаіць. Толькі чамусьці Чорным завецца. Мо таму, што рыба ў ім ніколі не вадзілася? Віною таму, лічу, газ балотны... Дык вось. Гадоў пару таму назад у Янкавым абходзе зімавала аж сем мядзведзяў. Спачатку залегла мядзведзіца з пестуном. (Падвесну ў яе нарадзілася яшчэ двое мядзведзянят.) Потым залёг стары самец, трошкі пазней — маладзейшы. А тады і трэці аднекуль прываloкся і таксама залёг паблізу. Во Янак радаваўся, калі выявіў кампанію такую!..»

Там, на Бярэзіне, я сустрэўся яшчэ з адным цікавым чалавекам — Бухаркіным Анатолем Віктаравічам. Ён таксама лесавод, але ўвесь вольны час аддае эцюдам. Калі я наведаў Анатоля Віктаравіча — дзіву даўся: яго кватэра нагадвала карцінную галерэю. Я трапіў у казачны свет, створаны мастаком. Эцюды, напісаныя маслам, зачароўвалі, бралі ў палон, не адпускалі, прымушалі «учытвацца» ў іх. Якое багацце зямлі роднай бачылася ў гэтых творах! Паспрабую «прачытаць» некалькі эцюдаў Бухаркіна.

**«Возера Палік».** Світанак. Ціхі і мяккі. Такія світанкі толькі тут, на Паліку. Сонца адтуль, з правага берага павінна ўстаць. Бо неба ў тым месцы пацягнута ледзь улоўнай ружаватай смугой.

Вецер яшчэ не прачнуўся, і вада гладкая, нібы шкло. Яна таксама адсвечвае ружавінкай і тут, каля берага, здаецца цёплай-цёплай. Так і рупіць дакрануцца рукою.

Відаць, зусім нядаўна над возерам кучаравіўся туман, а перад світанкам знік. І ніхто — ні рыбіна, ні птушка — не адважыўся парушыць спакойную роўнядзь. Возера быццам спіць.

Зусім блізенька, на беражку, дрэмле човен. Стары, абшарпаны і смалены-перасмалены. А дзе вясло?

Няўжо ўчора ўвечары чалавек узяў яго з сабою і заткнуў у падстрэшша?

Немалое ўсё ж возера! Таго берагу і не відаць нават. Ён толькі ўгадваецца. Там — лес, пасівелы, загадкавы. І цяжка сказаць, колькі туды будзе напрасткі.

А гэты бераг — зялёны-зялёны. Трава — яркая, сакавітая. Як свежа яна глядзіцца на світанку! Яе спакой ніхто яшчэ не парушаў: раса не прыняла слядоў ні звера, ні птушкі, ні чалавека.

Злева, каля самага краечку, у здзіўленні застыла чаромха: вунь як выгнала чарот! Гэта вада, сонца і парныя ночы дапамаглі яму.

Чаромха ўся ў чаканні. Вось-вось прыйдзе чалавек, бразне аб човен вяслом і разбудзіць возера. І тады ажыве ўсё — выкаціцца маладое сонца, зашуміць шапаткі чарот, заплюхае рыба, заспяваюць птахі. А лодка будзе аддаляцца паволі-паволі. Чайкі абавязкова правядуць яе аж да таго берага...

**«Лясная крынічка».** Цішынёю і спакоем дыхае лес. Задумліва стаяць сосны, асіны, елкі, бярэзінкі. Яны нібы згадваюць: а што тут было некалі?

А некалі над гэтай мясцінай страшэнная бура пранеслася. Яна скручвала верхавіны, пераломвала камлі, выдзірала з каранямі дрэвы. Адзін вывараценъ пачарнеў ад часу, натапырыўся сукавіннем, аброс імхом і нагадвае ўздыбленага звера.

Калі ўпала на зямлю дрэва, прабілася крынічка — маленькая, звонкая, чысцюткая. І пабегла яна, забруіла, а тут, бліжэй да краю, расплылася, утварыла нібы азярынку з ціхай-ціхай вадою. І здзівіўся лес, пазіраючы ў тое люстэрка. А каліна аж укленчыла — так пажадалася ёй звярнуць на сябе ўвагу.

Крынічка гэтая наталяе смагу і загойвае раны. Недарма сюды некалі прыходзілі партызаны. Тады і назвалі яе жывою...

Потым прамчаўся тут яшчэ адзін буралом. На гэты раз ён пляжыў дрэвы на кладкі. З правага берагу на левы, з левага — на правы. Вунь колькі тых кла-

дак ляжыць — і гладкіх, і заімшэлых. Відаць, лясныя жыхары задаволены: не трэба і ног мачыць. Выбірай, якую хочаш!

А хто гэта ішоў па кладцы? Козачка? Барсучыха? А можа мядзведзь? Не. Ён толькі патаптаўся на беразе, пахлябтаў вады, пакінуў на траве ўмяціны і паваloкся ў маліннік. Яго ж за вываратнем — як таго чароту на Паліку.

Нечакана кідаецца ў вочы: старая яліна верхавінаю ачысціла ад аблачын кавалачак неба, і адтуль бліснула сонца. Асвяціла толькі краечак лясной крынічкі, але і ад гэтага стала радасна.

**«Бярэзіна».** Непрыкметна сплыло па Бярэзіне лета, і на змену сімфоніі гукаў і фарбаў прыйшоў спакойны настрой восені. Першыя маразы пафарбавалі лістоту. Яна зрабілася яркай і кідкай. Во як на тым беразе гарыць бярэзінка! І асінка аж палыхае ад чырвані. Лазнякі таксама ўспыхнулі, нібы хто пазалотай пакрыў іх. Дуб стаіць у густым бурым уборы. А побач вярба кучаравіцца. Яе нібы не кранулі ні волкі туман, ні калючы прымаразак.

Рака стараецца ўвабраць колеры восені, а не можа — вада зрабілася цяжкай, страціла здольнасць адлюстроўваць. І толькі ў затоцы, што падступае да гэтага берага, нешта зелена паблісквае. Няўжо лісце белых гарлачыкаў? Яны! Быццам вялікія патэльні, цямнеюць лісты на халоднай вадзе.

Па той бок затокі — салаўіны бераг. Ён болей пакаты, чым гэты, болей зарослы, болей загадкавы. Менавіта там, у суседнім вірку, і водзяцца ляшчы-засланкі ды самы-круглякі. Але з вудаю туды і не думай — якую хочаш жылку парвуць!

А што там, у самым кутку затокі? Ці не бабровая хатка? Вунь колькі ламачча нацягаў! Бабру там добра. Вербалоз — побач. Сячы, колькі трэба, рыхтуйся да зімы, тралюй да хаткі. І ён тралюе. Бо чаго кругі па вадзе ідуць? Здаецца, пачакай трошкі — і ён з'явіцца на беразе, зірне на цябе цікаўным вокам, потым зноў зойдзе ў ваду, пляснe па ёй шырокім хвастом і пагоніць перад сабою чарговую галіну.

Працуй, бабёр! Цёпла і ярка гары ліст на прыбярэжных дрэвах! І ты, сарока, супакойся на верхавінцы вольхі! Запаведная мясціна не любіць, калі яе трывожаць...

**«Белая зямля».** Аднойчы, яшчэ ў канцы лістапада, на пажухлую траву балаціны лёг снег. Лёг смела і шчодра. Толькі азярынку не змог прысыпаць. Але ўсё ж яна цяпер не так паблісквае і не так удала адлюстроўвае неба.

А неба і зямля — аднолькавага колеру. І толькі паміж імі то там, то тут пракідаюцца іншыя колеры — зялёны, шэры, чырвоны. Зялёны — ад сасонак, што кучаравяцца па той бок азярынкі, на ўзвышшы. Чырвоны — ад ракітавых кустоў, што пасталі трошкі лявей на берагавым схіле. Шэры — ад камлёў старых альшын, што віднеюцца на самым ускрайку балаціны.

Вось і некалькі бярэзінак, тонкіх і гонкіх. Яны на фоне сасонак — як белыя ніткі, спушчаныя з белага неба на белую зямлю.

Радуе вока махавінне, што абвіло азярынку зялёнай стужкай. Сям-там укроплены ў тую стужку чырвоныя вочкі журавін. Відаць, сюды любяць прылятаць лясныя пеўні — глушцы — патаптацца на беражку, папіць вады, пачаставацца ягадамі. Але свежы сняжок прыцерусіў птушыныя крыжыкі. Толькі там, бліжэй да лазнякоў, відзён доўгі ланцуг слядоў. Гэта стары сякач напярэдадні правёў сваю сям'ю ў суседнюю дуброву.

Азярынка хутка зашкліцца лёдам.
А вакол будзе ляжаць белая зямля.
Чыстая зямля.
Спакойная зямля.

Спакойная зямля. Чыстая зямля...

А некалі тут, на Бярэзіне, было ой як неспакойна!

1920 год. Вайна з белапалякамі. Па Бярэзіне праходзіла лінія фронту. Адным з нашых палкоў камандаваў тады Васіль Іванавіч Чуйкоў — у будучым

вядомы савецкі ваенны дзеяч, Маршал Савецкага Саюза, двойчы Герой Савецкага Саюза.

У Бягомльскім музеі народнай славы ёсць карціна мастака Ісаака Бароўскага «Подзвіг трынаццаці». Гэта — суровы расказ пра мужнасць чырвонаармейцаў з палка Чуйкова, якія загінулі, але ворага не дапусцілі да пераправы цераз Бярэзіну... У сямідзесятых гадах мясцовыя следапыты на сутоку рачулкі Дзяражыны і Бярэзіны знайшлі кулямет «максім». Ён таксама з палка Чуйкова і захоўваецца ў тутэйшым музеі.

1941 год. У Саўскім бары (там цяпер тэрыторыя Бярэзінскага біясфернага запаведніка) быў створаны адзін з першых партызанскіх атрадаў у гэтых мясцінах — атрад Кузьмы. Яго камандзір, мясцовы жыхар, Кузьма Аўтушка ўлетку 1942 года ў баі з гітлераўцамі быў паранены, схоплены фашыстамі і жывым спалены ў сваім доме...

1944 год. Чэрвень. Фашысты паставілі перад сабой задачу: выцесніць партызанскія атрады, якія дзейнічалі на тэрыторыі былога Бягомльскага, Барысаўскага і часткі Лепельскага раёнаў, у раён возера Палік, акружыць, знішчыць і тым самым засцерагчы ад небяспекі свае тылы перад адступленнем. На правядзенне гэтай аперацыі было кінута каля 90 тысяч рэгулярных войск, карных батальёнаў, паліцэйскіх фарміраванняў. Аднак камандаванне партызанскай брыгады «Жалязняк» разгадала мэту блакады і пачало рыхтавацца да прарыву. Выходзілі з варожага кальца атрадамі, асобнымі групамі. А як быць з цяжкапараненымі, з тыфознымі хворымі? Іх трыццаць чатыры! Усе нетранспартабельныя. Прымаецца смелае рашэнне: параненых і хворых пакінуць на месцы! У спешным парадку для іх быў пабудаваны ў Саўскім бары падземны шпіталь, абсталяваны палаты, замаскіраваны ўваходы і прадухі, выкапаны калодзеж. Людзей забяспечылі саланінай і сухарамі, пакінулі з імі трох санітарак і трох медыцынскіх сясцёр. Тэрыторыя, дзе знаходзіўся падземны шпіталь, была блакіравана фашыстамі,

аднак людзі змаглі пражыць там аж васемнаццаць сутак — пакуль нашы не выгналі ворага. Пасля ўсе былі адпраўлены ў бальніцы і шпіталі на далечванне.

1944 год. Ліпень. Камандаванне партызанскай брыгады «Жалязняк» атрымала заданне ад штаба партызанскага руху падрыхтаваць на Бярэзіне пераправу для наступаючых нашых войск. Пераправу пачалі ўзводзіць паблізу вёскі Брады. Неўзабаве прабілася туды і сапёрная часць Чырвонай Арміі, стала дапамагаць партызанам. Пад няспынным варожым агнём смела дзейнічаў сяржант Віктар Кладзіеў. Ён быў паранены, але не пакінуў таварышаў, працягваў работу і кіраваў сапёрамі. Фашысты кінулі на пераправу артылерыю, самалёты. Віктара зноў параніла, на гэты раз смяротна...

Калі ехаць з Лепеля на Бягомль, з правага боку Кальніцкага моста цераз Бярэзіну можна заўважыць сціплы абеліск у знак подзвігу Героя Савецкага Саюза Кладзіева...

А 1812 год? Гэта ж на Бярэзіне завяршыўся канчатковы разгром напалеонаўскай арміі. У чэрвені таго ж года пераправай войск цераз Нёман Напалеон пачаў паход на Расію. Дайшоў да Масквы... Уцякаў у сваю Францыю праз Смаленск, Ляды, Оршу, Талачын, Зембін... Задума французскага ваякі пры адступленні пераправіць армію пад Барысавам была сарвана планам Кутузава. Французам удалося каля вёскі Студзёнка пабудаваць два масты, пераправіць на правы бераг баяздольныя часці. Але рускія войскі атакавалі ворага на абодвух берагах. Завязаўся цяжкі бой. Брылёўскае поле на Бярэзіне стала другім Куліковым полем... Вораг быў разбіты.

Сяржант Бургонь, якому цудам удалося вярнуцца ў Францыю, так апісваў у сваіх «успамінах» уцёкі суайчыннікаў пад Барысавам: «...Холад і голад ужо даймаў так, што салдаты варылі поліўку з конскай крыві... Большасць ішлі пехам, абапіраючыся на палкі, бо абмарожаныя ногі ледзь рухаліся, абкручаныя ў кавалкі аўчыны ці падраныя анучы... Няшчасныя

ішлі цераз мост агромністымі натоўпамі. Многія кідаліся ў раку, спадзеючыся дабрацца ўплаў да супрацьлеглага берага, але гінулі...»

Адмірал В. П. Чычагоў у сваіх мемуарах паведамляе пра гэта: «...Страшнае відовішча адкрылася нам, калі мы 17(30) лістапада прыйшлі на тое месца, якое напярэдадні займаў вораг і якое ён толькі што пакінуў. Зямля была ўкрыта трупамі забітых і замёрзлых людзей; яны ляжалі ў розных позах. Сялянскія хаты ўсюды былі імі перапоўнены, рака была запруджана мноствам затанулых пехацінцаў, жанчын і дзяцей; каля мастоў валяліся цэлыя эскадроны... Сярод гэтых трупаў, якія ўзвышаліся над паверхняй вады, відно было: стаялі, як статуі, скачанелыя кавалерысты на конях у той позе, у якой захапіла іх смерць...

У сваім дакладзе Аляксандру I Кутузаў пісаў, што на Бярэзіне праціўнік страціў з 16(28) па 20 лістапада (2 снежня) толькі палоннымі 5 генералаў, 427 штаб- і обер-афіцэраў і 23500 салдат, а разам з забітымі і тымі, што ўтапіліся, страты склалі каля 50 тысяч чалавек...

Англійскі падарожнік Джонстан, якому пазней давялося ехаць з Оршы на Барысаў, адзначаў у сваім «Падарожжы»: «Нішто не можа выглядаць так гаротна, як сумныя і заблытаныя сляды адступлення французскай арміі. Рады бярэзін, пасаджаныя ўздоўж дарог, былі цалкам спалены; кожнае дрэва не толькі каля дарогі, але і ў самай глыбіні лесу было падпалена. Здавалася, што французы раскладвалі вогнішча каля падножжа кожнага дрэва...

Аднак вернемся ў сорак чацвёрты. Пры вызваленні Барысава паблізу Бярэзіны загінуў французскі лётчык Жак Гастон. Служыў ён у Першым асобным французскім добраахвотным знішчальным авіяпалку «Нармандыя-Нёман», які ў Вялікую Айчынную вайну ўдзельнічаў у баях супраць фашысцкай Германіі. У 1964 годзе ў балоце паблізу вёскі Славені былі выяўлены астанкі самалёта «Як-3» і адважнага пілота... Мемарыяльная дошка ў гонар французскага

лётчыка Жака Гастона ўстаноўлена на будынку 9-й сярэдняй школы Барысава. Яго імя носіць піянерская дружына...

Беларуская зямля стала як бы другой радзімай для Жака. Наш народ ніколі не забудзе яго подзвігу...

І апошняе. З Бярэзінай звязаны біяграфіі паэта Міхася Клімковіча і кампазітара Нестара Сакалоўскага. Першы нарадзіўся ў Барысаўскім раёне, другі — у Докшыцкім. Яны — аўтары Гімна Беларускай ССР.

Штораніцы, у 6 гадзін 15 мінут па маскоўскаму часу, мы чуем урачыстую мелодыю, знаёмыя і дарагія кожнаму словы:

Мы — беларусы...

Быў будзённы дзень, і ў аўтобусе — самы раз, ніхто не стаяў. Большасць ехала ў Жодзіна, некаторыя — у Мінск. Побач са мною села вясковая кабета. Што была яна з вёскі — выдавалі рукі, вялікія, быццам мужчынскія, і мазолістыя, натруджаныя.

Такія здольны трымаць вілы, што дзяруць пласты гною ў хляве.

Яны здольны трымаць сякеру, што можа раскалоць якую хочаш плашку.

Яны здольны ўсю днёўку нароўні з мужчынамі класці ў пракосы траву.

Яны могуць утрымаць і зброю, калі гэта спатрэбіцца.

Яны, гэтыя рукі, здольны быць і пяшчотнымі, абдымаць каханага, гушкаць дзіця — будучае зямлі нашай...

Так думалася пра рукі мае суседкі.

Яшчэ думалася, што некалі складу пра іх лепшы свой гімн.

*Май 1985 г.— кастрычнік 1986 г.*

# Замест пасляслоўя

З таго часу, як выйшла ў свет кніга «Жаваранак над полем», а ў перыядычным друку пачалі з'яўляцца асобныя раздзелы «Зямлі бацькоў нашых» і загучалі перадачы пад гэтай рубрыкай на рэспубліканскім радыё, я атрымаў шмат пісьмаў з розных куткоў Беларусі і лішні раз пераканаўся, наколькі зацікаўлена чытач ставіцца да гісторыі роднага краю, экалагічных праблем, аховы прыроды.

Пісьмы гэтыя не аднолькавыя па зместу: ёсць лісты-падзякі, лісты-прапановы, лісты-парады, ёсць нават і з крытычнымі заўвагамі. Але адно яднае іх — сур'ёзнае стаўленне чытача да пісьменніцкай працы. Таму і даю слова чытачам.

*Юрый Мікалаевіч Сокалаў,* жыхар Баранавічаў:

«З вялікай радасцю сустрэў вашу кнігу «Жаваранак над полем», дзе так цудоўна апяваецца наша родная прырода... Вось закрыта апошняя старонка, а ў думках працягваю падарожжа з вашымі героямі.

Вялікі вам дзякуй за цікавую кнігу!»

*Алесь Фаміч Зайка,* настаўнік Запалянскай васьмігодкі Івацэвіцкага раёна:

«Буду шчырым. Кніга ў пэўнай меры адкрыла для мяне вас як пісьменніка. І надзвычай уразіла. Чым? Майстэрствам слова... Ваша мова дакладная, простая, даверлівая, шчырая, як глыток крынічнай вады ў спякоту. Паверце, гэта не камплімент. Гэта канстатацыя найпрыемнейшага адкрыцця, факта. Гэта першае.

Другое. Праз дзесяцігоддзі адно крычалі ў кнігах пра Радзіму, Айчыну, Бацькаўшчыну, Беларусь — і прыгожая яна, і любімая, і дарагая, і адзіная, і навек, і на ўсё жыццё. А яе лясы губілі, рэкі спрамлялі, азёры нішчылі, цэрквы — пад склады, палацы —

на друз, гісторыю — у забыццё... Дакрычаліся да таго, што пра гэтую ўзнёслую «любоў» і чытаць ніхто не хоча.

Даруйце мне, але «Жаваранак над полем» — адзін з галасоў гэтага хору. Праблем ніякіх, усё прыгожа, чысценька, хораша — рай на зямлі, а не Беларусь. Згодзен: цяжкія, застойныя гады былі. Сказаць праўду было амаль немагчыма...

Калі вы хочаце, каб вас ацанілі, змагайцеся за сваю Бацькаўшчыну, яе прыроду, культуру, гісторыю. Так, як змагаюцца Друцэ за сваю Малдавію, Залыгін, Бялоў, Распуцін — за сібірскія рэкі, як змагаўся Чывіліхін за Байкал. Цяпер патрэбна публіцыстыка!

Я думаю, вам ёсць пра што напісаць. Даруйце за пэўную рэзкасць, але, што зробіш,— так я думаю».

*Раіса Міхайлаўна Антонава,* супрацоўнік рэчыцкай газеты «Дняпровец»:

«Днямі слухалі па радыё ваш аповяд пра Рэчыцу, Гарываду, нафтавікоў. І такая ў нас думка ўзнікла: надрукаваць, з вашай згоды, гэты матэрыял у нашай газеце. Думаю, што з задавальненнем прачытаюць яго ўсе жыхары раёна».

*Д. К. Клімаў,* жыхар Пінска:

«Мяне моцна зацікавіў нарыс, у якім расказвалася пра жыццё буслоў (буськоў па-нашаму). Я прашу прадоўжыць рассказ аб жыцці гэтых птушак. Магу выслаць вам і цікавыя факты пра іх...»

*Уладзімір Уладзіміравіч Баярын,* ветэран вайны і працы, пасёлак Ленін Жыткавіцкага раёна:

«З вялікім спазненнем прачытаў ваш «Граніт Палесся» — ездзіў у Тынду, сталіцу БАМа, да сына. Але яшчэ там, у Тындзе, мне паведамілі аб нарысе мае сябры з Мікашэвічаў і Петрыкава... Я ўдзячны, што вы ўспомнілі і пра маю сціплую краязнаўчую працу. За ўсё вялікі дзякуй.

Але не гэта галоўнае. Каб сабраны мною (літаральна «па макулінцы»!) краязнаўчы матэрыял не ператварыўся ў макулатуру пасля маёй смерці, прашу вас дапамагчы мне напісаць кніжачку пра

пасёлак Ленін — колішні цэнтр Ленінскай воласці і Ленінскага раёна. Гэта, я лічу, своеасаблівы аазіс, жамчужына сярод шматлікіх цудоўных куткоў зямлі нашай...»

*Алесь Мікалаевіч Белакоз,* настаўнік Гудзевіцкай сярэдняй школы Мастоўскага раёна:

«Нарыс пра наш музей мне спадабаўся. Зоська Верас ужо ў некалькіх лістах піша, што захапляецца вашымі творамі і вельмі хоча з вамі сустрэцца...»

*Аляксандр Ульянавіч Дземша,* жыхар вёскі Полымя Гродзенскага раёна:

«...З прывітаннем да вас дзед Сашко́ і бабка Ліда. Шлём вялікую ўдзячнасць за клопат. У нас вялікая радасць: нам далі святло!..»

*Марыя Мартысюк,* жыхарка Брэста:

«Паважаны аўтар «Зямлі бацькоў нашых»! Дзякуй вялікі за вашу працу. Не кожнаму дадзена так проста і зразумела сказаць аб нашай зямлі, аб прыгажосці яе рэк і азёр, аб велічы лясоў нашых.

Сама я родам з маленькай вёсачкі, што паблізу абласнога цэнтра. Побач праходзіць магістраль Масква — Брэст. Тут я нарадзілася, тут зрабіла першы крок, тут прайшло маё дзяцінства і юнацтва. І хоць ужо дваццаць гадоў як жыву і працую ў горадзе, па-ранейшаму сэрцам і душою там, у сваёй роднай хатцы, куды часта прыязджаю. Тут знаёма кожная сцяжынка, кожны кусцік, тут усё мне дорага і міла. Тут жылі мае дзяды, прадзеды, бацькі. Даўно няма ні таты, ні мамы, але памяць аб іх жыве. Як зараз бачу бацьку маладога, але стомленага, які вяртаецца з горада, дзе ён працаваў на чыгунцы. Дарэчы, і я выбрала сабе прафесію чыгуначніка... Бачу маці, вечна заклапочаную, працалюбівую... Мне было сем гадоў, калі яна захварэла. З таго часу я і карову даіла, і свіней карміла. Увогуле, лёс не песціў...

Я зноў і зноў вяртаюся да вашага нарыса, чытаю і перад сабою бачу ўсю прыгажосць роднага краю. Неяк гады тры-чатыры назад з дачкой ездзіла ў Пажэжын. Выйшлі з цягніка, прайшлі ўздоўж пуці, збочылі налева і пакіравалі па лясной сцяжынцы. На

траве паблісквае раса. Вакол спяваюць птахі. А паветра — чыстае, празрыстае. То тут, то там стукае дзяцел. У лужку жабы крумкаюць...

Набралі многа ягад. Вярталіся да станцыі напрасткі. Здаецца, зусім побач чуцён перастук цягніка. Аднак ішлі, ішлі і натрапілі на балотца. Ні туды, ні сюды! Наўкол чарот, а на вадзе гарлачыкі бялеюць... Скакалі з купіны на купіну, пакуль выбраліся да чыгуначнага палатна,— стомленыя, але шчаслівыя...

Люблю сустракаць блакітныя світанкі. Прачнуся рана-раненька, выйду на парог. Якая прыгажосць! Зямля яшчэ спіць. Цішыня. А ўстане сонца — усё ўвачавідкі мяняецца. Пачынаецца ранак новага працоўнага дня...»

Што магу сказаць у заключэнне гэтага своеасаблівага пасляслоўя? Толькі адно: рады, што запаліў у сэрцах людскіх агеньчык любові да роднай зямлі.

# Змест


Ад аўтара . . . . . . . . . . . . . . 5
Крутагор'е . . . . . . . . . . . . . . 7
У жыце цвілі васількі . . . . . . . . . . 17
Пад высокім сонцам . . . . . . . . . . . 28
Гарывада . . . . . . . . . . . . . . 45
Бужане . . . . . . . . . . . . . . 56
Граніт Палесся . . . . . . . . . . . . 65
Белавежа . . . . . . . . . . . . . . 79
Паўночнае памежжа . . . . . . . . . . . 97
Соль зямлі . . . . . . . . . . . . . 107
Камень Вялікі . . . . . . . . . . . . 120
Музей у Гудзевічах . . . . . . . . . . . 132
Цар-дуб . . . . . . . . . . . . . . 151
На зямлі радзімічаў . . . . . . . . . . 167
Дзіва . . . . . . . . . . . . . . 179
Самае глыбокае . . . . . . . . . . . . 198
Гожа над Нёманам . . . . . . . . . . . 210
Сталіца валявах . . . . . . . . . . . . 222
Нарач . . . . . . . . . . . . . . 242
Полымя . . . . . . . . . . . . . . 257
Чужой бяды не бывае . . . . . . . . . . 271
Жыві, мая бярэзіна! . . . . . . . . . . 285
Замест пасляслоўя . . . . . . . . . . . 299

Литературно-художественное издание

**Пархуто Ярослав Сильвестрович**

**ЗЕМЛЯ ОТЦОВ НАШИХ**

Путешествие по родному краю

Минск, издательство «Полымя»

На белорусском языке

**Літаратурна-мастацкае выданне**

**Пархута Яраслаў Сільвестравіч**

**ЗЯМЛЯ БАЦЬКОЎ НАШЫХ**

Падарожжа па родным краі

Загадчыца рэдакцыі *Т. Г. Мінчукова*
Рэдактар *В. І. Дрозд*
Малодшы рэдактар *А. І. Саламевіч*
Мастацкі рэдактар *С. У. Стрэльскі*
Тэхнічны рэдактар *М. А. Шабалінская*
Карэктары *Г. В. Алешка, Л. І. Жылінская, Г. М. Журовіч, Л. К. Сямёнава*

ІБ № 583

Здадзена ў набор 18.09.87. Падпісана да друку 25.04.88. АТ 06159. Фармат 70 × 90¹/₃₂. Папера афсетная № 1. Гарнітура літаратурная. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 11,11. Ум. фарб.-адб. 23,52. Ул.-выд. арк. 13,51. Тыраж 18 000 экз. Выд. № 4159. Зак. 813. Цана 85 к.

Выдавецтва «Полымя» Дзяржаўнага камітэта Беларускай ССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, пр. Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.





85 к.

